Этот электронный документ был загружен с сайта филологического факультета БГУ http://www.philology.bsu.by

# ВУЧЭБНЫЯ МАТЭРЫЯЛЫ ПА ГІСТОРЫІ І ТЭОРЫІ РЫТОРЫКІ

## РЫТОРЫКА СТАРАЖЫТНАЙ ГРЭЦЫІ (АГУЛЬНАЯ ХАРАКТАРЫСТЫКА)

Пачынаючы сістэматычнае знаёмства з гісторыяй рыторыкі старажытнасці, мы маем права паставіць заканамерныя пытанні: ці не будуць залішнімі для сучаснага аратара гэтыя звесткі па "археалогіі вуснага слова"? ці не будуць яны незапатрабаваным, "мёртвым грузам" яго памяці? Запэўнім, што як бы прагматычна не быў настроены наш сучаснік, адказ на пастаўленыя пытанні можа быць толькі адмоўным. Звяртанне да рытарычнай мудрасці старажытных людзей, да вытокаў развіцця рыторыкі дазваляе ўбачыць і ацаніць вечныя, нецмянеючыя каштоўнасці і законы абыходжання са словам. Пра іх апраўданасць і значнасць гаворыць тое, што яны з гонарам вытрымалі выпрабаванне часам.

Асабліва вялікай і унікальнай ў гісторыі рыторыкі з'яўляецца роля старажытнагрэчаскіх практыкаў-аратараў і настаўнікаў-рытараў. Антычную Грэцыю справядліва называюць "калыскай еўрапейскай культуры" ў цэлым і рытарычнай культуры, у прыватнасці. Антычнасць – гэта і эпоха зараджэння пачатковых рытарычных ведаў, і час, калі яны фарміруюцца ў стройную навуковую сістэму; гэта перыяд, калі красамоўства дасягае самых высокіх вяршынь, рэальнай магутнасці і грамадскага прэстыжу. Ужо ў антычную эпоху, "пад небам юнай Элады", складваюцца светапоглядныя ідэалы слоўнага ўздзеяння і ўзаемадзеяння, выпрацоўваюцца адмысловыя і хітрамудрыя тактыкі пераканання, вызначаюцца прыцягальныя для слухачоў, але часам кантрастныя рытарскія манеры. Знаёмства з рытарычнай спадчынай старажытнасці садзейнічае духоўнаму абагачэнню асобы, далучае яе да культурнай памяці чалавецтва, разам з тым узбройвае прыёмамі, якія захоўваюцца ў сучаснай маўленчай практыцы.

Знаёмства з гэтай тэмай можа ахопліваць наступныя асноўныя пытанні:

1. Адрозненні паміж усходняй і заходняй рытарычнымі традыцыямі.
2. Вытокі старажытнагрэчаскага рытарскага мастацтва.
3. Роля рытарскага слова ў дэмакратычнай афінскай дзяржаве.
4. Красамоўства афінскага стратэга Перыкла.
5. Зараджэнне і асаблівасці сафістычнай рыторыкі.
6. Апазіцыя сафістычнай рыторыцы ў асабах Сакрата і Платона.
7. Буйнейшыя прадстаўнікі асобных родаў красамоўства.
8. Трагізм і веліч жыццёвага і творчага шляху Дэмасфена.
9. Рытарычная дзейнасць Арыстоцеля. Праблематыка трактата "Рыторыка".

Этот электронный документ был загружен с сайта филологического факультета БГУ http://www.philology.bsu.by

Паводле сведчанняў старажытных культурных помнікаў чалавецтва, рыторыка дасягае высокага ўзроўню развіцця не толькі ў Старажытнай Грэцыі і Рыме, якія традыцыйна шанаваліся еўрапейскай цывілізацыяй, але і ў краінах Старажытнага Усходу: Егіпце, Асірыі, Вавілоніі і асабліва – у Індыі і Кітаі. Аднак паміж усходняй і заходняй рытарычнымі традыцыямі назіраюцца заўважныя адрозненні. Яны выяўляюцца галоўным чынам:

- у розным характары **рэгламентацыі** прамовы – яе падпарадкаванасці папярэдне прадпісаным правілам;
- у розным характары **адрасаванасці** прамовы.

З аднаго боку, усходняя традыцыя арыентавала на больш жорсткае прытрымліванне да ўзору, на завучванне і вымаўленне прапанаванага гатовага тэксту. Старажытныя помнікі змяшчаюць шмат падобных ўзораў. Напрыклад, у адной з класічных кніг кітайскай адукаванасці – “І-лі” (“Абрады добрапрыстойнасці”) – змешчаны прыклады прамоў на вясельнай цырымоніі, на званым абедзе, выступленняў дзяржаўных служачых і да т.п. У Старажытнай Індыі на памяць завучвалася каля 30 кананічных разважанняў-аргументаў для іх выкарыстання ў спрэчцы. Заходняя традыцыя арыентавала больш на засваенне агульных правілаў пабудовы прамовы, якія рытар павінен быў самастойна прымяняць да кожнай канкрэтнай сітуацыі.

Таму ўсходні механізм падрыхтоўкі выступлення атрымаў назву ***канчатковага***, а заходні – ***матрычнага***. У першым прапаноўваецца закрытая, канчатковая сукупнасць тэкстаў на розныя выпадкі жыцця, у другім – схема-матрыца, скарыстоўваючы якую, рытар творча параджае адкрытае і патэнцыяльна бясконцае мноства тэкстаў.

З другога боку, у краінах Старажытнага Усходу прамова была разлічана на больш вузкую аўдыторыю, чым у Старажытнай Грэцыі і Рыме. Разлік рабіўся ў першую чаргу на псіхалагічныя асаблівасці чалавека ўвогуле, абстрактнага слухача самога па сабе (Старажытная Індыя), або на вузкае кола знатакоў і сваё ўнутранае пачуццё (Старажытны Кітай). Нядзіўна, што ў Кітаі, дзе прамовы шырока не гучалі, нават адзіная вымаўленчая норма складваецца ў эпоху сярэдневякоўя. Як вынік, развіваюцца асабліва вытанчаныя перыфрастычныя формы слоўнага выказвання (старажытнаіндыйскі трактат “Святло намёка”, старажытнакітайскі трактат “Разны дракон прыгожага пісьменства” і інш. помнікі), вельмі важная роля адводзіцца мастацкаму ўдасканаленню выказвання. Аўдыторыя ў Старажытнай Грэцыі і Рыме была больш шматлюднай, масавай, і ў выніку акцэнт рабіўся на здольнасць пераканаць, на дасягненне ў выступленні практычнай мэты. Такім чынам, каштоўнасць заходняй рытарычнай традыцыі заключаецца ў яе больш творчым і функцыянальна арыентаваным характары.

Першыя сведчанні аб развіцці старажытнагрэчаскага красамоўства знаходзяцца ў эпічных **паэмах Гамера** (VIII–VII стст. да н.э.), якія самі гучалі ў вусным выкананні. Простая мова герояў займае значнае месца ў тэксце твораў. Ужо тут прасочваюцца спробы індывідуалізаваных маўленчых характарыстык. Так, Менелай, цар Спарты, якая знаходзілася ў Лаконіі,

Этот электронный документ был загружен с сайта филологического факультета БГУ http://www.philology.bsu.by

сапраўды адрозніваецца лаканізмам, праматой і дзелавым характарам сваіх выступленняў:

…Заўжды гаварыў красамоўна,
Мала прадказваў, але незвычайна; не быў Атрыд многаслоўны,
Ні ў прамовах шматзначны…

Тонкай дыпламатычнасцю, улікам псіхалогіі слухача, вытанчаным абыходжаннем з рознымі людзьмі вызначаюцца прамовы цара Адысея. Напрыклад, пасля караблекрушэння і гібелі свайго плыта герой апынуўся на беразе ў мірнай краіне феакаў. Ад яго, які быў увесь у гразі і ціне, з жахам разбягаюцца служанкі царэўны Наўсікаі, што засталася. Адысей здолеў абудзіць у ёй давер і угаварыць яму дапамагчы, прадэманстраваўшы сваю пачцівасць і добразычлівасць: ён пачаў гаворку з вытанчанага разгорнутага кампліментa прыгажосці і чароўнасці царэўны.

Пры апісанні выступленняў Адысея ў перыяд Траянскай вайны мы сустракаемся з указаннем на такі вядомы ў рыторыцы будучага прыём, як ***пачатковая паўза***. Падняўшыся са свайго месца для таго, каб трымаць слова, Адысей, апусціўшы вочы і сціскаючы ў руках скіпетр, некаторы час знаходзіўся ў глыбокім роздуму. Слухачы гатовы былі ўжо падумаць, што перад імі зусім недасведчаны ў публічных выступленнях чалавек. Але тым больш уразіў кантраст, калі:

…Словы, як завірухі, з вуснаў яго вылятaлі.

У паэмах Гамэра дар красамоўства акружаны велічным пакланеннем, піетэтам. Натхняльнымі прамовамі падымае баявы дух войск правадыр грэчаскай раці Агамемнан. З пашанай ставяцца слухачы да расказаў і парад мудрага старца Нестара, якога Гамер назваў “громагалосным красамоўцам”. Нават храбраца Ахіла яго выхавальнік і настаўнік Фенікс павінен быў навучыць не толькі “смела дзейнічаць”, але і “добра гаварыць”. Да самога слова *слова* Гамер, надаючы яму асобную значнасць вобразнай ацэнкай, дадае прыгожы ўстойлівы эпітэт *крылатае*, якое потым, ужо ў XIX ст., быў пакладзены ў аснову выраза “крылатыя словы” (папулярныя выказванні вядомых асоб).

Росквіту рытарскага мастацтва ў Афінах V–IV стст. да н.э. садзейнічаў грамадскі лад жыцця гэтага горада-дзяржавы, нездарма красамоўства называюць “духоўным тварэннем дэмакратыі”. Важнымі складанымі звёнамі дзяржаўнай структуры Афін былі Народны сход, Савет пяцісот і суд прысяжных. Народны сход (орган, які нагадвае славянскае веча) вырашаў найбольш значныя, адказныя пытанні дзяржаўнага жыцця: абвяшчэнне вайны і заключэнне мірных пагадненняў, падпісанне саюзных дагавароў, прыняцце законаў, прызначэнне на буйныя дзяржаўныя пасады і да т.п. У ім магло прымаць удзел усё свабоднае дарослае мужчынскае насельніцтва горада. Пры гэтым аўдыторыя, перад якой даводзілася выступаць рытарам, налічвала паўтары-дзве тысячы чалавек. Савет пяцісот з’яўляўся прадстаўнічым органам, які кіраваў краінай у прамежках паміж народнымі сходамі. Тут таксама арганізоўвалася публічнае абмеркаванне пытанняў для прыняцця рашэнняў. Урэшце, у Афінах дзейнічаў суд прысяжных, звычайная

Этот электронный документ был загружен с сайта филологического факультета БГУ http://www.philology.bsu.by

колькасць якіх была каля пяцісот чалавек. Пры гэтым адвакатаў і пракурораў у сучасным разуменні слова не існавала, і кожны павінен быў сам абараняць сябе, выступаючы ў ролі адказчыка ці абвінаваўцы-істца. У такой абстаноўцы вялікае значэнне мела маўленчае майстэрства ўдзельнікаў працэсу, здольнасць эмацыянальна ўразіць шматлюдны сход прысяжных. Воіны, раздзіраючы адзенне, паказвалі рубцы ад ран; бацькі прыводзілі ў суд нашчадкаў, якія жалобна плакалі; паэты чыталі фрагменты твораў, каб паказаць суддзям сваё мастацтва. Паколькі не ва ўсіх быў талент, каб у даходлівай і прывабнай форме выкласці абставіны справы і прадставіць іх з найбольш выйгрышнага боку, многія былі вымушаны звяртацца за дапамогай да ***лагаграфаў*** – складальнікаў прамоў на заказ – і завучваць падрыхтаваныя тэксты выступленняў.

Такім чынам, вуснае слова ў Афінах магло вырашыць лёс і асобнага грамадзяніна, і ўсёй дзяржавы. Дземетрый Фалерскі так выказаўся пра тыя часы: “Вялікую ролю, якую на вайне адыгрывае жалеза, у мірным жыцці адыгрывае слова”. Заканамерна, што рытарскае мастацтва знайшло тут асабліва спрыяльныя ўмовы для свайго развіцця.

Сваёй вяршыні, самага высокага ўзлёту, “залатога веку” красамоўства афінян дасягае ў эпоху **Перыкла** (гады жыцця – каля 490–429 гг. да н.э.). Шматгадовым знаходжаннем каля стырна ўлады Перыкл быў шмат у чым абавязаны свайму дару красамоўства. Пра яго гаварылі, што на яго вуснах жыве сама багіня пераканання. Старажытнагрэчаскі гісторык Фукідыд, які паходзіў з варожага Перыклу клана, але зрабіўся гарачым яго прыхільнікам пад уражаннем велічнасці і абаяльнасці гэтага незвычайнага чалавека, гаварыў, што Перыкл спалучаў у сябе такія важныя якасці ідэальнага дзяржаўнага дзеяча, як патрыятызм, мудрасць, праўдзівасць і красамоўства.

Кульмінацыяй красамоўства Перыкла лічыцца “Надмагільнае слова ў памяць афінян, загінуўшых у першы год Пелапанескай вайны”. Пелапанеская вайна – трагічная братазабойчая вайна паміж Афінскай марской дзяржавай і Спартанскім ваенным саюзам, якая прывяла да паслаблення абодвух лагераў напярэдадні македонскай пагрозы і прывяла да таго, што Грэцыя страціла свабоду і незалежнасць. Перыкл не быў ініцыятарам гэтай вайны, але як дзяржаўны дзеяч павінен быў несці адказнасць за ўсё, што адбывалася. Прамова прагучала ў псіхалагічна складанай для рытара сітуацыі. Яму трэба было гаварыць каля кіпарысавых трун, дзе ляжалі забітыя, глядзець у пачырванелыя ад слёз вочы ўдоў і мацярэй. Выступленне скончылася нечакана і, на першы погляд, вельмі дзіўна: слухачы паднялі Перыкла на рукі і пранеслі яго праз увесь горад. Асноўныя сэнсавыя матывы прамовы, якая моцна ўразіла прысутных, – праслаўленне роднага горада – Афін як “духоўнай школы ўсёй Элады”; сцвярджэнне велічы і справядлівасці дэмакратычных ідэалаў, у імя якіх аддалі жыцці загінуўшыя; тэмы вечнай памяці і іх нябачнай прысутнасці сярод жывых; заклік да доблесці і стойкасці духу. Максімальнага эмацыянальнага ўздыму прамова, паводле ўспамінаў, дасягнула, калі рытар адзначаў трагізм страты юных жыццяў: “Гэта падобна

Этот электронный документ был загружен с сайта филологического факультета БГУ http://www.philology.bsu.by

на тое, калі б з пораў года раптам знікла вясна”. Гэты прыклад праніклёнага і запамінальнага вобраза прыводзіць Арыстоцель у трактаце “Рыторыка”.

Увогуле Перыклу як рытару былі, паводле ацэнак сучаснікаў, у большай меры ўласцівы роўная стрыманасць, асобная велічная годнасць, што проціпастаўляла яго правадыру радыкальнай палітычнай групоўкі Кляону (прататып Гарбара ў камедыі Арыстафана “Вершнікі”, у адпаведнасці з яго першапачатковым родам заняткаў). Кляон, як піша Плутарх, прыцягваючы ўвагу слухачоў громкім крыкам і ўдарамі ў грудзіну, “адкінуў на трыбуне ўсялякую добрапрыстойнасць”.

У сваю чаргу, рыторыка як навука, як тэарэтычныя веды пра рытарскае мастацтва ўзнікае ў 60-е гг. V ст. да н.э. на востраве Сіцылія, які быў заходняй грэчаскай калоніяй. Згодна легендзе, жыхары сіцылійскага горада Сіракузы цяжка пакутвалі ад жорсткага кіравання двух тыранаў і няспынна маліліся Зеўсу Вызваліцелю. Але калі ўрэшце гэта кіраванне пала, жаданы грамадзянскі спакой не ўсталяваўся. Узніклі анархія і разгубленасць. Усе варагавалі з усімі, высвятляючы назапашаныя за час тыраніі грахі і крыўды. Тады нехта пад імем Корак успомніў, што слова прызначана несці згоду і гармонію, і пачаў умела пабудаванымі прамовамі супакойваць усхваляваны і мітуслівы дэмас.

Пасля змены рэжыму кіравання па гораду пракацілася хваля судовых працэсаў, дзе таксама выступаў Корак. Вопыт пабудовы прамовы на судзе быў пакладзены ў аснову першых падручнікаў па рыторыцы, якія стварылі Корак і яго вучань Тысій. Тут прыведзена старажытнае азначэнне рыторыкі як “служанкі пераканання”.

Корак і Тысій былі **сафістамі –** прафесійнымі платнымі настаўнікамі філасофіі і красамоўства, якія з’явіліся ў Грэцыі ў V–IV стст. да н.э. Да вядомых прадстаўнікоў сафістычнай рыторыкі, акрамя іх, належаць Пратагор, Фразімах, Горгій, а да “малодшых сафістаў” – Ісакрат. Філасофскай асновай развіцця сафістыкі стала вучэнне аб адноснасці ісціны, якое сцвярджала, што няма прамой і адназначнай сувязі паміж рэчамі і ўяўленнямі пра іх, паміж уяўленнямі і словамі. Таму не існуе адзінай аб’ектыўнай ісціны, а нават калі б яна і існавала, то людзям не наканавана яе зразумець. Знакаміты лозунг Пратагора – “Чалавек ёсць мера ўсіх рэчаў”, напісаны на сцягу гуманізму, – першапачаткова разумеўся менавіта як сцвярджэнне суб’ектыўнасці любога ўяўлення. Гэта давала магчымасць абгрунтоўваць розныя меркаванні, нават прама супрацьлеглыя адно аднаму. Аблюбаванай інтэлектуальнай і рытарычнай “гімнастыкай” сафістаў быў доказ і абвяржэнне аднаго тэзіса. “Суджэнне выварочвалася на другі бок, як пальчатка”, што выклікала збянтэжанасць і здзіўляла недасведчаныя галовы. Так, сафісты, апісаныя ў адным з дыялогаў Платона, спачатку лёгка абвяргаюць думку пра тое, што вучацца людзі мудрыя (ім жа як раз менш за ўсіх трэба вучыцца), а потым таксама лёгка і грацыёзна, як у мудрагелістым інтэлектуальным танцы, яе даказваюць (самыя вялікія поспехі ў вывучэнні навук робяць спрадвечна разумныя людзі). У падобнай разумовай і слоўнай “эквілібрыстыцы”, якая ўражвала слухача, быў як адмоўны бок (гатоўнасць

Этот электронный документ был загружен с сайта филологического факультета БГУ http://www.philology.bsu.by

да падмены паняццяў дзеля вонкавага эфекта, маральная эластычнасць, беспрынцыповасць), што паўплывала на з'яўленне ў далейшым адмоўнага сэнсу слова *сафістыка*, так і станоўчы (гібкасць і дыялектычнасць мыслення). "Светлы бок медалю" меў на ўвазе нямецкі філосаф Г. В. Гегель, калі захапляўся сафістамі: "Што за раскоша ў іх дыялектыцы! што за бязлітаснасць! што за разняволенасць! Якое майстэрскае валоданне думкай і словам!".

Славуты афінскі філосаф **Сакрат** (469–399 гг. да н.э.) параўноўваў сябе з аваднём, які турбуе, абуджае думку і сумленне. Філосаф не пакінуў пасля сябе пісьмовых твораў, бо жывыя размовы, якія былі сродкамі выкладання, ўяўляліся яму найбольш каштоўнымі. Аднак своеасаблівасць яго поглядаў увекавечылі яго вучні. Паміж рыторыка-філасофскімі пазіцыямі Сакрата і сафістаў існавала кардынальнае супрацьстаянне, якое з'явілася асновай для крытыкі філосафа ў іх адрас. Сутнасць гэтых супярэчнасцей паказана ў табліцы.

**Адрозненні рытарычнай дзейнасці сафістаў і Сакрата**
**(у трактоўцы А. К. Міхальскай)**

| Рытарычная пазіцыя сафістаў | Рытарычная пазіцыя Сакрата |
|---|---|
| 1. Рытарычная дзейнасць носіць маніпулюючы ўсведамленнем суразмоўніка, суб'ект-аб'ектны характар, прадугледжвае ўздзеянне на адрасат, які выступае ў большай ступені як пасіўны аб'ект «слоўнага гіпнозу», чым як актыўны суб'ект зносін. | Рытарычная дзейнасць носіць актывізуючы ўсведамленне суразмоўніка, суб'ект-суб'ектны характар, прадугледжвае ўзаемадзеянне з адрасатам, які выступае як дзейсны ўдзельнік, суб'ект зносін з правам на самастойнасць думкі і слова і раўнапраўны партнёр у сумесным роздуме. |
| 2. Рытарычная дзейнасць накіравана на сцвярджэнне свайго пункту гледжання і перамогу над праціўнікам, яна мае аганальную — спаборніцкую, ваяўнічую — афарбоўку. | Рытарычная дзейнасць накіравана на аб'яднанне намаганняў суразмоўнікаў і дасягненне згоды, узаемаразумення, яна мае гарманічны характар. |
| 3. Рытарычная дзейнасць заснавана на ўяўленні пра адноснасць ісціны, на філасофскім падмурку рэлятывізму. Згодна поглядам сафістаў, не існуе адзінай пэўнай ісціны: «колькі людзей, столькі і думак». Таму можна абгрунтаваць любы выгадны на дадзены момант пункт гледжання, які не абавязкова павінен супадаць з сапраўдным | Рытарычная дзейнасць заснавана на ўяўленні пра абсалютнасць ісціны, веры ў магчымасць яе здабывання і яе настойлівым пошуку. Сакрат быў упэўнены, што ісціна можа і павінна нараджацца ў спрэчцы. Яго называлі рыцарам ісціны. Разуменне асабістай выгады, меркантыльныя разлікі не маглі прымусіць яго пакрывіць |

Этот электронный документ был загружен с сайта филологического факультета БГУ http://www.philology.bsu.by

| | |
|---|---|
| меркаваннем рытара. | душой, адступіць ад свайго пункту гледжання. |

Для стылю размовы Сакрата характэрна пастаноўка прыватных навадных пытанняў. Атрымаўшы на іх сцвярджальныя адказы, ён паступова і незаўважна схіляў суразмоўніка да згоды са сваім тэзісам. Сучасныя псіхолагі мяркуюць, што падобны камунікатыўны ход — атрыманне хоць бы трох станоўчых адказаў у пачатку пераканаўчага дыялогу — з’яўляецца апраўданым, паколькі адрасат пры гэтым нярэдка расслабляецца, становіцца больш адкрытым для зносін і страчвае гатоўнасць да вострага супрацьстаяння. Гэты прыём вядомы амерыканскі спецыяліст па праблемах чалавечых узаемаадносін Д. Карнегі лічыў вельмі важным для таго, каб схіліць суразмоўніка да таго ці іншага пункту гледжання, і называў «сакрэтам Сакрата».

Разам з гэтым у сучаснай педагогіцы прапагандуецца так званы сакратычны дыялог, калі вучань сам спачатку быццам бы адкрывае ісціну з дапамогай сістэмы ўмела пастаўленых пытанняў.

З жорсткай крытыкай сафістычнай рыторыкі выступіў таксама адзін з любімых вучняў Сакрата **Платон** (каля 428–347 гг. да н.э.), які занатаваў вобраз і погляды свайго настаўніка, у прыватнасці, у непасрэдна прысвечаным рытарычнай праблематыцы трактаце **«Горгій».** Аўтар абвінавачвае рытараў-сафістаў у тым, што яны набываюць поспех у публіцы, патураючы яе густу; захапляюцца вонкавым бокам рэчаў, не пранікаючы ў іх сутнасць; аддаюць перавагу выступленням перад змешаным і абмежаваным натоўпам, а не дыялогу з выбранымі людзьмі. «Метадам ад процілеглага» Платон малюе свой рытарычны ідэал — рытара, які імкнецца да выпраўлення нораваў, укаранення ў душах слухачоў добрых пачуццяў, імкнення да пазнання вечных ідэй.

Акрамя таго, у кожным з асноўных антычных родаў красамоўства — палітычным, судовым і ўрачыстым (хвалебным або ганебным) — вылучаліся свае выдатныя прадстаўнікі, асобныя з якіх выконвалі розныя рытарскія ролі. Так, галоўным чынам як буйнейшы палітычны рытар праславіўся Дэмасфен, найбольш громкія судовыя выступленні якога таксама маюць палітычную афарбоўку. Пра яго рытарычную творчасць гаворка пойдзе ніжэй. Выдатным майстрам судовага красамоўства Старажытнай Грэцыі з’яўляецца **Лісій (**459–380 гг. да н.э.). Ён стаў вядомы як лагаграф — стваральнік прамоў на заказ. Пра папулярнасць рытара сведчыць яго шматлікая кліентура, у старажытнасці яму прыпісвалася рэкордная колькасць складзеных прамоў (каля 425). Падрыхтаваныя Лісіем выступленні вызначаліся:

§ жывасцю і праўдападобнасцю абмалёўкі характара герояў (мастацтвам так званай **этапеі**), якія прадстаўлялі розныя сацыяльныя групы насельніцтва: воінаў і мірных жыхароў, людзей сярэдняга дастатку і заможных арыстакратаў;

§ стрыманасцю і карэктнасцю ў стаўленні да дэталей прыватнага жыцця праціўніка ў адрозненні з выступленнямі іншых антычных рытараў;

§ лаканічнасцю ўступаў і заключэнняў;

Этот электронный документ был загружен с сайта филологического факультета БГУ http://www.philology.bsu.by

§ дынамічнасцю і займальнасцю апавядальнай часткі з выкладаннем абставін справы;

§ чысцінёй і празрыстасцю мовы, пазбаўленай ненатуральных у вуснах заказчыка рытарычных упрыгажэнняў.

У сферы ўрачыстага красамоўства вызначаўся талент **Горгія** (483–375 гг. да н.э.). Яго рытарычная манера яскрава праявілася ў прамове «Пахвала Алене» — паўжартоўнай, паўсур’езнай спробе абяліць у вачах сучаснікаў Алену Прыгожую, віноўніцу кровапралітнай Траянскай вайны. Для Горгія-рытара асабліва характэрныя:

§ вера ў магічную і неадольную сілу слова. Крылатай стала наступная праграмная цытата з Горгія: «Слова — самы вялікі ўладар. На выгляд малое і непрыкметнае, а справы робіць цудоўныя — можа страх спыніць і смутак адвесці, выклікаць радасць, узмацніць спагаду»;

§ выключнае вынаходства, разнастайнасць і хітрамудрасць у падборы доказаў (практычная рэалізацыя сваёй ўстаноўкі на тое, што «даказваць слухачу трэба ўсімі доказамі»);

§ асаблівая выразнасць стылю, у прыватнасці, у выніку эфектнага ўжывання антытэзы, якая называецца адной з «гаргіянскіх фігур» па прычыне шырокага выкарыстання яе гэтым рытарам;

§ заваражальная напеўнасць мовы ў выніку перыядычнага выкарыстання рытму і ўжывання рыфмы ў прозе (так званая **фігура роўнаканчатковасці —** гомеатэлеўт).

Як выдатны прадстаўнік палітычнага і асабліва ўрачыстага красамоўства прызнаны **Ісакрат** (436–338 гг. да н.э.), кіраўнік элітарнай рытарычнай школы. Ён вылучаўся прыродным ціхім голасам і нясмеласцю перад натоўпам слухачоў. Таму свае выступленні распаўсюджваў для чытання, у тым ліку і публічнага. Аднак заслугамі Ісакрата з’явіліся:

§ вылучэнне ***«прынцыпа належнага»,*** адстойванне высокіх маральных ідэалаў, неабходнасці служэння дзяржаве і грамадству, выхавальніцкі характар выступленняў;

§ маштабнасць, абгрунтаванасць, аналітызм і філасафічнасць у раскрыцці тэмы;

§ распрацоўка універсальнай структуры пахвальнай прамовы, якая ўключала ў сабе пахвалу паходжанню героя (радзіме, народу, продкам, бацькам), яго адукацыі і выхаванню, праслаўленне вонкавага выгляду і станоўчых якасцей і супастаўленні, якія выйгрышна адцянялі цэнтральны вобраз;

§ прытрымліванне дакладнасці, «чалавечай нормы» пры ўсхваленні героя, адсутнасць рэзкіх і фантастычных перабольшванняў. Так, Ісакрат адмаўляўся ад перадачы цудоўных прароцтваў і сноў, якія папярэджвалі нараджэнню героя, што выглядае вельмі дзіўным у кантэксце міфічнага ўсведамлення таго часу;

§ адшліфаванасць і вытанчанасць стылю, выкарыстанне фігуры ***перыяду*** — аб’ёмных сінтаксічных структур з супрацьпастаўленнем узыходнай і

Этот электронный документ был загружен с сайта филологического факультета БГУ http://www.philology.bsu.by

сыходнай частак, падзеленых заўважнай паўзай, што надавала прамове музычнасць.

«Дасканалым рытарам» старажытнасці такі патрабавальны знаток, як Цыцэрон, прызнаваў **Дэмасфена** (384–322 гг. да н.э.). Передумовай заняткаў Дэмасфена рыторыкай паслужылі вельмі жалобныя абставіны, а менавіта тое, што ён, рана асірацеўшы, стаў ахвярай несумленных апекуноў, якія растрацілі яго маёмасць. З дзяцінства Дэмасфен марыў пра помсту і перамогу справядлівасці, старанна вучыўся мастацтву красамоўства і, пасталеўшы, даказаў віну апекуноў у судзе. Гэты поспех паўплываў на рашэнне Дэмасфена заняцца карыснымі для суграмадзян выступленнямі перад публікай.

Аднак узыходжанне да жаданых вяршынь красамоўства было для Дэмасфена вельмі цяжкім. Ад прыроды ён меў слабыя дыханне і голас, картавіў так, што не мог вымавіць першага гука ў слове *рыторыка*, бянтэжыўся ў прысутнасці натоўпу, адрозніваўся нявыйгрышнай звычкай, хвалюючыся, сутаргава пацепваць плячамі. Упартасць Дэмасфена ў пераадоленні розных перашкод і няспынным імкненні да сваёй мары, апетае ў «Параўнальных жыццяпісах» Плутарха, не можа не выклікаць захаплення. Ён трэніраваўся ў выступленнях перад шумным морам, якое нагадвала натоўп слухачоў; падчас дэкламавання браў у рот каменьчыкі, каб палепшыць дыкцыю; падымаўся высока ў горы ці размаўляў падчас бегу з мэтай умацаваць маўленчае дыханне; гаварыў прамову, стоячы пад падвешаным да столі мячом, які балюча калоў яго пры кожным непатрэбным руху пляча. Восем разоў ад рукі ён перапісваў «Гісторыю» Фукідыда, каб удасканаліць свой стыль, зрабіць яго больш ёмістым і энергічным (сучаснае выданне гэтай капітальнай працы, якое ўключае тэксты рытарскіх выступленняў па розных палітычных пытаннях, займае аб'ёмны том). Урэшце, Дэмасфен пераўтварыўся з першапачатковага «брыдкага качаня ад рыторыкі» ў сапраўды цудоўнага і ўплывовага рытара.

Усю сваю натуральную і набытую рытарскую моц Дэмасфен накіраваў на карысць Айчыне. Будучы ўпэўненым патрыётам, ён убачыў рэальную небяспеку ад македонскага цара Філіпа II, бацькі Аляксандра Македонскага. У цыкле сваіх гнеўных выкрывальных выступленняў, названых ***філіпікамі*** (8 прамоў), ён выкрывае каварныя і агрэсіўныя задумы Філіпа, заклікае да згуртаванасці і рашучых дзеянняў перад тварам ваеннай пагрозы, ганьбіць здраднікаў. Гэтыя выступленні настолькі пераканальныя і патэтычныя, што, паводле парадаксальнага прызнання Філіпа, пачуўшы адну з прамоў, якую яму зачыталі, ён быў гатовы сам галасаваць за вайну супраць сябе.

Аднак, нягледзячы на аўтарытэт Дэмасфена і прадпрынятыя пад уздзеяннем яго прамоў канкрэтныя крокі па супрацьстаянні македанцам (будаўніцтва ваенных умацаванняў, узброеныя конніцы, заключэнне мірных дамоў з магчымымі саюзнікамі і да т.п.), ваенныя сілы былі няроўныя, і ў бітве пры Херанеі (338 г. да н.э.) Грэцыя страціла сваю незалежнасць. У гэтай бітве Дэмасфен разам з іншымі змагаўся як радавы воін-пехацінец. Менавіта яму было даручана сказаць надмагільнае слова ў гонар загінуўшых у баі.

Этот электронный документ был загружен с сайта филологического факультета БГУ http://www.philology.bsu.by

Пасля страты Грэцыяй незалежнасці Дэмасфен не спыняў сваёй антымакедонскай дзейнасці, у далейшым накіроўваў яе супраць Аляксандра Македонскага і яго пераемнікаў. Урэшце, пасля падаўлення антымакедонскага паўстання ён быў вымушаны схавацца ў храме Пасейдона, дзе яго знайшлі і акружылі македонцы. На патрабаванне пакінуць храм і здацца ворагам рытар адказаў просьбай напісаць развітальны ліст родным і, непакораны, скончыў жыццё самагубствам, надкусіўшы трысняговае пяро, дзе была схавана атрута.

Суграмадзяне змаглі ўвекавечыць памяць аб Дэмасфене толькі праз дзесяцігоддзе пасля яго гераічнай смерці. Рукі бронзавай статуі, якая адлюстроўвала вобраз рытара, былі сціснутыя ў журботным жэсце, а на пастаменце выбіты надпіс:

О, Дэмасфен, калі моц і розум твае былі б роўныя,
Нас не скарыў бы сам македонскі Арэс.

(Меўся на ўвазе Аляксандр Македонскі, які сваім палкаводчым геніем нагадваў бога вайны.)

Адметнымі вызначальнымі рысамі рытарскай дзейнасці Дэмасфена былі:

§ неверагодная глыбіня і руплівасць папярэдняй падрыхтоўкі. Рытар не спадзяваўся на імправізацыю. У сваіх прамовах ён дасканала распрацоўваў фактычны бок справы, падбіраў дакументальныя сведчанні — законы, пастановы, пасланні відавочцаў – на карысць яго сцвярджэнняў.

Нядобразычліўцы папракалі Дэмасфена ў тым, што яго прамовы «пахнуць лампадным алеем», таму што ён вельмі рупліва працуе над імі ноччу. Аднойчы Дэмасфен ухітрыўся спланаваць нават быццам бы незапланаваную адсутнасць патрэбнага дакумента: звярнуўся да сакратара з традыцыйнай формулай “Бяры і чытай” і выклікаў часовае замяшальніцтва ў адказ — каб пазбегнуць папрокаў у тым, што яго выступленні створаны не па прычыне таланту і натхнення, а шматлікімі ўпартымі намаганнямі. На самай справе такая карпатлівасць падрыхтоўкі ўяўляла сабой годнасць стылю працы. Дэмасфена і надавала яго прамовам пераканалую важкасць і доказнасць;

§ свабода і гібкасць пабудовы. У сваіх выступленнях Дэмасфен не баяўся перагрупоўваць доказы ў той паслядоўнасці, якую лічыў для сябе выйгрышнай, не прытрымліваўся парад сваіх праціўнікаў гаварыць строга «па пунктах павесткі». (Прыкладам з’яўляецца структура знакамітай прамовы «Аб вянку», у якой Дэмасфен абараняў сваё права на атрыманне залатога вянка як высокай дзяржаўнай узнагароды);

§ энергія і мужнасць стылю. Гэта характарыстыка адлюстравана ў тонкім назіранні Квінтыліяна, які заўважыў, што калі да слоў Цыцэрона няма чаго дабавіць, то ў Дэмасфена нічога нельга выкрэсліць. Тым не менш вялікі грэк шырока карыстаўся такім прыёмам, як ***сінанімічнае падваенне*** — ужыванне пары прамых або кантэкстуальных сінонімаў, аб’яднаных саюзам (*улада і моц*, *ганебны і сорамны зговар*, *прамы і сумленны шлях*, *ясныя і неабвержныя доказы* і да т.п.). У яго вуснах яно не ўспрымаецца як

Этот электронный документ был загружен с сайта филологического факультета БГУ http://www.philology.bsu.by

шматслоўе, а дазваляе з максімальнай рэльефнасцю акрэсліць думку. Антычныя крытыкі называлі стыль Дэмасфена любімым азначэннем *магутны*;

§ экспрэсія і тэмпераментнасць выканання. Сябар Дэмасфена, акцёр пад імем Сатыр, аднойчы, калі будучы праслаўлены рытар гатоў быў пад уздзеяннем правалу ў распешчанай афінскай публікі назаўсёды выракчыцца ад сваіх рытарычных надзей, папрасіў яго прачытаць урывак з любой трагедыі. Потым для параўнання Сатыр перачытаў той жа фрагмент, аднак зусім інакш — з натуральнай і жывой інтанацыяй, свабоднай і артыстычнай пластыкай. Дэмасфен запомніў прыпададзены яму ўрок на ўсё жыццё і шмат трэніраваўся для дасягнення выразнасці выканання, у тым ліку рэпеціраваў перад люстэркам.

Рухомасць Дэмасфена на трыбуне параўноўвалася з ртуццю і пламем. Плутарх, паводле слоў сучаснікаў, адзначаў «бурную пылкасць» выканання рытарам яго прамоў.

Расказваюць, што на пытанне, што самае галоўнае ў мастацтве выступленняў, Дэмасфен адказаў настойлівым трохразовым паўторам: «Вымаўленне, вымаўленне і яшчэ раз вымаўленне!» (Часам гэту фразу перакладаюць у блізкім, але з больш асобным значэннем: «Жэсты, жэсты і яшчэ раз жэсты!»).

Знакаміты вучоны-энцыклапедыст старажытнасці **Арыстоцель** (384–322 гг. да н.э.), не толькі сучаснік, але і аднагодка Дэмасфена, з юнацтва і на працягу 20 гадоў быў вучнем Платона (так званы *1-ы афінскі перыяд* біяграфіі). Платон называў яго розумам і надзеяй школы. Дзякуючы арыгінальнасці і сіле мыслення ў сваіх поглядах Арыстоцель не крочыў, як раб, за сваім настаўнікам і не баяўся палемізаваць з ім. (Успомнім яго пазнейшы афарызм *Платон мне сябар, але ісціна даражэй.*) Існуюць цікавыя звесткі, што ў школе Платона Арыстоцель выкладаў рыторыку. Гэты аб'ёмны курс быў даручаны яму ў першыя жа гады знаходжання ў Акадэміі.

Праз час Арыстоцель вучыў разам з іншымі дысцыплінамі мастацтву паэзіі, красамоўству і этыкету Аляксандра Македонскага, будучага спадчынніка трона. У далейшым у прыгарадзе Афін адкрыў сваю ўласную школу – Лікей, які даў назву ўсім наступным навучальным установам такога кшталту. У Лікеі ён праводзіў заняткі, прагульваючыся са сваімі вучнямі па галерэі. Лічылася, што гэта актывізуе мысленне (*2-і афінскі перыяд* яго дзейнасці). Сярод прадметаў, што ён выкладаў, была рыторыка. Трактат «Рыторыка» з'явіўся менавіта на аснове тых строга навуковых лекцый, якія Арыстоцель чытаў раніцай сваім здольным вучням. Можна сцвярджаць, такім чынам, што заняткі рыторыкай праходзілі своеасаблівай «чырвонай ніткай» праз біяграфію вучонага. Далей мы тэзісна разгледзем структуру і праблематыку трактата «Рыторыка».

Кампазіцыйна трактат складаецца з трох кніг. У 1-й кнізе даецца ***азначэнне рыторыкі,*** паказваецца яе месца сярод іншых дысцыплін і мастацтваў. Несумненнай заслугай Арыстоцеля пры фармуляванні азначэння з'яўлялася падкрэсліванне ***універсальнасці*** рыторыкі, у процівагу Платону,

Этот электронный документ был загружен с сайта филологического факультета БГУ http://www.philology.bsu.by

якi словамi героя сваiх твораў Сакрата аспрэчваў самастойнасць дадзенай дысцыплiны на той падставе, што ў iншых навуках таксама ўжываецца перакананне ў праўдзiвасцi сваiх палажэнняў. Арыстоцель прапаноўвае такое тлумачэнне паняцця *рыторыка,* якое ператварае названы быццам бы недахоп у вялiкую годнасць: «Рыторыка – гэта здольнасць знаходзiць магчымыя спосабы перакананя адносна кожнага дадзенага прадмета». У той жа кнiзе трактата змешчана класiфiкацыя магчымых ***спосабаў перакананння***. Сярод iх, у прыватнасцi, вылучаюцца доказы да **логаса** (рацыянальна-лагiчны змест прамовы), доказы да ***этаса*** (дэманстрацыя станоўчых бакоў маральнага аблiчча прамоўцы) i доказы да пафаса (эмацыянальная афарбоўка выступлення, звяртанне да пачуццяў слухачоў):

**ЛОГАС**
**ЭТАС** **ПЕРАКАНАННЕ**
**ПАФАС**

Логас, этас, пафас – неад'емныя складальнiкi поспеху працэссу перакананя.

Важнае месца ў складзе 1-й кнiгi займае падрабязная характарыстыка трох асноўных родаў красамоўства, якiя вылучаў Арыстоцель у дачыненнi да маўленчай практыцы таго часу. Як вы ўжо ведаеце, да iх належаць дарадчае (палiтычнае – I), судовае (II) i ўрачыстае (эпiдэйктычнае – III) красамоўства. У прыватнасцi, фiлосаф вылучае асноўныя маральна-этычныя катэгорыi, якiя абмяркоўваюцца ў выступленнях кожнага роду красамоўства: карыснае / шкоднае (I) – справядлiвае / несправядлiвае (II) – прыгожае / ганебнае (III). Веданне гэтых катэгорый дазваляе рытару загадзя выраблаць слушныя «рытарычныя нарыхтоўкi» – пасылкi разважанняў, якiя ўжываюцца ў выступленнях з нагоды розных канкрэтных выпадкаў.

2-я кнiга «Рыторыкi» па сваiм змесце цесна звязана з псiхалогiяй i сацыялогiяй. Так, у ёй пералiчаны розныя ***вiды эмоцый,*** якiя неабходна абудзiць цi сцiшыць у сэрцах слухачоў. Яны разглядаюцца на фоне падобных i супрацьлеглых iм, напрыклад: гнеў адрознiваецца ад блiзкай да яго нянавiсцi як пачуццё больш моцнае, але менш устойлiвае – i прама супрацьлеглае мiласэрнасцi. Даюцца рэкамендацыi, як узмацнiць або аслабiць гэтыя пачуццi. Напрыклад, для таго каб супакоiць уз'юшаную аўдыторыю, прымусiць яе «змянiць гнеў на мiласць», неабходна паказаць яе перавагу над кiмсьцi. (У гэтай сувязi Арыстоцель прыгадвае, як Адысей супакоiў зграю сабак, прысеўшы перад ёй.)

Тут жа даюцца абагульненыя «маральныя партрэты» розных ***сацыяльных груп*** слухачоў: маладых, старых, заможных, знатных, чыноўнiкаў i да т.п. – i паказваецца, як магчыма «iграць на iх слабасцях». Напрыклад, на думку Арыстоцеля, у юнацкай аўдыторыi лягчэй выклiкаць прагу да прыгожага, запал да подзвiгу: яна менш разважлiвая, чым людзi сталыя. Пачуццi ў юнацтве ўспыхваюць лёгка i не ведаюць «залатой сярэдзiны». Гэта аўдыторыя паважае дасцiпнасць i не шкадуе таго, па кiм б'е яе зброя, паколькi «дасцiпнасць ёсць адшлiфаваная высакамернасць».

Этот электронный документ был загружен с сайта филологического факультета БГУ http://www.philology.bsu.by

У гэтай жа частцы пры разглядáнні канкрэтных спосабаў пераканання ўводзіцца ***паняцце энтымемы*** – няпоўнага лагічнага разважання, адна з частак якога мяркуецца, але не выказваецца. Так, на аснове энтымемы пабудавана сцвярджэнне: *Паколькі рыторыка – асобная навука, яна мае сваю спецыфічную сістэму паняццяў.* За ім хаваецца наступнае поўнае разважанне-сілагізм:

*Кожная навука мае сваю спецыфічную сістэму паняццяў.*

*Рыторыка – асобная навука.*

---

*Такім чынам, рыторыка мае сваю спецыфічную сістэму паняццяў.*

Энтымему Арыстоцель называе «рытарычным сілагізмам», паколькі яна менш стамляе слухачоў і больш распаўсюджана ў жывой практыцы зносін, чым поўныя сілагізмы.

У 3-й кнізе трактата паглыблена асвятляюцца ***пытанні стылю*** як агульнай манеры выказвання, якую магчыма і трэба ўдасканальваць. Асноўнай годнасцю стылю Арыстоцель лічыць ***яснасць.*** Ёй супрацьстаіць празмерная мудрагелістасць і халоднасць стылю. Каб дасягнуць яснага і ненапышлівага стылю, – раіць Арыстоцель, – неабходна пазбягаць вялікай колькасці складаных па пабудове слоў, залішніх тэрмінаў і мудрагелістых метафар, якія перашкаджаюць успрыманню і якімі вылучалася сафістычная рыторыка.

У заканчэнні трактата Арыстоцель закранае ***праблемы кампазіцыі*** – пабудовы розных відаў прамоў. Так, ён мяркуе, што ўступ да ўрачыстай прамовы можна параўнаць з прэлюдыяй музычнай п’есы, паколькі, як ён заўважае, флейтысты імкнуцца аб’яднаць у такім выступленні ўсе самыя лепшыя, удалыя і прыгожыя фрагменты і выклікаць эмацыянальнае ўражанне на слухача. Галоўнай жа задачай уступу да дарадчай ці судовай прамовы з’яўляецца, як у пралогу да драматычнага твора, увесці ў курс справы, ахарактарызаваць сітуацыю, што склалася. Такім чынам, Арыстоцель праводзіць актуальнае і сёння размежаванне розных асноўных задач, якія могуць вырашацца ва ўступнай частцы прамовы.

Як бачна, трактат Арыстоцеля вызначаецца значнай шырынёй і грунтоўным ахопам рытарычнай праблематыкі, ідэйным багаццем зместу, на стагоддзі ўперад дае глыбокія і пераканаўчыя адказы на многія хвалюючыя аратараў пытанні.

Гістарычнае развіццё рыторыкі ў глабальным плане прадстаўляе сабой непарыўны працэс стварэння новых сацыяльна і эстэтычна значных твораў. Пастаянна паглыбляюцца і тэарэтычныя ўяўленні вучоных пра механізмы ўздзеяння вуснага маўлення на ўсведамленне, эмоцыі, паводзіны чалавека. Аднак, як бы не складаўся гістарычны лёс мастацтва красамоўства, дасягненні старажытнагрэчаскай рыторыкі застаюцца сусветна прызнанымі, непераўзыходзячымі ўзорамі гармоніі, яснасці і высакароднасці думкі і слова.

## Кантрольныя пытанні

Этот электронный документ был загружен с сайта филологического факультета БГУ http://www.philology.bsu.by

**1.** У чым сутнасць прынцыповых разыходжанняў паміж усходняй і заходняй рытарычнымі традыцыямі?

**2.** Якія прыкметы даюць падставу сцвярджаць, што ў паэмах Гамера адлюстраваны вытокі старажытнагрэчаскага красамоўства?

**3.** Менавіта якія сацыяльна-палітычныя перадумовы садзейнічалі росквіту красамоўства ў Афінах у V–IV стст. да н.э.?

**4.** У чым выяўлялася рытарскае майстэрства Перыкла, якое ўзмацняла яго палітычны аўтарытэт?

**5.** Дзе, калі і пад уплывам якіх абставін зараджаецца рыторыка як тэарэтычнае вучэнне аб рытарскім мастацтве?

**6.** У чым заключаюцца станоўчы і адмоўны бакі рытарычнай дзейнасці сафістаў?

**7.** Якія асноўныя адрозненні супрацьлеглых рытарычных пазіцый сафістаў і Сакрата?

**8.** Назавіце самыя яркія асаблівасці рытарычнай спадчыны Лісія; Горгія; Ісакрата.

**9.** Як Дэмасфен стаў бліскучым прамоўцам?

**10.** Якім чынам звязаны паміж сабой палітычная і рытарская дзейнасць Дэмасфена?

**11.** Якія характэрныя асаблівасці рытарскага майстэрства Дэмасфена зрабілі яго імя легендарным?

**12.** Якое месца займала рыторыка ў біяграфіі самага выдатнага вучонага старажытнасці – Арыстоцеля?

**13.** Назавіце праблематыку кожнай з кніг трактата Арыстоцеля «Рыторыка»?

**14.** Якую своеасаблівую рысу рыторыкі як навукі падкрэслівае Арыстоцель у азначэнні гэтай дысцыпліны?

**15.** Якія тры складаныя пераканаўчага ўздзеяння маўлення былі вылучаны Арыстоцелем?

**16.** Што такое энтымема і чаму яна шырока ўжываецца ў рытарскіх выступленнях?

**17.** Якую якасць стылю Арыстоцель лічыў самай важнай і якія парады па яе дасягненні даваў?

## УРАЧЫСТАЕ КРАСАМОЎСТВА СТАРАЖЫТНАЙ ГРЭЦЫІ

### Тэкст для аналізу
### Горгій. Пахвала Алене

(1) Славай служыць гораду смеласць, целу – прыгажосць, духу – разумнасць, маўленню – праўдзівасць; усё процілеглае гэтаму – толькі бясслаўе. Неабходна нам мужчыну і жанчыну, слова і справу, горад і ўчынак, калі пахвальныя яны – хвалой ушанаваць, калі непахвальныя – насмешкай паразіць. І наадварот, роўна неразумна і няправільна высокахвальнае –

Этот электронный документ был загружен с сайта филологического факультета БГУ http://www.philology.bsu.by

ганьбіць, вартае ж асмейвання – усхваляць. (2) Давядзецца мне тут у адзін і той жа час і праўду паведаміць, і тых, хто няславіць, выкрыць – хто няславіць тую Алену, пра якую адзінагалосна і адзінадушна да нас дайшло і вернае слова паэтаў, і слава яе імя, і памяць пра няшчасці. Я і наважыўся, у прамове сваёй прыводзячы разумныя довады, зняць абвінавачванне з той, якой шмат дрэннага давялося пачуць, ганьбавальнікаў яе лгунамі вам паказаць, раскрыць праўду і канец пакласці невуцтву. (3) Што па роду і па паходжанні першае месца сярод найпершых жанчын і мужоў займае та, пра якую наша прамова, – няма нікога, хто б дакладна пра гэта не ведаў. Вядома, што яе маці была Леда, а бацькам быў бог, лічыўся ж смертны, і былі яны Тындарэй і Зеўс: адзін такі на выгляд, другі погаласам так называўся, адзін сярод людзей наймацнейшы, другі над сусветам гаспадар. (4) Народжаная імі, прыгажосцю была яна роўная Багам… Многія ў многіх страсці яна абудзіла, вакол адзінай сябе шматлікіх мужчын згуртавала, поўных годнасці гордай сілай: хто багацця велізарнасцю, хто рода старажытнасцю, хто прыроджанай сілаю, хто набытай мудрасцю; усе, аднак жа, адолены былі пераможным каханнем і непераможным славалюбствам. (5) Хто з іх і чым і як задаволіў каханне сваё, авалодаўшы Аленаю, гаварыць я не буду: вядомае ў дасведчаных давер атрымае, захаплення ж не заслужыць. Таму, былыя часы ў гэтай маёй прамове абмінуўшы, пачну я пахвальнае слова і для гэтага выкладу тыя прычыны, па якіх справядліва і прыстойна было Алене накіравацца ў Трою.

Ці па волі выпадку, ці па наказу багоў, ці па непазбежнасці зрабіла яна тое, што зрабіла? Ці была яна сілай выкрадзена, ці размовай улашчана, ці каханнем ахоплена? – Калі прыняць першае, то не можа яна вінаватай лічыцца: боскай волі людская воля не перашкода – ад прыроды слабое моцнаму не перашкода, а моцнае слабому ўлада і правадыр: моцны вядзе, а слабы следам ідзе. Бог мацнейшы за чалавека магутнасцю і мудрасцю, як і ўсім астатнім: калі багу ці выпадку мы віну павінны прыпісаць, то Алену свабоднай ад ганьбы павінны прызнаваць. (7) Калі ж яна сілай выкрадзена, беззаконна адолена, несправядліва пакрыўджана, то ясна, што вінаваты выкрадальнік і крыўднік, а выкрадзеная і пакрыўджаная не вінавата ў сваім няшчасці. Той варвар, што па-варварску дзейнічаў, за гэта няхай і пакараны будзе словам, правам і справай: слова яму – абвінавачванне, права – ганьба, справа – помста. А Алена, падвергнутая насіллю, радзімы пазбаўленая, няшчаснаю пакінутая, няўжо не заслугоўвае больш шкадавання, чым зняваг? Ён зрабіў, яна пазнала ганебнае; сапраўды, яна заслугоўвае літасці, а не нянавісці. (8) Калі ж размова яе пераканала і душу яе падманам захапіла, то і тут н не цяжка яе абараніць і ад гэтай віны абяліць. Бо слова – самы вялікі ўладар: на выгляд малое і непрыкметнае, а справы робіць цудоўныя – можа страх спыніць і смутак адхіліць, выклікаць радасць, узмацніць літасць. (9) А што гэта так, я дакажу – бо слухачу даказваць трэба ўсімі доказамі.

Паэзію я лічу і называю маўленнем, якая мае мернасць; ад яе ідзе да слухачоў і страх, поўны трапятання, і жаль, якае л'е слёзы, і страсць, напоўненыя смуткам; на чужых справах і целах, на шчасці іх і няшчасці асабістага пакутвання жадае душа – па воле слоў. (10) Але ад гэтай размовы

Этот электронный документ был загружен с сайта филологического факультета БГУ http://www.philology.bsu.by

перайду я да іншай. Боганатхняльныя закліcнанні напевам слоў здольныя і радасць прынесці, і смутак адвесці; зліваючыся з душы ўяўленнем, сіла слоў заклінанняў сваім чарадзействам яе чаруе, пераконвае, перараджае. Два ёсць сродкі ў чарадзейства і вядзьмарства: душэўныя памылкі і няправільныя ўяўленні. (11) І колькі і колькіх і ў колькіх справах пераканалі і будуць заўсёды пераконваць, у няпраўдзе скарыстоўваючы маўленчае мастацтва! Калі б ва ўсім усе мелі аб справах мінулых успамін, і аб сучасных разуменне, і аб будучых прадбачанне, то адныя і тыя ж словы адным і тым жа чынам нас не падманвалі бы. Цяпер жа не так лёгка помніць мінулае, аналізаваць сучаснае, прадбачыць будучае, таму шмат у чым вельмі многія бяруць за кіраўніка душы сваёй уяўленне – тое, што нам здаецца. Але яно і падманлівае і няўстойлівае і сваёй падманнасцю і няўстойлівасцю наклікае на тых, хто імі карыстаецца, усялякія няшчасці.

(12) Што ж перашкаджае і пра Алену сказаць, што пайшла яна, перакананая словам, пайшла накшталт той, што не хоча ісці, быццам незаконнай сіле яна падпарадкавалася бы ці выкрадзена была сілай. Перакананасці яна дазволіла сабой авалодаць; і перакананне, якое ёй авалодала, хоць і не выглядае як насілле, прымус, але сілу мае гэткую ж. Бо пераканалае слова прымушае душу падпарадкавацца сказанаму. Пераканаўца таксама вінаваты, як і той, хто прымусіў; яна ж, перакананая, дарэмна ў словах да сябе чуе знявагу. (13) Што перакананне, выкарыстаўшы слова, можа на душу такую пячатку паставіць, якую захоча, – пра гэта можна даведацца перш за ўсё з вучэння тых, хто выкладае пра неба: яны, меркаваннем меркаванне змяняючы, адно знішчыўшы, другое прыдумаўшы, усё няяснае і непацвержанае ў вачах агульнага меркавання прымушаюць ясным з’явіцца; потым – з немінулых спрэчак у судовых справах, дзе адна прамова, майстэрскі напісаная, не па праўдзе сказаная, можа, зачараваўшы натоўп, прымусіць паслухацца; па-трэцяе – са спрэчак філосафаў, дзе адкрываюцца і думкі хуткасць, і мовы вастрыня: як хутка яны прымушаюць мяняць давер да меркавання! (14) Аднолькавую магутнасць маюць і сіла слова для стану душы, і склад лекаў для адчування цела. Падобна на тое, як лекі розныя па-рознаму выводзяць сокі з цела і адныя спыняюць хваробы, іншыя жа жыццё – таксама і прамовы: адныя засмучаюць, тыя захапляюць, гэтыя пужаюць, іншым жа, хто слухае іх, яны храбрасць надаюць. Бывае, нядобрым сваім перакананнем душу яны зачароўваюць. (15) Такім чынам, гэтым сказана, што калі яна паслухалася прамовы, яна не злачынка, а пакутніца.

Цяпер чацвёртаю прамоваю чацвёртае я прааналізую яе абвінавачванне. Калі гэта зрабіла каханне, то не цяжка пазбегнуць ёй абвінавачвання ў тым злачынстве, якое яна, гавораць, здзейсніла. Усё тое, што мы бачым, мае паходжанне не тое, якое мы можам жадаць, а якую лёс вырашыў ім даць. Пры дапамозе зроку і характар душы прымае іншае аблічча. (16) Калі цела воіна для вайны цудоўна апранецца ў ваенную зброю з жалеза і медзі, адным каб сябе абараняць, іншым каб ворагаў забіваць, і ўбачыць відовішча гэта і само збянтэжыцца і душу збянтэжыць, так што

Этот электронный документ был загружен с сайта филологического факультета БГУ http://www.philology.bsu.by

часта, калі ніякай няма небяспекі, бягуць ад яго людзі, ганебна напуганыя: знішчана вера ў законную праўду страхам, які пранік у душу ад відовішча: прадстаўшы перад людзьмі, яно прымушае забыць прыгожае, якое па закону прызнаецца, і гонар пасля перамогі. (17) Нярэдка, убачыўшы жахлівае, людзі страчваюць разуменне патрэбнага ў патрэбны момант: так страх разумныя думкі і заглушае і праганяе. Многія ад яго дарэмна пакутвалі, вельмі хварэлі і безнадзейна розум страчвалі: так вобраз таго, што вочы ўбачылі, дакладна адбіваўся ва ўсведамленні. І шмат таго, што страх выклікае, я не адзначыў, але тое, што не адзначана, падобнае на тое, пра што сказана. (18) А вось і мастакі: калі многімі фарбамі з многіх цел цела адно з дасканалымі формамі яны ствараюць, тады зрок наш зачароўваюць. Стварэнне куміраў багоў, статуй людзей – колькі яны асалоды нашым вачам прыносяць! Так цераз зрок звычайна бывае: ад аднаго мы пакутуем, іншага моцна жадаем. Шмат у многіх да розных рэчаў і людзям успыхваюць моцныя каханне і жаданне.

(19) Чаму ж здзіўляцца, калі вочы Алены, целам Парыса зачараваныя, страсці імкненне, бітвы любоўнай жаданне ў душы яе ўзбудзілі! Калі Эрас, будучы богам багоў, боскай сілай валодае, – як жа можа слабейшы ад яго адбіцца і абараніцца! А калі каханне – хваробаў людскіх пакуты, пачуццяў душэўных зацямненне, то не як злачынцу трэба яе ганіць, а няшчаснай лічыць. Прыходзіць яна, як толькі прыйдзе, па воле лёсу – не па загаду думкі, сіле кахання саступіць прымушаная – не па сваёй волі.

(20) Ці можна лічыць справядлівым, калі ганьбяць Алену? Ці зрабіла яна тое, што зрабіла, сілай кахання пераможаная, ці хлуснёй прамоў перакананая, ці сілком у далечыню прывезеная, ці багамі прымушаная, – ва ўсіх гэтых выпадках на ёй няма ніякай віны.

(21) Прамовай сваёю я зняў ганьбу з жанчыны. Закончу: што ў прамове спачатку сабе я паставіў, таму верным застаўся; паспрабаваўшы разбурыць ганьбы несправядлівасць, агульнага меркавання неабдумнасць, гэту прамову захацеў я напісаць Алене ў славу, сабе ў забаўку.

**Пытанні і заданні да тэксту**

**1.** Захоўвае ці пераўтварае Горгій сюжэтную канву добра знаёмага вам міфа, ці з'яўляецца традыцыйнай ацэнка паводзін яго герояў?

**2.** У сярэдзіне прамовы Горгій заўважае: «А што гэта так, я дакажу – бо слухачу даказваць трэба ўсімі доказамі». Дакажыце сапраўднае вынаходства, вастрыню думкі рытара пры падборы ўсіх магчымых доказаў у абарону гонару і годнасці гераіні. Колькі структурных элементаў, адпаведных колькасці распрацаваных довадаў, можна вылучыць у цэнтральнай, аргументатыўнай частцы выступлення? Якім чынам Горгій палягчае для слухачоў успрыняцце настолькі разгалінаванай і хітрамудрай сістэмы доказаў? Як акцэнтуюцца павароты падчас аргументацыі – змянення яе прычыны? Адшукайце ў тэксце прамовы паўтор у архітэктанічнай (кампазіцыйна значнай) функцыі. Начарціце аргументатыўную вось прамовы, падпісаўшы над кожным з пунктаў аргументацыі назву(-ы) выкарыстаных Горгіем сродкаў размежавання для слухачоў асобных частак выступлення. Знайдзіце і зачытайце выснову з напамінаннем сутнасці

Этот электронный документ был загружен с сайта филологического факультета БГУ http://www.philology.bsu.by

прыведзеных рытарам аргументаў. Сфармулюйце кароткія рэкамендацыі сучаснаму аратару, як палегчыць успрыманне складаных аргументатыўных паслядоўнасцей у пераканаўчых прамовах на аснове вывучэння рытарычнай практыцы Горгія.

**3.** Ці можна і чаму гаварыць пра элементы кальцавой кампазіцыі ў пабудове прамовы (успомніце, что ў антычнасці такая геаметрычная фігура, як круг, лічылася сімвалам гармоніі і дасканаласці)? Параўнайце паміж сабой: уступ і заключэнне прамовы; праблемныя пытанні ў пачатку аргументатыўнай часткі выступлення і канчатковая яе выснова.

**4.** Ці прыводзіць рытар жывыя прыклады на карысць сваіх слоў або абмяжоўваецца абстрактымі разважаннямі? Станоўча ці адмоўна ўплывае адзначанае на моц і пераканаўчасць аргументацыі?

**5.** Заканчваючы прамову, Горгій прызнаецца ў яе эксперыментальным, гульнявым характары, развітваючыся з намі з хітрай усмешкай на вуснах. Ці не здалося вам, аднак, што ў гэтай паўжартоўнай, дэманстратыўна франтаватай прамове ўсё ж гучаць ноты сур’езнасці, непадробленага натхнення, выказваюцца патаемныя перакананні аўтара? (Звярніце ўвагу на тое, які з довадаў аўтар распрацоўвае асабліва грунтоўна.)

**6.** Адной з найбольш вядомых «гаргіянскіх фігур», вынаходства якіх прыпісвалася старажытнымі людзьмі гэтаму рытару, з’яўляецца антытэза. На самай справе яна, безумоўна, выкарыстоўвалася прамоўцамі задоўга да нараджэння Горгія, аднак яму належыць заслуга спецыяльнай увагі да антытэз і свядомага іх культывавання. Выпішыце з «Пахвалы Алене» 2–3 прыклады антытэтычных пабудоў, падкрэсліваючы супрацьпастаўленыя паняцці. Якая кампазіцыйная частка прамовы набывае асаблівую выразнасць дзякуючы высокай канцэнтрацыі антытэз? Якая з больш за паўтара дзесятка антытэз тэкста можа быць прызнана цэнтральнай апазіцыяй прамовы і выконвае самую важную сэнсастваральную функцыю?

**7.** Менавіта ў чым выяўляецца блізкасць стылю Горгія да паэзіі? Выпішыце з тэксту прамовы 2–3 прыклады гомеатэлеўтаў (іх у тэксце каля 40), падкрэсліце сугучныя словы. Сам Горгій дае наступнае азначэнне паэзіі: “Паэзію я лічу і называю маўленнем, якая мае мернасць…” Ці сустракаюцца ў тэксце рытмізаваныя фрагменты? (Складзіце метрычную схему наступнага ўрыўка фразы: “І колькі і колькіх і ў колькіх справах пераканалі і будуць заўсёды пераконваць…”.) Якім чынам уплывае рытмізацыя стылю на парадак слоў у сказах? Зрабіце агульную выснову пра ўзаемасувязь выкарыстання гомеатэлеўтаў і рытма ў прамове з частотнасцю інверсійных і сінтаксічна паралельных, сіметрычных канструкцый.

Чаму для рыторыкі ў пачатковы перыяд яе развіцця было важна зацвердзіцца ў якасці асобнага, не дасягальнага для простага смертнага мастацтва, выразна супрацьпаставіўшы сябе звычайнаму маўленню? Якім чынам гэта было дасягнута ў творчасці Горгія?

Растлумачце на прыкладзе «Пахвалы Алене», як вы разумеце сэнс нечаканай высновы, якую зрабіў буйны расійскі філосаф і мастацтвазнавец

Этот электронный документ был загружен с сайта филологического факультета БГУ http://www.philology.bsu.by

XX стагоддзя А. Ф. Лосеў: «Рыторыка – гэта і ёсць сапраўдная антычная музыка».

**8.** У дыялогу Платона «Федр» змяшчаецца энкомій Эроту, у якім сучасныя даследчыкі бачаць элементы наўмыснага парадзіравання стылю выступленняў сафістаў (і ў прыватнасці, Горгія). На матэрыяле ўрыўка з энкомія вызначце, якія асаблівасці стылю Горгія леглі ў аснову парадзіравання: «Лагоднасці аматар, грубасці ганіцель, ён на прыязнасць багаты, на непрыязнасць не багаты. Да добрых цярплівы, мудрацамі шанаваны, багамі любімы…».

Чаму Платон накіраваў вастрыё сваёй іроніі супраць падобных рытарычных хітрасцей? (Падумайце, менавіта што, на думку знакамітага філосафа, павінна выступаць на першы план у прамове: форма ці змест.)

**9.** Як вы думаеце, ці лёгка было перакладаць «Пахвалу Алене» са старажытнагрэчаскай мовы? Аргументуйце сваё меркаванне, абапіраючыся на зроблены раней аналіз мастацкіх асаблівасцей маўлення.

**10.** Ці валодае слова Горгія той чароўнай сілай пераканання, якую ўвогуле прыпісвае слову рытар? Чаму вы так думаеце?

**11.** 1) Падзяліце прапанаваныя студэнтамі тэмы для парадаксальных энкоміяў на дзве групы: а) пахвала з’яўляецца парадаксальнай з-за нязначнасці, няважнасці прадмета ўсхвалення; б) пахвала з’яўляецца парадаксальнай з-за адмоўнай ролі прадмета прамовы ў жыцці людзей.

«Пахвала будзільніку, які спыніўся»; «Пахвала разбітай талерцы»; «Пахвала таракану»; «Пахвала шнуркам»; «Пахвала лямпачцы, якая перагарэла ў пакоі студэнцкага інтэрната ноччу напярэдадні экзамена»; «Пахвала пляме ад кавы на белай спадніцы ў ясны сонечны дзень»; «Пахвала кошцы з сабакам, якія жывуць у суседзяў за сцяной»; «Пахвала хатнім тапачкам»; «Пахвала шпаргалцы»; «Пахвала чарзе»; «Пахвала носу».

2) Падрыхтуйце невялікае (каля 5 хвілін) выступленне ў жанры парадаксальнага энкомія на любую тэму, якая вам спадабалася, або самастойна прыдуманую тэму.

## СУДОВАЕ КРАСАМОЎСТВА СТАРАЖЫТНАЙ ГРЭЦЫІ

### Тэкст для аналізу

### Лісій. Прамова пра тое, што не даюць пенсіі інваліду[1]

(1) Члены Савета! Я амаль што ўдзячны свайму праціўніку за тое, што ён узбудзіў супраць мяне гэтую справу. Раней у мяне не было падставы даць справаздачу аб сваім жыцці, а цяпер дзякуючы яму я атрымаў яе. У сваёй прамове я пастараюся паказаць, што ён хлусіць, а я сваім жыццём да сённяшняга дня хутчэй заслугоўваў пахвалы, чым зайздрасці: не па іншай прычыне, думаецца мне, ён узбудзіў супраць мяне гэту справу, а толькі з-за зайздрасці. (2) А хто зайздросціць таму, каго ўсё шкадуюць, перад якой подласцю, як вы лічыце, спынецца такі чалавек? Калі ж ён зрабіў на мяне беспадстаўны данос з-за грошай…; але калі ён гаворыць, што помсціць мне

Этот электронный документ был загружен с сайта филологического факультета БГУ http://www.philology.bsu.by

па асобнай варожасці, то гэта няпраўда: з такім подлым чалавекам я ніколі не быў ні сябрам, ні ворагам. (3) Значыць, члены Савета, ужо адразу бачна, што ён зайздросціць мне, – менавіта, што я, нягледзячы на свой заган, больш, чым ён, сумленны грамадзянін. Да, члены Савета, на мой погляд, цялесныя заганы трэба ўраўнаважваць душэўнай годнасцю, гэта правільна. Калі, напрыклад, напрамак розуму ў мяне і ўвесь увогуле лад жыцця будзе ў адпаведнасці з маім заганам, дык чым жа я буду адрозніваццa ад яго?

(4) Але хопіць пра гэта. Цяпер я скажу, наколькі магчыма карацей, пра тое, што складае мэту маёй прамовы. Праціўнік мой сцвярджае, быццам я не маю права атрымліваць дапамогу ад дзяржавы, паколькі я здаровы фізічна і не належу да ліку «нядужых», ды і ведаю такое рамяство, што магу жыць і без гэтай дапамогі. (5) У доказ маёй фізічнай сілы ён указвае на тое, што я магу ездзіць вярхом, а ў доказ забяспечанасці маёй ад рамяства – на то, што я магу сябраваць з людзьмі, якія могуць дазволіць сабе некаторыя затраты. Якая вялікая ў мяне забяспечанасць ад рамяства, і ўвогуле якое маё жыццё, я думаю, вы ведаеце; але ўсё ж я скажу пра гэта некалькі слоў. (6) Бацька мне пакінуў у спадчыну … нічога; маці карміць я перастаў толькі трэці год таму, з яе смерцю; дзяцей, якія пра мяне паклапаціліся бы, у мяне пакуль што няма. Рамяство маё дае мала прыбытку; да таго ж мне самому ім займацца ўжо цяжка, а купіць сабе раба, які замяніў бы мяне ў працы, пакуль яшчэ не магу. Іншых прыбыткаў, акрамя гэтага, у мяне няма; і, калі вы забярэце яго ў мяне, мне пагражае небяспека апынуцца ў вельмі цяжкім становішчы. (7) Таму, члены Савета, не прыгаворвайце мяне да смерці несправядлівым рашэннем, калі ў вас ёсць магчымасць зберагчы мне жыццё рашэннем справядлівым; не забірайце ў мяне цяпер, калі я старэю і слабею, таго, што вы далі мне, калі я быў маладзейшы і мацнейшы! Вы перш за ўсё славіліся людзьмі надзвычай спагадлівымі нават да тых, у каго няма ніякага няшчасця; дык не абыходзьцеся бязлітасна цяпер, пад уплывам гэтага чалавека, з тымі, хто выклікае спачуванне нават у ворагаў; не прыводзьце ў роспач усіх, хто знаходзіцца ў аднолькавым са мной становішчы, калі ў вас хопіць духу пакрыўдзіць мяне! (…)

[1] Прамова прыводзіцца ў скарачэнні.

(10) Што тычыцца маёй язды вярхом, згадаць пра якую перад вамі ён рашыўся, лёсу не баючыся і вас не саромеючыся, то пра гэта размова кароткая. Усе, хто мае якую-небудзь немач, члены Савета, канешне, накіроўваюць свае намаганні і думкі на тое, каб паменшыць свае пакуты. Адзін з іх – я: апынуўшыся ў такім няшчасці, я знайшоў сабе палягчэнне ў яздзе на кані, калі мяне чакае больш ці менш далёкі шлях па неабходных справах. (11) Але самы галоўны доказ, члены Савета, таго, што я езджу не з-за фанабэрыі, як ён сцвярджае, а ў выніку сваёй немачы, – гэта вось які.

Калі б у мяне было багацце, я ездзіў бы на муле[1], а не чужым кані; але паколькі я не магу яго купіць, часта бываю вымушаны браць чужога каня. (12) Калі б ён бачыў, што я езджу на муле, то маўчаў бы (што тут можна гаварыць?): ці ж не глупа з яго боку, члены Савета, на той падставе, што я

Этот электронный документ был загружен с сайта филологического факультета БГУ http://www.philology.bsu.by

езджу вярхом на кані, якога выпрашу ў каго-небудзь, старацца ўпэўніць вас, быццам я здаровы? Яшчэ: ён не ўказвае ў сваім абвінавачванні, як на прыкмету майго здароўя, тое, што я хаджу з двума палкамі, у той жа час як усе ходзяць з адной[2]: ці не глупа прыводзіць вам у доказ майго здароўя тое, што я езджу на кані? Я ж карыстаюся і тым, і іншым сродкам па адной і той жа прычыне (…) (14) Але, на шчасце, вы не падзяляеце яго меркавання. Хоць ён і з'явіўся сюды з мэтай аспрэчваць у мяне маю немач, падобна нявесце-сіраце са спадчынай, і стараецца пераканаць вас, што я не такі, якім вы ўсе мяне бачыце, але вы, як і належыць людзям разумным, больш верыце сваім вачам, чым яго запэўненням (…)

(19) Далей, ён гаворыць, што ў мяне збіраюцца розныя нягоднікі і ў вялікай колькасці – людзі, якія сваё багацце праматалі і цяпер шукаюць выпадку напасці на тых, хто хоча зберагчы сваё. Але вы ўсе павінны мець на ўвазе, што ён, кідаючы гэткі папрок мне, абвінавачвае мяне не больш, чым усіх, хто займаецца рознымі рамёствамі, і маіх наведвальнікаў абвінавачвае не больш, чым наведвальнікаў усіх іншых рамеснікаў. (20) Кожны ж з вас мае звычай заходзіць куды-небудзь[3]: адзін – у парфюмерны магазін, другі – у цырульню, трэці – у шавецкую майстэрню, чацвёрты – куды давядзецца; часцей за ўсё заходзяць куды-небудзь паблізу ад рынку і вельмі рэдка – куды-небудзь далёка ад яго. Такім чынам, калі нехта з вас прызнае нягоднікамі маіх наведвальнікаў, то, відавочна, прызнае гэткімі ж і тых, хто бывае ў іншых; а калі іх, то і ўвогуле ўсіх афінян, таму што вы ўсе маеце звычай заходзіць куды-небудзь і там вабіць свой свабодны час.

[1] На мула надзявалася сядло са спінкай, якое нагадвала крэсла і рабіла язду больш камфортнай, чым вярхом на кані.

[2] У старажытнасці ў Афінах звычайна хадзілі, абапіраючыся на посах.

[3]Афіняне звычайна ў вольны час заходзілі ў лаўкі і майстэрні, каб пагаварыць з іншымі наведвальнікамі; такім чынам, майстэрня інваліда-адказчыка выступала ў якасці своеасаблівага клуба.

(21) Але не ведаю, дзеля чаго мне так падрабязна ўсё расказваць, адказваючы ў сваёй абароне на кожны пункт абвінавачвання асобна, і надакучваць вам далей. Паколькі я сказаў ужо пра самыя галоўныя пункты, дзеля чаго буду я, накшталт майго праціўніка, спыняцца на дробязях? Я са свайго боку прашу вас усіх, члены Савета, не мяняць вашага папярэдняга меркавання пра мяне: (22) не пазбаўляйце мяне па яго даносу таго адзінага дабра, якое лёс даў мне на радзіме; не слухайце аднаго гэтага чалавека, не забірайце ў мяне тых грошай, якія вы далі мне ўсе па агульнаму рашэнню ўжо даўно! Да, члены Савета, лёс пазбавіў нас вышэйшага дабра; па прычыне гэтага дзяржава прызначыла нам гэтую пенсію, маючы на ўвазе, што як шчасце, так і няшчасце можа выпасці на долю кожнага аднолькава. (23) Так няўжо не быў бы я самым нешчаслівым чалавекам у свеце, калі б, пазбаўлены сваёй немаччу лепшага і вышэйшага дабра, страціў па міласці свайго

Этот электронный документ был загружен с сайта филологического факультета БГУ http://www.philology.bsu.by

праціўніка тую пенсію, якую мне дала дзяржава, заклапочаная становішчам такіх людзей? Не, не, члены Савета, не выносьце такога рашэння! Дык за што вы можаце да мяне так ставіцца? (24) Можа быць, за тое, што хто-небудзь па маёй скарзе калі-небудзь быў прыцягнуты да суда і пазбавіўся сваёй маёмасці? Не, ніхто не можа гэтага даказаць. Можа быць, за тое, што я ўмешваюся ў чужыя справы, што я дзёрзкі і сварлівы? Не, не ў такіх умовах я жыву. (25) Можа быць, за тое, што я ганарлівец і буян? Не, гэтага ён нават сам не скажа, калі не захоча хлусіць і ў гэтым, як хлусіць ва ўсім астатнім. Можа быць, за тое, што падчас кіравання калегіі Трыццаці я быў у сіле і рабіў зло многім грамадзянам? Не, я разам з вашай народнай партыяй збег у Халкіду[1] і, хоць меў магчымасць жыць з імі і нічога не баяцца, я палічыў за лепшае пайсьці і дзяліць з вамі небяспечнасці. (26) З прычыны гэтага, члены Савета, не стаўцеся да мяне, чалавека ні ў чым не вінаватага, так, як вы ставіцеся да злачынцаў; вынесіце наконт мяне такое ж рашэнне, якое пастанаўляў Савет у мінулыя гады (…) (27) Прыняўшы такое рашэнне, вы ўсе вынесіце справядлівы прыгавор, я за такія адносіны вашы буду вам вельмі ўдзячны, а ён у будучым зразумее, што не трэба нападаць на хворых, а трэба старацца змагацца з роўнымі.

**Пытанні і заданні**

1. Паспрабуйце самастойна, не абапіраючыся на фактаграфічны каментарый, вызначыць, у чым заключаецца сутнасць, перадгісторыя судовай справы, якая разглядаецца. У пачатку прамовы знаходзіцца наступнае папярэджанне: «Цяпер я скажу, *наколькі магчыма карацей*, пра тое, што складае мэту маёй прамовы». Ці стрымлівае прамоўца сваё абяцанне? Ці сапраўды выкладанне сутнасці судовага канфлікту ў прыведзенай прамове Лісія характарызуецца сцісласцю і дакладнасцю?

2. Хто маецца на ўвазе ў гэтай прамове пад займеннікам «я»? Да самаабарончай ці абарончай прамовы адносіцца гэтае выступленне: па абставінах стварэння; па абставінах маўлення? У чым сходнасць біяграфій Лісія і яго кліента, якая, па ўсёй верагоднасці, абуджала ў рытара-лагаграфа сімпатыю да свайго героя? Якім і чаму менавіта такім вы ўяўляеце сабе характар безыменнага інваліда? Падбярыце 3–4 азначэнні, якія яго характарызуюць (ці можна назваць галоўнага героя прыніжаным і забітым, панурым і хмурным, якім магла бы яго зрабіць фізічная немач?). На якіх двух важных кантрастах, што намечаны ўжо ў першым абзацы прамовы, ствараецца гэты вобраз? Растлумачце, як садзейнічаюць стварэнню станоўчага арэола вакол вобраза галоўнага героя кантраст паміж яго цялеснымі і душэўнымі якасцямі, паміж ім і яго праціўнікам. Ці згодны вы з акадэмікам С. І. Сабалеўскім у тым, што «ў гэтай прамове Лісій паказаў ва ўсім бляску сваю здольнасць да этапеі»?

[1] Халкіда – горад, куды падчас кіравання Трыццаці тыранаў збеглі многія прыхільнікі дэмакратыі.

Этот электронный документ был загружен с сайта филологического факультета БГУ http://www.philology.bsu.by

3. Адзін з відаў доказу з’яўляецца падзяляльным, пры якім праўдзівасць тэзіса абгрунтоўваецца шляхам выключэння астатніх магчымасцей. (Напрыклад, ёсць толькі тры магчымыя падазроныя: Іваноў, Пятроў, Сідараў, і віна Іванова вызначаецца на аснове доказу невінаватасці Пятрова і Сідарава.) Назавіце выпадкі выкарыстання падзяляльнага доказу ў дадзенай прамове. Звярніце ўвагу на тое, як сінтаксічна адлюстроўваюцца тэзіс і пасылкі ў другім з выпадкаў. Правядзіце стылістычны эксперымент: зачытайце гэтае разважанне ў той форме, якую яно мела бы ў нейтральным, бясстрасным выкладанні. Якія якасці тэксту пры гэтым страчваюцца? У чым выяўляецца тут адрозненне тэмпераментнай, арыентаванай на адрасата рытарычнай аргументацыі ад сухой і строгай лагічнай працэдуры доказу?

4. Вельмі вострым і эфектыўным прыёмам абвяржэння служыць «давядзенне да недарэчнасці», «звядзенне да абсурду» – дэманстрацыя рэзкага разыходжання паміж рэчаіснасцю і тымі наступствамі, якія выводзяцца з прыняцца тэзіса, які абвяргаецца. Дзе і як выкарыстаны гэты прыём у тэксце прамовы?

5. Знайдзіце і зачытайце прыклады выкарыстання прамоўцам так званага аргумента да славалюбства («падмазванне аргумента») – пахвал у адрас аўдыторыі, падкрэслівання яе годнасці і павагі рытара да яе.

6. Як выкарыстоўваецца ў выступленні «эффект падманутага спадзявання» (наўмыснае ўнясенне збояў у работу механізма магчымаснага прагназіравання зместу прамовы, якое узмацняе ўражанне слухачоў)? Дзе можна ўбачыць змястоўнае падабенства паміж першымі фразамі дваццаць чацвёртай прамовы Лісія і яго дванаццатай прамовай: «Спадары суддзі! Не пачаць абвінавачванне здаецца мне цяжкім, а скончыць прамову: настолькі вялікія і настолькі шматлікія злачынствы гэтых людзей»? Што за нарматыўны від канструкцыі з § 6: «Бацька пакінуў мне ў спадчыну … нічога» – і чаму Лісій прымяняе гэтую дзіўную пабудову сказа?

7. Прагледзьце тэкст выступлення з пункту гледжання таго, якія ў ім сустракаюцца тропы. Колькі ўсяго тропаў вам удалася знайсці? Ці з’яўляецца выкарыстанне слоў у пераносным значэнні характэрным для прапанаванай прамовы і чаму?

8. З дапамогай якіх стылістычных сродкаў ствараецца запальчывасць і гарачнасць тону прамовы? Пералічыце назвы заўважаных вамі рытарычных сродкаў, прыводзячы па адным цытатным прыкладзе на кожны. Якое з іх з’яўляецца найбольш распаўсюджаным? Зачытайце, калі гэта яшчэ не было зроблена, па адным прыкладзе выкарыстання такіх прыёмаў, як рытарычнае пытанне і пытальна-адказны ход; растлумачце розніцу паміж гэтымі дзвюма фігурамі. Выпішыце з тэксту выступлення ланцужок антытэз, падкрэсліце супрацьпастаўленыя словы і словазлучэнні. Колькі ўсяго супрацьпастаўленняў змяшчаецца ў дадзеным кантэксце?

9. Менавіта дзе падчас выступлення спецыяльна прадугледжана выкарыстанне выразнага жэста? Менавіта які жэст скарысталі бы ў такой сітуацыі мы з вамі сёння? Зрабіце агульны вывад пра тое, якія прыёмы

Этот электронный документ был загружен с сайта филологического факультета БГУ http://www.philology.bsu.by

з'едлівай іроніі ў адносінах да праціўніка свайго кліента выкарыстоўвае Лісій.

10. Вынік гэтага судовага працэсу, на жаль, нам невядомы. Як вы лічыце, ці ўдалася адказчыку выйграць працэс? Уявіце сябе ў ролі аднаго з членаў Савета. За адмену выдачы грашовай дапамогі інваліду ці супраць такой адмены прагаласавалі бы вы? Чаму? Ці ёсць у гэтым заслуга або віна Лісія?

## РЫТАРСКАЕ МАЙСТЭРСТВА ДЭМАСФЕНА – ВЯРШЫНЯ ГРЭЧАСКАГА КРАСАМОЎСТВА

Этапнай і вельмі паказальнай у рытарычнай творчасці Дэмасфена з'яўляецца яго аб'ёмная прамова «За Ктэсіфонта аб вянку». Перадгісторыя судовага працэсу, падчас якога яна прагучала, наступная. Дэмасфен прымаў актыўны ўдзел у арганізацыі грамадскіх работ – будаўніцтве гарадскіх сцен, якія ігралі значную абарончую ролю, і ўклаў у гэтую дзейнасць не толькі дзяржаўныя, але і асабістыя сродкі. За заслугі перад суграмадзянамі нехта Ктэсіфонт, асоба нязначная на палітычнай арэне, прапанаваў узнагародзіць вялікага рытара залатым вянком. Прапанова Ктэсіфонта была апратэставана прамакедонскай партыяй у асобе даўняга ворага Дэмасфена – Эсхіна, чалавека нязнатнага паходжання, які прайшоў па шляху да вядомасці цераз шэраг іншых заняткаў: школьнага настаўніка, акцёра і пісара (раней Дэмасфен абвінавачваў Эсхіна, якога падкупіў македонскі цар Філіпп, у здрадзе радзіме). Скарга Эсхіна на процізаконнасць прапановы Ктэсіфонта будавалася на аснове 3-х пунктаў: 1) Дэмасфен як службовая асоба, не зрабіў справаздачу аб выкананні сваіх абавязкаў; 2) увянчанне павінна было адбыцца ў тэатры, а не на народным сходзе, як меркавалася; 3) Дэмасфен як палітык і як чалавек ніякім чынам не заслугоўвае ўшанавання. Узнагароджанне не здзейснілася, аднак на працягу доўгіх 6 гадоў Эсхін не пачынаў працэсу, чакаючы спрыяльнага для македонцаў (значыць, і для яго самога) становішча спраў. Урэшце, дачакаўшыся выйгрышнай, на яго думку, палітычнай сітуацыі – вяршыні магутнасці і славы Аляксандра Македонскага, Эсхін узбуджае справу аб вянку. У прызначаны для яе разглядання дзень прысутнічаць на «паядынку двух буйнейшых рытараў свайго часу» (Тэафраст), якія ўвасаблялі сабой непрымірымую канфрантацыю пра- і антымакедонскіх сіл, сабралася вялікая колькасць публікі («… ніхто не прыпомніць, каб столькі людзей прыйшлі на спрэчку па дзяржаўнай справе», – адзначаў Эсхін). Прамова Дэмасфена, будучы другой па ліку, вельмі паўплывала на слухачоў, і ён перамог. Эсхін пацярпеў сакрушальнае паражэнне: не набраўшы і пятай часткі галасоў суддзяў, ён пазбавіўся права прымаць удзел у дзяржаўных справах і быў падвергнуты так званай атыміі – грамадзянскай ганьбе, і прымушаны быў сыйсці з палітычнай сцэны і падацца ў выгнанне.

Этот электронный документ был загружен с сайта филологического факультета БГУ http://www.philology.bsu.by

## Фрагменты для аналізу

### Тэкст 1. Абвінавачванні ў адрас Дэмасфена з прамовы Эсхіна «Супраць Ктэсіфонта аб вянку»

(134) …Менавіта пра такіх, як Дэмасфен, цудоўна сказана ў вершах Гесіёда – там, дзе ён навучае народ і раіць гарадам не спадзявацца на хужэйшых з народаўцаў.

(135) …Часта нямалы горад за аднога разлічваецца мужа,
Мужа, што творыць грахі і чыніць безразважнасць…

(136) Не звяртайце ўвагу на вершаваны памер і падумайце — і сапраўды, вы адчуеце, што гэта не вершы Гесіёда, а боскае прароцтва пра Дэмасфенава кіраванне...

(152) Як мне тут не ўзгадаць пра тых нашых доблесных мужоў, якіх гэты Дэмасфен, нягледзячы на нядобрыя і неспрыяльныя ахвяры, сам адправіў на верную смерць, а цяпер яшчэ адважваецца, узыходзячы на курган тымі ж ступнямі, якімі бег з поля бою і з месца ў страі, праслаўляць хвалою іх мужнасць! ...Няўжо ты пасмееш, гледзячы гэтым грамадзянам у вочы, аб’явіць, што за ўсе беды нашай айчыны цябе ўзнагародзяць вянком? ... (158) Бо на самой справе ні гораду, ні прыватным асобам ніколі не было дабра ад саветаў Дэмасфена. Ці не сорамна вам, афіняне? У вас ёсць закон аб перавозчыках на Саламін: у каго пры перавозе выпадкова перавернецца лодка, таго больш не дапускаць да перавозу, каб непанадна было нядбала ставіцца да жыццяў элінаў; так ці дазволіце вы зноў запраўляць грамадскімі справамі гэтаму чалавеку, які дашчэнту перавярнуў уверх дном і ваш горад, і ўсю Эладу? ...

(173) А які яго паўсядзённы лад жыцця? Ён рыхтаваў у дарогу караблі — але аказаўся наёмным пісакай судзебных прамоў, таму што смехатворна растраціў усю бацькоўскую маёмасць. Згубіўшы давер і тут — за тое, што ён выдаваў праціўнікам довады абароны, — выскачыў ён на памост Народнага сходу. Робячы дзяржаўныя справы, браў ён удосталь, але засталося пры ім самая маласць. Цяпер ён пакрыў свае выдаткі царскім золатам, але і гэта ненадоўга: дрэннаму нораву ніякага золата не хопіць. Самае ж галоўнае, што жыве ён за кошт не сваіх даходаў, а вашых, афіняне, бедстваў.

(174) А добрыя думкі і красамоўства? Пышныя словы і кепскія справы...

(181) ...Хто, па-вашаму, лепшы: Фемістокл, які камандаваў пры Саламіне, калі вы ў моры разбілі персаў, ці гэты Дэмасфен, які цяпер пакінуў строй? Мільтыяд, які адолеў варвараў пры Марафоне, ці гэты гаспадар? ...(182) Клянуся алімпійскімі багамі, грэшным здаецца і ўзгадваць побач з гэтымі мужамі гэту пачвару! А вось няхай Дэмасфен пакажа, ці было пастаноўлена хаця б аднаго з іх узнагародзіць вянком. Не? няўжо народ такі няўдзячны? Наадварот, народ наш высокадушны, і мужы гэтыя цалкам яго дастойны: яны меркавалі, што слава — не ў напісаных пастановах, а ў памяці ашчасліўленых...

Этот электронный документ был загружен с сайта филологического факультета БГУ http://www.philology.bsu.by

(215) Нарэшце, я хачу каротка папярэдзіць і тыя папрокі, якія будуць выказаны мне самому. Чуў я, што Дэмасфен збіраецца гаварыць, што гораду нашаму ад яго была адна карысць, а ад мяне адна шкода, і ўзваліць на мяне ўсё, што ідзе ад Філіпа і Аляксандра. Ён такі лоўкі на словах, што яму мала абвінавачваць мяне за тое, што я гаварыў перад народам ці рабіў для дзяржавы: (216) не, ён напускаецца і на тое, як я жыў спакойна і маўчаў у далечыні ад спраў, каб нічога ўжо не пакінуць неабылганым... (217) Клянуся Зеўсам, я нават чуў, што ён хоча мяне спытаць: чаму гэта я асуджаю агульны напрамак яго дзяржаўных спраў, а паасобку не выступаў супраць ніводнай, а толькі цяпер, хоць і рэдка займаюся справамі горада, сабраўся ды і прыцягнуў яго да суда?

Я на гэта скажу, што ні Дэмасфенаваму ладу жыцця я не зайздрошчу, ні свайго не саромлюся: я не шкадую, што сказаў тыя прамовы, якія сказаў, а вось калі б мне давялося гаварыць тое, што Дэмасфен, дык лепш было б і не жыць. (218) Калі я маўклівы, то гэтаму, Дэмасфен, прычынай мой умераны лад жыцця: я задавольваюся нямногім, не ганюся, згубіўшы сорам, за вялікім і таму гавару і маўчу па сваім меркаванні, а не пад ціскам прыроднай марнатраўнасці. Ты ж, узяўшы грошы, маўчыш, а патраціўшы іх, крычыш; гаворыш не калі хочаш і не што хочаш, а па загаду тваіх наймальнікаў; і табе не сорамна пахваляцца маной, якая вось-вось будзе выкрыта...

(220) Ты папракаеш мяне за тое, што я выступаю перад народам не часта, а зрэдку, і думаеш, што мы не бачым: сам папрок гэты — у духу не народнай улады, а зусім іншай. Бо гэта пры ўладзе нямногіх выступаць можа не той, хто хоча, а той, хто ў сіле; пры народнай жа ўладзе — усякі, хто хоча, і тады, калі ён палічыць неабходным. Таму выступаць рэдка ўласціва чалавеку, які займаецца дзяржаўнымі справамі па абставінах і на народную карысць, выступаць жа штодзённа — гэта справа наёмніка і рамесніка...

(255) Помніце ж, што вы вырашаеце лёс не чужога, а свайго горада... узнагароды прысуджайце тым, хто лепшы і больш дастойны; спадзявайцеся не на слых, а на вочы свае. Азірніцеся, напрыклад, хто з вас прыйдзе на дапамогу Дэмасфену? можа быць, яго таварышы юных гадоў па паляванні ці па палестры? ды не, бачыць Зеўс, не на кабаноў ён тады паляваў і не цела закаляў, а практыкаваўся ў падкопах супраць тых, хто больш заможны... (257) А калі пад канец прамовы ён закліча сабе на дапамогу паплечнікаў па хабару, то вы уявіце, што супраць нахабнасці гэтых гаспадароў вось на гэтым камяні, дзе я зараз стаю і гавару, вам з’явіліся дабрадзеі вашай айчыны. Вось Салон, які найцудоўнейшымі законамі ўсталяваў народную ўладу, любамудр і слаўны вершатворца, з належнай прыстойнасцю просіць вас не ставіць Дэмафенавы словы вышэй вашых прысяг і законаў. (258) Вось Арыстыд, размяркоўнік падаткаў паміж элінамі, пасля смерці якога сам народ выдаў замуж яго дочак: як ён наракае, што справядлівасць затаптана ў гразь... (259) ... А Феміcтокл, а загінуўшыя пры Марафоне і Платэях, а самыя грабніцы вашых продкаў няўжо не застогнуць, калі дастанецца вянок таму, хто сам гаворыць, што ён разам з варварамі быў супраць элінаў?

Этот электронный документ был загружен с сайта филологического факультета БГУ http://www.philology.bsu.by

(260) Няхай жа будуць сведкамі зямля, сонца, дабрадзейнасць, розум і людское асветніцтва, якія дапамагаюць нам адрозніваць цудоўнае ад ганебнага: вось я выказаўся, каб вам гэта было ў дапамогу. Калі я выкрыў несправядлівасць добра і дастойна — значыць я сказаў як хацеў, калі недастаткова — значыць, я сказаў, як жадаў. Вы ж, прыняўшы да ведама ўсё сказанае і не сказанае, цяпер самі выносьце прысуд, справядлівы і карысны для дзяржавы.

## Тэкст 2
## Адказ на абвінавачванні Эсхіна з прамовы Дэмасфена “За Ктэсіфонта аб вянку”

(194) Ну, а калі пярун ці смерч аказаліся мацнейшыя не толькі за нас, але ўсіх увогуле элінаў — што ж тут зробіш? Гэта ўсё роўна, што калі карабельшчык ўсё зрабіў бы для бяспекі карабля і забяспечыў бы яго ўсімі выратавальнымі сродкамі, а потым трапіў у буру, ад якой пашкодзіўся ці ўвогуле патануў увесь суднавы рыштунак — і тут яго знянацку прыцягнулі б да адказнасці як вінаватага ў караблекрушэнні. Ён бы і адказаў, што не ён быў рулявым — як і не я быў палкаводцам! — і што не ён уладар над выпадкам, але, наадварот, выпадак кіруе светам...

(208) ...Не, не памыліліся вы, грамадзяне афінскія, ідучы на небяспечную справу дзеля агульнай свабоды і ўратавання, — хай будуць сведкамі таму продкі вашыя, якія не спалохаліся пры Марафоне, трымалі строй пры Платэях, біліся на караблях пры Саламіне і Артэмісіі і ў многіх іншых бітвах выпрабоўваліся! Прах гэтых доблесных мужоў пахаваны на нашых гарадскіх могілках, і ўсіх іх горад аднолькава ганарова пахаваў, — так, Эсхін, усіх, а не толькі тых, хто дасягнуў поспеху і перамог, і гэта справядліва, бо ўсе яны рабілі сваю справу сумленна, а ўдачы кожнаму дасталося столькі, колькі даў бог...

(252) ...Я лічу сапраўдным вар’яцтвам, калі адзін чалавек папракае іншага яго лёсам. Сапраўды, калі нават той, хто верыць, што ўсё ў яго ідзе выдатна, і таму ўяўляе, быццам злавіў удачу, усё ж такі не можа ведаць, ці прадоўжыцца ўдача яго хоць бы да вечара, тады ці варта ўвогуле гаварыць пра яе і ці варта папракаць ёю іншых? Аднак ён гаворыць пра гэты прадмет з такой жа саманадзейнасцю, як і пра ўсё астатняе, а калі так, шаноўныя афіняне, то глядзіце і думайце самі, наколькі згодна з ісцінай і чалавечнасцю разважаю пра лёс я...

(270) ...Калі ва ўсім падсонечным свеце ты, Эсхін, адшукаеш хоць бы аднаго чалавека —эліна ці варвара, — які раней не пакутваў ад самаўладства Філіпа і які цяпер не пакутуе ад самаўладства Аляксандра, тады няхай будзе па-твойму, а я згаджуся, што вінавата маё шчасце ці злая доля, гэта уж як ты хочаш назваць. (271) Але калі нават там, дзе мяне не бачылі і не слухалі, многім людзям давялося сцярпець шматлікія бедствы — і не асобным людзям, а цэлым гарадам і народам! — калі так, дык няўжо не больш сумленна і правільна меркаваць, што вінаватыя агульнае няшчасце амаль што ўсяго чалавецтва і нейкі няўдалы і горкі збег абставін?...

Этот электронный документ был загружен с сайта филологического факультета БГУ http://www.philology.bsu.by

(276) Больш за тое, у прытворнай сваёй шчырасці і добранамернасці ён яшчэ і параіў вам нядаўна з асаблівай настойлівасцю, каб вы мяне асцерагаліся і каб сачылі, як бы я вас не перахітрыў і не задурыў, бо я ж спрытнюга, і падманшчык, і балака — як толькі ён мяне тут не абзываў!... Аднак я ўпэўнены, што вы ўсе добра яго ведаеце і ўжо зразумелі, наколькі яму больш уласцівыя згаданыя ім жа якасці. (277) Я ўпэўнены таксама і ў тым, што вытанчаныя мае прамовы — але досыць! Скажу адно: ясна, што слухачы па сваёй волі надзяляюць сілаю прамоўцу, і таму мае рацыю той бок, якому вы выказваеце больш увагі і прыхільнасці. Дык вось, калі я хоць трохі кемлю ў прамовах, то ўсе вы можаце бачыць, што я заўсёды карыстаўся гэтым сваім мастацтвам дзеля агульнага дабра і дзеля вас... (278) Сумленны і прыстойны грамадзянін не павінен дзеля асабістай карысці абуджаць у суддзяў, якія з'явіліся сюды выканаць грамадзянскі доўг, гнеў, нянавісць і іншыя подлыя пачуцці — не трэба яму ісці да вас з такімі намерамі, а яшчэ лепш і зусім не мець такіх намераў, але калі гэта непазбежна, то трэба хоць бы прытрымлівацца прыстойнасці і сціпласці. А ўсё ж ці бывае так, што даводзіцца гаварыць і дзейнічаць з палкай рашучасцю? Так, бывае, бо калі небяспека пагражае самому існаванню дзяржавы і калі народ уступае ў схватку з ворагам, тады без сумленнага і адважнага грамадзяніна абысціся нельга. (279) Але мусіць пакараць мяне, хоць за мной не лічыцца ніякага дзяржаўнага — заўважу, што прыватнага таксама — зачынства, і мусіць пра гэта не дзеля горада і нават не дзеля асабістай выгады, а з'явіцца сюды і пабудаваць каверзнае абвінавачванне толькі для таго, каб забраць у мяне вянок і пахвалу, — вось гэта ўжо азначае асабістую варожасць і зайздрасць і нізасць, але сумленнасці тут і блізка няма! Ну, а адхіліцца ад прамога суда са мной і замест гэтага абвінавачваць вось яго — проста сапраўдная подласць! (280) Застаецца меркаваць, што ты, Эсхін, выбраў гэты суд не для таго, каб дабіцца пакарання злачынцу, але толькі жадаючы пахваліцца, як прыгожа ты гаворыш і які гучны ў цябе голас. Ты жа павер: прамоўцу паважаюць не за красамоўства і нават не за глотку, а за згоду з меркаваннем народным і за тое, што ненавідзіць ён і любіць разам з айчынай...

(285) Мноства цудоўных і вялікіх спраў задумаў і зрабіў наш горад дзякуючы мне, і справы гэтыя не забыты, Эсхін. Вось табе доказы. Калі народ пасля ўсяго, што здарылася, вырашаў адкрытым галасаваннем, хто скажа надмагільнае слова загінуўшым, то не сабралі галасы ні ты, хоць гаворка ў цябе гучная, ні Дземад, хоць ён толькі што заключыў мір, ні Гегемон і ніхто іншы з вашай брацііі, а прызначылі мяне... Людзі ведалі вас і ведалі мяне: пра мяне яны ведалі, што я ва ўсіх справах праяўляў руплівасць і добранамернасць, а пра вас ведалі, што вы здраднікі... (287) Таму і было вырашана, што гаварыць над палеглымі суграмадзянамі і хваліць іх доблесць ніяк немагчыма таму, хто дзяліў дах і стол з непрыяцелем, і што ганаровая гэта пасада не для таго, хто вярнуўся дадому, весела адсвяткаваўшы гібель элінаў разам з іх забойцамі, і што аплакваць гэта гора трэба не няшчырымі галашэннямі, а ад душы — і гэты смутак людзі заўважалі ў сябе і ў мяне, але не ў вас, (288) а таму абраны быў я, а не вы...

Этот электронный документ был загружен с сайта филологического факультета БГУ http://www.philology.bsu.by

(289) Прачытай жа яму надпіс, якую горад высек ў памяць загінуўшых...

Ярасць і доблесць явіўшы на поле бітвы, жыцці
Не зберaглі, сышоўшы ў дольны Аідаў надзел...
Богі бароняць ад няшчасцяў і богі даруюць удачу,
Але непазбежнага лёсу людзям мінуць немагчыма.

(290) Чуеш, Эсхін, як тут сказана: “Богі бароняць ад няшчасцяў і богі даруюць удачу”, — гэта значыць няма ў дарадчыка сілы падараваць перамогу ў баі, такая сіла толькі ў багоў! Чаму ж ты, нягоднік, праклінаеш мяне за паражэнне? Хай праклёны твае падуць на галовы табе і тваім хаўруснікам!

(307) ...Клянуся Зеўсам! — сумленны грамадзянін ніколі не здрадзіць айчыне... і не будзе маўчаць насуперак закону і агульнай карысці, як гэта вельмі часта робіш ты. (308) Канешне, маўчанне бывае і па закону і па агульнай карысці — вось так, значыць без усякага каварства маўчыце вы, а вы складаеце большасць. Аднак ён жа маўчыць не так, зусім не так! Калі яму гэта бывае зручна — а такое бывае часта, — ён адыходзіць ад дзяржаўных спраў і чакае, пакуль вам не надакучыць шматслоўны дарадчык, ці пакуль лёс не будзе да вас непрыхільным, ці пакуль не здарыцца яшчэ якая-небудзь непрыемнасць — а ў людзей што толькі не здараецца? — і вось тады ён раптам з’яўляецца са сваімі прамовамі, быццам як вецер, які вырваўся з бяздзейснага спакою, і ўжо тут падрывае глотку, красамоўнічае, пляце словы, крычыць усё падрад буз усялякага перапынку... (309) Канешне, Эсхін, калі гэта тваё спрактыкаванае красамоўства было б не прытворнае і карыснае айчыне, ад яго пайшлі бы цудоўныя і слаўныя і для ўсіх прыбытковыя плады — саюз паміж гарадамі, павелічэнне багацця, уладкаванне гандлю, карыснае заканадаўства, выкрыццё і адоленне ворагаў. (310) Усімі гэтымі справамі і ў мінулыя часы выпрабоўвалі грамадзян, а нядаўняе наша мінулае прадастаўляла сумленным і высакародным людзям шмат магчымасцей вызначыцца, але ты ж тады з ўсёю шчырасцю не імкнуўся ні да першага, ні да другога, ні да трэцяга, ні да чацвёртага, ні да пятага, ні да шостага месца, і ўвогуле ні да якога месца — нідзе не жадаў ты служыць на карысць айчыне. (311) І сапраўды, якіх саюзнікаў набыў горад тваімі намаганнямі? Каму дапамог? У каго знайшоў павагу і прыхільнасць?... Ці аказана была каму-небудзь хоць адзіная паслуга, якая дабавіла гораду нашаму добрай славы? Ці ўладкавалася дзякуючы табе хоць што-небудзь тут у нас, ці ўвогуле ў элінаў, ці ў чужых краінах? Дзе твае баявыя караблі? Дзе верфі? Дзе конніца? Дзе нанава адбудаваныя сцены? Ці прынёс ты хоць якую-небудзь карысць? Ці дапамагаў ты багатым або бедным асабістымі ці дзяржаўнымі сродкамі? Ты ўвогуле нічога не рабіў! (312) Ты мне адкажаш, што і без гэтага выказваў добранамернасць і руплівасць, а я ў цябе зноў спытаю: дзе і калі? Не, нягоднік з нягоднікаў, ты нават тады, калі ўсе, што хоць раз гаварылі з памоста, давалі грошы на выратаванне горада і калі Арыстонік аддаў апошняе, сабранае ім для аднаўлення ў правах, — дык вось, нават тады ты выкруціўся і нічога не даў, і зусім не па беднасці. Якая ж беднасць? Ты як раз

Этот электронный документ был загружен с сайта филологического факультета БГУ http://www.philology.bsu.by

атрымаў у спадчыну багацце сваяка свайго Філона, а гэта больш за 5 талантаў...

(314) Яшчэ ты тут згадваў доблесных мужоў старажытнага часу — і гэта атрымлівалася ў цябе выдатна. Аднак жа, шаноўныя афіняне, наўрад ці справядліва злоўжываць вашай павагай да памяці памерлых, каб меркаваць пра мяне, вашага сучасніка, у параўнанні з імі. (315) Кожнаму вядома, што жывым заўсёды, хоць бы спадцішка, зайздросцяць — часам больш, часам менш, — а да памерлых не адчуваюць нянавісці нават іх былыя ворагі. Так заведзена ад прыроды, але ці магчыма тады меркаваць пра мяне тут і цяпер на аснове падобных прыкладаў? Ніяк немагчыма! Не, Эсхін, твае прыклады не да месца і недобрасумленныя, а лепш параўнай жа ты мяне з самім сабой ці з адным з тваіх таварышаў, але толькі з жывым. (316) Да яшчэ падумай, што ж будзе лепшым і больш карысным для горада: усхваляць былыя подзвігі — няхай вялікія, няхай невыказна вялікія — на такую вышыню, каб сённяшнія справы засталіся ў забыцці і занядбанні, ці ўсё ж такі дазволіць усялякаму, хто робіць справу сваю старанна і сумленна, набыць ад суграмадзян гонар і прыхільнасць? (317) Аднак, калі патрэбна мне гаварыць пра ўсё гэта, то скажу, што дзяржаўныя мае справы і прадпрыемствы яўна падобныя на подзвігі праслаўленых у старажытнасці дзеячаў, ды і намеры ў мяне з імі былі аднолькавыя, а вось ты настолькі жа відавочна падобны на платных даносчыкаў тых даўніх часоў... (318) І ты яшчэ гаварыш, быццам бы я зусім не падобны на вялікіх продкаў! Ці не ты на іх падобны? ... Або хто іншы з цяперашніх балбатуноў? Вось я рашуча сцвярджаю, што на іх не падобны ўвогуле ніхто, аднак ты, ласкавы, — не буду называць цябе інакш, — ты ў сваіх разважаннях параўноўвай жывых з жывымі і сучаснікаў з сучаснікамі, пра каго б не ішла гаворка, нават пра вершатворцаў, або пра акцёраў, або пра атлетаў. (319) Няўжо Філамон, які, канешне ж, быў слабейшы за Глаўка Карыстыйскага і іншых старажытных сілачоў, пайшоў з Алімпіі без вянка? Не, ён быў абвешчаны пераможцам і атрымаў вянок, таму што змагаўся лепш за ўсіх сваіх сапраўдных сапернікаў! Дык і ты параўноўвай мяне з сучаснымі дзяржаўнымі людзьмі, параўноўваў з самім сабой і з кім табе хочацца з жывых — вось тут я і слова насуперак не скажу...

(323) Так, я не толькі не валэндаюся па плошчы, радуючыся чужым удачам і кідаючыся з віншаваннямі і рукапацісканнямі да тых, хто можа паведаміць пра мяне патрэбнаму чалавеку, але я да таго ж не дрыжу ад страху і не апускаю ўніз скорбныя вочы, калі чую добрыя для горада нашага навіны, — так, я не падобны на гэтых вось нягоднікаў. Гэта яны нясlавяць наш горад — можна падумаць, быццам тым самым яны не няслаўяць сябе! — гэта яны глядзяць у бок, усхваляючы злую долю элінаў і шчасце чужакоў, гэта яны ўгаворваюць іх зберагчы цяперашні парадак на векі вечныя. (324) Але не, не бываць гэтаму! Я прашу ўсіх багоў разам і кожнага паасобку: не дазваляйце гэтага! Лепш абудзіце ў гэтых грэшнікаў разумны сэнс і сумленнае разуменне, калі ж будуць яны непапраўныя, то зрабіце так, каб згінулі яны назаўсёды ў безданях зямных і ў безданях марскіх, а нам, хто

Этот электронный документ был загружен с сайта филологического факультета БГУ http://www.philology.bsu.by

застаўся, падаруйце найхутчэйшае пазбаўленне ад спасціглай бяды і мірнае жыццё.

**Пытанні і заданні да тэкстаў 1 і 2**

1. У чым назіраецца падабенства выкарыстаных аўтарамі рытарычных прыёмаў, якія абумоўлены агульнасцю рытарскага стылю эпохі? Менавіта хто: Дэмасфен, Эсхін ці яны абодва – звяртаецца да багоў і памяці слаўных продкаў, выкарыстоўвае паэтычныя цытаты, элементы нізкага стылю пры ацэнцы дзеянняў праціўніка і высокага – пры дэманстрацыі свайго патрыятызму, маляўнічыя параўнанні, яскравыя антытэзы паміж сабой і сваім сапернікам, рытарычныя звароты да яго і народа, іншыя разнастайныя экспрэсіўныя сінтаксічныя пабудовы? Свой адказ пацвердзіце цытатамі.

2. Ці знайшоў вялікі, паводле агульнага прызнання, рытар Дэмасфен дастойнага для сябе праціўніка ў асобе Эсхіна? Чаму Цыцэрон палічыў неабходным і карысным асабіста перакласці на лацінскую мову не толькі прамову Дэмасфена па справе “Аб вянку”, але і папярэдняе ёй выступленне Эсхіна? Якім чынам у стылі гэтага рытара адбіваецца яго акцёрскае мінулае, уплыў мовы трагедый? Ці ўражвае заключэнне прамовы Эсхіна? Чаму пасля яго выступлення суддзі хутчэй гатовы былі прыняць яго бок, чым бок Дэмасфена?

3. Знайдзіце ў фрагментах прамоў Эсхіна і Дэмасфена паралельныя адзін аднаму па сэнсу месцы, пакажыце тэмы, якія іх аб’ядноўваюць, і запішыце побач з кожнай нумары адпаведных параграфаў абодвух выступленняў. а) Хто з аўтараў выступае ў ролі абвінавальнага, а хто — абараняльнага боку: фармальна (дэ-юрэ)? рэальна (дэ-факта)? Ці можна прызнаць ўдалым выказванне прафесара С. І. Радцыга: “Дэмасфен з абвінавачанага становіцца абвінаваўцай”? б) Хто з’явіўся ініцыятарам узаемных і грубых асабістых нападкаў, змешчаных у прамовах аб вянку? Ці прынесла гэта карысць ці, наадварот, шкоду таму, хто нясе адказнасць за часам скандальны тон абмеркавання? Ці справядлівы быў бы папрок Дэмасфену ў нясціпласці, якая мяжуе з адкрытым самахвальствам? в) Ці ўдалося Эсхіну, які нядрэнна быў інфармаваны пра змест прамовы Дэмасфена, загадзя нейтралізаваць значэнне абвінавачванняў апошняга і тым самым адвесці ад сябе зваротны ўдар? Чаму? У фрагментах якіх рытараў дэманструецца вялікая фактычная насычанасць, змястоўнасць прамовы? Які не раз паўтораны рытарычны прыём дапамагае пакрэсліць гэтую яе якасць?

4. Ці можна назваць Эсхіна дэмагогам у сучасным значэнні гэтага слова? А Дэмасфена? Калі не, то як сумясціць вашы меркаванні з тым, што Дэмасфен, як і Эсхін, ніякім чынам не адмаўляецца ад узвышанага пафаса і некалькі тэатральнай афектацыі?

5. Невядомы аўтар трактата “Аб узвышаным” (I ст. н. э.), характарызуючы багатую дзеяслоўную сінаніміку ў тэксце клятвы Дэмасфена памяці продкаў, робіць цікавае назіранне, што рытар старанна пазбягае слова *перамагалі* (у той час як Эсхін — заўважым ад сябе — згадвае пра афінян былых часоў, якія *разбілі* і *адолелі* ворага): “Ён гаворыць пра

Этот электронный документ был загружен с сайта филологического факультета БГУ http://www.philology.bsu.by

воінаў, якія *ваявалі* пры Марафоне, *біліся* на моры пры Саламіне і Артэмісіі, *выступалі* пад Платэямі, аднак нідзе не называе іх пераможцамі, насупраць, усюду ён зусім выключыў нават ўпамінанне пра вынік баёў, бо...” (курсіў наш). Дапоўніце перарваную фразу сваім тлумачэннем адзначанай дэталі. Чые словы ў гэтым выпадку былі больш прыемныя для слухачоў і чаму? Хто з рытараў паказвае сябе ў гэтым сэнсе больш глыбокім псіхолагам?

6. Чыя маральная пазіцыя: Эсхіна або Дэмасфена — выклікае ў вас большую павагу, здаецца больш цвёрдай? Асоба якога рытара і дзякуючы чаму бачыцца вам больш значнай, велічнай і манументальнай? Менавіта дзе Дэмасфен дакладна вызначае сваё рытарскае крэда, абвяшчае свой грамадзянскі і рытарычны “сімвал веры”? Што, згодна са словамі Дэмасфена, павінна адыгрываць галоўную ролю для рытара: клопат пра змест ці пра форму яго прамовы? Ці з’яўляецца актуальным намаляваны Дэмасфенам вобраз ідэальнага рытара — “сумленнага і высакароднага грамадзяніна” — для нашага часу? Ці вядомы вам імёны рытараў — “класікаў” і “сучаснікаў”, якіх можна было б прызнаць адпаведнымі такому вобразу?

7. Вядомы папулярны ў старажытных аўтараў расказ пра тое, як Эсхін падаўся пасля працэсу ў выгнанне на востраў Родас і заснаваў там рытарычную школу. Аднойчы ў якасці узору ён прачытаў вучням сваю абвінавальную прамову “Аб вянку”. Зачараваныя радасцы са здзіўленнем спыталі, як жа магло здарыцца, што пасля такога добрага выступлення рытар пацярпеў няўдачу і апынуўся ў выгнанні. У адказ Эсхін сказаў: “Калі б вы чулі прамову Дэмасфена, вы бы пра гэта не пыталіся”. Як бы вы маглі больш падрабязна адказаць на пытанне радосцаў?

8. Як вы разумееце сэнс выказвання Цыцэрона: “...У Эсхіна гучнасць, у Дэмасфена магутнасць”? Ці згодны вы з такой ацэнкай? Напішыце невялікую творчую працу (па выбару) — параўнальную характарыстыку, дыпціх рытарычных партрэтаў-эсэ “Эсхін і Дэмасфен у люстэрках прамоў адзін аднаго” (падумаем: ці зусім крывыя гэтыя люстэркі?) або дыскусійнае разважанне на тэму “Рыторыка-палітычная дуэль Эсхіна і Дэмасфена: ці справядлівы прысуд народа і гісторыі?” (ці на самой справе ў дадзеным выпадку “голас народа — голас божы”?).

## Абагульняючыя пытанні і заданні

1. Вызначце, да якога роду красамоўства і канкрэтнага жанра (абвінавальная, абарончая, самаабарончая прамова) адносіцца выступленне Дэмасфена. Дакажыце прамежкавасць, сінкрэтызм родавай і жанравай прыналежнасці прамовы.

2. Як вядома, да антычнасці ўзыходзіць традыцыя падзялення доказаў, якія выкарыстоўваюць рытары ў працэсе вынаходства прамовы, на дзве буйныя групы: 1) простыя, натуральныя, відавочныя (у тэрміналогіі Арыстоцеля — нетэхнічныя), якія ў ідэале па сваёй прыродзе павінны гаварыць самі за сябе і адрозніваюцца высокай ступенню дакладнасці (фактычны і дакументальны матэрыял); 2) ускосныя, штучныя, гіпатэтычныя

Этот электронный документ был загружен с сайта филологического факультета БГУ http://www.philology.bsu.by

(тэхнічныя) — здагадкі рытара, якія маюць толькі адносную ступень праўдападобнасці. Колькі выпадкаў выкарыстання доказаў 1-га тыпу налічваецца ў прыведзеных ніжэй вытрымках з прамовы Дэмасфена? Дакажыце, што гэтыя аргументы з'яўляюцца разнастайнымі па сваім характары.

(221) Што ж да мяне самога, то я зноў жа быў упэўнены — а калі і памыляўся, дык шчыра, — такім чынам, я быў упэўнены, што ні пастановы ніхто лепш за мяне не напіша, ні справы лепш не зробіць, ні пасольскай пасады не выканае больш старанна і сумленна. Таму я і браў на сябе ўсе прызначэнні. Прачытай лісты Філіпа. [Чытаюцца лісты] (222) Чуеш, Эсхін? Вось куды загнаў я Філіпа, вось якім голасам ён гаварыў — а да таго ж сказаў столькі дзёрзкіх прамоў супраць нашага горада! За такія справы суграмадзяне па справядлівасці ўзнагародзілі мяне вянком, і ты быў тут, але не пярэчыў, а Дыёнд, які абжалаваў пастанаўленне, не сабраў патрэбнай колькасці судзейскіх каменьчыкаў. Прачытай, сакратар, гэтыя пацвержаныя судом пастановы, якія ён нават не абжалаваў. [Чытаюцца пастановы].

(267) А цяпер, сакратар, нясі сюды сведкавыя паказанні аб выкананых мной грамадскіх павіннасцях, я іх абвяшчу... Чытай пасведчанне. [Чытаюцца сведкавыя паказанні.] (268) Вось які я ў гарадскіх справах, што ж тычыцца прыватных спраў, дык калі яшчэ не ўсім вам вядома, які я пачцівы і дружалюбны і заўсёды гатовы дапамагчы ў бядзе, тады мне застаецца маўчаць...

У сваёй прамове "Супраць Ктэсіфонта аб вянку" Эсхін іранізуе над адным з выступленняў Дэмасфена менавіта таму, што апошні ў канцы спаслаўся на пастанову (псефісму), даўжэйшую за "Іліяду" (100). Які рытарычны прыём дазволіў Эсхіну, згусціўшы фарбы, зрабіць ухмылку над Дэмасфенам асабліва атрутнай? Чаму, аднак, у адказнай прамове Дэмасфен не толькі не адмовіўся ад цытавання законаў і пастаноў, але і выкарыстаў нетэхнічныя доказы вельмі шырока — усяго больш за 40 разоў, рызыкуючы стаміць слухачоў гэткім "сухім і сумным" матэрыялам? Ці паслабляе гэта, на ваш погляд, пераканаўчасць прамовы; якія якасці надае тэксту? Чаму сучасныя даследчыкі шкадуюць, што многія з дакументальных уставак Дэмасфена страчаны ці падменены больш познімі рэканструкцыямі рэдактара рукапісаў (ці толькі філалагічны інтарэс прадстаўляюць сабой гэтыя ўкрапленні)?

3. 1) Ці спраўдзіліся разлікі Эсхіна на выгаднасць для яго адтэрміноўкі дадзенага судовага разбіральніцтва? Ці схілялася грамадскае меркаванне афінян у выбраны ім момант на бок македонцаў? Якія пункты абвінавачвання Эсхіна страцілі да моманту слухання справы сваю злабадзённасць?

2) Для тонка прадуманай кампазіцыі прамовы характэрна наступнае: адсоўваючы ў цень нявыйгрышныя для яго юрыдычныя падрабязнасці справы, на аснове якіх фармальная правата аказвалася на баку Эсхіна, Дэмасфен, паводле слоў старажытнага каментатара, як умелы стратэг, перагрупоўвае свае войскі, размяшчаючы пытанні, якія асвятляюцца, у

Этот электронный документ был загружен с сайта филологического факультета БГУ http://www.philology.bsu.by

выгадным для сябе парадку — пачынаючы з агляду сваёй палітычнай дзейнасці, у якім паказаў лепшыя і высакародныя рысы сваёй натуры, і ім жа заканчваючы. а) Запішыце нумарацыю пунктаў абвінавачвання Эсхіна ў той паслядоўнасці, у якой іх абвяргае Дэмасфен. б) Вызначце, якому з прыведзеных апісанняў адпавядае размяшчэнне ў прамове аргументаў на карысць невінаватасці Ктэсіфонта і Дэмасфена. У чым гэта праяўляецца?

а) ад найбольш моцных цераз
сярэднія да больш слабых
б) ад больш слабых цераз
сярэднія да найбольш моцных
в) ад больш слабых цераз
найбольш моцныя да сярэдніх
г) ад сярэдніх цераз больш
слабыя да найбольш моцных

4. Якую сапраўдную стылёвую рысу, уласцівую некаторым з прамоў Дэмасфена, заўважыў Эсхін, называючы яго "чалавекам, у якога няма нічога, акрамя слоў, напышлівых і з'едлівых" (229)? Вылучыце ў прыведзеных кантэкстах словы, якія маюць (узвышаную ці заніжаную) эмацыянальна-стылістычную афарбоўку, і дакажыце правільнасць свайго меркавання: улічваючы, што стылістычнае адценне значэння слова — з'ява адносная, падбярыце да кожнай з лексем нейтральны сінонім. Растлумачце, якімі асаблівасцямі зместу прамовы матывавана няроўнасць яе стылю — стылёвая арытмія, даходзячая да рэзкага стылістычнага кантрасту.

1) ...Малю я найбольш дзеля вас, дзеля набожнасці вашай і славы, да прымусяць вас богі не слухаць парад абвінаваўцы — сапраўды гэта абуральна! — але кіравацца законам і прысягай... (1—2) 2) Вось і што тычыцца асабістых маіх абставін уж колькі набрахаў ён тут на мяне дрэннага... (10). 3) Такім чынам, з дапамогай маёй дзяржаўнай дальнабачнасці мы тады... не толькі здабылі славу айчыне, але яшчэ і даказалі усяму чалавецтву сваю сумленнасць і Філіпаву подласць (93). 4) ....Памятаючы пра шматлікія і вялікія справы айчыны, якая заўсёды гатова змагацца дзеля чужога дабрабыту, што ж павінен быў я раіць і гаварыць грамадзянам, калі гаворка пачалася... пра іх асабістую выгаду? (101) 5) ...Сама ўдзячнасць яшчэ больш высокапахвальная за заслугі таго, каго вянчаюць, так што не дарэмна ў нас ёсць свой закон (120). 6) Ты тут крычыш усялякія словы, якія трэба і не трэба... (122). 7) Аднак ты па самой прыродзе сваёй настолькі нізкі і подлы, што, стаўшы з дапамогай гэтых вось людзей з раба свабодным і з галадранца багатым, зусім не адчуваеш да іх удзячнасці... (131). 8) Урэшце, калі не прапаноўваў ён пастаноў, ці значыць гэта, быццам ён маўчаў, калі было магчыма хоць як-небудзь нашкодзіць? (140). 9) ...Калі хто лічыць сябе народжаным толькі для бацькоў, той чакае смерці, наканаванай прыродай, а хто лічыць сябе народжаным таксама і для айчыны, той гатовы памерці, толькі б не бачыць яе зняволенай... (256) 10) ...Паколькі ты, Эсхін, абавязкова жадаеш пагаварыць пра мой лёс, дык параўноўвай яго са сваім, а калі высветліцца, што мой лепшы, то не абгаворвай яго (256). 11)

Этот электронный документ был загружен с сайта филологического факультета БГУ http://www.philology.bsu.by

Ты дрэнны грамадзянін і дрэнны скамарох (267). 12) Так пры гэтым ведайце, што я, каб пазбегнуць чыей-небудзь зайдрасці, вельмі прыніжаю ў сваім расказе веліч створанага... (305).

5. Характэрнымі для стылю Дэмасфена прызнаюцца так званыя сінанімічныя падваенні (дыяды) — аб'яднанні блізкіх па значэнні слоў у пары з дапамогай злучальнага саюза. Ці не супярэчыць такая прыкмета слоўнага перабольшання меркаванню рымскага рытара I ст. н. э. Квінтыліяна пра тое, што ў Дэмасфена "нельга нічога забраць"? Які сэнсавы і рытмічны эфект дасягаецца шляхам выкарыстання названага прыёма?

а) Выпішыце з прыведзеных ніжэй сказаў, узятых з прамовы "За Ктэсіфонта аб вянку", сінанімічныя пары.

1) Дык такая жа прырода чалавечая, што лаянку людзям слухаць салодка, а калі хто сам сябе возьмецца хваліць, дык гэта ім непрыемна... (3) 2) ...Аднак калі б усе абвінавачванні і паклёпы, выказаныя абвінавальнікам, аказаліся праўдзівыя, то ўсё ж такі ўсякаму дадзена неад'емнае права звярнуцца да народа і выказацца (12—13). 3) За гэта вы справядліва і верна на іх [астатніх элінаў] асердзіліся і з ахвотаю паслухалі Філіпа... (19). 4) Такім чынам, у справе з пасольствам Філіп упершыню падмануў, а гэтыя вось злачынцы ўпершыню яму прадаліся, — і я зноў пацвярджаю, што і тады і цяпер не пераставаў спрачацца і пярэчыць ім па гэтай прычыне (31). 5) Сапраўды, калі б Філіп усякі раз, атрымаўшы перамогу, неадкладна адыходзіў і потым сядзеў спакойна, ніяк і нічым не ўшчамляючы ні сваіх саюзнікаў, ні іншых элінаў, тады можна было б хоць па некаторых прычынах папракаць і лаяць яго праціўнікаў, — але ўсё здаралася не так! (65) 6) Няўжо ты, Эсхін, настолькі тупы і глупы, каб не здагадацца, што таму, каго вянчаюць, вянок заўсёды ў радасць, дзе пра тое не абвяшчалі б, і што ўзнагароджанне ў тэатры робіцца дзеля таго, хто вянчае? (120) 7) І усё ж такі, хоць здрадніцтва тваё і раней было відавочна і несумненна, а потым ва ўжо згаданых абставінах ты сам сябе выкрыў, ты цяпер папракаеш мяне ў тым, у чым разумна было б абвінавачваць усіх астатніх (284).

б) Дапоўніце пачатыя сінанімічныя пары ва ўрыўках з прамовы "За Ктэсіфонта аб вянку" падыходзячымі па сэнсу і стылістычнай танальнасці словамі (гэта дапаможа вам праверыць і пашырыць багацце вашага лексікону).

1) ...Усякая страта для чалавека журботная і (___), а асабліва калі віною таму злозычлівец, але горш за ўсё страціць вашу добрапрыхільнасць і (___). 2) Ужо са сказанага вышэй бачна, што і ўсе іншыя яго абвінавачванні будуць такімі жа несумленнымі і (___). 3) ...Паміж усімі — і тымі і гэтымі — пачаўся разлад і (___), якія ніяк не маглі вырашыцца. 4) Пра ўсё гэта я гавару гэтак шматслоўна і (___) толькі праўды дзеля... 5) ...Заставалася толькі адно — па справядлівасці супраціўляцца ўсім несправядлівасцям, якія рабіў ён супраць вас, і менавіта гэта вы рабілі з самага пачатку ўсімі дарэчнымі і (___) спосабамі. 6) ...Ніколі не рабіў я нічога зневажальнага і (___) для горада. 7) ...Вось гэты паклёпнік пачаў крычаць і (___), што я быццам жорстка абражаю народамаральнасць... 8) ...Усім людзям, якім давялося жыць у наш час, лёс

Этот электронный документ был загружен с сайта филологического факультета БГУ http://www.philology.bsu.by

выпаў цяжкі і (___). 9) Гэта маё меркаванне пра лёс і мне — упэўнены, што і вам таксама, — яно здаецца правільным і (___). 10) Ці, па-твойму, усе тут моцна спяць і да таго нічога не помняць, што забыліся, якія словы гаварыў ты, ці або падчас вайны, калі кляўся і (___), быццам няма ў цябе з Філіпам нічога агульнага?...

6. Ніжэй прыводзіцца падборка фрагментаў з прамовы Дэмасфена, якія сталі любімымі хрэстаматыйнымі прыкладамі ў рыторыках пазнейшага часу. Назавіце, якія канкрэтна рытарычныя сродкі маглі адлюстроўвацца ў гэтых урыўках.

1) Калі ўсе вы адобрылі і ніхто ні слова не запярэчыў на гэта, дык я не толькі заявіў гэта, але і напісаў сваю прапанову, не толькі напісаў, але і паехаў паслом, не толькі паехаў паслом, але і пераканаў фіванцаў, — не, я прайшоў праз усе выпрабаванні ад пачатку да канца і аддаваў сябе за вас рашуча ва ўсіх небяспечнасцях, якія напаткалі дзяржаву (179). 2) Ты служыў пры школе — я вучыўся ў школе, ты пасвячаў у таінствы — я спасцігаў таінствы, ты запісваў за іншымі — я засядаў і вырашаў, ты іграў трэція ролі — я глядзеў паказы, ты правальваўся — я абсвістваў, ты дапамагаў ворагам — я працаваў дзеля айчыны (265). 3) ...Усе яны — нягоднікі, падхалімы, пагібель роду чалавечага, бо кожны з іх знявечыў сваю айчыну, прапіў свабоду з Філіпам, а цяпер прапівае з Аляксандрам, вымярае шчасце абжорствам і юрам, топча вольнасць і незалежнасць, якія ў мінулыя часы былі для элінаў узорам дабра (296).

а) Да якога з урыўкаў адносіцца каментарый аўтара трактата “Аб узвышаным”, дзе ёсць разважанні пра дапушчальнасць выключэнняў з рытарычнага правіла, якім прадпісваецца абмежавацца дзвюма, у крайнім выпадку трыма суседнімі метафарамі, каб пазбегнуць ненатуральнага і хаатычнага нагрувашчвання вобразаў: “Метафары да месца толькі там, дзе пачуцці, разліваючыся бурным патокам, падхопліваюць і клічуць за сабой. У гэтым пытанні вяршыняй з’яўляецца той жа Дэмасфен... Гнеў рытара на здраднікаў радзімы адсоўвае і засланяе сабой усё багацце мастацкіх прыёмаў”?

б) Які з урыўкаў і прыёмаў стаў аб’ектам для пераймання Цыцэрона ў наступным кантэксце з прамовы “У абарону Ціта Анія Мілона”: “І ён жа [Мілон] паўстаў не толькі перад народам, але і перад сенатам і не толькі перад сенатам, але і перад узброенай дзяржаўнай аховай, якую выставіла дзяржава, і даверыўся не толькі ёй, але таксама і ўладзе таго чалавека, якому сенат даўно даручыў усю дзяржаву, усю моладзь Італіі, усе ўзброеныя сілы рымскага народа” (61)?

## ТРАКТАТ “РЫТОРЫКА” АРЫСТОЦЕЛЯ

### Тэкст 1

(1358а) Ёсць тры віды рыторыкі, таму што ёсць столькі ж родаў слухачоў. Прамова складаецца з трох элементаў: з самога рытара, (б) з прадмета, пра які ён гаворыць, і з асобы, да якой ён звяртаецца; яна і ёсць канчатковая мэта ўсяго (я разумею слухача). Слухач звычайна бывае або

Этот электронный документ был загружен с сайта филологического факультета БГУ http://www.philology.bsu.by

простым глядачом, або суддзёй, і прычым суддзёй або таго, што ўжо здзейснілася, або таго, што можа здзейсніцца. Прыкладам чалавека, які разважае пра тое, што мае быць, можа служыць член народнага сходу, а прыкладам таго, хто разважае пра тое, што ўжо было, — член суда; чалавек, які звяртае ўвагу [толькі] на дараванне [рытара], ёсць просты глядач. Такім чынам, натуральна існуюць тры роды рытарычных прамоў: дарадчыя, судовыя і эпідэйктычныя. Справа прамоў дарадчых — схіляць або адхіляць, таму што як людзі, якім даводзіцца раіцца ў прыватным жыцці, так і рытары, якія выступаюць публічна, робяць адно з двух [або схіляюць, або адхіляюць].

Што тычыцца судовых прамоў, то справа іх — абвінавачваць або апраўдваць, таму што цяжэбнікі заўсёды робяць абавязкова адное што-небудзь з двух [або абвінавачваюць, або апраўдваюцца].

Справа эпідэйктычнай прамовы — хваліць або ганьбаваць. Што тычыцца часу, якое мае на ўвазе кожны з пазначаных родаў прамовы, то чалавек, раючыся, мае на ўвазе будучы: адхіляючы ад чаго-небудзь ці схіляючы да чаго-небудзь, ён дае парады адносна будучага. Цяжэбнік мае справу з мінулым часам, таму што заўсёды з-за падзей, якія здзейсніліся, адзін абвінавачвае, а другі абараняецца. Для эпідэйктычнага рытара найбольш важным з'яўляецца цяперашні час, таму што кожны хваліць ці ганьбіць з-за таго, што існуе; урэшце, рытары часта карыстаюцца і іншым часам, успамінаючы мінулае або будуючы сказы адносна будучага. У кожнага з гэтых родаў прамоў розная мэта, і паколькі ёсць тры роды прамоў, то існуюць і тры розныя мэты: у чалавека, які дае параду, мэта — карысць і шкода: адзін дае параду, падштурхоўваючы да лепшага, іншы адгаворвае, адхіляючы ад горшага; астатнія меркаванні, менавіта: справядлівае і несправядлівае, цудоўнае і саромнае — тут на другім плане.

Цяжэбнікі ставяць за мэту справядлівае і несправядлівае, але і яны далучаюць да гэтага іншыя меркаванні.

Для людзей, якія хваляць ці ганьбяць мэтай служыць цудоўнае і саромнае; але тут таксама маюцца на ўвазе іншыя меркаванні.

Доказам таму, што для кожнага роду прамоў існуе менавіта названая намі мэта, служыць тыя абставіны, што ў дачыненні да астатніх пунктаў у некаторых выпадках і не спрачаюцца; напрыклад, цяжэбнік часам аспрэчвае тое, што нейкі факт сапраўды меў месца або што гэты факт сапраўды прычыніў шкоду, але ён ніколі не згадзіцца, што здзейсніў несправядлівую справу, таму што ў такім выпадку ніякі суд не быў бы патрэбны.

Таксама і рытары, якія даюць парады, у астатнім часта робяць уступкі, але ніколі не прызнаюцца, што раяць бескарыснае ці адхіляюць ад карыснага; напрыклад, яны часта не звяртаюць ніякай увагі на тое, што несправядліва занявольваць суседзей ці людзей, якія не зрабілі ім нічога дрэннага. Таксама і рытары, якія хваляць ці ганьбяць, не глядзяць на тое, ці зрабіў гэты чалавек што-небудзь карыснае ці шкоднае, але нават часта ставіць яму ў заслугу, што, не звяртаючы ўвагі на сваю карысць, ён зрабіў што-небудзь цудоўнае; напрыклад, усхваляюць Ахіла за тое, што ён дапамог свайму сябру Патроклу, ведаючы, што яму самому наканавана пры гэтым памерці[1], між іншым як у

Этот электронный документ был загружен с сайта филологического факультета БГУ http://www.philology.bsu.by

яго была вялікая магчымасць жыць. Для яго такая смерць ўяўляецца чымсьці больш цудоўным, а жыццё чымсьці карысным.

Са сказанага бачна, што перш за ўсё неабходна ведаць пасылкі кожнага з указаных родаў прамоў у асобнасці, таму што доказы, верагоднасці і прыкметы — пасылкі рыторыкі... Паколькі не магло здзейсніцца ў мінулым і не можа здзейсніцца ў будучым што-небудзь немагчымае, а [заўсёды здзяйсняецца толькі] магчымае і паколькі не магло здзейсніцца ў мінулым тое, што не адбывалася, таксама, як не можа быць у будучым зроблена што-небудзь такое, чаго не будзе, то неабходна рытару, як таму хто дае парады, так і таму, хто вымаўляе судовыя ці эпідэйктычныя прамовы, мець напагатове пасылкі аб магчымым і немагчымым, пра тое, ці было што-небудзь ці не было, будзе ці не будзе.

Акрамя таго, паколькі ўсе рытары, як той, хто хваліць ці ганьбіць, так і той, хто ўгаворвае ці адгаворвае, а таксама і той, хто абвінавачвае ці апраўдвае, не толькі імкнуцца даказаць што-небудзь, але і стараюцца паказаць веліч або нікчэмнасць дабра або зла, цудоўнага або саромнага, справядлівага або несправядлівага, разглядаючы пры гэтым прадметы ў дачыненні да іх саміх, або супастаўляючы іх адзін аднаму. Маючы на ўвазе ўсё гэта, відавочна, што трэба мець напагатове пасылкі як агульнага, так і прыватнага характару ў дачыненні да вялікасці і нікчэмнасці і ў дачыненні да большага і меншага, напрыклад, у дачыненні таго, што можна назваць большым ці меншым дабром, або большым ці меншым злачынствам, або больш ці менш справядлівым дзеяннем; так жа і ў дачыненні да астатніх прадметаў.

[1] Пра гэта Ахіл даведаўся ад сваёй маці, марской багіні Фетыды; блізкую пагібель прадказаў Ахілу чалавечым голасам і яго бессмяротны конь Ксанф.

...Неабходна параўноўваць чалавека з людзьмі знакамітымі, таму што калі ён будзе лепшы за людзей, дастойных павагі, яго годнасць ад гэтага выйграе. Перавышэнне па справядлівасці выкарыстоўваецца пры пахвалах, таму што пахвала мае справу з паняццем перавагі, а перавага належыць да ліку рэчаў цудоўных, таму калі нельга параўноўваць чалавека са знакамітымі людзьмі, трэба супастаўляць яго ўвогуле з іншымі людзьмі, таму што перавага служыць прыкметай дабрачыннасці. Увогуле з прыёмаў, якія аднолькава належаць усім [тром] родам прамоў, перабольшанне больш усяго падыходзіць да прамоў эпідэйктычных, таму што тут рытар мае справу з дзеяннямі, прызнанымі за бясспрэчны факт; яму застаецца толькі надаць ім веліч і прыгажосць. Што тычыцца прыкладаў, то яны найбольш падыходзяць да прамоў дарадчых, таму што мы выказваем меркаванні пра будучае, робячы здагадкі на аснове мінулага. Энтымемы, наадварот, [найбольш прыдатныя] для прамоў судовых, таму што мінулае, па прычыне сваёй няяснасці, асабліва патрабуе ўказання прычыны і доказаў.

Этот электронный документ был загружен с сайта филологического факультета БГУ http://www.philology.bsu.by

**Пытанні і заданні да тэксту 1**

1. З якой па ліку кнігі арыстоцелеўскай рыторыкі, судзячы па яго тэматыцы, запазычаны прыведзены ўрывак?

2. Карыстаючыся сучаснай тэрміналогіяй аналізу, начарціце і запоўніце заснаваную на прачытаным вамі фрагменце табліцу "Характарыстыка розных відаў красамоўства (па Арыстоцелю)", якая будзе мець наступныя графы:

| Роды (віды) красамоўства | Катэгорыі слухачоў | Задачы прамовы | Этычныя паняцці прамовы | Пануючая часовая суаднесенасць | Асноўны з канкрэтных прыёмаў доказу |
|---|---|---|---|---|---|
| | | | | | |

3. Які з родаў красамоўства, грунтуючыся на ўсталяванай Арыстоцелем сувязі паміж родавай прыналежнасцю прамовы і пераважнай часовай аднесенасцю яе зместу, з'яўляецца самым цяжкім? (Разважаючы на гэту тэму, улічвайце, што пры наступным разглядзе вызначанага пытання Арыстоцель цытуе з'едліва-іранічную заўвагу мудраца Эпіменіда Крыцкага: "Мінулае робіцца вядомым нават прарокам".)

4. Як вы думаеце, які з родаў красамоўства, сыходзячы са своеасаблівасці ўзроставай псіхалогіі, уяўляўся Арыстоцелю асабліва цікавым для юнацкай аўдыторыі, калі мець на ўвазе меркаванне філосафа пра тое, што юнакі жывуць больш сэрцам, чым разлікам? Ці адпавядаюць, на ваш погляд, думкі Арыстоцеля інтарэсам і запытам сучаснай моладзі? Аргументуйце каштоўнасць выступленняў названага вамі тыпу для маральнага развіцця слухачоў.

5. У чым, на аснове рэкамендацый самога Арыстоцеля, бачыцца вам практычная каштоўнасць праведзенай ім класіфікацыі?

а) Рытару, які рыхтуе прамову, вельмі пажадана, на думку Арыстоцеля, свабодна арыентавацца ў этычнай праблематыцы, звязанай з асноўнымі для дадзенага роду красамоўства маральнымі катэгорыямі: гэта дазволіць яму назапасіць дарэчныя "дамашнія нарыхтоўкі" ў выглядзе пасылак адносна станоўчай і адмоўнай накіраванасці паводзін. Для нас таксама карысна ўсвядоміць сутнасць ключавых для пэўных відаў прамоў паняццяў, паколькі апошнія ўяўляюць сабой "кропкі адліку", якія ляжаць у аснове зместу рытарычных твораў, галоўныя ацэначныя параметры, якія ў іх выкарыстоўваюцца. Суаднясіце прапанаваныя Арыстоцелем значэнні з назвамі адпаведных кожнаму з трох родаў красамоўства катэгорый: 1) дабра (бо карыснае ёсць дабро, а шкоднае — зло); 2) справядлівасці; 3) цудоўнага.

1) "Такая дабрачыннасць, у сілу якой кожны валодае тым, што яму належыць, і так, як загадвае"; 2) "Нешта такое, што пажадана само па сабе, ...тое, што адпавядае ўказанням розуму; ...нешта такое, прысутнасць чаго робіць чалавека спакойным і самазадаволеным"; 3) "Тое, што будучы жаданым само па сабе, заслугоўвае яшчэ і пахвалы".

Этот электронный документ был загружен с сайта филологического факультета БГУ http://www.philology.bsu.by

б) Згрупуйце антычныя афарызмы ў залежнасці ад родавай прыналежнасці выступленняў, для падрыхтоўкі якога дадзенае выказванне перш за ўсё магло б спатрэбіцца ў якасці пасылкі. Якія этычныя катэгорыі служаць крытэрыямі ацэнкі індывідуальных і сацыяльных паводзін людзей у кожным з выпадкаў?

1) Учынкі, адпаведныя дабрачыннасці, цудоўныя і адбываюцца ў імя цудоўнага (Арыстоцель). 2) Несправядліва нават справядлівае рашэнне, калі суддзя бакі не выслухаў (Сенека). 3) ...Найлепшай крыніцай даходу як у прыватных гаспадарках, так і ў дзяржаве я лічу беражлівасць (Цыцэрон). 4) Аднолькавая бязлітаснасць — не даравац нікому і даравац усім (Публілій Сір — рымскі паэт I ст. да н. э., родам з Сірыі). 5) Доблесць жа не патрабуе іншай узнагароды за сваю працу, акрамя ўзнагароды ў выглядзе пахвалы і славы... (Цыцэрон). 6) Неабходна доўга рыхтавацца да вайны, каб хутчэй перамачы (Публілій Сір). 7) Самаму несправядліваму міру я аддаў бы перавагу самай справядлівай вайне (Цыцэрон).

## Тэкст 2

Годнасць стылю заключаецца ў яснасці; доказам гэтага служыць тое, што, калі прамова няясная, яна не дасягае сваёй мэты. [Стыль не павінен быць] ні вельмі нізкім, ні вельмі высокім, але павінен адпавядаць [прадмету прамовы]; і паэтычны стыль, канешне, не нізкі, але ён не адпавядае рытарскай прамове. З імёнаў і дзеясловаў тыя адрозніваюцца яснасцю, якія ўвайшлі ва ўсеагульнае ўжыванне. Іншыя імёны, якія мы пералічылі ў творы, што тычыцца паэтычнага мастацтва[1], робяць прамову не нізкай, але ўпрыгожанай, бо адступленне [ад мовы звычайнай] спрыяе таму, што прамова здаецца больш урачыстай: бо людзі так жа ставяцца да стылю, як да

[1] Маецца на ўвазе трактат Арыстоцеля “Паэтыка”.

іншаземцаў і сваіх суграмадзян. Таму і неабходна надаваць мове характар іншаземнага, бо людзі схільны здзіўляцца таму, што [прыходзіць здалёк], а тое, што здзіўляе, – прыемна. У вершах шмат уздзейнага і вартага, [гэта значыць у паэзіі], таму што прадметы і асобы, пра якія [там] ідзе гаворка, больш аддаленыя [ад жыццёвай прозы]. Але ў празаічнай мове такіх сродкаў намнога менш, таму што прадмет іх менш узвялічаны; тут было б яшчэ больш непрыстойна, калі раб, ці чалавек вельмі малады, ці той, хто паведамляе пра нікчэмныя прадметы, гаварыў бы ўзнятым стылем. Але і тут трэба гаварыць то прыніжаючы, то ўзвышаючы стыль, адпаведна [з трактаваным прадметам], і гэта трэба рабіць незаўважна, быццам бы гаворыш не штучна, а натуральна, таму што натуральнае здольна пераконваць, а штучнае наадварот. [Людзі] недаверліва ставяцца да такога [рытара], як быццам бы ён задумвае [што-небудзь супраць іх], таксама, як да падмешаных він. [Стыль рытара павінен быць такім], якім быў голас Феадора[2] ў параўнанні з галасамі іншых акцёраў: яго голас здаваўся голасам таго чалавека, які гаварыў, а іх галасы гучалі зусім як чужыя.

Этот электронный документ был загружен с сайта филологического факультета БГУ http://www.philology.bsu.by

## Пытанні і заданні да тэксту 2

1. Вызначце, менавіта якую кнігу трактата Арыстоцеля прадстаўляе дадзены фрагмент? Чаму вы так вырашылі? Якая яшчэ якасць стылю, акрамя яснасці, вылучаецца ва ўрыўку як патрабуючае асаблівай ўвагі рытара? Выберыце для яго адпаведныя назвы з сучаснага спісу найбольш важных камунікатыўных якасцей: *правільнасць, дакладнасць, лагічнасць, чысціня, багацце, выразнасць, дарэчнасць*. Ці захоўваюць сваю актуальнасць выказаныя тут рытарам палажэнні і пажаданні?
2. Які рытарычны сродак надае выступленню яркасць, жвавасць і захапляльнасць і спрыяе яго папулярызацыі? Колькі разоў выкарыстоўваецца гэты прыём?

## Тэкст 3

Халоднасць стылю можа паходзіць.., па-першае, ад ужывання складаных слоў. Вось у чым заключаецца першая прычына [халоднасці стылю]. Другая – ва ўжыванні эпітэтаў або доўгіх, або недарэчных, або ў вялікай колькасці; у паэзіі, напрыклад, магчыма называць малако белым, у прозе жа [такія эпітэты] зусім недарэчныя; калі іх вельмі шмат, яны паказваюць [рытарычную штучнасць] і даказваюць, што паколькі імі трэба карыстацца, гэта ёсць ужо паэзія, бо ўжыванні іх змяняе звычайны характар мовы і надае стылю адценне нечага чужога. У гэтых адносінах трэба імкнуцца да ўмеранасці, таму што [няўмеранасць тут] ёсць большае зло, чым мова простая, [гэта значыць без эпітэтаў]: у апошнім выпадку мова не мае годнасці, а ў першым яна заключае недахоп. Вось чаму творы Алкідаманта здаюцца халоднымі: ён ужывае эпітэты не як прыправу, а як ежу, бо ў яго яны частыя, перабольшаныя і кідаюцца ў вочы... Урэшце, ... [прычына, ад якой, можа, паходзіць] халоднасць стылю, заключаецца ў метафарах. Ёсць метафары, якія не трэба ўжываць, — адныя таму, што [яны маюць] смешны сэнс, вось чаму і аўтары камедый ужываюць метафары іншыя таму, што сэнс іх вельмі ўрачысты і трагічны; акрамя таго, [метафары маюць] няясны сэнс, калі [яны запазычаны] здалёк...

[2] Феадор — праслаўлены ў Старажытнай Грэцыі трагічны акцёр.

## Пытанні і заданні да тэксту 3

1. Пазначце, да якой з кніг “Рыторыкі” Арыстоцеля можна аднесці па зместу дадзены фрагмент.
2. Занатуйце дадзены ўрывак, выкарыстоўваючы табліцу:

| Магчымыя прычыны халоднасці (напышлівасці) стылю | Ілюстрацыі з выступленняў сафістаў |
|---|---|

Правую графу запоўніце прыкадамі, падабранымі Арыстоцелем: “шматтварнае неба высокавяршыннай зямлі” (Лікафрон); “змрочны душэўны клопат” (Алкімадант); “твар, які робіцца вогнекаляровым” (Алкімадант); “ты ў гэтай справе пасеяў ганьбу і пажаў няшчасце” (Горгій); “вільготны пот”

Этот электронный документ был загружен с сайта филологического факультета БГУ http://www.philology.bsu.by

(Алкімадант); “вузкадарожны бераг” (Лікафрон); “цёмнакаляровая марская паверхня” (Алкімадант).

3. Якое з выказванняў Арыстоцеля гучыць афарыстычна і шырока цытуецца? Які рытарычны прыём робіць названую вамі фразу дасціпнай і меткай? Ці не прыняло самога Арыстоцеля выкарыстанне дадзенага прыёма да халоднасці стылю? Чаму вы так мяркуеце?

## Абагульняючыя пытанні і заданні па трактату “Рыторыка”

*“Рыторыка”*
*Арыстоцеля*
*аб прыёмах пераканання*

Прачытайце блізкі да тэксту Арыстоцеля пераказ змешчаных у трактаце прыкладаў. Вызначце, да якога роду красамоўства належыць кожны фрагмент, які з прыёмаў пераканання ляжыць у аснове аргументацыі ў кожным выпадку.

1. Нехта, усхваляючы Ахіла, падкрэслівае, што той перамог у паядынку і забіў Гектара, лепшага з траянцаў, а таксама — што ён пайшоў у паход на Трою, будучы самым маладым з цароў і не будучы звязаным клятвай жаніхоў Алены Прыгожай дапамагаць яе выбранніку.

2. Адзін з цяжэбнікаў заяўляе: “Мой праціўнік гаворыць, што ён адданы народу. Не верце яму: ён не любіць народ, бо ён удзельнічаў у змове Трыццаці тыранаў”.

3. Калі жыхары сіцылійскага горада Гімеры выбралі Фаларыда (будучага тырана, які спальваў асуджаных у медным быку) палкаводцам з неабмежаванай уладай і хацелі даць яму целаахоўнікаў, паэт Стэсіхор, прыводзячы розныя довады супраць гэтага, расказаў ім таксама пра тое, як у старажытныя часы нейкі конь валодаў пашай. Калі прыйшоў алень і пачаў таптаць і сапсаваць пашу, конь, жадаючы адпомсціць аленю, спытаў нейкага чалавека, ці не можа ён пасадзейнічаць яму ў гэтым. Той адказаў, што можа, калі возьме абродзь і сам сядзе на яго, з кап’ём у руцэ. Калі конь згадзіўся на гэта, то замест таго, каб адпомсціць аленю, апынуўся ў рабстве.

1) Выпішыце заключаную ў адным з прыкладаў энтымему. Прааналізуйце яе структуру, вылучыўшы суджэнне-пасылку і суджэнне-заключэнне. Аднавіце прапушчаную абагульняльную пасылку.

2) Да якога старажытнага літаратурнага жанра належыць гісторыя, расказаная Стэсіхорам? Дапішыце канчатак прамовы Стэсіхора, сфармуляваўшы мараль апавядання.

*“Рыторыка”*
*Арыстоцеля*
*аб метафарах*

Зрабіце сэнсавы аналіз метафар, падабраных Арыстоцелем у якасці прыкладаў, вылучыўшы ў іх: тое, *што* параўноўваецца (літаральную рамку метафары), і тое, з *чым* параўноўваецца (метафарычны фокус). Які з

Этот электронный документ был загружен с сайта филологического факультета БГУ http://www.philology.bsu.by

прыкладаў вам здаецца найбольш удалым? Ці выяўляе Арыстоцель густ і патрабавальнасць пры падборы наглядных, "вытанчаных і удалых" моўных ілюстрацый для свайго трактату?

1. Сучаснік Арыстоцеля, палітычны дзеяч Піфалай называў паралу (афінскі карабель, які служыў месцам знаходжання начальніка флота падчас вайны) "булавой народа".

2. Палітык Лептын заклікаў Афіны дапамагчы Спарце. Ён гаварыў, што нельга дапусціць, каб Элада зрабілася сляпой на адно вока.

3. Рытар Кефісадот, выкрываючы карысталюбівага палкаводца, які не змог адбіць атаку Філіпа Македонскага, але пасняшаўся зрабіць справаздачу пра ход вайны, гаварыў, што той імкнуўся зрабіць справаздачу, калі ўвесь народ знаходзіўся "ў катле".

4. Знакаміты ў антычнасці рытар Ісакрат гаварыў, што мірны дагавор — трафей значна больш каштоўны, чым трафей, які атрыманы на вайне.

*"Рыторыка"*
*Арыстоцеля*
*аб перыфразах*

Арыстоцель звяртае ўвагу на тое, што апісальная назва аднаго і таго ж прадмета, з'явы, якасці можа падкрэсліваць як яго станоўчую, так і адмоўную ролю. Вялікі рытар раіць шырока выкарыстоўваць гэтую з'яву ў інтарэсах рытара ў прамовах выкрывальных і пахвальных. Выпішыце з праведзеных Арыстоцелем ілюстрацый перыфрастычныя выразы, ставячы знак (+) побач з тымі, якія маюць станоўчае эмацыянальнае адценне і (–) — адмоўнае.

1. У Эўрыпіда Арэст называе сам сябе "мсціўцам за бацьку", Менелай жа называе яго "забойцам маці".

2. Акцёры могуць быць названы або "рабамі Дыёніса" (бога, апекуна тэатральнага мастацтва), або "Дыянісавымі майстрамі".

3. Вядомаму ў старажытнасці паэту Сіманіду Кеёскаму пераможца ў бегу калясніц, запрэжаных муламі, прапанаваў стварыць пахвальны верш у гонар гэтай падзеі. Плата здалася паэту вельмі малой, і ён катэгарычна адмовіўся, спасылаючыся на тое, што яму непрыемна ўсхваляць "напалову аслоў". Калі ж урэшце была прапанавана дастойная сума, Сіманід напісаў такі фрагмент:

Вітаю вас, о дочкі хутканогіх кабыліц!

Прыдумайце перыфрастычныя пары з рознай ацэначнай афарбоўкай, для прамоў, у якіх бы ўсхваляліся або асуджаліся: няпраўда, слава, смех, спрэчка, снег. Напрыклад: няпраўда — "сумесь атруты з мёдам", але яна жа — "залаты сон чалавека".

*"Рыторыка"*
*Арыстоцеля аб багацці*
*інтанацыі*

Арыстоцель адзначаў, што пры паўторы аднаго і таго ж (у тым ліку пры адным пачатку і адным заканчэнні) неабходна гаварыць кожны раз

Этот электронный документ был загружен с сайта филологического факультета БГУ http://www.philology.bsu.by

інакш, што як бы дае месца дэкламацыі, набліжае гаворку да акцёрскай. Той жа, хто гаворыць такія сказы манатонна, становіцца падобны на чалавека, які нясе бервяно. Гэта жа заўвага не страчвае сваёй значнасці і пры бессаюзнасці (асіндэтоне): калі бессаюзны пералік вымаўляецца “аднолькавым голасам”, яго састаўныя часткі зліваюцца.

Паводле парады вялікага Стагірыта выразна прачытайце яго жа прыклады.

а) Вось той, хто абакраў вас; вось той, хто падмануў вас; вось той, хто, урэшце, вырашыў здрадзіць вам.

б) Я прыйшоў, загаварыў, папрасіў — ён з пагардай паставіўся да ўсяго, што я сказаў.

Падбярыце, або прыдумайце 2—3 падобныя прыклады і артыстычна “агучце іх” згодна рэкамендацыям Арыстоцеля.

## ЦЫЦЭРОН ЯК ПРАМОЎЦА

У кульмінацыйны для палітычнай кар’еры Цыцэрона год яго консульства – 63 г. да н.э. – была сказана амаль самая лепшая з яго прамоў – 1-я каціліннарыя (каціліннарыямі называецца тэматычны цыкл з 4-х выступленняў, прысвечаных выкрыццю загавора Каціліны). Каб зразумець змест і ацаніць наступальны пафас гэтай прамовы, неабходна хоць бы ў самых агульных рысах прадстаўляць сутнасць таго грамадзянскага канфлікту, звязанага з рухам каціліннарцаў, які яе выклікаў. Звернемся да строчак аднаго з «малых паэтаў» 1 в. н.э. Карнелія Севера:

Подзвігі консула зноў магутныя ў думках паўсталі,
Клятвы, раскрытыя ім, і падкопы страшэнных саюзаў,
Знатных злодзеяў ганьба: і вось – паўтарылася зноў
Кара Цэтэга, і зноў беззаконны прыйшоў Каціліна…

Луцый Сергій Каціліна (каля 108–62 гг. да н.э.), выхадзец са старажытнага патрыцыянскага роду, не раз рабіў упартыя спробы прыйсці да ўлады легальным шляхам, выстаўляў сваю кандыдатуру на выбарах у консулы, аднак гэта не прыносіла яму поспеху. Урэшце рэшт, Каціліна устаў на шлях патаемнай падрыхтоўкі да гвалтоўнага захопу улады. Важнай ваеннай апорай змовы былі ўзброеныя сілы ў Этрурыі пад камандаваннем Гая Манлія, ветэрана войск дыктатара Сулы (да ліку паплечнікаў апошняга некалі належыў сам Каціліна). Асноўным палітычным лозунгам Каціліны з’яўлялася адмена пазык, што схіліла на яго бок прадстаўнікоў розных слаёў насельніцтва: «залатую моладзь», якая ўвязла ў пазыках, ветэранаў Сулы, якія збяднелі і знаходзіліся ў занядбанні, беззямельных сялян і дэкласаваныя элементы горада. Акрамя таго, Каціліна імкнуўся да абмежавання ўлады сената, які да таго часу ў значнай меры страціў былы аўтарытэт і сваёй кансерватыўнасцю перашкаджаў значным сацыяльным пераўтварэнням.

Пасля таго як войска Гая Манлія падняла мяцеж, а змоўшчыкі пачалі рыхтаваць падпал сталіцы і забойствы шэрага ўплывовых у горадзе асоб,

Этот электронный документ был загружен с сайта филологического факультета БГУ http://www.philology.bsu.by

Цыцэрон, якога ўведамілі пра намеры кацілінарцаў яго агенты, выступіў перад сенатам з першай са сваіх прамоў супраць Каціліны і патрабаваў, каб той пакінуў Рым. Той жа ноччу Каціліна, ідучы на немінучае выкрыццё, сапраўды выехаў у лагер Гая Манлія. У хуткім часе Цыцэрону ўдалося атрымаць дакументальныя ўлікі супраць змоўшчыкаў, якія засталіся ў Рыме, – іх лісты да свайго правадыра, завераныя пячаткамі і подпісамі. Пяцёра прыхільнікаў Каціліны, у тым ліку і згаданы ў працытаваным намі ўрыўку паэмы Гай Цэтэг, былі пакараны Цыцэронам па рашэнні сената, але без фармальнага суда. Праз месяц ўрадавыя войскі канчаткова разбілі атрады Каціліны, які быў смяротна паранены ў баі.

Барацьба з Кацілінай і кацілінарцамі з’яўляецца адной з яскравых і драматычных старонак біяграфіі Цыцэрона, які ў разгар падзей быў удастоены народнага ўшанавання і гордага тытула “Pater Patrie” («Бацька Айчыны»), аднак пасля правёў больш года ў выгнанні, абвінавачаны ў злоўжыванні консульскай уладай – пакаранні рымскіх грамадзян без папярэдняга суда. Што тычыцца 1-й кацілінарыі, якая па жанры з’яўляецца класічнай <u>інвектывай</u> (рэзкай выкрывальнай прамовай), то яна, нягледзячы на існуючыя супярэчныя гісторыка-палітычныя ацэнкі паводзін Цыцэрона ў той перыяд грамадзянскай смуты, і сёння застаецца непераўзыдзеным узорам красамоўства, сведчаннем моцнай і шчырай захопленасці рытара роляй абаронцы і выратавальніка Айчыны.

## Пытанні і заданні да «Першай прамовы супраць Луцыя Сергія Каціліны»

I. Прачытайце матэрыялы да характарыстыцы асобы і дзейнасці Каціліны, запазычаныя з розных па часу стварэння і ацэначнай танальнасці крыніц.

1) Ці адрозніваюцца характарысткі Каціліны, дадзеныя Цыцэронам у 1-й кацілінарыі і ў прамове ў абарону Марка Цэлія Руфа? Якая з гэтых характарыстык, на ваш погляд, больш блізкая да рэчаіснасці, аб’ектыўная (калі ўлічваць, што абедзве яны адпавядаюць інтарэсам рытара ў кожным з выпадкаў: у 1-м – абвінаваціць Каціліну, у 2-м – апраўдаць падабароннага, якога, акрамя ўсяго, папракалі ў тым, што ў юнацтве ён быў сярод сяброў дзяржаўнага злачынцы)? Ці апраўдана тэндэнцыйнасць другой?

2) Якія жахлівыя дэталі біяграфіі Каціліны, што згадваюць Цыцэрон у 1-й кацілінарыі і Плутарх у «Параўнальных жыццяпісах», уяўляюцца няпэўнымі перабольшаннямі, наўмысным сгушчэннем цёмных фарбаў?

3) У чым выяўляецца агульнасць наступных гістарычных перыядаў, у якіх уваскрашаецца грозны цень Каціліны, бо ім гэты вобраз адпавядае?

### Характарыстыка Каціліны з прамовы Цыцэрона «У абарону Марка Цэлія Руфа»

Этот электронный документ был загружен с сайта филологического факультета БГУ http://www.philology.bsu.by

(V, 12) Аднак – скажуць мне – Цэлій, пасля таго як на працягу некалькіх гадоў выступаў на форуме, падтрымаў Каціліну. І тое ж самае зрабілі многія людзі ўсіх саслоўяў і рознага ўзросту. Паколькі Каціліна, як вы, на мой розум, памятаеце, валодаў вельмі многімі калі і не ярка вызначанымі, але заўважнымі задаткамі вялікіх доблесцей. З многімі несумленнымі людзьмі ён знаўся, але прыкідваўся, што адданы сумленным мужам. Яго вабіла да сябе распуста, але падчас захоплівалі настойлівасць і праца. Яго адольвалі заганы юру; у яго таксама былі вялікія імкненні да ваенных подзвігаў. І я думаю, на зямлі ніколі не было гэткай пачвары, якая спалучала бы ў сябе настолькі супрацьлеглыя і розныя прыроджаныя імкненні і страсці, якія змагаюцца адзін з адным. (VI, 13) Хто калі-небудзь быў больш па душы праслаўленым мужам, хто быў больш цесна звязаны са зняслаўленымі? Хто як грамадзянін быў калі-небудзь бліжэй да сумленных людзей, хто быў больш бязлітасным ворагам нашым грамадзянам? Хто быў больш заплямлены распуснымі ўцехамі і хто больш трывалы ў нястачы? Хто быў больш прагным у грабяжах і больш шчодрым у раздачах? Вось якія якасці, суддзі, гэтага чалавека па-сапраўднаму здзіўляюць: ён мог прывабіць да сябе многіх людзей сяброўскімі адносінамі, аказаць ім паслугі, падзяліцца з любым чалавекам сваёй маёмасцю, у бядзе дапамагчы ўсім сваім прыхільнікам грошамі, уплывам, за кошт асабістых нястач, а калі трэба – нават злачынствам і дзёрскай адвагай; ён мог змяняць свой прыродны характар і валодаць сабой пры любых абставінах, быў гібкім і вёрткім, мог з суровымі людзьмі трымаць сябе строга, з вясёлымі прыветліва, са старымі з годнасцю, з моладдзю ласкава; сярод злачынцаў ён быў дзёрзкім, сярод распуснікаў ён быў марнатраўным. (14) Валодаючы такім пераменлівым і разнастайным характарам, ён сабраў вакол сябе ўсіх дёрзкіх і бясстрашных людзей з усіх краін і ў той жа час утрымліваў каля сябе нават многіх храбрых і сумленных мужоў, так сказаць, выглядам сваёй прытворнай доблесці. І ў яго ніколі не ўзнікла бы гэтага злачыннага імкнення загубіць нашу дзяржаву, калі б такое бязмернае мноства жахлівых заганаў не суправаджалася ў яго далікатнасцю і вытрымкай…

Нават мяне, паўтараю, мяне Каціліна калісьці ледзь не ўвёў у зман, калі мне здавалася, што ён добры грамадзянін, які імкнецца блізка сысціся з лепшымі людзьмі, добры і верны сябар. Злачынствы яго я ўбачыў сваімі вачамі раней, чым зразумеў іх; схапіў іх рукамі раней, чым западозрыў…

**Фрагменты з манаграфіі рымскага гісторыка Салюстыя «Пра загавор Каціліны» (1 ст. н.э.) (Пра маральны воблік Каціліны)**

4. (3) …З праўдзівасцю, з якой толькі здольны, каротка паведамлю пра загавор Каціліны; (4) Менавіта ж гэта зладзейства сам я лічу найбольш памятным з усіх па бяспрыкладнасці злачынства і яго небяспекі для дзяржавы…

Этот электронный документ был загружен с сайта филологического факультета БГУ http://www.philology.bsu.by

5. (1) Луцый Каціліна, чалавек знатнага паходжання, вылучаўся вялікай сілай духу і цела, але злым і дрэнным норавам. (2) З малых гадоў яму былі па сэрцу міжусобныя войны, забойствы, грабяжы, грамадзянскія смуты, і ў іх ён правёў сваю маладосць. (3) Целам ён быў неверагодна трывалым у адносінах да голада, холада, недасыпання. (4) Духам ён быў дзёрзкім, каварным, зменлівым, майстар прыкідвацца і ўсё ўтойваць, квапны да чужога, марнатараўны да свайго, нястрыманы ў пачуццях; красамоўства было шмат, розуму мала. (5) Яго нястрымны дух заўсёды імкнуўся да чагосьці празмернага, неверагоднага, выключнага. (6) Пасля адзінаўладдзя Луцыя Сулы яго ахапіла нястрыманае жаданне стаць кіраўніком дзяржавы, але як дасягнуць гэтага – толькі б атрымаць царскую ўладу, – яму было ўсё роўна. (7) З кожным днём усё мацней узбуджаўся яго нястрымны дух, уз'юшаны недахопам сродкаў і ўсведамленнем зробленых злачынстваў.

(Пра гібель Каціліны)

61. (1) Толькі тады, калі бітва скончылася, і можна было ўбачыць, якімі вялікімі былі адвага і мужнасць у войску Каціліны. (2) Бо амаль што кожны, сканаўшы, ляжаў на тым жа месцы, якое займаў у пачатку бітвы. (3) Некалькі чалавек у цэнтры, якіх разагнала прэторская кагорта, ляжалі трошкі ў баку, але ўсе, аднак, параненыя ў грудзі. (4) Самога Каціліну знайшлі недалёка ад яго салдат, сярод варожых цел. Ён яшчэ дыхаў, і на яго твары была пячатка той жа неўтаймаванасці духу, якой ён адрозніваўся пры жыцці. (5) Словам, з усяго войска Каціліны ні ў бітве, ні ў час уцёкаў ніводны паўнапраўны грамадзянін не быў узяты ў палон, (6) так мала ўсе яны шкадавалі жыццё – як сваё, так і варожае.

## Фрагменты апавядання пра Каціліну з «Параўнальных жыццяпісаў» Плутарха (1 ст. н.э.)

…Але былі і людзі, якія імкнуліся пахіснуць і змяніць сучаснае становішча спраў, прычым дзеля асабістых выгад, а не дзеля агульнага дабра… а ў іх быў галава чалавек смелы, энергічны і па характару здольны на ўсё – Луцый Каціліна. Акрамя іншых шматлікіх і важных злачынстваў, ён калісьці выклікаў на сябе абвінавачванне… у забойстве брата. Баючыся суда над сабой за гэту справу, ён пераканаў Сулу запісаць забітага як яшчэ жывога ў спіс тых, хто павінен быў памерці. Абраўшы яго старэйшым, злачынцы далі адзін аднаму клятву вернасці, прычым заклалі над ахвярнікам чалавека і елі яго мяса. Значная частка гарадской моладзі была разбэшчана Кацілінай; кожнага з іх улагоджваў ён пастаянна рознымі ўцехамі, папойкамі, нават прывозіў ім палюбоўніц і не скупіўся даваць неабходныя для ўсяго гэтага сродкі.

## Урыўкі з артыкула А. Блока «Каціліна:

Этот электронный документ был загружен с сайта филологического факультета БГУ http://www.philology.bsu.by

**старонка з гісторыі сусветнай рэвалюцыі» (1918)**

Уявіце сабе тую нечалавечую раз'юшанасць, якая ахапіла ўзлаванага і зняважанага Кацiліну ў храме Юпіцера Статара. Прадажныя сенатары не пажадалі сядзець з ім на адной лаўцы і павярнуліся да яго спінамі. Ініцыятар гэтай пышнай цэрымоніі для яе правядзення выбраў наўмысна храм, быццам храм ёсць менавіта тое месца, дзе можна і патрэбна абражаць і цкаваць чалавека, які б гэты чалавек не быў. Уся цэрымонія была інсцэніравана… У канцы самы паважаны і самы адукаваны муж горада, не пагрэбаваўшы звязацца з сенатарамі ў імя выратавання айчыны, разыграў ўсю гэтую зневажальную камедыю, скончыўшы тым, што выліў на зацкаванага чалавека цэбар бляскучага адвакацкага красамоўства; Кацiліне заставалася, быццам бы, адно: захліпнуцца ў моры зневажальных цыцэронаўскіх слоў.

Аднак Кацiліна атрапіўся. Ён досыць цягаўся па брудных прытонах і дастаткова агрубеў; лаянка не зачапілася за яго каўнер; гэта яму дапамагло скінуць цяжар і шаленства, што ахапіла яго; ён быццам бы пераўтварыўся. Яму стала лёгка, бо ён «выракся ад старога свету» і «атрос пыл» Рыма са сваіх ног.

…На… чорным фоне начнога горада… уявіце сабе натоўп, наперадзе якога ідзе страціўшы ад гнева розум чалавек, прымушаючы несці перад сабой прыкметы консульскай годнасці. Гэта – той жа Кацiліна, нядаўні ўлюбёнец львіц рымскага свету і паўсвету, злачынны кіраўнік распуснай банды; ён ідзе ўсё той жа сваёй – «то лянівай, то паспешлівай» хадой; але злосць і шаленства надалі яго хадзе музычны рытм; быццам бы гэта ўжо не той – карыслівы і распусны Кацiліна; у постаці гэтага чалавека – мяцеж, паўстанне, фурыі народнага гневу…

…Рымскі «бальшавік» Кацiліна загінуў. Рымскія грамадзяне радаваліся; яны вырашылі, што «сабаку – сабачая смерць». Знакамітыя пісьменнікі падтрымалі меркаванне сваіх суграмадзян у сваіх творах. Новая і вартая чалавецтва ацэнка Кацiліны была зроблена… Толькі ў першай палове мінулага стагоддзя… Праз дзевятнаццаць стагоддзяў пасля гібелі Кацiліны дваццацігадовы юнак, памочнік аптэкара, а ў будучым – вялікі пісьменнік Генрых Ібсен, натхнёны рэвалюцыяй 1848 года, паказаў сапраўдныя намеры рымскага рэвалюцыянера Кацiліны.

…Ібсен на сорак восьмым годзе свайго вельмі цяжкага жыцця, нягледзячы на усялякія рэвалюцыі, апрацаваў, «зусім не кранаючы ідэй, вобразаў і развіцця дзеяння», і перавыдаў сваю юнацкую драму, якая заканчваецца зусім не ліберальна: *вартым Элізіума і маючым дачыненне да кахання становіцца менавіта бунтар і забойца самага святога, што было ў жыцці – Кацiліна.*

II. Ці выклікае Кацiліна вашу сімпатыю і спачуванне? На аснове вядомых вам звестак з гісторыі, а таксама крытычнага аналізу 1-й кацiлінарыі і прапанаваных фрагментаў падрыхтуйцеся да выступлення с самастойным дыскусійным разважаннем па праблемным пытанні: «Луцый Сергій Кацiліна: спаборнік за свабоду і дэмакратыю або амаральны палітычны авантурыст?».

Этот электронный документ был загружен с сайта филологического факультета БГУ http://www.philology.bsu.by

III. Згодна тэарэтычным устаноўкам Цыцэрона, уступ да прамовы павінен быць хутчэй спакойным, чым патэтычным і вытрыманым ва ўмеранай (сярэдняй) танальнасці. Спакой рытара з першага яго слова выкліча ў слухачоў упэўненасць у праўдзівасці і справядлівасці яго сцвярджэнняў. Падмацаваннем ці адмаўленнем высунутых Цыцэронам правіл з'яўляецца уступ да 1-й каціліналы? Чым гэта можна абгрунтаваць і растлумачыць?

IV. Які менавіта традыцыйны для антычнай рыторыкі прыём надае заключэнню прамовы асаблівую веліч і ўрачыстасць? У каго са старажытных рытараў вы ўжо сустракалі выкарыстанне гэтага прыёму ў завяршальнай частцы выступлення?

V. Дакажыце праўдзівасць агульнапрызнанага палажэння аб багацці славарнага запасу Цыцэрона, які заўсёды радуе даследчыкаў класічнай латыні, на матэрыяле 1-й каціліналы: 1) знайдзіце ў першых трох фразах словы з часовым значэннем. Аднолькавымі ці рознымі яны з'яўляюцца? 2) З §§ 2, 18, 23 і 24 прамовы выпішыце парамі злучаныя сінонімы, якія служаць сродкам узмацнення рэльефнасці думкі і эмацыянальнай напружанасці выказвання. Каго з рытараў – папярэднікаў Цыцэрона – прымушае ўспомніць згаданы прыём?

VI. Дакажыце разнастайнасць крыніц метафарызацыі стылю ў прамове Цыцэрона, якая захапляла яго сучаснікаў і нашчадкаў. Зачытайце з 1-й каціліналы па адным прыкладзе метафар, звязаных з жыццём жрацоў, ваенных, гладыятараў, рабоў.

VII. У адной з тэарэтычных прац Цыцэрона – трактаце «Аб рытары» – вуснамі Ліцынія Краса даецца вялікі пералік фігур думкі і слова:

«Прыёмы пабудовы і слоў і думак амаль што незлічоныя, што, як я ўпэўнены, вам вядома. Адрозненне паміж пабудовай слоў і пабудовай думак у тым, што пры перамене слоў слоўная пабудова парушаецца, а пабудова думак зберагаецца, якімі бы словамі не карыстаўся… Часта сустракаецца… выразны *намёк,* які гаворыць больш за словы…; *папярэджанне* пра тое, што збіраешся гаварыць, і *падсумоўванне* таго, што ўжо сказана, і *вяртанне* да сказанага…; і *запытанне,* як бы ў адказ на яго *падказванне* свайго меркавання; потым тое, што больш за ўсё як бы ўваходзіць ва ўсведамленне людзей, – *іронія,* калі гаварыцца адно, а маецца на ўвазе іншае.., потым *папраўка* таго, што ўжо сказаў…; *гутарка,* калі ты быццам абмяркоўваеш пытанне са сваімі слухачамі; …*увасабленне* – амаль што самы моцны і выдатны прыём узмацнення; …потым гэтыя два наймацнейшыя прыёмы ўздзеяння – *параўнанне* і *прыклад*; … *супрацьпастаўленне, змаўчанне,* …*маленне*… Вось прыблізна якія іскры думкі надаюць маўленню бліскучасць.

Што тычыцца самой слоўнай часткі, дык і тут, як ва ўзброенай барацьбе, прымяняюцца або пагрозы і выпады, або прыёмы, якія робяць яе прыгожай. Так, надае ёй іншы раз моц, а іншы раз хараство і *паўтор* слоў, і *дабаўленне слова, якое блізка і падобна гучыць,* і *паўтор* аднаго і таго ж слова… у пачатку…; і *нарастанне*… Ёсць яшчэ… і *бяззлучнасць,* …і *вокліч,* …і *пералічэнне,* …і *апісальнае выказванне.* Вось прыблізныя прыёмы, а іх

Этот электронный документ был загружен с сайта филологического факультета БГУ http://www.philology.bsu.by

можа быць яшчэ больш! – што ўпрыгожваюць маўленне думкамі і слоўнымі зваротамі».

Пасля маналога Краса, які імкнецца да максімальнай сэнсавай насычанасці выкладання, іншы герой трактата, Кота, заўважае: «Як бачна, ты цвёрда ўпэўнены, што мы ўсе гэта добра ведаем, і таму высыпаў усе гэтыя фігуры перад намі без азначэнняў і прыкладаў».

Праілюструйце (вусна) кожную з пералічаных фігур прыкладам, запазычаным з рытарскай практыкі Цыцэрона, – з яго 1-й каціліінарыі. Выпішыце: а) 3–4 прыклады *іроніі* ў адрас Каціліны, яго хаўруснікаў або нерашучай «палітычнай верхавіны» дзяржавы – слоў і выказванняў, якія пры ўспрыманні прамовы бяруцца ў думках у двукоссе; б) 2–3 прыклады *папраўкі (карэкцыі)* – наўмыснай папраўкі рытарам сваіх жа папярэдніх слоў, пярэчанні самому сабе (пры дапамозе якога характэрнага слова нярэдка афармляецца пераход да падобных заўваг, якія супярэчаць выказаным раней заўваг?); в) 2–3 прыклады *прэтэрыцыі* («праходжання міма») – такой разнавіднасці змаўчання, якая ўяўляе сабой «своеасаблівы рытарычны парадокс» (І. П. Стрэльнікава): рытар заяўляе, што не збіраецца закранаць якую-небудзь тэму, але гэтай абмоўкай ужо дакранаецца да быццам бы незаўважанага прадмета абмеркавання і падкрэслівае яго; г) 2–3 прыклады *нарастання* (узыходзячай *градацыі*) – размяшчэння аднародных элементаў у парадку ўзмацнення іх эмацыянальна-сэнсавай значнасці. Ці можна назваць пісьмова праілюстраваныя вамі прыклады тыповымі для стылю 1-й каціліінарыі?

VIII. Запішыце ў свой тэрміналагічны слоўнік тлумачэнне рытарычнага тэрміну *гендыядыс*: «Гендыядыс – фігура, пры якой адно складанае паняцце вызначаецца праз два простых».

Назавіце паняцці, якія сэнсава расшчапляюцца ў наступных, прыведзеных у літаральным перакладзе з 1-й каціліінарыі: а) смерць і кара (з боку рэспублікі) (§4); б) вар'яцтву і злачынству (супрацьдзейнічалі) (§15).

Напрыклад: *погляд* і *твар* (§1) – *выраз твару*. Які сэнсавы і рытмічны эффект дасягаецца шляхам выкарыстання гэтай фігуры?

IX. 1) Выкажыце меркаванне, ці выказваў сенат падчас выступлення Цыцэрона сваё стаўленне да таго, што адбываецца. Растлумачце прычыны апісаных вамі паводзін сенатараў. Ці з'яўляліся яны безумоўна спрыяльнымі для прамоўцы? У чым выяўляецца рытарскае вынаходства Цыцэрона, якая дазваляла яму тлумачыць рэакцыю аўдыторыі на сваю карысць?

3) Прачытайце фрагменты верша выпускніка філалагічнага факультэта БДУ, які ў метафарычнай форме апісвае «пакуты творчасці». Як перакладаецца запазычаны з 1-й каціліінарыі Цыцэрона лацінскі выраз, што абрамляе тэкст? Які выкарыстаны прамоўцам рытарска-стылістычны прыём надае эфектнасць і афарыстычнасць гучанню гэтай крылатай фразы? Знайдзіце ў § 18 прамовы яшчэ адзін выпадак выкарыстання названага вамі экспрэсіўнага прыёму.

Этот электронный документ был загружен с сайта филологического факультета БГУ http://www.philology.bsu.by

– **Cum tacent, clamant, –**
сказаў Атрамант.
Усчала лямант
мая папера…
Сціскаю сілай
душу чарніла.
Каб вызнаць праўду,
іду на здраду…

А мудрасць сніла
Спакой чарніла,
І бель паперы –
Пустыя дзверы –
Не зачыняла.
І мне сказала:
– Кідай свой лямант.
**Cum tacent, clamant.**

В. Пятроўскі

Якія выразы з 1-й кацілінарыі таксама сталі шырока вядомымі, крылатымі? Якія рытарычныя фігуры робяць іх такімі выразнымі і запамінальнымі?

X. 1) У 1-й кацілінарыі, як мы змаглі пераканацца, адзначаецца значная канцэнтрацыя, «згушчэнне» разнастайных рытарычных сродкаў (так, толькі ў пачатковых 3-х параграфах выступлення налічваецца каля 35 выпадкаў іх ужывання). Ці выклікае такая вялікая шчыльнасць рытарычных прыёмаў уражанне штучнасці, неарганічнасці?

2) Прафесар Г. Кнабе, аналізуючы стылістычныя якасці 1-й кацілінарыі, пісаў пра «штучна вытканае, бліскучае і трывалае рытарычнае палатно прамовы, што пераліваецца ўсімі колерамі і адценнямі». Які рытарычны сродак надае вобразнасць самому гэтаму водкліку? Які рытарычны прыём праходзіць чырвонай ніткай праз жывую тканіну твора, з’яўляецца вельмі частым і характэрным для выступлення?

XI. 2. Пры вымаўленні якіх фрагментаў прамовы, верагодна, былі выкарыстаны ўказальныя жэсты, якія адначасова ўжываліся з адпаведнымі займеннікамі і дапамагалі ўзмацніць нагляднае ўздзеянне выступлення? Падрыхтуйцеся да выразнай дэкламацыі выбранных вамі фраз, суправаджаючы іх імітацыяй патэтычных жэстаў старажытнага рытара.

XII. Вядома, што гісторык Салюстый, які у цэлым нядобразычліва ставіўся да Цыцэрона, тым не менш назваў 1-ю кацілінарыю «яскравай і карыснай для дзяржавы прамовай». Ці згодны вы з прыведзеным меркаваннем? Раскрываючы змест кожнага з падабраных Салюстыем азначэнняў, дайце абагульненую ацэнку літаратурна-мастацкага і грамадска-палітычнага значэння выступлення Цыцэрона.

XIII. Напішыце невялікую (1-2 старонкі) інвектыву – абвінавальную прамову супраць міфалагічнага ці літаратурнага героя або гістарычнага дзеяча, карыстаючыся па прыкладу Цыцэрона ўступнай серыяй рытарычных пытанняў.

XIV. Знакаміты гуманіст Эразм Ратэрдамскі гаварыў: «Я раблюся лепшым чалавекам, калі чытаю Цыцэрона». Ці можна суаднесці гэта выказванне аб высакародным уздзеянні твораў вялікага арпінца на душу чытача да вядомых вам прамоў Цыцэрона? Аргументуйце свой адказ на прыкладзе любога з выступленняў (па выбару).

Этот электронный документ был загружен с сайта филологического факультета БГУ http://www.philology.bsu.by

# «КАРОТКАЯ ІНСТРУКЦЫЯ ДА КРАСАМОЎСТВА» М. В. ЛАМ АНОСАВА

## Фрагменты для аналізу

## Частка 1. Аб вынаходстве.

## Глава 1. Аб вынаходстве ўвогуле

3. Вынаходства рытарычнае ёсць збор розных ідэй, прыстойных прапанаванай матэрыі. Ідэямі называюцца ўяўленні аб рэчах або дзеяннях у розуме нашым…

5. Усе ідэі вынаходжаны з агульных месцаў рытарычных, якія ёсць: 1) род і від, 2) цэлае і часткі, 3) якасці матэрыяльныя, 4) якасці жыццёвыя, 5) імя, 6) дзеянні і пакуты, 7) месца, 8) час, 9) паходжанне, 10) прычына, 11) папярэдняе і наступнае, 12) прыметы, 13) абставіны, 14) падабенствы, 15) процілеглыя і розныя рэчы, 16) ураўноўванні.

6. Родам называецца агульнае падабенства асаблівых рэчаў. Такое падабенства бачым Нявы з Дзвіной, Дняпром, Волгай і іншай вялікай вадой, што цячэ ў мора і называецца адным словам – рака, якая ёсць род, а Нява, Дзвіна, Дняпро,  Волга, Вісла і іншыя ёсць віды яго.

7. Цэлае ёсць тое, што складаецца з іншых рэчаў, а часткамі называюцца тыя рэчы, якія яго складаюць, напрыклад, горад ёсць цэлае, а сцены, вежы, дамы, вуліцы і іншае ёсць яго часткі.

8. Якасці матэрыяльныя ёсць тыя, якія чуллівым рэчам жывым і бяздушным прыпісваюцца, як велічыня, фігура, цяжкасць, цвёрдасць, пругкасць, рух, звон, колер, смак, запах, цеплыня…

9. Жыццёвыя якасці належаць адушаўлёным рэчам, з якіх, па-першае, ёсць галоўныя душэўныя дараванні: паняцце, памяць, уяўленне, разважанне, самавольнасць. Другое – страсці: радасць і смутак, асалода і раскаянне, ... гнеў і міласэрнасць, любоў і нянавісць… Трэцяе – дабрачыннасці: …міласць, удзячнасць, …працавітасць, …сціпласць. Чацвёртае – заганы: …лютасць, …няўдзячнасць, …лянота, …самахвальства. Пятае – вонкавае становішча: благароддзе і неблагароддзе, шчасце і няшчасце, багацце і ўбоства, слава і няслаўе, улада і безуладдзе… Шостае – цялесныя якасці і дараванні: узрост, век, пол, моц, прыгажосць, здароўе, праворства. Сёмае – пачуцці: зрок, слых, нюх, смак, дотык.

10. Імя ёсць уласцівае і прыкладзенае. Уласцівае ёсць, якім што звычайна называюць… Прыкладзеныя імёны даюцца звыш уласцівым, што бывае наступным чынам: 1) калі імя іншамоўнае з іншай мовы на родную перакладзена будзе, напрыклад: … «Андрэй» з грэчаскай – мужны…; 2) калі па асаблівых справах ці якасцях дадзена каму будзе праімя, так, Аляксандр з-за вялікай мужнасці называўся вялікім…

11. Дзеянне і залежнасць ёсць усякая перамена, якую адна рэч у іншай стварае. Тое, што стварае перамену называюць незалежным, а тое, у якім

Этот электронный документ был загружен с сайта филологического факультета БГУ http://www.philology.bsu.by

перамена адбываецца, залежным. Напрыклад: *моцны вецер мора хвалюе* – моцны вецер ёсць незалежнае, а мора ёсць залежнае…

12. Час ёсць указальны і колькасны: указальны пазнаецца праз пытанне калі? Напрыклад: *плады збіраюць восенню*. Колькасны час пазнаецца цераз пытанне *наколькі доўга?* Напрыклад: *Аўгуст, цэзар рымскі, кіраваў сорак чатыры гады*.

13. Месца падзяляецца на «ўстойлівае» і «рухомае». Першае вызначаецца пытаннем дзе? Напрыклад: *востраў Сіцылія ляжыць на Міжземным моры*. Другое ўказвае на пытанне па чым? Напрыклад: *молнія бліштыць па паветры…* сюды належаць «змястоўнае» і змесціва, напрыклад: горад ёсць «змястоўнае», а людзі, якія ў ім жывуць, – змесціва.

14. Паходжанне ёсць пачатак, ад якога нешта іншае паходзіць і сваё быццё вядзе, напрыклад: *металлы паходзяць ад зямлі, мёд – ад пчол, няслаўе і пакаранні – ад дрэнных спраў;* зямля, пчолы і дрэнныя справы ёсць паходжанне металаў, мёду, няслаўя і пакаранняў.

15. Прычына ёсць канчатак, для якога ўсялякая рэч ёсць ці бывае, напрыклад: *земляроб арэ зямлю і насейвае, каб вырасціць сябе хлеб, каб паесці*. Вырошчванне хлеба земляробам, каб паесці, ёсць прычына арання і насейвання зямлі.

16. Папярэдняе ёсць тое, што перад рэччу заўсёды бывае, наступнае – што пасля адбываецца, так: *вясна папярэджвае лету, за якім прыходзіць восень…*

17. Прыкметай называюць тое, што іншую рэч прадстаўляе, калі яна сама пачуццям падуласна… *Скрываўленая шпага Тыцыя, бледны яго твар, аддаленасць ад людзей і бег ад мёртвага цела Семпронія ёсць прыкметы ўчыненага ім забойства…*

18. Абставіны ёсць тыя рэчы, якія хоць з дадзенай рэччу не злучаны, аднак маюць да яе некаторую датыкальнасць; так, звяры, якія сустракаюцца падарожніку, мясціны па шляху, судны, што плаваюць па рацэ, і птушкі, пчала, якая сядзіць на ружы, ёсць абставіны падарожніка, ракі і ружы.

19. Падабенства рытарычнае ёсць суаднясенне двух рэчаў у якасцях ці дзеяннях. Сэрца чалавека, які ўз'юшаны гневам, можа быць параўнана з бушуючым морам…

20. Процілеглымі называюцца тыя рэчы, якія разам не могуць быць побач, як дзень і ноч, спякота і сцюжа, багацце і ўбоства, любоў і нянавісць. Розныя рэчы бываюць, калі замест адной процілеглай рэчы прапаноўваецца тое, што ад яе паходзіць, напрыклад: любіць і пакрыўдзіць (замест ненавідзець), …бо крыўда ад нянавісці… паходзіць.

21. Ураўноўванне ёсць суаднясенне двух рэчаў, адну адной роўную, большую ці меншую шануючы. Прыклад першага: *Юлій Цэзар зайздросціў славе Аляксандра Македонскага, роўна як Аляксандр – славе бацькі свайго Філіпа…*

## Глава 2. Аб вынаходстве простых ідэй

Этот электронный документ был загружен с сайта филологического факультета БГУ http://www.philology.bsu.by

23. Стваральнік слова тым большымі вынаходствамі яго ўзбагаціць можа, чым хутчэйшую мае сілу ўяўлення, якая ёсць душэўнае дараванне з адной рэччу, якая розумам ўяўляецца, разам уяўляць іншыя, як-небудзь з ёй звязаныя, напрыклад: калі, уявіўшы розумам карабль, з ім уяўляем разам і мора, па якім ён плыве, з морам – буру, з бурай – хвалі, з хвалямі – шум каля берагоў, з берагамі – камяні і гэтак далей. Гэта ўсё магчыма дзякуючы ўяўленню, якое, злучанае з разважаннем, называецца дасціпнасцю.

24. Адсюль відаць, што праз уяўленне з адной простай ідэі нарадзіцца могуць іншыя, а чым іх больш, тым больш багата будзе створана слоў. Гэта душэўнае дараванне хоць многія маюць ад прыроды шмат, аднак яно не заўсёды і не ва ўсякім выпадку трывалае, у дапамогу яму неабходна прапанаваць некаторыя правілы.

25. Матэрыя, дадзеная стваральніку слова, звычайна складзаецца з ідэі, якая называецца тэмай. Простыя ідэі, з якіх яна складаецца, называюцца тэрмінамі. Напрыклад, гэта тэма: *няспынная праца перашкоды пераадольвае* – складаецца з чатырох тэрмінаў: няспыннасць, праца, перашкоды і пераадольванне. Прыназоўнікі і іншыя дапаможныя словы не лічацца тэрмінамі.

26. Ад тэрмінаў тэмы могуць стварацца праз уяўленне (па п. 23 і 24) многія простыя ідэі, якія мы падзяляем на першасныя, другасныя і трацічныя. Першаснымі называем тыя, якія ад тэрмінаў тэмы непасрэдна паходзяць, другаснымі, якія ад першасных, трацічнымі, якія ад другасных ідэй нараджаюцца…

27. Каб у збіранні першасных, другасных і трацічных ідэй не толькі дзякуючы ўяўленню дзейнічаць, для таго трэба прытрымлівацца наступных правілаў: 1) усе тэрміны, якія тэма мае, напісаць асобна; 2) да кожнага тэрміна знайсці першасныя ідэі з месцаў рытарычных і прыпісваць да іх асабліва адну ад другой на наўмыснай адлегласці, каб другасным і трацічным месца хапіла; 3) да першасных ідэй шукаць і прыпісваць другасныя, да другасных, калі неабходна, трацічныя з тых жа месцаў; 4) калі якое-небудзь месца ў разважанні нейкага тэрміна няплоднае, то можна абмінуць, як у пільнасці (!) матэрыяльныя якасці і азначэнне імя; 5) трэба глядзець, каб знойдзеныя ідэі былі да тэмы, аднак не трэба заўсёды тыя адкідваць, якія здаюцца ад тэмы далёкімі, бо яны часам, будучы звязаны па правілах наступнай главы, могуць скласці немалыя і да тэмы добра прыдуманыя ідэі. Для лепшага тлумачэння правілаў прапаноўваем як прыклад згаданую вышэй тэму: *няспынная праца перашкоды пераадольвае* з далучэннем да кожнага тэрміна ідэй першасных і другасных з месцаў рытарычных… Усе … ідэі для яснага разумення змяшчаюцца ў наступнай табліцы:

| Тэрміны | **Першасныя ідэі** | Другасныя ідэі |
|---|---|---|
| Пільнасць | Надзея<br><br><br>Перайманне | (Іншыя страсці, каханне, жаданне), падбадзёрванне, выка-нанне, адчай, як сон.<br>Золата, каменні |

Этот электронный документ был загружен с сайта филологического факультета БГУ http://www.philology.bsu.by

| | | |
|---|---|---|
| | Багацце<br>Гонар<br>Раніца<br>Вечар<br>Дзень<br>Ноч<br>Рака<br>Лянота<br>Гульба<br>Сіла | каштоўныя, дамы, сады, слугі, Бог, сябры, ад сваёй працы, убоства.<br>Доступ да знаці, пахвала, улада.<br>Абуджэнне, утойванне зорак, зарніца, усход сонца, спяванне птушак.<br>Цемната, холад, раса, зверы, якія выходзяць з нор.<br>Цеплыня, святло, шум, назіранне за нічым не занятымі людзьмі.<br>Дрымота, маўчанне, луна, зоркі.<br>Быстрыня, вадкасць, празрыстасць, берагі, судны, рыбы, абмыванне, напойванне.<br>Вяселле, вясна, ясныя дні, сады, лугі, гульні, спатканне.<br>Самсон, Геркулес. |
| Праца | Пачатак, сярэдзіна і канец<br>Пот<br>Супакаенне<br>Пчолы | Лятанне па кветках, збіранне мёду. |
| Перашкоды | Страх<br><u>Зіма</u><br><u>Вайна</u><br><u>Горы</u> | Бледнасць, трасенне …, як лісце ад ветру ўвосень.<br>Мароз, снег, град, дрэвы, пазбаўленыя пладоў і лісця, аддаленне ад сонца.<br>Лютасць непрыяцелей, мячы, дзіды, агонь, спусташэнне, слёзы даведзеных да галечы.<br>Вышыня, крутасць, расколіны, пячоры, ядавітыя гадзюкі. |

Этот электронный документ был загружен с сайта филологического факультета БГУ http://www.philology.bsu.by

| | | |
|---|---|---|
| Пераадольванне | Пустыні<br>Моры<br>Радасць<br>Успаміны | Лясы, балоты, пяскі, нуда, разбойнікі, звяры.<br>Нясталасць, хваляванне, камні, віры.<br>Воклічы, пляскі, як прахалода пасля спякоты.<br>Паведамленне прыяцелям, іх забаўлянне, смутак і зайздрасць непрыяцеляў. |

**Заданні да тэксту**

1. Стварыце фрагмент прамовы на разгледжаную М. В. Ламаносавым маральна-дыдактычную тэму «Няспынная праца перашкоды пераадольвае», скарыстоўваючы частку ідэй, падабраных для яе асвятлення вялікім расійскім аратарам.

2. Прачытайце рытарычныя эцюды і выступленні, створаныя студэнтамі другога курса мінулых гадоў з прымяненнем ламаносаўскай методыкі вынаходства зместу прамовы, заснаванай на актывізацыі асацыятыўнага мыслення.

НІШТО НЕ ЛЕЧЫЦЬ ЛЕПШ, ЧЫМ ЧАС

Ні горкія пілюлі, ні салодкія цукеркі, ні цяжкі рок, ні «Санта-Барбара» не дапамогуць так супакоіць боль сэрца, жаль аб страце блізкага чалавека, забыць пра гарачае каханне, як яркая раніца кожнага дня і густая цемра кожнага развітальнага вечара, як месяцы, складзеныя з такіх дзён, і гады, сягаючыя ў бясконцасць (Л. Мартынава).

УСЁ ПЕРАМАГАЕ КАХАННЕ … (ВЯРГІЛІЙ)

Каханне!.. гэта шальны посвіст вятроў і райская музыка слоў, гэта гарачая ліхаманка і імгненны хмель, іскрыстае полымя і снег у крыві; гэта вострыя стрэлы Амура і салодкія напевы Афрадыты… Гэта гулкі стук сэрца і таямнічы бляск у вачах. Гэта тое непаўторнае яднанне смутку і радасці, дзеля якога, калі нешта раптам не ладзіцца, калі нехта пераходзіць дарогу, калі цяжкасці растуць адна за адной самі па сабе, быццам горны абвал або агароджа з атрутных церняў, – ты пойдзеш на край сусвету, пераадолееш касмічную прастору і будзеш няспынна змагацца, як паранены дзікі звер: вяпрук, тыгр або леў, як эгідатрымаючы Зеўс і авеяны зямной славай Геракл (Н. Шылка).

Этот электронный документ был загружен с сайта филологического факультета БГУ http://www.philology.bsu.by

### ПАКУТЫ – ШЛЯХ ДА ДУХОЎНАГА РАЗВІЦЦЯ

Таямнічы змрок і зоркі на небе, світанне і яснае сонца – маўклівыя сведкі чалавечага жыцця, жыцця, якое дадзена чалавеку для дабра, але можа пераўтварыцца ў пакуту.

Той, хто жыве адным днём, хто не думае пра будучыню, хто смуткуе толькі па сабе, – той можа жыць у пагоні за забавамі. Той жа, хто памятае пра жыццё за рысай смерці, хто не абыякавы да хворых і пакінутых, да нешчаслівых, – ён не можа жыць і атрымліваць асалоду. Ён прыносіць сябе ў ахвяру іншым. Пакутуе не толькі цела, але і душа гэтага чалавека, назіраючы, як суседнічаюць палацы і крыжы, віно, якое л’ецца з перапоўненых кубкаў, і кроў, якая ракой цячэ па зямлі.

Свет заграз у крыві і гразі. Перад чалавекам паўстаюць пытанні: чаму гэтак няроўна дзеліць Бог? у чым корань зла? як выратаваць чалавецтва? Усё гэта не хвалюе таго, хто імкнецца жыць без клопату, хто стараецца глядзець вакол праз ружовае шкло, хто хоча бачыць толькі прыгожае, чыстае і бліскучае. Чалавек, які сваімі вачамі бачыў кроў, голад, смерць, спазнаў многае на асабістым вопыце, пачынае паглыбляцца ў сябе і спрабуе знайсці адказы на гэтыя і іншыя пытанні.

Цярністы шлях да зорак. Да гэтых маленечкіх акенцаў у прыстанку анёлаў – прыстанку, дзе пануюць спакой, мудрасць, духоўная чысціня. Ухабы і купіны, сукі і калючкі спадарожнічаюць вандроўніку на яго цяжкім шляху да краіны святла, розуму, дабра і любові. Але ўсяму прыходзіць канец. І якімі цяжкімі не былі б вашы выпрабаванні, якім бы доўгім і бясконцым не быў ваш цярністы шлях, калі-небудзь вы дасягнеце вашай мэты. І толькі там і тады вас чакае сапраўднае шчасце, якое вы заслужылі пакутамі (**О**. Койра).

Прывядзіце прыклады ідэй, падабраных: а) у 1-м тэксце – пры дапамозе прыкладання топасу цэлага і частак да тэрміну «час»; топасу роду і віду – да ідэі пачуцця («страсці», гаворачы ламаносаўскай мовай); топасу якасцей матэрыяльных – да ідэй раніцы і цемры; б) у 2-м тэксце – пры дапамозе прыкладання топасу прыкметы і топасу вобразнага падабенства да тэрміну «каханне»; топасу роду і віду – да ўяўленню аб дзікім зверы; в) у 3-м тэксце – пры дапамозе прыкладання топасаў паходжання і процілеглага – да тэрміна «пакута», топасу абставін – да тэрміна «шлях».

3. Прывядзіце аналіз студэнцкага выступлення з пункту гледжання актуалізацыі ў яго змесце ідэй, крыніцамі якіх паслужылі разнастайныя па свайму характару топасы. Для доказу такой разнастайнасці начарціце – па аналогіі з прыведзенай М. В. Ламаносавым – спрошчаную табліцу вытворных ідэй да тэрміна *наганяць* дадзенай тэмы, выкарыстоўваючы наступную загалоўкавую графу:

| Топасы для падбору першасных ідэй | Першасныя ідэі |
|---|---|

### ПРАЎДА ДАГАНЯЕ ЛГУНОЎ І ЛЖЭСВЕДКАЎ (ГЕРАКЛІТ)

Этот электронный документ был загружен с сайта филологического факультета БГУ http://www.philology.bsu.by

Праўда, як і жыццё, рухаецца па свайму пастаяннаму маршруту. Яна ведае сваю мэту і свой адрас. Праўда адшукае тых, хто калі-небудзь хлусіў – родным ці знаёмым, на сяброўскай сустрэчы ці ў судзе. Яна прыйдзе да іх – раніцай ці вечарам, у жаркі ці ў марозны дзень. Праўда можа пастукаць у дзверы тады, калі яе зусім не чакаюць. Для яе не мае значэнне месца, дзе знаходзяцца лгуны – яна знойдзе іх у доме і на працы, у час ціхай адасобленай гутаркі або шумнай вечарынцы. І не трэба спадзявацца лгунам, што праўда пакіне іх без адказу за зробленае, што яна знікне і згіне з цягам часу. Не! Яна абавязкова прыйдзе, каб пакараць гэтых людзей, прыйдзе, нягледзячы на тое, як яны жывуць: у багацці ці ў беднасці, у занядбанні ці ў славе. Час расплаты наступае незваротна. Праўда ўварвецца ў сэрцы гэтых грэшнікаў, каб прыцягнуць да свайго суда, нягледзячы на ўсю ўладкаванасць жыцця лгуноў. Праўда дагоніць іх, як імклівы паляўнічы сокал даганяе сваю здабычу. Праўда рухаецца няспынна, як ні на імгненне не перапыняецца бег часу. Праўда прыйдзе, прыйдзе абавязкова, як прыходзіць за летам восень, а потым і зіма, як прыходзіць за сонечным днём непагадзь. Няхай не цяпер, не адразу з'явіцца яна да лгуноў у госці, а праз гады, але ўсё ж такі праўда будзе ісці ўпарта, крок за крокам, бо нічога не праходзіць бясследна на гэтай зямлі, бо за кожны свой учынак і слова людзі павінны адказваць.

Чакайце! Яна ўжо блізка! Прыйдзе Праўда!.. (Т. Кананові

4. Выкарыстоўваючы ламаносаўскую методыку вынаходства зместу прамовы цераз сістэму «агульных месцаў», падрыхтуйце невялікае (на 2–4 хвіліны) выступленне на адну з наступных тэм: «Дзяцінства – цудадзейная краіна», «Багацце занявольвае душу», «Эгаізм – гэта атрута для сяброўства» (А. Бальзак), «Няма суда вышэй за суд сумлення». (Рабочыя матэрыялы пажадана сістэматызаваць у табліцу.) Ацаніце, наколькі поўна і дакладна слухачы-студэнты вашай группы змогуць аднавіць пакладзеную ў аснову прамовы сетку асацыятыўных сувязей ключавых паняццяў тэмы і падабраных вамі для яе раскрыцця першасных ідэй.

5. Дакажыце на прыкладзе распрацаванай М. В. Ламаносавым методыкі вынаходства ідэй пры падрыхтоўцы выступлення справядлівасць выказанага акадэмікам В. У. Вінаградавым меркавання аб уласцівай ламаносаўскай «Рыторыкі» «наяўнай арыентацыі на глыбокую сэнсавую змястоўнасць прамовы як на аснову яе грамадскай каштоўнасці і грамадскага ўздзеяння».

## АКАДЭМІЧНАЕ КРАСАМОЎСТВА Ў РАСІІ Ў XIX СТАГОДДЗІ

У XIX стагоддзі ў Расіі перажывае час свайго грамадскага прызнання і росквіту акадэмічнае красамоўства. Пры гэтым, разам з поспехамі універсітэцкага выкладання, да другой паловы XIX стагоддзя адбываецца станаўленне асобнай жанравай разнавіднасці публічнай прамовы – навукова-папулярнай лекцыі з асветніцкай функцыяй. Непераўзыдзеныя ўзоры лектарскага майстэрства з навучальнымі і навукова-папулярнымі мэтамі ў

Этот электронный документ был загружен с сайта филологического факультета БГУ http://www.philology.bsu.by

той перыяд ствараюцца выдатнымі прадстаўнікамі як соцыягуманітарных ведаў (гісторыкамі Ц. М. Граноўскім, С. М. Салаўёвым, В. В. Ключэўскім, філолагам Ф. І. Буслаевым і інш.), так і прыродазнаўчых ведаў ( хімікам Дз. І. Мендзялеевым, фізікам М. А. Умавым, фізіёлагамі І. М. Сечанавым і І. П. Паўлавым, анатомам П. Ф. Лесгафтам, бактэрыёлагам І. І. Мечнікавым, заолагам А. М. Северцавым, батанікам К. А. Ціміразевым і інш.) і дакладных навук (напрыклад, матэматыкам М. І. Лабачэўскім). Намалюем самыя агульныя, эскізныя штрыхі да рытарычнага партрэту некалькіх праслаўленых лектараў таго часу.

«Ідэальным прафесарам 40-х гадоў» XIX стагоддзя называлі аднаго з «уладароў думак» эпохі, спецыяліста па гісторыі заходнееўрапейскага сярэдневякоўя Цімафея Мікалаевіча Граноўскага. Чатыры прачытаных ім курса публічных лекцый выклікалі вялікі грамадскі рэзананс: П. Я. Чаадаеў адзначыў, што лекцыі Граноўскага па гісторыі маюць «гістарычнае значэнне». Выступленні вучонага прасякнуты шчырым натхненнем яго высакароднай, рамантычнай натуры, заключаюць у сябе паэтычны, мастацкі элемент (невыпадкова іх выканаўца ў юнацтве пісаў і друкаваў вершы). Дасканальна валодаючы прадметам, лектар, аднак, не ашаламляў аўдыторыю сваёй эрудыцыяй, вялікай колькасцю цытат і спасылак. «Формулу» свайго рытарскага поспеху сам Ц. М. Граноўскі вывеў у наступных знамянальных словах: «Красамоўства? У мяне ёсць яно, таму што ў мяне ёсць цёплая душа і перакананні».

«Я гавару прыгожа, таму што мае словы прасякнуты маёй крывёй», – так не менш лаканічна і ёміста, гучала гэта «формула» з вуснаў іншага талантлівага рускага гісторыка Васілія Восіпавіча Ключэўскага. У лекцыях Ключэўскага знаходзяцца не толькі глыбокія веды дэталей, каларыту эпохі, якія дарылі слухачам быццам бы жывое сузіранне абставін, што апісваліся, але і вострую цікавасць да псіхалогіі простых людзей мінулага і манархаў. Дасціпнасць, месцамі – чэканная афарыстычнасць («формульнасць»), вельмі багатая палітра, насычаная яскравымі, трапнымі словамі і народнымі зваротамі, сапраўдны артыстызм у гульні інтанацыйных адценняў і кантрастаў (у патэтычныя моманты голас лектара нечакана зніжаўся да шэпту) – усё гэта захапляла шматлюдныя, заўсёды перапоўненыя аўдыторыі слухачоў Ключэўскага.

«Ідэальнага прафесара 60-х гадоў» увасабляў у сабе Фёдар Іванавіч Буслаеў. Паказальна яго рытарычная эвалюцыя. Першапачаткова вучоны чытаў лекцыі рускай славеснасці «з аркуша», па поўнасцю падрыхтаваным тэксце. Парадаксальна, аднак, што, нягледзячы на складанасць успрымання такой прамовы, Буслаеву ўдавалася зачароўваць студэнцкую аўдыторыю. Вытокамі гэтага з’яўляліся ўважлівая прадуманасць і цэльнааформленасць зместу (асобныя раздзелы курса, які чытаў Буслаеў, фактычна ўяўлялі сабой прыдатныя для публікацыі закончаныя навуковыя работы), уменне маляваць карціны славянскай старажытнасці, выразная, з падкрэсленай жэстыкуляцыяй манера выканання. Больш познія выступленні Ф. І. Буслаева

Этот электронный документ был загружен с сайта филологического факультета БГУ http://www.philology.bsu.by

дабавілі да гэтых вартасцей свабоду і натуральнасць жывой творчасці маўлення.

Лекцыі геніяльнага хіміка Дзмітрыя Іванавічам Мендзялеева не вызначаліся бездакорнай гладкасцю і плаўнасцю вымаўлення. Між іншым менавіта далучальнасць да працэсу навуковага мыслення, пошуку найбольш дакладных форм яго выкладання хвалявала і захоплівала слухачоў. Строгай сістэматычнасці ў выкладанні матэрыялу не перашкаджалі кароткія экскурсы ў гісторыю навукі і вобласць сумежных дысцыплін: фізікі, астраноміі, біялогіі, аграноміі і нават артылерыі. Велічны выгляд Мендзялеева, музычная разнастайнасць громкасці гучання яго голаса (ад шэпту да громападобных выклікаў), яго вышыня (ад ценару да нізкага барытону), тэмпа вымаўлення (ад скорагаворкі да задумлівага расцягвання слоў) не маглі не ўзмацніць уражання слухачоў.

Некаторыя зайздросныя і нядобразычлівыя калегі Пятра Францавіча Лесгафта спрабавалі растлумачыць шумны поспех яго лекцый «ігрой на публіку», наўмыснай пагоняй за папулярнасцю ў студэнтаў. Лесгафт у адказ пытаў, ці не бязглузда гнацца за тым, чым і так валодаеш… Сапраўднымі складальнікамі ўздзеяння выступленняў Лесгафта на слухачоў, многім з якіх непасрэдны ўплыў гэтага энергічнага, упэўненага чалавека дапамагаў пакінуць шкодныя звычкі і пачаць займацца спортам, былі здольнасць актывізаваць успрыяцце, дыялагізаваць – нярэдка ў палемічнай танальнасці – сваю лекцыю, падабраць пераканалыя жыццёвыя ілюстрацыі да сваіх разважанняў, урэшце, сама жывая манера лектара рухацца па аўдыторыі і задаваць слухачам пытанні. Наказам для вучняў Лесгафта служыў дэвіз: «Думка – уперад!».

Своеасаблівымі «лектарскімі запаветамі» буйнейшага аўтарытэта ў галіне фізіялогіі раслін і бліскучага папулярызатара навуковых ведаў Клімента Аркадзьевіча Ціміразева з’яўляюцца гістарычны падыход да тлумачэння, які дазваляў аднавіць драматызм паражэнняў і перамог чалавецтва ў пошуках праўды, а таксама суб’ектыўны, асобасны пачатак у выкладанні матэрыялу, які папярэдне павінен увайсці «ў кроў і плоць» прамоўцы. У цыкле з дзесяці публічных лекцый аб жыцці раслін (1875/76 гг.) К. А. Ціміразеў эфектыўна выкарыстоўвае прыём пастаноўкі праблемы, якая папярэджвае выкладанню, індуктыўны ход разважанняў (ад прыватнага да агульнага, ад дэманстрацыі вопытаў да вываду), літаратурныя і агульнакультурныя паралелі. Некаторыя яркія, натхняльна-вобразныя фрагменты яго выступленняў, паводле водклікаў сучаснікаў, здаваліся нават вершамі ў прозе.

Тэксты лекцый выдатных прадстаўнікоў акадэмічнага красамоўства XIX стагоддзя і сёння вабяць гармоніяй, спалучэннем глыбокай навуковасці зместу з яснасцю і захапляльнасцю формы. Яны не толькі навучаюць, але і выхоўваюць, адлюстроўваюць не застылыя веды ў іх гатовым, дагматычным выглядзе, а дынаміку пазнавальнага працэсу і разам з тым захоўваюць сталую эмацыянальна-эстэтычную каштоўнасць. Практычныя заданні дадзенага раздзела тэмы маюць на ўвазе манаграфічнае знаёмства з

Этот электронный документ был загружен с сайта филологического факультета БГУ http://www.philology.bsu.by

фраментамі аратарскай спадчыны Ц. М. Граноўскага – пачынальніка рускай лектарскай школы.

## Тэкст 1

**1.** Гісторык Ц. М. Граноўскі прызнаваўся, што ў гісторыі яго асабліва вабілі і прыцягвалі, як магнітам, пераходныя, пераломныя эпохі. Як вы думаеце, чаму? Прачытайце ўрывак.

### З лекцый 1849/50 г. (Аб пераходзе ад сярэдніх вякоў да Адраджэння і новага часу)

…Паміж гісторыяй сярэдняй і новай ёсць істотнае адрозненне. Але ўсякі раз, калі выпадае адзін парадак рэчаў, з'яўляюцца вестуны, па якіх вопытнае вока можа ўбачыць заняпад. Тады супраць усякага былога напрамку з'яўляецца новы рашучы напрамак. У сярэднія часы была свая геаграфія, свая дзяржава, свая царква і навука. І вось напрыканцы 15 стагоддзя з'яўляецца Хрыстафор Калумб і пашырае межы, якія былі пастаўлены ўсяму свету ў сярэднія вякі. Новаму чалавецтву цесна ў былых межах… У сярэднія вякі была свая дзяржава, свае палітычныя тэорыі. У канцы 15 і пачатку 16 стагоддзя гучыць… голас фларэнційскага грамадзяніна Нікало Макіявелі. Больш рэзкага адмаўлення ад сярэдневяковых тэорый нельга сабе ўявіць. І адзінства сярэдневяковай царквы было разбіта Рэфармацыяй нямногімі асобамі, якія смела пачалі барацьбу. Але сярэдні век яшчэ не зжыў усе свае пачаткі да канца. Урэшце, сярэдневяковая навука, схаластыка, некалі настолькі бліскучая і смелая, якая ператварылая ў 14 і 15 стагоддзях у навуку аб формах, бясплённай, пачынаннем якой стала абараняць ісціны і паняцці сярэдніх вякоў, і гэта навука разбіваецца намаганнямі гуманістаў: Эразм, Рэйхлін выступаюць супраць яе. За імі – юная дружына людзей, якія вывучылі і паважаюць глыбока класічнае мастацтва. Паўсюль, адным словам, заўважаны разрыў паміж сярэдневяковым і новым жыццём. Можа быць, у цэлай гісторыі чалавецтва няма такой урачыстай і радаснай эпохі, як гэта. Самыя сухія даследванні вучоных носяць у той час нейкі лірычны характар. Яны думалі, што доўгія выпрабаванні скончыліся, што ўсе ідэалы чалавецтва гатовы здзейсніцца. Падзеі не апраўдалі гэтых спадзяванняў: 16 і 17 стагоддзі прадстаўляюць нам страшную барацьбу паміж старымі і новымі элементамі. Чалавек нецярплівы; ён думае, што з падзеннем аднаго ў той жа час пачынаецца лепшае, але гісторыя не спяшаецца. Разбураючы адзін парадак рэчаў, яна дае час згніць яго руінам, і разбуральнікі былога парадку ніколі не бачаць сваімі вачамі той мэты, да якой яны ішлі. Такім чынам, мы бачым у новай гісторыі пастаянную барацьбу паміж уцалелымі элементамі сярэдніх вякоў, новыя патрабаванні, новую навуку, новыя ідэі. Гэта надае новай гісторыі драматычны характар.

Этот электронный документ был загружен с сайта филологического факультета БГУ http://www.philology.bsu.by

1. Якія моцныя бакі мыслення Граноўскага адлюстраваліся ў дадзеным эскізе гістарычнай панарамы? Дакажыце ўласцівыя лектару шырыню абагульнення і сістэмнасць бачання падзей мінулага (якія сферы чалавечага існавання і розуму паказаны як ахопленыя карэннымі пераўтварэннямі?); дыялектычнасць погляду. Ці можна назваць выкладанне зместу прамовы паслядоўным і лагічным? Выпішыце двойчы выкарытаныя рытарам паказчыкі падсумоўвання, якія папярэджвалі абагульняючым меркаваннем і рабілі сэнсавую структуру прыведзенай часткі выступлення больш зразумелай для студэнтаў.

2. Якім чынам, на ваш погляд, больш правільна можна ацаніць танальнасць падачы Ц. М. Граноўскім матэрыялу пра дастаткова аддаленыя ў часе ад яго і слухачоў фазы развіцця ўсеагульнай гісторыі: як спакойную, роўную і некалькі сухаватую – або як узвышаную, прасякнутую патэтыкай і драматызмам? Якія пачуцці ажыўляюць разгорнутую выкладчыкам перад аўдыторыяй карціну змены гістарычных перыядаў?

3. Вядома, што сябры і калегі называлі Ц. М. Граноўскага «мастаком на кафедры». Якія рытарычныя прыёмы надаюць гэтаму ўрыўку вобразнасць і мастацкасць? Выпішыце з яго: а) эпітэты; б) метафары. Сярод апошніх падкрэсліце выпадак разгорнутага ўвасаблення.

## Тэкст 2
## (Пра асобу і лёс Жанны д’Арк)

Калі справы Францыі былі ў дрэнным стане і на прастоле французскім сядзеў Генрых VI Плантагенет дынастыі Ланкастарскай, калі большая частка абласцей прызнала яго ўладаром і апошні Капетынг ледзь знаходзіў прыстанішча ў заходніх абласцях Францыі, [якая заўсёды вызначалася прыхільнасцю да манархаў], – недалёка ад Вандэі жыў Карл VII, – у гэту эпоху здзейснілася справа, сэнс якой нялёгка разгадаць і цяпер: простая дзева выступіла дзеля выратавання Францыі. Вядома, як шмат супярэчлівага гаварылі пра гэтую загадкавую з’яву. Ужо сярод сучаснікаў Жанны д’Арк чуліся насмешлівыя галасы; большасць лічыла яе вядзьмаркай, высшыя колы – ілгуньяй або падманутай цешчай Карла VII.

18 стагоддзе, згодна са сваім напрамкам, прылічыла Дзеву Арлеанскую да асоб, праслаўленых у гісторыі шчаслівым падманам. Вальтэр зацямніў яе паэтычным, але амаральным творам. Толькі даследванні нашага часу далі магчымасць зразумець гэтую з’яву. Працэс Арлеанскай Дзевы надрукаваны ў наш час. Мы бачым у ёй адну з прызначаных боскай воляй істот, адораных незвычайнай жывасцю ўражанняў, глыбокай душой, якая рана пачала сумаваць аб бедствах тагачаснай Францыі. Ёй гэтыя бедствы былі вядомы не па чутках, яна бесперапынна бачыла натоўп [сялян], які бег з краін, занятых англічанамі, бачыла часта зарава пажараў. Яе пастаянна мучыла думка аб бедствах Францыі і аб яе выратаванні. І вось, урэшце, ёй пачалі з’яўляцца прывіды, яна пачала чуць галасы. Зразумела, сярод простых сялян слава яе не магла зрабіць важнага ўражання. Калі яна прыйшла з дзядзькай да аднаго з

Этот электронный документ был загружен с сайта филологического факультета БГУ http://www.philology.bsu.by

суседніх рыцараў і прасіла яе да караля, той параіў дзядзьке даць ёй аплявуху і адвесці дадому. Гэткія цяжкасці недаверу выпала ёй пастаянна пераадольваць. Не прымаючы за станоўчы факт расказ пра яе спатканне з Карлам, мы можам растлумачыць вельмі проста яе ўплыў на караля. Гэта здарылася, калі англічане акружылі Арлеан; калі б яны яго ўзялі, нацыянальная справа канчаткова загінула бы. Прыхільнікамі Карла авалодалі безнадзейнасць і туга. Сам Карл, таленавіты, але лянівы і бестурботны ўладар, знясілеў ад дробных намаганняў і гатоў быў не раз адрачыся ад свайго прастолу.

Раптам сярод гэтага стомленага двара і безыніцыятыўнага войска з'яўляецца жанчына са словамі натхнення; людзі простыя зачараваліся яе загадкавасцю, людзі дальнабачныя зразумелі магчымасць скарыстаць яе як сродак: але яны хутка памыліліся. Кароль прапанаваў паставіць вопыт – адправіць яе на дапамогу ў Арлеан; громкі погалас папярэджваў яе з'яўленню.

Народ прыняў яе як святую, пачаў бітву з натхненнем. Пабудаваныя [англічанамі] умацаванні ўзяты, ва ўсіх прыступах яна ўдзельнічала асабіста, аднойчы яна была паранена. Да якой ступені ў ёй было шмат жаноцкасці, бачна з расказу сучаснікаў: калі яна была паранена, яна спужалася і заплакала, але хутка ўспрыяла духам зноў. Калі англічане знялі асаду, слава яе пашырылася па ўсёй Францыі. [Яна сваім з'яўленнем надала вайне характар народнай.] Народныя массы не варушыліся да той пары; цяпер яны зварушыліся, на чале іх ішла Дзева нізкага паходжання, яна прывяла Францыю да ўсведамлення нацыянальнасці. У дзеяннях яе і парадах Карлу праглядаецца рэдкі розум, яе дзеянні смелыя. Пасля перамогі яна прыходзіць прама да Рэймса і ўвенчвае караля. Але калі гэта было зроблена, калі недастаткова было аднаго прыроднага розуму і натхнення, а трэба было дзейнічаць згодна з партыямі двара, яна пала духам; пасля няўдалага нападу на Парыж яе дух паў; яе абвінацілі ў здрадзе, яе не любілі рыцары Карла, бо яна ад іх патрабавала строгага падпарадкавання і маральнага жыцця. У палоне пасля доўгага працэсу, дзе яна выступала з усёй чысцінёй, яе спалілі. У адказах сваіх яна была надзвычай простай, напоўнена высокай паэзіі. Яна не надзявала на сябе маску гераізму і паказала, што баіцца смерці, хоць была ўпэўнена ў праўдзівасці сваёй справы. Уласна, ёй тады ўжо і не трэба было нічога рабіць, яна выканала сваю справу. Можа быць, потым, калі б яна засталася сярод распуснага двара, то страціла бы свой паэтычны характар. Вынікі гэтай з'явы былі незвычайна значныя для французскай гісторыі. Яна павяла за сабой народ французскі, калі ніводнае феадальнае саслоўе не магло абараніць дзяржаву.

Яна прывяла Францыю да ўсведамлення нацыянальнасці і прадставіла незвычайную з'яву: дачка селяніна некаторы час стаяла вышэй не толькі за рыцараў, але і кароль быў паслухмяным выканальнікам яе загадаў. З той пары англічане дзейнічалі паспяхова, Карл VII прачнуўся ад дрымоты, і менавіта з таго часу яго кіраванне ўяўляе надзвычай добры характар…

Этот электронный документ был загружен с сайта филологического факультета БГУ http://www.philology.bsu.by

1. Ці ўласцівы фрагменту лекцыі, прысвечанай асобе Жанны д'Арк, праблемнасць і палемічнасць? Аргументуйце свой адказ.

2. Ці можна назваць намаляваны Ц. М. Граноўскім вобраз Жанны д'Арк поўнасцю ідэалізаваным? Якія згаданыя ў лекцыі дэталі біяграфіі Жанны дапамагаюць пазбегнуць яго схематызму і прамалінейнасці? Ці прыводзіць пералічэнне лектарам «негераічных» рыс яе паводзін да дэгераізацыі, развенчванню ў вачах слухачоў легендарнага вобраза Арлеанскай Дзевы?

3. Выпішыце выкарыстаныя Ц. М. Граноўскім словы-сінонімы па названаму 1-му з іх: *селянін* – _____; *пастаянна* – ______; *безнадзейнасць* – ______; *натхненне* – ______ . Пра якую якасць прамовы Граноўскага сведчыць іх выкарыстанне?

4. Ці выказваецца ў дадзеным урыўку стаўленне лектара да таго, пра што ён гаворыць? Выпішыце ацэначныя прыметнікі і прыслоўі, якія падкрэсліваюць выключнасць асобы Жанны д'Арк.

5. Якія вобразныя выразы робяць больш запамінальнымі характарыстыкі Жанны д'Арк і Карла VII? Да якой разнавіднасці тропаў належаць згаданыя вамі выпадкі?

6. Якія займеннікі і дзеяслоўныя формы дапамагаюць лектару ўстанавіць кантакт з аўдыторыяй, прыцягнуць слухачоў да сумеснага працэсу пазнання?

7. Знайдзіце ва ўрыўку выступлення прыклад <u>фігуры перыяду</u> – разгорнутай сінтаксічнай кантрукцыі, для інтанацыйнага контуру якой характэрна супрацьпастаўленне ўзыходнай і сыходнай частак, падзеленых выразнай паўзай. Укажыце месца такой паўзы ў вылучаным вамі моўным утварэнні. Якое сэнсавае значэнне мае дадзены перыяд (у адпаведнасці з сэнсавым профілем выкарыстаных у ім аднародных даданых сказаў)? Дакажыце на дадзеным прыкладзе, што перыяд не толькі надае прамове рытмічную гарманічнасць і вытанчанасць, але і абвастрае ўвагу слухачоў, робіць больш напружаным чаканне працягу выступлення. Прыдумайце свой прыклад перыяду, пабудаваны ў адпаведнасці з адной наступных схем.

<u>Мадэлі перыядаў з параллелізмамі і паўторамі</u>

а) Перыяд азначальны
*Хто…, хто…, хто…, – той… .*
б) Перыяд заключны
*Настолькі…, настолькі…, настолькі… – што… .*
в) Перыяд умоўны
*Калі…, калі…, калі…, – то… .*
г) Перыяд уступальны
*Няхай…, няхай…, няхай… – але ўсё ж… .*
д) Перыяд супастаўляльны
*Чым…, чым…, чым… – тым… .*

8. Разважаючы пра лекцыі Граноўскага, В. В. Ключэўскі робіць парадаксальныя, на першы погляд, заўвагі (прыводзім іх у скарачэнні):

Этот электронный документ был загружен с сайта филологического факультета БГУ http://www.philology.bsu.by

«Грано̆ускі выкладаў навуку аб мінулым, а слухачы выносілі з яго лекцый веру ў сваю будучыню… Лекцыі Граноўскага аб феадальным сярэдневякоўі выхоўвалі дзейсную любоў да рускай Айчыны, энтузіястычную прагу да працы на яе карысць, моцнасць духу, ідэю абавязка і адказнасці перад грамадствам». Ці можна параўнаць гэта выказванне з прыведзеным фрагментам? Ці мог ён мець якое-небудзь значэнне для грамадзянскага выхавання і духоўнага развіцця слухачоў?

9. Паводле ўспамінаў сучаснікаў, Ц. М. Граноўскі зусім не належыў да тыпу аўтарытэтнага выкладчыка, гаварыў нягучна, трохі заікаўся, часам глытаў словы. Дзякуючы чаму, на ваш погляд, яму ўсё ж удавалася непадзельна валодаць увагай аўдыторыі?

10. Як згадвалася вышэй, Ц. М. Граноўскага называлі «ідэальным прафесарам 40-х гадоў» XIX ст. Напішыце невялікую прамову-разважанне на тэму «Ідэальны прафесар (лектар) XIX і пачатку XXI стагоддзяў».

## ЦЭЛАСНЫ АНАЛІЗ ТЭКСТУ ПРАМОВЫ

Прааналізуйце сваю прамову (або адносна скончаны ўрывак прамовы) аднаго з вядомых аратараў мінулага па прапанаваным плане.

### План-схема
### цэласнага гісторыка-рытарычнага аналізу тэксту прамовы

Аспекты аналізу:
1 – сітуацыйны;
2 – класіфікацыйны;
3 – аргументатыўны;
4 – структурны;
5 – стылістычны;
6 – вымаўленчы.

1. Высветліць з каментарыя прыблізную храналагічную суаднесенасць тэксту і скласці агульнае ўяўленне аб эстэтыка-культурным і (калі неабходна) сацыяльна-палітычным/судовым кантэксце стварэння прамовы. Якое месца займае твор, што аналізуецца, у жыццёвай і творчай біяграфіі аратара-аўтара?

2. Ахарактарызаваць родавую прыналежнасць прамовы, яе асноўную агульную мэту (адказ аформіць тэрміналагічна).

3. а) Вызначыць цэнтральны тэзіс прамовы і спосабы яго доказу (вывады, прыклады, аналогіі).

б) Ацаніць суадносіны рацыянальных і эмацыянальных кампанентаў прамовы. Да якога аратарскага тыпу належыць прамоўца: да рацыянальнага (лагічнага), эмацыянальнага (мастацкага) або сінтэтычнага? Як можна ахарактарызаваць «вобраз аратара»: якія «аратарскія дабрачыннасці» імкнецца паказаць прамоўца? Менавіта да якіх пачуццяў слухачоў ён звяртаецца?

Этот электронный документ был загружен с сайта филологического факультета БГУ http://www.philology.bsu.by

4. Вывучыць кампазіцыйныя асаблівасці прамовы, вызначыўшы межы ўступу і заключэння. Якія прыёмы маўленчага звароту сустэліся ва ўступе і заключэнні прамовы? У якім парадку падаецца матэрыял у апавяданні (прамым, зваротным, інверсійным), у разважанні (дэдуктыўным, індуктыўным)?

5. Ахарактарызаваць стыль прамовы як агульную яе танальнасць (высокі, сярэдні, нізкі, змешаны). Прарэцэнзаваць прамову з пункту гледжання такіх камунікатыўных якасцей, як чысціня маўлення, слоўнае багацце, кароткасць/разгорнутасць. Адзначыць асобныя, найбольш яркія рытарычныя сродкі (тропы і фігуры маўлення) і ацаніць эффект ад іх выкарыстання (памятайце: значэнне мае не проста пералік і кваліфікацыя рытарычных фактаў тэксту, а вылучэнне іх функцыі ў маўленні!).

6. Вызначыць аптымальную вышыню тону, інтэнсіўнасць гучання (гучную/ціхую) і тэмп вымаўлення (хуткі/замедлены) асобных частак прамовы. У якіх месцах прамовы можна прымяніць жэстыкуляцыю і якую па характару?

ВЫВАД: даць агульную ацэнку прамове з пункту гледжання таго, што ў ёй прадстаўляе пераважна пазнавальны, гісторыка-рытарычный інтарэс, а што мае значэнне для сучаснай аратарскай практыцы.

## МОЎНЫЯ АСАБЛІВАСЦІ ВУСНАЙ ПУБЛІЧНАЙ ПРАМОВЫ

### Асноўныя тэарэтычныя звесткі па тэме

Аратар, які імкнецца да натуральнага і жывога ўражання ад сваіх выступленняў, павінен арыентавацца на своеасаблівасць вуснай публічнай прамовы (далей выкарыстоўваецца прынятая ў даследваннях абрэвіятура ВПП). Комплекс моўных рыс, з асаблівай частотнасцю прадстаўленых у ВПП, дыктуецца самой спецыфікай сітуацыі публічных выступленняў. Абагульнена і коратка ў ліку сітуацыйных якасцей ВПП трэба перш за ўсё адзначыць:

1) ***зваротнасць (кантактнасць)* –** неабходнасць уліку рэакцыі слухачоў;

2) ***невяртальнасць* –** неабходнасць аператыўнага засваення без магчымасці звароту адрасата да папярэдняга тэксту.

Калі першую асаблівасць пажадана ўзмацняць, то другую – нейтралізаваць. У ролі канкрэтных моўных сродкаў, якія служаць для ўзмацнення ***кантактнасці*** прамовы, можна назваць:

**І-1.** ***Звароты***, якія, безумоўна, датычацца да цэнтральнай зоны агульнага поля сродкаў маўленчай кантактнасці. Пры выкарыстанні зваротаў мэтазгодна ўлічваць наступныя рэкамендацыі:

- нежадана злоўжываць адным і тым жа зваротам на працягу ўсёй прамовы. Так, да аўдыторыі можна звярнуцца, асобна падкрэсліваючы яе ўзроставы склад (***маладыя людзі)***, сацыяльны статус (*дарагія* ***студэнты-***

Этот электронный документ был загружен с сайта филологического факультета БГУ http://www.philology.bsu.by

***трэцякурснікі***), прафесійную арыентацыю (*паважаныя калегі-**філолагі***), стаўленне аратара да слухачоў (***сябры***) і да т. п.;

ü чым больш афіцыйнай з'яўляецца сітуацыя зносін, тым больш нейтральнымі і менш арыгінальнымі павінны быць звароты, якія выкарыстоўваюцца;

ü пры асобасна арыентаваным падыходзе да навучання ў педагагічнай рыторыцы заканамерна ўзрастае значнасць індывідуальных зваротаў.

**I-2. Асабістыя займеннікі 1 і 2 ас. мн. л.**, адпаведныя ім ***прыналежныя*** займеннікі і ***дзеясловы*** ў аналагічных формах. Займеннік *мы,* які аб'ядноўвае аратара і слухачоў, называецца «*мы* сумеснае» (***мы** ведаем, што…; як **мы** бачым,* …). Часам сустракаюцца так званыя займенныя канкрэтызатары, якія дадаткова ўзмацняюць кантактнасць прамовы (***усе** мы, мы **з вамі***). У такіх моўных зваротах часта ўжываюцца дзеясловы са значэннем разумова-маўленчай дзейнасці (*магчыма, вы **мяркуеце,** што…; вы, канешне, **згадзіцеся** з тым, што…*).

**I-3. Пытанні** розных тыпаў, у прыватнасці:

**а)** ***рытарычныя пытанні*** **–** пытанні, якія не патрабуюць адказу: *Хто з аратараў не марыць знайсці агульную мову з аўдыторыяй? = Кожны аратар марыць знайсці агульную мову з аўдыторыяй.*

**б)** пытанні ў складзе ***пытальна-адказных адзінстваў*** **–** пытанні, на якія адказвае сам аратар: *Як знайсці агульную мову з аўдыторыяй? Па-першае, неабходна ўлічваць яе склад…* .

Пытальна-адказныя канструкцыі здольны садзейнічаць праблемнасці выкладання і дакладнаму ўяўленню кампазіцыйнай структуры матэрыялу (пытальныя фармулёўкі пунктаў плана могуць пачынаць структурныя блокі тэксту).

Палегчыць успрыманне ВПП і тым самым пераадолець магчымыя адмоўныя наступствы яе ***невяртальнасці*** для засваення і запамінання зместу дазваляюць:

**I-1.** ***Скарачэнне даўжыні сказаў*** і ***спрошчанне іх структуры.*** Разам з тым ужыванне адных кароткіх сказаў таксама здольна стаміць слухачоў. Таму аптымальным для сінтаксічнага складу ВПП лічыцца спалучэнне кароткіх і больш працяглых (хоць і не вельмі доўгіх) фраз. Важна адзначыць, што сказы, арганізаваныя па мадэлях пабудовы фігур маўлення, дзякуючы замацаванасці гэтых мадэлей ва ўсведамленні слухачоў і ўмацаванню выразнасці ўспрымаюцца лягчэй, чым іх аналагі з роўнай ступенню распаўсюджанасці, якія не змяшчаюць падобных рытарычных сродкаў. (Вось чаму, напрыклад, не існуе прынцыповай забароны на ўключэнне ў прамову такой масіўнай структуры, як перыяд.)

Успрыманне ВПП спрошчваюць такія сінаксічныя прыёмы, як:

**а)** замена дзееprыметных словазлучэнняў дададымі азначальнымі сказамі: *Аргумент – сцвярджэнне (ці сукупнасць сцвярджэнняў), прыведзенае ў падтрымку сапраўднасці іншага сцвярджэння і пакладзенае ў аснову доказу*

Этот электронный документ был загружен с сайта филологического факультета БГУ http://www.philology.bsu.by

*Аргумент – сцвярджэнне (ці сукупнасць сцвярджэнняў), якое прыводзіцца ў падтрымку сапраўднасці іншага сцвярджэння і кладзецца ў аснову доказу*;

**б) *«назоўны самастойны»*,** які вядомы лінгвіст Аляксандр Мацвеевіч Пяшкоўскі называў «лектарскім назоўным» па прычыне яго распаўсюджанасці ў акадэмічным красамоўстве, – дубліраванне назоўніка, які абазначае прадмет маўлення, займеннікам: ***Рыторыка – яна*** *нарадзілася больш за 25 стагоддзяў таму* (падобныя канструкцыі дазваляюць рэльефна вылучыць прадмет абмеркавання);

**в) *парцэляцыя*** (ад лац. *pars* – 'частка') – разбіўка сінтаксічна адзінай канструкцыі на камунікатыўна самастойныя часткі: *мы даверылі менавіта гэтаму прэтэндэнту адказнае выступленне і не памыліліся, нават атрымалі такі грамадскі водгук, на які не маглі разлічваць. Мы даверылі менавіта гэтаму прэтэндэнту адказнае выступленне. І не памыліліся. Нават атрымалі такі грамадскі водгук, на які не маглі разлічваць* (падкрэслены парцэляты – маўленчыя адрэзкі, якія набылі інтанацыйную саматойнасць). Пры парцэляцыі, у адрозненне ад разбіўкі складаных сказаў на простыя, таксама вельмі актуальнай пры падрыхтоўцы пісьмовага тэксту да вуснага гучання, выніковыя парцэляваныя сегменты выказвання маюць выгляд няпоўных;

**г)** перавага складаназлучаным сказам у параўнанні з складанападпарадкаванымі (першыя, паводле эксперыментальных дадзеных, засвойваюцца лягчэй): ***Нягледзячы на тое, што*** *рытарычная традыцыя сягае сваімі каранямі ў глыб стагоддзяў, рыторыка не спыняе сваё развіццё, абагачаецца новымі праблемнымі арыентацыямі і рашэннямі. Рытарычная традыцыя сягае сваім каранямі ў глыб стагоддзяў,* ***але*** *рыторыка не спыняе сваё развіццё, абагачаецца новымі праблемнымі арыентацыямі і рашэннямі.*

**ІІІ-3. *Паўторы*** розных відаў, асобныя з якіх паказаны на схеме 1. Заслугоўвае ўвагі і такая ўласцівая многім выступленням асаблівасць ВПП, як ***блізкасць да гутарковай мовы.*** Уплыў гутарковай моўнай стыхіі выяўляецца ў канкрэтных рысах ВПП:

**а)** распаўсюджанасць ***гутарковых слоў і выразаў, ацэначных элементаў.*** У прыватнасці, часам адзначаецца выкарыстоўванне так званых тэмпераментных эпітэтаў – экспрэсіўных, з доляй перабольшання азначэнняў (пісьмовая мова звычайна больш асцярожная ў ацэнках): ***фенаменальныя*** *поспехі,* ***вар'яцкая*** *ідэя.* У сённяшні час, паводле меркавання спецыялістаў, назіраецца тэндэнцыя да вядомай дэмакратызацыі акадэмічнага красамоўства – дасягненню больш натуральнай, нефармальнай атмасферы зносін шляхам выкарыстання гутарковых элементаў, якая, аднак, прадугледжвае разумную памяркоўнасць у іх ужыванні, а таксама рашучае пазбяганне прастамоўя і вульгарызмаў;

Тоесныя (дакладныя, літаральныя)

Элементарныя (простыя, адналексемныя)

Па форме

Варыятыўныя (відазмененыя, мадыфікаваныя, перыфрастычныя, семантычныя)

Этот электронный документ был загружен с сайта филологического факультета БГУ http://www.philology.bsu.by

Па памерах
Разгорнутыя
**П А Ў Т О Р Ы**
Па знаходжанні
Кантактныя (сумежныя)
Дыстантныя (разгрупаваныя)
М а л. 1
**Розныя класіфікацыі слоўных паўтораў як сродкі пераадольвання невяртальнасці ВПП**

**б)** частотнасць ***інверсій*** **–** адступленняў ад прамога парадку слоў: *На практычных занятках студэнты актыўна адказвалі, прыводзілі* ***прыклады цікавыя.***

Па прычыне вуснай прыроды ВПП уласцівы таксама наступныя асаблівасці:

- ***перарывістасць.*** Яна выяўляецца ў розных момантах: самаперабіваннях прамоўцы і зрывах пачатых канструкцый; паўзах разважання (хістанні, хезітацыі); іх запаўненні асобнымі гукамі (працяглымі *э-э, м-м*), словамі і выразамі (*у агульным, значыць, так сказаць*); вымушаных паўторах-падхватках і да т.п.
- ***наяўнасць слыхавага і зоркавага ўспрымання так званых паралігвістычных*** (пазаслоўных, невербальных) ***дапаўненняў маўлення***: змяненняў гучнасці, вышыні і тэмбру голасу прамоўцы, тэмпу маўлення, інтанацыі, позы, дыстанцыі да аўдыторыі, мімікі, погляду, жэстыкуляцыі і інш., што здольна значна пашырыць сэнсавую ёмістасць выкладання.

Пры падрыхтоўцы да выступлення ў **пісьмовай** форме трэба тым не менш падрыхтоўваць менавіта **вусную публічную прамову** ў яе непаўторнасці і своеасаблівасці, маючы на ўвазе весь комплекс акрэсленых асаблівасцей, усяляк узмацняць і культываваць пажаданыя для ВПП рысы і імкнуцца нівеліраваць уздзеянне непажаданых.

## Пытанні і заданні

**1.**1. Запоўніце правую графу табл. 1 характарыстыкамі сітуацыйных асаблівасцей ВПП у параўнанні з пісьмовай мовай і ў супрацьпастаўленні ёй.

Табліца 1

**Сітуацыйныя асаблівасці ВПП у параўнанні з пісьмовай мовай**

| Пісьмовая мова | ВПП |
|---|---|
| **I**.Той, хто піша, і адрасат звычайна ўяўляюць адзін аднаго толькі ў думках.<br>Прамова не можа мяняцца ў залежнасці ад рэакцыі адрасата, якой | |

Этот электронный документ был загружен с сайта филологического факультета БГУ http://www.philology.bsu.by

| | |
|---|---|
| бы яна не была (разуменне / непаразуменне, адабрэнне / неадабрэнне і г.д.) | |
| **II.** Той, хто чытае, можа вярнуцца да прачытанага раней, перачытаць незразумелае. | |
| **III.** Той, хто піша, як правіла, мае больш выйгрышныя магчымасці для ўдасканалення свайго тэксту на фінальным этапе яго стварэння. Цяжкасці пры стварэнні прамовы ў большасці не бачны адрасату. | |

2.Назавіце тры абагульненых паняцці, згаданых у тэарэтычнай даведцы і звязаныя адпаведна з кожнай з трох адзначаных вамі глабальных сітуацыйных рыс ВПП.

**2**. На чым заснаваны камічны эффект вядомай анекдатычнай замалёўкі?

Спіч на званай вячэры:

– Лэдзі і джэнтльмэны! Я звяртаюся да вас так выключна па традыцыі, нягледзячы на тое, што добра вас усіх ведаю…

Якая з характарыстык звароту, што прагучаў, не зусім задавальняла прамоўцу? Якую асаблівасць гэтага звароту ён пры гэтым выпусціў з-пад увагі?

**3.**Уявіце сабе карціну на абароне дыпломнай работы. Студэнт-дыпломнік становіцца за кафедру і гаворыць наступнае: «Глыбокапаважаны Старшыня дзяржаўнай экзаменацыйнай камісіі! Паважаныя члены дзяржаўнай экзаменацыйнай камісіі! Паважаны навуковы кіраўнік дыпломнай работы! Паважаны рэцэнзент дыпломнага даследавання! Паважаныя прысутныя, выкладчыкі і студэнты, знаёмыя і сябры!». Як будзе ўспрыняты слухачамі такі пачатак выступлення? Які варыянт выкарыстання зваротаў з’яўляецца дапушчальным для дадзенага выпадку?

**4.** Прапануйце як мага больш розных зваротаў, магчымых у адносінах да аўдыторыі: а) студэнтаў III курса філалагічнага факультэта універсітэта; б) вучняў 5-га класа агульнаадукацыйнай школы.

**5.**1. Растлумачце, чаму камунікатыўна-кантактныя звароты называюць «фокуснымі адзінкамі» (А. К. Міхальская).

2. Пабудуйце па адным камунікатыўна-кантактным звароце на аснове прыведзеных ніжэй асноўных дзеясловаў.

Думаць, лічыць, меркаваць, ведаць, разумець, помніць, згаджацца, пацвярджаць, прызнаваць, пераконвацца, верыць, сумнявацца, пярэчыць, спрачацца.

**6.** Зачытайце наступныя сказы з выступленняў студэнтаў-філолагаў, уводзячы ў кожнае з іх камунікатыўна-кантактны зварот, які ўзмацняў бы адрасаванасць прамовы да слухачоў. Імкніцеся выкарыстоўваць разнастайныя звароты. З апошнім з тэзісаў пастарайцеся выклікаць у

Этот электронный документ был загружен с сайта филологического факультета БГУ http://www.philology.bsu.by

слухачоў нязгоду шляхам выкарыстання адпаведнай камунікатыўна-кантактнай формулы.

1. Ефрасіння Полацкая – знакамітая беларуская асветніца. 2. Знак – двухбаковая з’ява, якая мае план зместу і план выяўлення. 3. Не трэба быць лінгвістам, каб зразумець, што ў прамове змяшчаюцца не толькі канкрэтныя звесткі, але і перадаецца ўнутранае становішча чалавека. 4. Вясна абуджае ў душы чалавека думкі пра цяпло, каханне і вечную сілу жыцця.

**7.** Трансфармуйце прыведзеныя ніжэй меркаванні ў рытарычныя пытанні. Выпішыце маўленчыя стэрэатыпы, якія дапамаглі вам у гэтым.

1. Прыемна хадзіць па ўсыпаным рознакаляровым лісцем восеньскім парку. 2. Нікому не патрэбны спрэчкі па дробязях. 3. Усе мы рабілі памылкі. 4. Трэба было звярнуцца за дапамогай да сяброў. 5. Не трэба гнявіць нябёсы бясконцымі скаргамі. 6. Няма ніякай радасці ў тым, каб заставацца летам у душным, пыльным горадзе. 7. Нідзе, акрамя як у Італіі, вы не паспрабуеце сапраўднай піцы. 8. Ніколі гэтага не было, каб воўк пачаў есці толькі рамонкі. 9. Надыйшоў час перастаць спадзявацца на раптоўны цуд і пачаць дзейнічаць самім. 10. Гэта шчасце, калі цябе разумеюць. 11. Нішто не можа быць больш бескарыслівым і самаадданым, чым любоў маці.

**8.**1. Па кожнай з падобных адна на адну фраз-асноў складзіце рытарычнае пытанне, якое па стэрэатыпу пабудовы адрознівалася бы ад астатніх.

1. Вы марыце аб прыгожым, змястоўным і добра пражытым жыцці. 2. У лесе вы адчуваеце сябе, як у зачараваным царстве. 3. Вясной вы адчуваеце асаблівую цеплыню і жыватворнасць сонечных праменняў.

2. Якія яшчэ моўныя сродкі, характэрныя для вуснага публічнага выступлення, выкарыстаны ва ўсіх гэтых сказах?

**9.** Па прапанаваным змесце ўрыўка з студэнцкага выступлення пабудуйце серыю пытальна-адказных канструкцый.

Неабходную вучэбную літаратуру студэнт атрымлівае ў бібліятэцы на сваім факультэце. Калі патрэбнага дапаможніка не знайшлося, карыстайцеся чытальнымі заламі іншых бібліятэк. Калі ж кніга новая і пакуль не паступала ў бібліятэкі, можна пашукаць яе ў кніжных магазінах.

**10.** Прадоўжыце пытальна-адказныя структуры па прапанаваным пачатку.

1. Гэты чалавек вядомы ўсяму свету. Чым жа ён вядомы?… 2. Гэта праблема хвалюе многіх. Чаму?... 3. Чаму я выбраў(ла) менавіта гэту прафесію? Таму што…

**11.** Якое пажаданне да моўных форм публічных выступленняў, на ваш погляд, можа быць сфармулявана на аснове апісаных ніжэй параўнанняў Арыстоцеля?

«З аднаго боку, слухач можа знаходзіцца ў незайздросным становішчы спадарожніка, які адстаў ад свайго правадыра па дарозе ў густым лесе. З другога – слухач можа нагадваць бегуна, які чапляецца за фінішную стужку і падае, пры гэтым працягваючы па інерцыі рухацца наперад».

Этот электронный документ был загружен с сайта филологического факультета БГУ http://www.philology.bsu.by

**12.** Пераўтварыце дзеепрыметныя словазлучэнні з прыведзенага ніжэй энцыклапедычнага азначэння так, каб дадзены кантэкст пры неабходнасці лягчэй успрымаўся на слых. Зрабіце вывад, якая частка структуры навуковага азначэння (дэфініцыі) нярэдка змяшчае дзеепрыметнікі і дапускае спрошчванне.

Жанр – унутранае падраздзяленне ва ўсіх відах мастацтва, утворанае гістарычна і заснаванае на абагульненні зместавых і фармальных рыс вялікай групы твораў.

**13.** На прапанаваных студэнтамі прыкладах прадэманструйце з'яву парцэляцыі, прачытаўшы іх уголас па-іншаму. (Калі спатрэбіцца, выкарыстоўвайце перастаноўку слоў з зыходных канструкцый.) Які агульны сэнсавы і эмацыянальны эффект зробленых вамі пераўтварэнняў?

1. Лёгка быць героем на словах, асабліва калі знаходзішся далёка ад небяспекі. 2. Не стамляйцеся рабіць дабро кожны дзень, пры першай магчымасці. 3. Я не расказваў пра гэта ніводнай жывой душы, нават сваёй маці. 4. Прышчэпліванне, канешне, – сам па сабе момант не з прыемных, але кароткі. 5. На ўвесь комплекс мерапрыемстваў спатрэбіцца два тыдні як мінімум па самых добрых разліках. 6. Павінен прайсці час, каб зноў адчуць цягу да жыцця, каб спыніць боль. 7. Нялёгка падмануць жаночую інтуіцыю, тым больш сэрца, якое кахае. 8. Забудзьце пра былую варожасць, пра асабістыя амбіцыі хоць на хвіліну! 9. Мне хацелася пабыць адной, у цішыні, паслухаць песню сэрца… 10. Збегчы б куды-небудзь, схавацца ад перашэптванняў, ад поглядаў спадцішка, ад усёй гэтай мышынай валтузні. 11. Ноччу да паэта ў хату нечакана з'явіліся няпрошаныя госці. 12. Экспедыцыя няспынна рухалася наперад, нягледзячы на мноства абставін, якія перашкаджалі гэтаму.

**14.** Пераўтварыце складанападпарадкаваныя сказы з рытарычных выказванняў студэнтаў у складаназлучаныя. Вызначыце зыходны і выніковы віды канструкцый па значэнні. Сфармулюйце і запішыце адпаведныя вывады аб праявах граматычнай сінаніміі.

1. Нягледзячы на тое, што па календару ўжо даўно мінуў пачатак восені, лісце на дрэвах у том незабыўным годзе ўсё яшчэ заставалася зялёным. 2. Пасля таго як развеюцца ружовыя ілюзіі, пачнуцца манатонныя будні з іх непазбежным шэрагам праблем і клопатаў, бытавой неўладкаванасцю, спешкай і мітуснёй. 3. У той час як асноўная частка войск накіравалася ў абыход ракі, невялікі атрад у трыццаць добра ўзброеных добраахвотнікаў рушыўся напрамкі, на пераправу. 4. У выніку таго, што пры вырабе прыбора былі парушаны тэхнічныя параметры камплектуючых блокаў, устройства аказалася ненадзейным у эксплуатацыі. 5. Дзякуючы таму, што дагэтуль ажыццяўлялася аператыўная пагалоўная эвакуцыя людзей з небяспечнай зоны, стыхійнае бедства, на шчасце, абышлося без чалавечых ахвяр. 6. Для таго, каб праца была па-сапраўднаму якаснай і пладатворнай, трэба выхоўваць сур'ёзнае, адказнае стаўленне да яе з малых гадоў.

Этот электронный документ был загружен с сайта филологического факультета БГУ http://www.philology.bsu.by

**15.** 1. Растлумачце, як вы разумееце парадаксальнае выказванне вядомага спецыяліста па псіхалогіі дзелавых зносін П. Энекмана: «Сказаць адзін раз – гэта ўсё роўна, што не сказаць ні разу».

2. Вызначце, якім чынам трэба размясціць у апорным канспекце (мал. 1) прыведзеныя ніжэй умоўныя абазначэнні розных відаў паўтораў.

I. **П, П; П…П.**
II. **П = П; П ~ П.**
III. **П П (1); П1 П2 П1 П2 (> 1).**

3. Якая разнавіднасць слоўных паўтораў па кожнай з класіфікацый мае асобнае значэнне: а) для дакладнага засваення слухачамі тэрмінаў, імёнаў асабістых, лічбавых дадзеных; б) для выразнага ўсведамлення аўдыторыяй галоўнай думкі прамовы?

**16.** Дадзеныя «фразы для перыфразы» перафармулюйце так, каб іх моўная абалонка максімальна адрознівалася ад першапачатковай. (Выкарыстоўвайце лексічныя замены і граматычную перабудову.)

1. Фальклорная спадчына – гэта каштоўная крыніца для гісторыі і этнаграфіі. 2. Веды аб семантыка-камунікатыўнай асаблівасці сінонімаў спрыяюць іх прадуманаму ўжыванню ў маўленні.

**17.** Падбярыце для выдзеленых слоў і выразаў з выступленняў студэнтаў размоўныя аналагі – словы або фразеалагізмы, з дапамогай якіх можна ажывіць прамову.

1. Рытарычна не развіты чалавек, не знаходзячы прыдатнай тэмы для размовы, нават у добразычлівай кампаніі можа адчуваць сябе **дыскамфортна.** 2. Некаторыя студэнты пры сдачы экзаменаў маюць звычку **значна адыходзіць ад сутнасці пытання.** 3. У гарадскім транспарце ў «гадзіну пік» па-ранейшаму **адзначаецца перагружанасць.** 4. Кожнае фізічнае цела складаецца з малекул, якія **перамяшчаюцца ў розных напрамках.** 5. Электроны ў тэлевізійнай трубцы **рухаюцца выключна хутка.** 6. Сітуацыя **абсалютна відавочная.** 7. Пры выкананні апошняга задання было **зроблена шмат памылак.** 8. Пасля заняткаў па курсу сінтаксісу студэнты-філолагі **ўпэўнена аналізавалі** нават даволі **складаныя** прыклады граматычных канструкцый.

**18.** Прыдумайце ярка экспрэсіўныя азначэнні («тэмпераментныя эпітэты») да наступных назоўнікаў: *фантазія, дараванне, асоба, мноства, грошы, любоў, планы.*

**19.** Пазнаёмцеся з прыкладамі вуснай публічнай прамовы, якія насычаны з'явамі перарывістасці. Ацаніце апошнія як дапушчальныя ці нежаданыя (датыкальна да кожнага з урыўкаў). Якія назіранні аб сувязі тэматыкі выступлення і ступені дапушчальнасці ў ім з'яў вуснапрамоўнай перарыўнасці дазваляюць стварыць прыведзеныя фрагменты?

а) Ну што я… м-м-м… магу вам… гэта… параіць? Ну… вы… калі… гэта, гаворыце, вы…так сказаць… асоба не цягніце. Вы… ну, гаварыце ўсё… карацей, ну… прама і як бы адразу.

Этот электронный документ был загружен с сайта филологического факультета БГУ http://www.philology.bsu.by

б) Вы жа зразумейце, што… што гэта самае… што гэта, значыць, важна, каб зразумець…што… што чалавек ўсё ж павінен помніць свой… гэты… э-э… яго родны кут.

в) Што такое шчасце?.. Ведаеце, так адразу і не скажаш… Мне здаецца… Магчыма, шчасце – гэта…вось для мяне, бадай… хоць гэта банальна, але, сапраўды… калі падумаць цвяроза, гэта проста адсутнасць наяўнага няшчасця.

**20.** Спецыяльныя даследаванні паказваюць, што мова інтэлігентнага чалавека адрозніваеццца не ўвогуле адсутнасцю запаўняльнікаў паўз хістання, а іх разнастайнасцю і дарэчнасцю. Падбярыце шэраг слоў і выразаў (10–15), якія могуць дапамагчы замаскіраваць вымушаную паўзу, выгадаць час для роздуму, не звяртаючы на сябе празмернай ўвагі і не дакучаючы слухачам.

**21.** Уявіце сябе на месцы настаўніка, якому неабходна ацаніць прыведзеныя ніжэй адказы вучняў. Якія адзнакі вы паставілі бы адказчыкам? Стварыце фрагменты рэцэнзій, адзначыўшы, чым выклікана перарывістасць маўлення (паўзы, самапраўкі) у кожным з выпадкаў.

**Чым адрозніваюцца дзеясловы ад назоўнікаў?**

Назоўнік абазначае прадмет, а дзеяслоў прыкмету… не… дзеянне прадмета. Назоўнік адказвае на пытанні *хто? што?*, а дзеяслоў – на пытанні *што рабіць? што зрабіць?* Назоўнік змяняецца… змяняецца па склонах і ліках, а дзеяслоў – па асобах… змяняецца па асобах і таксама змяняецца па ліках… А некаторыя дзеясловы… дзеясловы прошлага часу змяняюцца па родах…

**Як змяняюцца дзеясловы?**

Дзеяслоў змяняецца па ліках… па асобах… не… па асобах… У часе. Напрыклад… *пяе*. Гэты дзеяслоў стаіць… Гэта дзеяслоў цяперашняга часу, а *пяеце*… не, *пеў* – гэта дзеяслоў прошлага часу…

Яшчэ дзеяслоў змяняеццца… па канчатках… (расшыфроўка аналагічных магнітафонных запісаў была апублікавана Т. А. Ладыжэнскай.)

**22.** Выдатны французскі літаратар А. дэ Сэнт-Экзюперы, аўтар шырока вядомай аповесці для дзяцей і дарослых «Маленькі прынц», пісаў сваёй вялікасвецкай сяброўцы Рынет, што яе лісты ён вымушаны чытаць, як загаворшчык шыфрагарму, і адчайвацца ад таго, што не ведае, як вымавіць тую ці іншую фразу. Напісана: «Ідзе дождж». Як гэта растлумачыць? Гэта можа быць пафарбавана смуткам: «Ідзе дождж, і мне так халодна і сумна на сэрцы… Кроплі дажджу быццам горкія слёзы». Аднак тое ж самае магло прагучаць без ценю смутку: «Ідзе дождж, а мне ўсё роўна! Я, як у дзяцінстве, гатова скакаць цераз лужыны…». Урэшце, напісанае можа сведчыць пра поўную нуду і абыякавасць да адрасата: «Я смяротна стамілася ад Вас. Мне зусім няма чаго Вам сказаць, і таму я напішу безаблічнае *Ідзе дождж*».

Этот электронный документ был загружен с сайта филологического факультета БГУ http://www.philology.bsu.by

Агучце няясную для Сэнт-Экзюперы фразу так, каб слухач адчуў па чарзе тры апісаныя падтэксты. Пры дапамозе якіх сродкаў, характэрных для вуснага маўлення, гэта стала магчымым?

**23.** Як вы разумееце заклік замежных спецыялістаў да эфектыўнага маўленчага звароту ў публічным выступленні «*гаварыць **для вушэй, а не для вачэй***»? З чым можна пагадзіцца і з чым паспрачацца ў гэтым дэвізе?

**24.** 1. Падбярыце невялікі (каля адной надрукаванай старонкі) адносна закончаны ўрывак са спецыяльнай навуковай літаратуры па цікавай для вас праблеме і ператварыце яго ў чарнавік выступлення, адлюстраваўшы комплекс пажаданых для ВПП асаблівасцей. Зрабіце каментарыі (магчыма – у выглядзе спасылак) па сутнасці прыведзеных вамі змяненняў і дапаўненняў.

2. Як называецца больш радыкальнае і глыбокае пераўтварэнне: *трансфармацыяй* або *мадыфікацыяй*? Якім з гэтых паняццяў больш дакладна абазначаецца вынік зробленых вамі дзеянняў?

## ВІДАВАЯ І ЖАНРАВАЯ ПРЫНАЛЕЖНАСЦЬ АРАТАРСКАГА ВЫСТУПЛЕННЯ.
## ТЭМА, НАЗВА І МЭТАВАЯ ЎСТАНОЎКА ВЫКАЗВАННЯ

### Асноўныя тэарэтычныя звесткі па тэме

Разнастайнасцю грамадскай маўленчай практыкі абумоўлена дыферэнцыяцыя выступленняў на асобныя віды ў залежнасці ад сферы маўлення. У тэорыі сучаснага рытарскага мастацтва агульнапрызнаным і замацаваным з'яўляецца вылучэнне 5 асноўных ***відаў*** (родаў) ***красамоўства***. У табл. 2 побач прыводзяцца суадносныя ім прыклады маналагічных ***жанраў выступленняў*** – канкрэтных разнавіднасцей тэкстаў, якія характарызуюцца адносна ўстойлівымі асаблівасцямі ў змесце, кампазіцыі, моўным афармленні і тэхніцы выканання.

**Табліца 2**

**Віда-жанравая дыферэнцыяцыя аратарскіх выступленняў**

| Від (род) красамоўства | Прыклады асобных жанраў выступленняў | Тыпічныя лексіка-фразеалагічныя сродкі |
|---|---|---|
| **I.** Сацыяльна-палітычнае | –даклад на сацыяльна-палітычную тэму (у т.л. справаздачны);<br>–парламенцкае выступленне;<br>–агітатарская прамова;<br>–мітынгавая прамова;<br>–палітычны каментарый (міжнародны агляд);<br>–ваенна-палітычнае выступленне; | Грамадска-палітычная лексіка і фразеалогія |

Этот электронный документ был загружен с сайта филологического факультета БГУ http://www.philology.bsu.by

| | | |
|---|---|---|
| | – дыпламатычная прамова | |
| **II.** Акадэмічнае | – лекцыя (навучальная або навукова-папулярная, эпізадычная або цыклавая);<br>– навуковы даклад;<br>– навуковае паведамленне;<br>– навуковы водзыў | Навуковыя тэрміны, агульнанавуковая лексіка, паказчыкі падкрэсленай лагічнасці выкладання |
| **III.** Судовае | – абвінавальная (пракурорская) прамова;<br>– абараняльная (адвакацкая) прамова;<br>– самаабараняльная прамова абвінавачанага | Лексіка і фразеалогія судовага справаводства |
| **IV.**Духоўнае (багаслоўска-царкоўнае) | – пропаведзь;<br>– унутрыцаркоўная прамова (напрыклад, для хрысціянскіх свяшчэннаслужыцеляў – прамова на саборы) | Канфесіянальная лексіка і фразеалогія, якая ўзыходзіць да свяшчэнных для дадзенага веравучэння тэкстаў (напрыклад, біблейская) |
| **V.** Сацыяльна-бытавое | – пахвальная, віншавальная прамова;<br>– застольная прамова (тост);<br>– памінальнае (надмагільнае) слова;<br>– вусны бытавы расказ | Размоўныя элементы; словы і выразы, якія называюць маральныя якасці і эмацыянальнае становішча чалавека |

Як самастойныя віды іншы раз адасабляюцца парламенцкае, дыпламатычнае і ваенна-патрыятычнае красамоўства. Сёння абгрунтоўваецца таксама вылучэнне гандлёвага (дзелавога) красамоўства, да жанраў якога належаць, у прыватнасці, выступленне на прэзентацыі і рэкламны тэкст.

Прамоўцу, які імкнецца дасягнуць поспеху, важна ўлічваць традыцыю адпаведнага віда і жанра выступленняў (большасць студэнтаў-філолагаў у далейшай прафесійнай дзейнасці будзе спрабаваць сябе ў галіне акадэмічнага красамоўства).

У структуры першага з этапаў працы над прамовай – этапа складання зместу – вылучаецца (у прыватнасці, С. Ф. Івановай) ***аналітыка-канцэптуальная стадыя,*** на якой нараджаецца стратэгічная задумка выступлення. Тут ажыццяўляюцца: выбар тэмы, калі будучаму прамоўцу прадастаўлена гэткае права; фарміраванне мэтавай устаноўкі прамовы і вызначэнне асноўнай ідэі выказвання; фармуляванне яе папярэдняга, эскізнага плана.

***Тэма выступлення*** або прапаноўваецца прамоўцу, або самастойна ім выбіраецца. Галоўнымі крытэрыямі, якімі трэба кіравацца пры магчымасці

Этот электронный документ был загружен с сайта филологического факультета БГУ http://www.philology.bsu.by

выбару тэмы, з'яўляюцца: адпаведнасць інтарэсам і ведам самога прамоўцы; адпаведнасць інтарэсам слухачоў (агульначалавечым або групавым); актуальнасць і навізна; праблемнасць, дыскусійнасць.

Акрамя прамой назвы прамовы, якая супадае з акрэсленай тэмай, магчыма ***«рэкламная»*** назва, якая служыць яскравым сігналам для прыцягнення ўвагі і інтарэсу аўдыторыі (тэматычная і рэкламная назвы прамовы могуць аб'ядноўвацца ў падвойным загалоўку). Існуюць шматлікія прыёмы надання назве рэкламнага характару:

- фармуляванне пытання (агульнага, прыватнага або альтэрнатыўнага, параўнаем: *«Ці патрэбна старажытная рыторыка сёння**?**»; «Навошта вывучаць рыторыку**?**»; «Рыторыка: навука ці мастацтва**?**»*);
- прыўнясенне вобразнага пачатку («Чалавек у *люстэрку зносін»);*
- выкарыстанне фразеалагізма, цытаты (***«Ісціна нараджаецца ў спрэчцы»*** *(Дыскусійныя жанры прамовы)»*);
- рыфмоўка (*«Размаўляць – значыць ствараць»*) і г.д.[2]

Прыёмы надання выразнасці загалоўку могуць камбініравацца адзін з адным.

Пад ***мэтай прамовы*** ў рыторыцы маецца на ўвазе ўяўленне аб пажаданай рэакцыі аўдыторыі. Адрозніваюцца ***агульная*** мэта (пэўны тып мэты) і ***канкрэтная*** мэта, якая маецца на ўвазе ў дадзеным выступленні. Вылучаюцца наступныя агульныя мэты і адпаведна – жанравыя групы выступленняў: 1) інфармацыйная; 2) пераканаўчая; 3) заклікальная да дзеяння; 4) натхняльная; 5) займальная; 6) патаемная. Пры гэтым 2-і, 3-і і 4-ы віды мэт, характэрныя для прамоў з асабліва развітай аргументацыяй, іншы раз аб'ядноўваюцца ў паняцці агітацыйнай накіраванасці. Безумоўна, у выступленні можа ставіцца не адна, а дзве ці некалькі агульных мэт, аднак сярод іх ёсць асноўная і дадатковыя. Канкрэтная мэта выступлення фармулюецца на аснове агульнай за кошт удакладняльнага дадатку галоўнай думкі (таму таксама бывае не адзінай). Уся сукупнасць мэт, якія высоўваюцца для рэалізцыі ў выступленні, можа называцца яго мэтавай устаноўкай. Для максімальнай эфектыўнасці выступлення дасягненню намечанай мэтавай устаноўкі павінна падпарадкоўвацца ўся праца аратара над прамовай.

## Пытанні і заданні

**1.** 1. Зрабіце рэканструкцыю рытарычнай сітуацыі вымаўлення дадзеных урыўкаў выступленняў, ахарактарызаваўшы яе па схеме: дзе, кім, каму, чаму магла вымаўляцца прамова, з фрагментам якой вы азанаёміліся? Вызначце відавую і ўмоўную жанравую прыналежнасць прамовы.

2. Выпішыце і кваліфікуйце, згодна табл. 2, словы і выразы, якія дапамаглі вам у вызначэнні відавой прыналежнасці прамовы.

3. Адзначце яскравыя рытарычныя сродкі, якія звярнулі на сябе вашу ўвагу.

Этот электронный документ был загружен с сайта филологического факультета БГУ http://www.philology.bsu.by

I. Паміж абвінавачаннем і падсудным у гэтай справе няма месца для захапляючай барацьбы, для непрымірымай спрэчкі. Падсудны, які прызнаўся

[2] Пры падборы прыкладаў «рэкламных» назваў для выступленняў на рытарычныя тэмы выкарыстаны працы Д. Х. Вагапавай і Б. Ю. Нормана.

на папярэднім следстве, пацвердзіў бы без усялякіх адхіленняў слова сваё і тут. Гэта спрошчвае задачу абароны, звужае аб'ём яе, абмяжоўваючы яе довады тымі, што, паводле дадзеных справы, могуць уплываць толькі на меру і ступень заслужанага падсудным пакарання. Вывучэнне ўмоў, якія ўплываюць на меру пакарання, якое чакае падсудны, павінна супасці з аднаўленнем фактычных падрабязнасцей справы… Абвінавальнік патрабуе справядлівага прысуду, – я напамінаю і хадайнічаю аб спалучэнні ў ім праўды з міласэрнасцю, доўга суддзі з цудоўнымі абавязкамі чалавекалюбства.

II. У малітве, у пазнанні Слова Божага, у любові да прыгажосці свету, прыгажосці жыцця чалавечага, у павелічэнні ўсяго добрага ў злым свеце, усяго светлага ў цёмным свеце – мы жывем побач з Госпадам. Але часта мы адступаем, плывем па цячэнні, і нам здаецца такое жыццё нармальным. На самай справе яно з'яўляецца нудным, шэрым, сумным, паўшым, у рэшце рэшт грахоўным таму, што мы далёкія ад Бога. І кожны дзень у нас адбываецца Суд Божы. Калі прасынаецца ў цябе сумленне – гэта Суд Божы, калі доўг патрабуе зрабіць так, як цябе не хочацца рабіць, – гэта Суд Божы. І, урэшце, калі табе даводзіцца цярпець выпрабаванні – гэта таксама Суд Божы, благаславенны, літасцівы суд, таму што Ён хоча з нас выхаваць дзяцей Божых і не пакінуць нас на пагібець у пыл, яе леташнюю траву, як восеньскае лісце, як нікому не патрэбнае смецце дарожнае. Бо для Госпада кожная душа дарагая, Ён хоча кожную душу ўзвесці ў Царства Божае ўжо тут, у жыцці…

У нас ёсць абраз "Сашэсце Збавіцеля ў ад", дык вось, здаецца, што Ён у ад сыходзіць заўсёды. Сыходзіць у ад нашага жыцця, нашай душы для таго, каб нас усіх адтуль выцягнуць. І ў гэтым адзінае вырataванне.

III. Шмат каго хвалюе, што супраць прынцыпа асабістай свабоды гучаць нападкі і справа, і злева, але левыя, у дадзеным выпадку, ідуць супраць прынцыпаў разумнай і сапраўднай свабоды. Няўжо не зразумела, што кабала абшчыны, цяжар сямейнай маёмасці з'яўляецца для 90 мільёнаў насельніцтва горкай няволяй?.. Нельга вяртацца на той шлях, нельга толькі ў вярхах развешваць сцягі нейкай уяўнай свабоды. Нельга цурацца чорнай працы, нельга забываць, што мы прызваны вызваліць народ ад жабрацтва, ад невуцтва, ад бяспраўя…

Усе сілы і заканадаўца, і ўрада павінны накіроўвацца на тое, каб падняць вытворчыя сілы крыніцы нашага дастатку – зямлі. Прымяненнем да яе сваёй працы, асабістай уласнасці, прыкладаннем да яе ўсіх, рашуча ўсіх народных сіл неабходна падняць нашу збяднелую, нашу слабую, нашу

Этот электронный документ был загружен с сайта филологического факультета БГУ http://www.philology.bsu.by

знясіленую зямлю, бо зямля – гэта залог нашай сілы ў будучым, зямля – гэта Расія.

IV. Паколькі гаворка ідзе пра гукі, то вельмі натуральна, што іх павінна вывучаць акустыка. З іншага боку, гукі гэтыя вырабляюцца чалавечым моўным апаратам: лёгкімі, гартанню, языком і гэдак далей. Знычыць, гэтым займаецца фізіялогія. Кіруе гэтым апаратам цэнтральная нервовая сістэма. Значыць, гэта справа фізіялогіі цэнтральнай нервовай сістэмы. Потым, нас цікавяць гукі галоўным чынам настолькі, наколькі яны што-небудзь азначаюць. Тут уступае ў свае правы фанетыка. Значыць, яна навука прамежкавая: не то фізіялогія, не то акустыка, не то філалогія… Такім чынам, шмат што вывучае гэта навука…. Хоць і старажытная гэта навука, тое, што яна на трох кітах стаіць, ёй вельмі перашкаджае. Можна сказаць, можа быць, што і няма гэтай навукі, а ёсць акустыка і фізіялогія?

V. Мы дорым Вам унікальны касметычны рэцэпт – рэцэпт маскі Вечнае Маладосці: “Адну сталовую лыжку натхнення дадаць да 150 грамаў Вашай высокай эмацыянальнасці; парыць 2 хвіліны на павольным душэўным агні, далучыць поўную чашу жыццялюбнасці, а для клейкасці – 150 грамаў экстракту працоўнага захаплення; злёгку ахаладзіць. Атрыманую сумесь правесці праз нітніцу і адстойваць да поўнага выпадзення ў асадак стомленасці і дэпрэсіі. Да гэтай масы дадаць неабмежаваную колькасць кропель светлага гумару.

Маску наносяць пяшчотай, шчырасцю і фантазіяй тоўстым слоем на твар. Маску можна не змываць!”[1]

(Сярод выкарыстаных – фрагменты выступленняў, зробленых вядомымі прадстаўнікамі красамоўства XIX–XX стст.: Ф. Н. Плевака, П. А. Сталыпіным, Л. В. Шчэрбай, А. Менем.)

**2.**Размясціце тэмы для выступленняў у парадку звужэння.

1. а) Вызначэнне тэмы і назвы прамовы.

б) Структура рытарычнай дзейнасці.

в) Этап вынаходства падчас падрыхтоўкі рытарскай прамовы.

2. а) Лірыка Адама Міцкевіча.

б) Тэма кахання ў вершах Адама Міцкевічв.

3. а) Вобразна-выразныя сродкі ў паэме “Новая зямя” Якуба Коласа.

б) Мастацкая своеасаблівасць паэмы “Новая зямля” Якуба Коласа.

в) Выкарыстанне эпітэтаў у паэме “Новая зямля” Якуба Коласа.

**3.** Выберыце адвольную тэму з прыведзенага праблемнага поля і прывядзіце прыклад яе звужэння (у адзін –два крокі).

1. Экалагічная абстаноўка ў Рэспубліцы Беларусь.

2. Вышэйшая адукацыя ў Рэспубліцы Беларусь.

3. Сучасная беларуская літаратура.

**4.** Уявіце сабе, што на семінарскі занятак па ўводнаму спецкурсу “Навуковыя асновы пазнавальнай дзейнасці” студэнты першага года падрыхтавалі даклады з наступнымі назвамі:

1. “Да пытання аб пазнанні”.

Этот электронный документ был загружен с сайта филологического факультета БГУ http://www.philology.bsu.by

2. “Жаданне вывучаць новае як важная станоўчая якасць асобы, якую павінен абавязкова выхоўваць кожны, хто жадае дасягнуць поспехаў у жыцці і заваяваць павагу людзей”.

3. “Кожны студэнцкі дзень – гэта лішнія веды”.

4. “Дамінантныя фактары рэалізацыі гнастычных інтэнцый”.

[1] Дадзены прыклад выступлення, якое рэальна гучала, быў надрукаваны Г. І. Нікалаенка

Якія рытарычныя патрабаванні да назвы прамовы парушаны ў гэтай праграме семінара? Прапануйце адрэдагаваныя варыянты фармулёвак загалоўкаў.

**5.**Які нярэдка ўласцівы назвам выступленняў недахоп гіпербалізаваны ў камічнай фармулёўцы тэмы, прыдумнай польскім гумарыстам Станіславам Ежы Лецем: “Чалавек у гісторыі чалавецтва”?

**6.** Вызначце прыём (або спалучэнне прыёмаў), які быў выкарыстаны для надання выразнасці кожнай з прапанаваных “рэкламных” назваў для выступлення.

Да тэмы “Запазычаныя словы”

“Словы-прышэльцы”, “Заморскія госці”, “Запазычанні: жаданыя госці ці небяспечныя захопнікі?”, “Словы-падарожнікі”, “Адкуль прыйшлі да нас словы-іншаземцы?”, “Не тое золата, што блішчыць” (аб выкарыстанні запазычаных слоў)”.

Да тэмы “Паронімы”

“Паронімы”, “Паронімы: сябры ці ворагі?”, “Паронімы, або Яшчэ раз пра тое, што знешні выгляд бывае вельмі падманным”, “Паміж двух агней (Паронімы і дакладнасць маўлення)”, “Ці патрэбны паронімы паэзіі?”, “*Абанент – абанемент*: ці адно гэта слова?”, “Асцярожна: паронімы!”, “*Карысны – карыслівы”:* ці трэба нам разважаць, дзе і як гаварыць?”.

Да тэмы “Састарэлыя словы”

“Спатканне з мінулым”, “Далёкае і блізкае”, “Падарожжа ў машыне часу (у свеце састарэлых слоў)”, “Ці могуць паміраць словы?”, “Вытокі сучасных слоў”, “Жывыя выкапні”, “Трошкі аб аэраплане – у новым плане”.

**7.**Прыдумайце 2 прыклады інтрыгуючых назваў для выступленняў на любую філалагічную тэму і прыміце ўдзел у конкурсе “рэкламных” назваў сярод сваіх аднагрупнікаў.

**8.**Сфармулюйце прыватныя пытанні, з дапамогай якіх можа ажыццяўляцца канкрэтызацыя агульнай мэты выступлення: а) пераканаць; б) заклікаць; в) натхніць; г) пазабавіць; д) прызнацца.

*Узор:* праінфармаваць (пра што?)  пра тое, што…

**9.**Якія мэты выступленняў былі пераблытаны паміж сабой у гумарыстычным расказе Тэфі? У чый адрас накіравана галоўнае вастрыё іроніі аўтара?

Швейцар прыватных камерцыйных курсаў павінен быў вечарам адлучыцца, каб даведацца, ці памёр яго дзядзька, а таму руль кіравання перадаў свайму памочніку і, перадаючы, загадваў строга:

Этот электронный документ был загружен с сайта филологического факультета БГУ http://www.philology.bsu.by

– Вечарам тут дзве залы аддадзены пад прыватныя лекцыі. Прашу ставіцца да справы ўважліва, наведвальнікаў пытацца, хто куды. Сядзі на сваім месцы, здымай паліты. Калі на лекцыю Кіньгрусціна, – прайдзіце направа, а калі на лекцыю Фермапілава, – прайдзіце налева. Здаецца, справа простая.

…Вавіле ўсё гэта было вельмі крыўдна, і калі швейцар пайшоў, ён гаварыў вешалцы:

– Няма ні свята, ні будняў, нічога для нас няма… І навошта я павінен у дзвярэй сядзець? Каб мне ад дзверы другасны флюс на зуб надзьмула? Сядзі сам, а я на той бок сяду.

Ён перасунуў стул да процілеглага боку і супакоіўся.

Праз дзесяць хвілін пачала збірацца публіка.

– Дзе ў вас тут лекцыя гумарыста Кіньгрусціна?

– На лекцыю Кіньгрусціна прайдзіце направа, – адказваў памочнік швейцара тонам сапраўднага швейцара…

За вясёлымі студэнтамі прыйшлі панурыя студэнты і курсісткі са сшыткамі: “Лекцыя Фермапілава тут?”

– На лекцыю Фермапілава прайдзіце налева…

Тыя, хто прыйшлі на гумарыстычную лекцыю, рагаталі загадзя…

– І што гэта ён гэткае задумаў: лекцыю чытаць! Пэўна, пародзія на вучоную бязглуздзіцу. Вось пазабавіць! Малайчына гэты Кіньгрусцін!

Аўдыторыя Фермапілава паводзіла сябе сканцэнтравана, вастрыла алоўкі, перагаворвалася ў паўголаса:

– Вы не ведаеце, таварыш, ён, здаецца, будзе чытаць аб пабудове Зямлі?..

Лектары выйшлі са сваёго пакойчыка, дзе пілі чай для ўмацавання голасу, і накіраваліся кожны ў нанятую імі залу. Кіньгрусцін, мажны спадар, у чырвонай камізэльцы, хутка ўзбег на кафедру і, не даючы публіцы апамятацца. Крыкнуў:

– Ну, вось і я!

– Які ён маладжавы, гэты Фермапілаў, – зашапталі курсісткі. – А гаварылі, што стары.

– Ці ведаеце вы, спадары, што такое цешча? Не, вы не ведаеце, спадары, што такое цешча!

– Што? Як ён сказаў? – зашапталі курсісткі. – Таварыш, вы не чулі?

– Н… не зразумеў…

– Дык вось, спадарства, сённяшнюю маю лекцыю я хачу поўнасцю прысвяціць найсур’ёзнейшаму разбору цешчы самой па сабе, паходжанню яе, гістарычнаму развіццю, і прасачу яе разам з вамі ва ўсіх эвалюцыях.

– Якая ясная думка! – зашаптала публіка.

Між іншым у другой зале стаяў дым каромыслам.

Калі на кафедру залез маленькі, сівенькі дзядок Фермапілаў, публіка сустрэла яго выбухам апладысментаў і крыкамі “ура”.

Этот электронный документ был загружен с сайта филологического факультета БГУ http://www.philology.bsu.by

– Я хацеў пагутарыць з вамі, – забразджаў лектар, – па пытанні, якое не можа не цікавіць кожнага, хто жыве на планеце пад назвай Зямля, а менавіта – аб пабудове гэтай самай Зямлі.

– Ха-ха-ха! – заходзіліся слухачы. – Кожны, маўляў, цікавіцца. Ох-ха-ха-ха! Менавіта, кожны цікавіцца.

– Я бы папрасіў спадароў быць цішэй, – запішчаў дзядок. – Мне вельмі цяжка!

– Цяжка! Ох, замарыў! Давайце яму дапамагаць!

– Дык вось, міласцівыя паненкі і міласцівыя паны, – надрываўся дзядок, – наша сённяшняя размова…

– Спрытна парадзіруе, шэльма! Брава!

А ў процілеглай зале гумарыст Кіньгрусцін лез са скуры вон, жадаючы выклікаць усмешку хоць на адным з гэтых засяроджаных благавейных твараў. Ён з зайздрасцю прыслухоўваўся да чутнага смеху і радаснага гулу слухачоў Фермапілава… Ён адкашляўся, зрабіў камічную грымасу вучонага педанта і працягваў сваю лекцыю:

– Каб вы не падумалі, міласцівыя паненкі і, у асаблівасці, міласцівыя паны, што цешча ёсць від выкапня або проста нейкая зямная акамянеласць і гэты забабон існаваў шмат вякоў, я бяру на сябе смеласць паведаміць вам, што цешча ёсць не што іншае, як, паводле выразу старажытных вучоных, непаразуменне ў квадраце.

Ён прыпыніўся.

Курсісткі старанна запісвалі нешта ў сшыткі Многія, насупіўшы бровы і ўтаропіўшыся на лектара, здавалася, лавілі кожнае слова, і напружаная работа думкі надавала іх фізіяноміям натхнёны і горды выгляд…

Кіньгрусцін зусім разгубіўся. Ён адчуваў, як перлы яго дасціпнасці стукаюцца аб гэтыя панурыя галовы і адскокваюць, як град ад падаконніка… Ён зусім заблытаўся, схапіўся за галаву, папрасіў прабачэння і збег.

У пярэдняй стаяў трэск і грукат. Маленькі дзядок Фермапілаў мітусіўся каля вешалкі і патрабаваў сваё паліто. Гучнагалосая публіка хацела абавязкова яго качаць і раўла: “Брава, Кіньгрусцін! Брава!”

Кіньгрусцін, нягледзячы на сваю разгубленасць, спытаў аднага з гарлапанаў:

– Чаму вы крычыце пра Кіньгрусціна?

– Дык вось ён, Кіньгрусцін, вунь той, загрыміраваны ў дзядка. Ён нас прама да непрытомнасці…

– Як ён? – увесь пахаладзеў гумарыст. – Гэта я Кіньгрусцін. Гэта я… Да непрытомнасці… тут жахлівае непаразуменне.

---

Калі непаразуменне высветлілася, абурэнню публікі не было канца. Яна крычала, што гэта нахабства і махлярства, што трэба было яе папярэдзіць, дзе гумарыстычная лекцыя, а дзе сур’ёзная. Крычала, што гэтую агіднасць трэба выкрыць у газетах, і ў рэшце рэшт патрабавала вярнуць ёй грошы назад.

Грошай ёй не вярнулі, але памочніка швейцара, які натварыў бяды, выгналі.

Этот электронный документ был загружен с сайта филологического факультета БГУ http://www.philology.bsu.by

І па заслугах. Ці можна так здзекавацца над публікай?!

**10.** Сфармулюйце рытарычную мэтавую ўстаноўку тлумачэння выкладчыкам любога звязанага з філалогіяй матэрыялу, якая змяшчала б не толькі асноўную, але і хоць бы адну дадатковую мэту.

## РЫТАРЫЧНАЯ ДЗЕЙНАСЦЬ НА ЭТАПЕ ВЫНАХОДСТВА

Прыступаючы да падрыхтоўкі будучай прамовы, аратар у першую чаргу вырашае для сябе праблему: *што* сказаць? Гэта праблема разглядаецца на ўзроўні фарміравання задумы і на ўзроўні яе канкрэтнай змястоўнай рэалізацыі, складаючы сутнасць раздзела вынаходства ў структуры рытарычнага канона. Сама назва дадзенага раздзела арыентуе на творчую дзейнасць, на стварэнне новага сэнсу, на сваё “адкрыццё тэмы”, і сапраўды, засваенне рытарычных заканамернасцей і прыёмаў у дадзенай галіне павышае творчы патэнцыял асобы, развівае мэтанакіраванасць, гібкасць і арыгінальнасць мыслення, удасканальвае ўменні па самастойным пошуку патрэбнай інфармацыі, здольнасць “паварочваць рознымі гранямі” прадмет думкі і прамовы.

Вывучэнне дадзенай тэмы можа быць пабудавана па наступным плане:

**1.** Унутраная структура этапа вынаходства.

**2.** Выбар тэмы і назвы выступлення.

**3.** Фарміраванне мэтавай устаноўкі прамовы. Тыпалогія выступленняў у залежнасці ад іх агульнай мэты.

**4.** Асноўныя крыніцы падбору матэрыяла да выступлення.

**5.** Прымяненне эўрыстычных схем для вынаходства зместу прамовы.

**6.** Рэкамендацыі па рацыянальнай працы з літаратурнымі крыніцамі вынаходства.

У структуры этапа вынаходства вылучаюцца (у прыватнасці, маскоўскім спецыялістам па тэорыі рыторыкі Соф’яй Філіпаўнай Івановай) дзве глабальныя стадыі дзейнасці:

**1) аналітыка-канцэптуальная стадыя,** на якой выспявае стратэгічная задума выступлення;

**2) камплектацыйна-распрацоўчая стадыя,** на якой вядзецца падбор канкрэтнага матэрыялу.

Дынаміку пачатковых этапаў працы над выступленнем з інфармацыйнага пункту гледжання паказвае табліца, якая заснавана на матэрыяле, прыведзеным у літаратуры па праблемах рытарскага майстэрства.

### Характар інфармацыйнага забеспячэння будучай прамовы ў пачатку яе падрыхтоўкі

| Сутнасць дзейнасці будучага | Наглядная выява стану інфармацыі | Слоўная колькасна-якасная |
|---|---|---|

Этот электронный документ был загружен с сайта филологического факультета БГУ http://www.philology.bsu.by

| рытара | | характарыстыка стану інфармацыі |
|---|---|---|
| Выбар тэмы – пачатак аналітыка-канцэптуальнай стадыі этапа вынаходства (0) | | Няпоўная і неўпарадкаваная інфармацыя |
| Фарміраванне задумы – заканчэнне аналітыка-канцэптуальнай стадыі этапа вынаходства (І-1) | | Няпоўная, але ўпарадкаваная інфармацыя |
| Падбор матэрыялу – заканчэнне камплектацыйна-распрацовачнай стадыі этапа вынаходства (І-2) | | Поўная, але неўпарадкаваная інфармацыя |
| Сістэматызацыя матэрыялу – заканчэнне этапа размяшчэння (ІІ) | | Поўная і ўпарадкаваная інфармацыя |

Як бачна, нават у самым пачатку падрыхтоўкі выступлення, у момант выбару тэмы, яна для аратара не выступае як *tabula rasa* (“чыстая дошка”): аратар абавязкова мае якія-небудзь, часта неўсвядомленыя, разрозненыя і выпадковыя ўяўленні аб прадмеце размовы і пажаданым сэнсавым напаўненні выказвання. На аналітыка-канцэптуальнай стадыі вынаходства адбываецца першаснае ўпарадкаванне гэтых няпэўных уяўленняў і крысталізацыя задумы выказвання. Далей арганізуецца адбор адсутнага матэрыялу па намечаных напрамках, і зноў атрыманая інфармацыя, якая ўжо не толькі суаносіцца з рэгламентам выступлення, але і звычайна нават перавышае яго аб’ём, як правіла, не бывае аптымальна сістэматызаванай. Гэта задача вырашаецца ўжо па-за рамкамі раздзела вынаходства, складаючы прэрагатыву этапа размяшчэння матэрыялу.

Такім чынам, на першай, аналітыка-канцэптуальнай, стадыі работы над зместам прамовы ажыццяўляецца:

- выбар тэмы, калі будучаму аратару прадастаўлена такая магчымасць;
- вызначэнне асноўнай ідэі выказвання і асэнсаванне мэтавай устаноўкі прамовы;
- фармуляванне назвы прамовы;
- прадумванне яе папярэдняга, эскізнага плана.

**Тэма для выступлення** або прапаноўваецца аратару, або выбіраецца ім самастойна. Пры магчымасці выбара тэмы (напрыклад, пры аналізе прадугледжанай выкладчыкам тэматыцы дакладаў і паведамленняў для падрыхтоўкі да семінарскіх заняткаў) трэба кіравацца такімі важнымі катэгорыямі, як:

Этот электронный документ был загружен с сайта филологического факультета БГУ http://www.philology.bsu.by

ü адпаведнасць ведам і інтарэсам самога прамоўцы. Застаючыся "халодным і безудзельным" да сваёй тэмы, аратар наўрад ці зможа выклікаць энтузіязм у слухачоў. Вялікае значэнне мае "эфект заражэння" сваёй захапляльнасцю;

ü адпаведнасць інтарэсам слухачоў (агульначалавечым або групавым). Такая тэма прамовы, як *"Прафілактыка і пераадольванне стрэсаў"*, выйгрышная тады, калі датычыцца да катэгорыі, якая мае агульначалавечы інтарэс. У той жа час, плануючы выступленне перад аўдыторыяй студэнтаў-філолагаў аб філасофіі экзістэнцыялізму, добра звязаць тэму з прафесійнымі інтарэсамі слухачоў, напрыклад, сфармуляваць яе наступным чынам: *"Светапогляд экзістэнцыяналізму і літаратурная творчасць"*;

ü навізна і актуальнасць. Так, можна чакаць, што тэма выступлення *"Лёс кнігі ў камп'ютэрны век"* дзякуючы злабадзённай пастаноўцы пытання будзе ўспрынята з большым інтарэсам, чым блізкая да яе, але больш агульная тэма *"Роля кнігі ў духоўным развіцці чалавека"*;

ü дыскусійнасць, праблемнасць, якая надае драматызм выкладанню, дазваляе аратару не заставацца ў баку і выказваць свой пункт гледжання на пытанне, што звычайна цэніцца слухачамі. Напрыклад, чытаючы лекцыю аб прадметнай своеасаблівасці рыторыкі або педагогікі, аратар можа з-за метадычных меркаванняў узмацніць праблемны пачатак у фармуліроўцы тэмы, прадставіўшы яе так: *"Рыторыка (Педагогіка): навука ці мастацтва?"* (хоць падобная адназначная фармулёўка пытання з навуковага пункту гледжання не правамерная, і сутнасць справы заключаецца менавіта ў сінтэтычнай прыродзе прадмета абмеркавання).

Акрамя рабочай назвы прамовы, якое з'яўляецца нейтральным і прама ўказвае на яе тэму, дадатковым рэзервам прыцягнення ўвагі слухачоў служыць спецыяльнае прыдумванне больш яскравай **"рэкламнай", інтрыгуючай назвы** для выступлення. Так, з рыторыка-псіхалагічнага пункту гледжання сама па сабе назва знакамітага вельмі смешнага выступлення з фільма "Карнавальная ноч" (*"Ці ёсць жыццё на Марсе?"*) была, нягледзячы на ўсю сваю распаўсюджанасць, сфармулявана больш удала – больш даступна і цікава, чым калі прамова для той жа сітуацыі выкладання яе ў клубе называлася бы строга і суха (скажам, *"Праблема існавання незямных цывілізацый"*). Рэкламныя і тэматычныя назвы выказванняў могуць аб'ядноўвацца ў падвойным загалоўку, напрыклад: *"Жамчужыны мовы (Аб ужыванні прыказак і прымавак)"*.

Існуюць разнастайныя прыёмы надання назве рэкламнага, інтрыгуючага характару, якія могуць паспяхова камбінавацца адзін з адным. Пералічым некаторыя шырока распаўсюджаныя прыёмы, прадэманструем іх рэалізацыю на прыкладзе назваў студэнцкіх паведамленняў пра асаблівасці выкарыстання жэстаў у аратарскіх выступленнях і ацэнцы жэставых паводзін слухачоў:

ü прыўнясенне вобразнага пачатку (*"Чалавек **як адкрытая кніга**"; "Рукі, якія **гавораць**"; "Жэсты – **"дэтэктары няпраўды"**);*

Этот электронный документ был загружен с сайта филологического факультета БГУ http://www.philology.bsu.by

- пастаноўка пытання. Паводле класіфікацыі, вядомай з заняткаў па замежнай мове, магчыма фармуляванне пытанняў агульнага, прыватнага або альтэрнатыўнага характару, параўнаем: *“Ці ведаеце вы мову жэстаў**?**”; “Як навучыцца разуменню без слоў**?; “***Жэсты: памочнікі ці здраднікі***?**”* – у апошнім прыкладзе ў спалучэнні з метафарай, якая адушаўляе жэсты;
- прыцягненне фразеалагізма, цытаты (*“**Стварыце** свой імідж **сваімі рукамі**”* **–** абыгрыванне прымаўкі і адначасова прамога значэння пазначанага выраза; ***“Маўклівы думкі знак” –*** цытата з старажытнага верша, дзе пра жэст гаворыцца так:

*Маўклівы думкі знак,*
*Знак пачуцця бясслоўны*);

- рыфмоўка, якая ўяўляе сабой старажытную рытарычную фігуру гомеатэлеўта суадносна з празаічным тэкстам астатняга выступлення і забяспечвае асабліва трывалае запамінанне прыдуманай назвы (*“Выкарыстоўваем жэсты ў свой час і да месца”; “Рытарскі жэст – на шчырасць тэст”; “Жэст – згода ці пратэст?”* – у камбінацыі з альтэрнатыўным пытаннем) і г.д.

Акрамя таго, у “рэкламных” назвах адзначаецца выкарыстанне так званай інтрыгуючай лексікі і фразеалогіі адносна універсальнага характару – слоў і выразаў тыпа *загадкі, метамарфозы, адкрыцці, парадоксы, сакрэты, незвычайны, сенсацыйны, фенаменальны, дзіўны, падарожжа ў свет…*, напрыклад: ***Тайны** жэста; **Асаблівая захапляльная** мова*[1].

Для поспеху выступлення важнае значэнне мае таксама максімальна дакладнае і яснае асэнсаванне аратарам мэты будучай прамовы. “Для таго, хто не ведае, да якой прыстані ён трымае шлях, ніводны вецер не будзе спадарожным”, – заўважаў філосаф Сенека.

Гэта азначае, што наколькі спрыяльнымі бы ні былі умовы для публічнага выступлення і першапачатковае стаўленне аўдыторыі, яно па-сапраўднаму не можа адбыцца і апраўдаць затрачаны на яго падрыхтоўку час без мэты, якая свядома выбрана і ажыццяўляецца прамоўцам. Пад **мэтай прамовы** ў рыторыцы разумеецца ўяўленне аб пажаданай рэакцыі слухачоў, на дасягненне якой павінна накіроўвацца ўся праца аратара над выказваннем.

Вылучаюцца **агульная** мэта (пэўны тып мэты) і **канкрэтная** мэта, якая рэалізоўваецца ў адзінкавым выступленні. Яшчэ ў нетрах рымскай рыторыкі зарадзілася трыяда агульных рытарскіх мэт: навучыць (*docere*) – прасунуць (*movere*) – пазабавіць (*delectare*). Да гэтага размежавання генетычна ўзыходзіць сучасная тыпалогія агульных мэт і заснаваных на іх функцыянальных груп выказванняў, якая склалася ў амерыканскай прагматычнай рыторыцы (1908 г.) і была дапоўнена Л. А. Мурынай. Называюцца наступныя агульныя мэты і адпаведна – жанравыя групы рытарскіх выступленняў:

***1)*** інфармацыйная (уласцівая, напрыклад, для лекцыі, дакладу, паведамлення);

Этот электронный документ был загружен с сайта филологического факультета БГУ http://www.philology.bsu.by

[1] Пры падборы прыкладаў "рэкламных" назваў для выступленняў выкарыстаны працы А. В. Барышавай, В. А. Валовіка, І. Н. Гарэлава і В. Ф. Енгалычава, А. Ю. Панасюка, Г. Вілсана і К. Макклафліна.

***2)*** пераканаўчая (рэалізуецца ў абвінавальным ці абарончым выступленні);

***3)*** заклікальная да дзеяння (у мітынгавай прамове, рэкламным выступленні);

***4)*** натхняльная (у пропаведзі, ваенна-патрыятычным выступленні);

***5)*** забаўляльная (у частцы тостаў, у вусным гумарыстычным расказе);

***6)*** патаемная (прыкладамі могуць служыць споведзь, прызнанне ў каханні).

Другі, трэці і чацвёрты з пералічаных тыпаў мэт, якія ўласцівы выступленням з асабліва развітай аргументацыяй, часам аб'ядноўваюцца ў паняцці агітацыйнай накіраванасці. Відавочна, што ў выказванні можа ставіцца не адна, а дзве ці некалькі агульных мэт, аднак сярод іх адрозніваюцца асноўная і дадатковыя. Так, абсалютная большасць выступленняў нясе ў сябе якую-небудзь новую інфармацыю. Аднак гэта мэта ставіцца як асноўная ў выступленні лектара аб архітэктурных помніках Велікабрытаніі, у той час як асноўнай мэтай выступлення турыстычнага агента, які паведаміць частку аналагічных звестак, – заклікаць да дзеяння, схіліць да прыняцця рашэння аб наведванні гэтай краіны.

Канкрэтныя мэты выступлення фармулююцца на базе кожнай з агульных мэт, па ўмоўнай мадэлі: *канкрэтная мэта = агульная мэта + адпаведная галоўная думка.* Напрыклад, канкрэтныя мэты ўступнай лекцыі па курсу рыторыкі могуць быць наступныя:

- *паведаміць (праінфармаваць)* пра тое, што ў сваім класічным разуменні рыторыка з'яўляецца вучэннем аб пераканаўчай прамове і мастацтвам яе стварэння;
- *пераканаць* у тым, што рытарычныя ўменні карысныя ўсім і кожнаму і ў дзелавых, і міжасобасных зносінах;
- *натхніць* слухачоў тым, што ўменне гаварыць красамоўна і пераканаўча паддаецца паступоваму развіццю і ўдасканаленню пры ўмовах мэтанакіраванасці, працавітасці, веры ў поспех ("прамоўцамі становяцца").

Усю прыведзеную сукупнасць мэт, якія высоўваюцца для рэалізацыі ў выступленні, будзем называць яго мэтавай устаноўкай.

Яшчэ раз падкрэслім, што чым больш шматгранна і поўна аратар асэнсоўвае мэтавую ўстаноўку выступлення, тым лепшыя шансы на поспех яно мае. Так, уявім, што ў апісаным выпадку аратар вырашыць абмежавацца вузка інфармацыйнай мэтай, ужо на першапачатковым этапе паведаміўшы ў сваёй лекцыі максімум звестак з гісторыі рыторыкі, але пры гэтым выпусціць з-пад увагі значнасць дадатковых мэт. У выніку ён не зможа сфарміраваць у слухачоў станоўчую матывацыю, даць той эмацыянальны імпульс, які патрэбен для далейшай работы над курсам, і ў яго не хопіць сіл запаліць іскру інтарэса да прадмета.

Этот электронный документ был загружен с сайта филологического факультета БГУ http://www.philology.bsu.by

На камплектацыйна-распрацоўчай стадыі этапа вынаходства ў распараджэнні аратара, увогуле, ёсць наступныя асноўныя крыніцы інфармацыі:

*1)* асабістыя разважанні, успаміны, фантазія аратара;

*2)* спецыяльна арганізаваныя назіранні і асабісты вопыт у закранутай галіне;

*3)* кансультаванне ў аўтарытэтных асоб;

*4)* чытанне, успрыманне радыё- і тэлеперадач.

Пералічаныя крыніцы можна, як гэта робіць Міхаіл Расціслававіч Львоў, падзяліць на дзве групы: **група А** (крыніцы 1, 2) – матэрыял, здабыты непасрэдна аратарам; **група Б** (крыніцы 3, 4) – матэрыял, атрыматы рытарам апасродкавана, з дапамогай іншых сродкаў інфармацыі.

Напрыклад, рыхтуючыся да выступлення на тэму "Рытарычны партрэт ідэальнага лектара", звязаную з нашым курсам, студэнт можа:

*1)* паспрабаваць самастойна змадэліраваць сукупнасць прафесійных і чалавечых якасцей, якія ствараюць ідэальны вобраз лектара, на аснове ўспамінаў пра дзейнасць асоб, якія ўспрымаюцца ім як узоры лектарскага майстэрства, – або, наадварот, рухацца "шляхам ад процілеглага", сыходзячы са сваіх адмоўных ураженнях пра тыя ці іншыя выступленні;

*2)* спецыяльна праслухаць лекцыі, якія ён наведвае, пад рытарычным вуглом успрымання і прааналізаваць станоўчыя бакі ў працы лектараў, з якімі ён сустракаецца на працягу дадзенага семестра; дамовіцца пра тое, каб прачытаць самому ў школе лекцыю перад старшакласнікамі, і пастарацца асэнсаваць гэты вопыт "знутры": што дапамагае і што перашкаджае наблізіцца да вяршынь рытарычнага ідэалу;

*3)* распытаць знаёмых лектараў-практыкаў пра тое, хто для іх з'явіўся прыкладам для пераймання і якія асобасныя рысы ім даводзілася і даводзіцца ў сябе развіваць і пераадольваць;

*4)* вывучыць літаратуру па праблематыцы акадэмічнага красамоўства; праслухаць адукацыйныя праграмы па радыё і тэлебачанні, адзначыць найбольш характэрныя асаблівасці, якія робяць навукова-папулярную мову яскравай і захапляльнай.

Як правіла, чым больш разнастайныя крыніцы вынаходства выкарыстоўваюцца прамоўцам, тым больш змястоўным і цікавым для слухачоў становіцца выступленне. Асабліва выйгрышным і цікаўным для аўдыторыі з'яўляецца наяўнасць асабістага вопыта аратара ў галіне, якая асвятляецца, – прымяненне такога метаду "ролевай прымеркі", "уваходжання ў вобраз", які нярэдка выкарыстоўваюць журналісты для падрыхтоўкі востра праблемных публікацый.

Яшчэ ў эпоху Асветніцтва былі сфармуляваны два, на першы погляд, радыкальна супярэчлівых адзін аднаму тэзісы: "Людзі перастаюць думаць, калі перастаюць чытаць" (Д. Дзідро) і "Вельмі шмат людзей чытаюць толькі, каб не думаць" (К. Ліхтэнберг). Безумоўна, карыстанне крыніцамі групы Б здольна ўзбагаціць прамоўцу інтэлектуальнымі здабыткамі многіх таленавітых і неардынарных людзей, у выпадку чытання – часта нават значна

Этот электронный документ был загружен с сайта филологического факультета БГУ http://www.philology.bsu.by

аддаленых ад прамоўцы ў часе і прасторы. Аднак першапачатковае напаўненне мозга запазычанымі ідэямі і прыкладамі тоіць у сябе падаўленне працэсу фарміравання ў таго, хто рыхтуецца да выступлення, свайго бачання праблемы. Сыходзячы з сказанага вышэй, у плане чарговасці звяртання да пералічаных крыніц трэба сфармуляваць прынцып прыярытэтнасці (папярэдняга выкарыстоўвання) першай з крыніц вынаходства зместу прамовы. На практыцы гэта азначае, што рытарычна падрыхтаваны чалавек пры рабоце над сэнсавым напаўненнем выступлення не пабяжыць адразу ў бібліятэку ў пошуках чужых думак і слоў. Каб не даць загінуць расткам свайго разумення пытання і рацыянальна спланаваць той жа інфармацыйны пошук, будучую дзейнасць, ён паспрабуе спачатку зрабіць тое, што ў яго сілах, асэнсаваць магчымыя змястоўныя грані разгледжання тэмы.

Якім жа чынам можа быць арганізавана разважанне аратара над зместам будучай прамовы? Не заўсёды жа свежыя і каштоўныя ідэі адразу нараджаюцца ў галаве па загаду чалавечай волі, па ўнутранай камандзе: "А ну-ка, думай!". Тады на дапамогу аратару прыходзіць веданне перспектыўных напрамкаў, якія робяць больш плённай працу розуму. У класічнай рыторыцы гэта сукупнасці топасаў – "агульных месцаў", універсальных тыпаў сувязей паміж прадметам прамовы і рэчаіснасцю (напрыклад, наступныя сэнсавыя мадэлі: род і від, цэлае і частка, знешнія і ўнутраныя якасці, імя – паходжанне назвы, час і месца, прычына і наступства, лагічнае і вобразнае параўнанне, супрацьлеглае і да т. п.). Топасы параўноўваюць з высоўнымі полкамі гіганцкай шафы, дзе захоўваецца незлічонае мноства ідэй, якія патэнцыяльна суадносяцца з тэмай выказвання. 24 топасы былі апісаны ўжо Арыстоцелем. 16 важных топасаў пералічаны ў "Кароткай інструкцыі да красамоўства" М. В. Ламаносава. Нагадаем, што больш падрабязна аб гэтай сістэме топасаў і асаблівасцях яе выкарыстоўвання ў працэсе падрыхтоўкі выступлення можна прачытаць у "Практыцы па гісторыі рыторыкі" (тэма 8).

Топасы дазваляюць сфарміраваць разгалінаваную сетку сувязей паміж ключавымі паняццямі тэмы і іншымі паняццямі, якую можна прадставіць у больш строгай форме, у выглядзе табліцы, чаргуючы ўказанні зыходных ідэй, топасаў і вытворных ідэй, або ў больш свабоднай схематычнай форме, у выглядзе так званага дрэва ідэй. У самой прамове знойдзеныя ідэі актуалізуюцца выбарачна, спалучаючыся ў парадку, зручным для прамоўцы, але зусім не абавязкова ў паслядоўнасці іх узнікнення (невыпадкова ўжо Ламаносаў паказваў, што для паспяховай творчай дзейнасці розуму аднолькава неабходны і здольнасць да ўстанаўлення ўзаемасувязей, спалучэння ідэй, і здольнасць да адхілення лішніх асацыяцый).

"Спадчынніцамі" класічнай сістэмы топасаў з'яўляюцца сучасныя эўрыстычныя схемы, якія прапагандуюцца, у прыватнасці, у амерыканскай рыторыцы. Вядома, што само слова *эўрыка* літаральна азначае *знайшоў* – легендарны выкрык Архімеда, які адкрыў названы яго імем закон аб дзеянні выштурхвальнай сілы на апушчанае ў вадкасць цела. Эўрыстычныя схемы ў галіне рыторыкі могуць выглядаць як пералікі пытанняў, якія дазваляюць

Этот электронный документ был загружен с сайта филологического факультета БГУ http://www.philology.bsu.by

паглядзець на тэму з розных бакоў. Прывядзём (не толькі для агульнага ўяўлення, але і для непасрэднага практычнага выкарыстання) прыклад адной з такога рода эўрыстык – "Як апісаць прадмет?", для максімальнай дакладнасці прадставіўшы яе ў выглядзе табліцы.

**Прыклад сучаснай эўрыстычнай схемы для апісання прадмета**

| Пытанні для сэнсавага пошуку | Адпаведны аналітычны падыход |
|---|---|
| 1. Якімі знешнімі прыкметамі валодае прадмет (памеры, форма, колер, гучанне, смак і г. д.)? | Уласна апісальны |
| 2. Якая ўнутраная пабудова прадмета? | Структурны |
| 3.Чым прадмет падобны на аналагічныя і чым адрозніваецца ад іх? | Супастаўляльны |
| 4. Якая гісторыя ўзнікнення і вывучэння прадмета? | Генетычны, гістарычны |
| 5. Якое прызначэнне прадмета? | Функцыянальны |
| 6. Якое магчымае будучае развіццё прадмета? Якім чынам яго можна выкарыстаць інакш з максімальнай эфектыўнасцю? | Праектыўны (прагнастычны) |

Выбарачна карыстаючыся прыведзенай схемай, можна паспрабаваць апісаць самыя розныя фізічныя аб'екты – ад марскога каменьчыка да касмічнага карабля, аднак пры творчым, гібкім прымяненні яе можна адаптаваць і да характарыстыкі абстрактных паняццяў для паўнаты іх навуковага даследвання і тэкставага прадстаўлення вынікаў.

Безумоўна, калі сама праблема будучага абмеркавання выклікае творчае натхненне аратара, ніякія штучныя апоры – "думкавыя падпоркі" – могуць і не спатрэбіцца. Разам з тым, нават у выпадку шчырага інтарэсу да прадмета размовы, будзе карысным зверыць напрамкі стыхійнага руху сваёй думкі з іх універсальным і ўпарадкаваным логіка-рытарычным арсеналам.

Пасля самастойных разважанняў і працы над змястоўным напаўненнем выступлення будучы прамоўца з пытаннямі, якія ў яго ўзніклі, звяртаецца да крыніц гатовай інфармацыі. Тут мы абмяжуемся асобнымі агульнапрызнанымі рэкамендацыямі ў галіне знаёмства з літаратурай аб прадмеце прамовы, якое здольна значна пашырыць сэнсавыя гарызонты зразумення тэмы.

Інфармацыйны пошук пры звяртанні да літаратурных крыніц праходзіць тры галоўныя ступені:

***1)*** бібліяграфічны (знаходжанне звестак аб выданнях, якія цікавяць аратара);

***2)*** дакументальны пошук (атрыманне на рукі саміх выданняў);

Этот электронный документ был загружен с сайта филологического факультета БГУ http://www.philology.bsu.by

*3)* тэарэтыка-фактаграфічны пошук (выбар у крыніцах тых звестак – палажэнняў і прыкладаў, якія перспектыўныя для адлюстравання ў выступленні).

Коратка спынемся на шляхах ажыццяўлення бібліяграфічнага пошуку, не здарма ж эмблемай бібліяграфіі з'яўляецца залаты ключ, які адкрывае дзверы ўсіх навук. Важнай крыніцай бібліяграфічнай інфармацыі з'яўляюцца **каталогі,** якія цяпер прадстаўлены не толькі ў картацечнай, але і электроннай форме. Каталогі могуць быць арганізаваны па розных прынцыпах, сярод якіх, акрамя **алфавітнага,** трэба ўлічваць магчымасці **прадметнага (тэматычнага)** і **сістэматычнага** падыходаў. Прадметны падыход заснаваны на вылучэнні ключавых паняццяў-тэм, размешчаных далей у алфавітным парадку; сістэматычны – на вылучэнні розных галін навук, шыфр кожнай з якіх пры неабходнасці ўдакладняецца па асобным спецыяльным паказальніку.

Пошук дадатковых звестак аб выданнях, якія развіваюць пэўную галіну навукі, у асаблівасці навейшых, можа весціся пры праглядванні **рэфератыўных часопісаў.** Яны змяшчаюць звесткі аб крыніцах у якой-небудзь галіне, апублікаваных за апошні перыяд, прычым не толькі бібліяграфічныя дадзеныя, але і кароткія анатацыі прац або рэфераты замежных выданняў. Сярод рэфератыўных часопісаў вучоным-гуманітарыям дабра вядома інфармацыя, якая перыядычна падрыхтоўваецца ІНІГН РАН (Інстытутам навуковай інфармацыі па грамадскіх навуках Расійскай акадэміі навук). Цяпер такія агляды таксама змяшчаюцца ў друкаваным і электронным выглядзе.

Акрамя таго, "скрытымі бібліяграфічнымі дапаможнікамі" называюць спасылкі на літаратуру ва ўжо знойдзеных крыніцах па тэме выступлення. Гэта перш за ўсё прыкніжныя і прыартыкульныя спісы літаратуры, а таксама падстрочкавая і ўнутрытэкставая бібліяграфічная інфармацыя. Дадзены шлях разглядаецца як вельмі перспектыўны, паколькі ў выпадку яго выкарыстання прымаецца ў разлік работа, зробленая непасрэдна кваліфікаванымі спецыялістамі па праблеме. Такі метад пошуку знакаміты французскі літаратар Андрэ Маруа называў "зоркавым": кожнае выданне нібыта працягвае прамяні, асвятляючы шлях да іншых.

Калі пажадана забяспечыць паўнату і шматбаковасць звестак, якія паведамляюцца, трэба, наколькі гэта дазваляе час падрыхтоўкі, прытрымлівацца <u>прынцыпа разнастайнасці шляхоў бібліяграфічнага пошуку.</u>

Пры вызначэнні рацыянальнай паслядоўнасці знаёмства з падабранымі літаратурнымі крыніцамі спецыялісты па навуковай арганізацыі разумовай працы бяруць пад увагу наступныя фактары:

- <u>ступень цяжкасці тэксту для засваення</u> – пераходзяць ад простых і даступных для ўспрымання крыніц да больш складаных, якія патрабуюць большай падрыхтаванасці чытача (напрыклад, ад знаёмства з артыкулам прадметнага слоўніка-даведніка да манаграфіі, спецыяльна прысвечанай дадзенай праблеме);

Этот электронный документ был загружен с сайта филологического факультета БГУ http://www.philology.bsu.by

- ступень тэарэтычнасці крыніцы – ад больш тэарэтычна нагружаных прац да больш прыкладных, якія змяшчаюць практычныя вынікі з засвоеных пастулатаў (напрыклад, ад адпаведнага раздзела вучэбнага дапаможніка для ВНУ да метадычных рэкамендацый, што раскрываюць праблемы выкладання дадзенай тэмы);
- шырыня ахопу праблемы – ад крыніц больш агульнага і шырокага профілю да больш вузкіх па тэматычным ахопе (напрыклад, ад кніг, якія панарамна ахопліваюць праблему ў цэлым, да часопісных артыкулаў, якія адлюстроўваюць прыватныя аспекты праблемы);
- адваротная храналагічная паслядоўнасць – ад крыніц, дзе змяшчаецца новая інфармацыя, да больш старых, якія паказваюць гісторыю вывучэння тэмы. Гэта дае магчымасць адразу ж быць у курсе сучаснага становішча пытання, не прымаць на веру састарэлыя звесткі.

Рыхтуючыся да прамовы, чалавек можа быць зажыва пахаваным пад гарой кніг – а можа, наадварот, узвысіцца над ёю дзякуючы яе дапамозе. Гэта залежыць ад ступені рацыянальнасці ў працы з літаратурнымі крыніцамі вынаходства зместу выказвання.

Пры знаёмстве з асобнай літаратуранай крыніцай на тэарэтыка-фактаграфічнай ступені інфармацыйнага пошуку апраўданай з'яўляецца апора на прынцып гібкасці ў выбары стратэгіі чытання. Вобразную фармулёўку адзначанага прынцыпа ўяўляе сабой ужо вядомае меркаванне англійскага філосафа Фрэнсіса Бэкана (XVII ст.): "Адныя кнігі мы спрабуем, другія – праглынаем, і толькі нямногія разжоўваем і пераварваем". Бясспрэчна, колькасць выданняў па самых розных галінах ведаў у нашы дні надзвычай вялікая і папаўняецца з уражвальнай хуткасцю, таму значэнне дадзенага прынцыпа ўзрастае ва ўмовах "інфармацыйнага выбуху".

Вылучаюцца розныя віды чытання, у прыватнасці: **а)** па ступені ахопу аб'ёма крыніцы – суцэльнае (цэласнае) і выбарачнае; **б)** па глыбіні засваення матэрыялу – чытанне-прагляд, азнаямленчае і вывучальнае (аналітычнае, паглыбленае).

Каротка ахарактарызуем асаблівасці розных стратэгій чытання па глыбіні "апускання ў матэрыял". **Чытанне-прагляд** заўсёды бывае выбарачным, гэта свайго роду беглая "пастаноўка дыягназу" кнізе. Пры яго рэалізацыі павышаная ўвага звяртаецца ў першую чаргу на:

- вокладку і тытульны аркуш выдання;
- анатацыю, дзе ў вельмі лаканічнай форме могуць давацца звесткі пра аўтара, асноўныя пытанні, своеасаблівасці выдання і яго чытальніцкі адрас;
- загаловак, які дазваляе адразу бачыць структуру працы;
- прадмову і пасляслоўе, якія могуць змяшчаць агульную характарыстыку часу напісання твора і гісторыю яго стварэння, біяграфічныя звесткі пра аўтара, розныя водгукі аб кнізе, значэнне твора для сучаснага перыяду;
- графічны і ілюстрацыйны матэрыял, які прадастаўляе інфармацыю ў нагляднай і кампактнай форме (у гэтым сэнсе псіхалагічна

Этот электронный документ был загружен с сайта филологического факультета БГУ http://www.philology.bsu.by

заканамерным з’яўляюцца паводзіны дзяцей, якія перш за ўсё шукаюць у новай кніжцы малюнкі);

- велічыню абзацаў. Гэты крытэрый не абсалютны, але ў той жа час бывае дастаткова дэманстрацыйным. Лічыцца, што дробныя абзацы сігналізуюць аб насычанасці тэксту вялікай колькасцю розных ідэй, а аб’ёмныя – аб значнай ступені разгорнутасці і важкасці змешчанай у крыніцы аргументацыі;
- наяўнасць імянных і прадметных (паняційных) паказальнікаў, якія даюць уяўленне пра ахоплены матэрыял.

У выніку прагляду робіцца папярэдні вывад аб неабходнасці выкарыстання выдання і аб наступнай стратэгіі працы з асобнымі структурнымі часткамі.

У працэсе **азнаямленчага** чытання ажыццяўляецца “сэнсавае ўзважанне” інфармацыі – яе сартыроўка на галоўную і другарадную, на новую і ўжо вядомую, на сапраўдную і спрэчную, сумніўную, малапраўдападобную. Пры вызначэнні сэнсавай каштоўнасці інфармацыі знешнімі арыенцірамі служаць:

- <u>структурныя прыкметы</u> (размяшчэнне ў тэксце: асобную ўвагу павінны прыцягваць пачатак і канец усяго твора або яго фрагмента і канчатак асобнай фразы, дзе ў славянскіх мовах часцей за ўсё размяшчаецца новае – рэма);
- <u>моўныя прыкметы</u> (выкарыстанне паказчыкаў падсумоўвання – слоў і выразаў тыпа *у выніку, як бачна з сказанага…*; найвышэйшая ступень прыметнікаў і прыслоўяў тыпа *старэйшы, самы вядомы, самы яскравы*; мадальных часціц тыпа *толькі, менавіта* і да т.п.);
- <u>графічныя прыкметы</u> (змяненне тлушчу шрыфта, набор вялікімі літарамі, падкрэсліванне, каляровы друк і да т.п.).

Вынікі азнаямленчага чытання могуць фіксавацца з дапамогай закладак або, калі выкарыстоўваецца кніга з асабістай бібліятэкі аратара, у сістэме графічнай разметкі тэксту і паметак на палях (так званых маргіналій). Пры гэтым ужываецца разнастайная сімволіка: матэматычная (+, –); пунктуацыйная (?,!); лініі розных канфігурацый і інш.

Падчас **вывучальнага** чытання – уважлівай прапрацоўкі, штудзіравання тэксту – звычайна вядуцца запісы. Яны могуць абапірацца на выпіскі ці самастойна фармулявацца чытачом, мець форму плана, тэзісаў або канспекта (у апошнім выпадку асноўныя палажэнні крыніцы суправаджаюцца асобнымі аргументамі і прыкладамі). З магчымых сістэм размяшчэння запісаў самым не рацыянальным з’яўляецца суцэльны запіс у сшытку, а найбольш эфектыўным лічыцца запіс на картках (так званы ***рассыпны канспект***). Яго зручнасць заключаецца перш за ўсё ў магчымасці мабільнай перакампаноўцы матэрыялу і замене перапісвання расклейваннем. Нездарма Дз. І. Мендзялееў адкрыў свой знакаміты перыядычны закон пасля таго, як цэлы дзень svoj ператасоўваў карткі з напісанымі на іх характарыстыкамі хімічных элементаў, па-living сістэматызуючы матэрыял і раскладваючы своеасаблівыя “пасьянсы” і шмат у чым дзякуючы таму, што неабходная

Этот электронный документ был загружен с сайта филологического факультета БГУ http://www.philology.bsu.by

інфармацыя была прадстаўлена ў дынамічнай форме. Вартасць дадзенай сістэмы запісу раскрываецца пры ўмове выканання наступных патрабаванняў:

- сачыць за тым, каб змест карткі быў адзіны, раскрываў якую-небудзь адну падтэму ці мікратэму выступлення;
- дакладна ўказваць аўтарства прыведзеных палажэнняў: ці з'яўляюцца яны цытатамі з літаратурнай крыніцы (і якога канкрэтна) ці асабістымі каментарыямі чытача;
- весці запіс толькі на адным баку карткі.

Прадуманае вядзенне і сістэматызацыя запісаў па прачытаным матэрыяле дапаможа аратару не толькі падрыхтавацца да асобнага адзінкавага выступлення, але і паступова сфарміраваць свой унікальны і не аднойчы запатрабаваны ***рабочы архіў*** па тэматыцы, якая яго цікавіць, – скарбніцу ўжо перапрацаванай, кароткай і прапушчанай праз індывідуальнае ўсведамленне інфармацыі (якая можа быць упарадкавана, у залежнасці ад індывідуальных пераваг, у скрынках з карткамі-раздзяляльнікамі або ў папках з тэматычнымі канвертамі).

У традыцыі рытарскага і мастацкага слова шмат разоў прадкрэслівалася пэўнае значэнне раздзела вынаходства для паспяховага праходжання далейшых этапаў у рабоце над тэкстам. Яшчэ Катон высунуў як "рытарычнае крэда", як свой дэвіз лаканічны пастулат: "Засвой справу, а словы адшукаюцца". Цыцэрон выказваў наступнае максімалісцкае, арыентаванае на высокі ідэал меркаванне: "Прамова павінна квітнець і разгортвацца толькі на аснове поўнага ведання яе прадмета". Тэарэтык французскага класіцызму Н. Буало так ахарактарызаваў асаблівасці творчага працэсу стварэння твора:

Пока неясно вам, что вы сказать хотите,
Простых і точных слов напрасно не ищите.
Но только замысел у вас в уме готов –
Все нужные слова придут на первый зов.

Урэшце, можна ўспомніць і рускую класіку – цудоўныя, натхнёныя строчкі М. Лермантава:

На мысли, дышащие силой,
Как жемчуг, нижутся слова…

Няхай жа меркаванні знакамітасцей, якія падкрэсліваюць значнасць валодання сутнасцю пытання для свабоднага стварэння прамовы, паслужаць для вас урокам і наказам у вашай асабістай аратарскай практыцы.

### *Кантрольныя пытанні*

1. Якія дзве стадыі вылучаюцца ў складзе этапа вынаходства зместу прамовы?
2. З якіх аперацый складаецца фарміраванне задумы будучага выступлення?

Этот электронный документ был загружен с сайта филологического факультета БГУ http://www.philology.bsu.by

**3.** Назавіце крытэрыі, якія трэба ўлічваць пры выбары тэмы для будучай прамовы.

**4.** Якія прыёмы дапамогуць прамоўцу сфармуляваць цікавую назву выступлення?

**5.** Чым адрозніваюцца адзін ад аднаго агульная і канкрэтная мэты вуснага выступлення? Якія групы выступленняў можна вылучыць у залежнасці ад іх асноўнай агульнай тэмы?

**6.** Укажыце асноўныя магчымыя крыніцы вынаходства зместу будучай прамовы. Да якой з іх і чаму, як правіла, мэтазгодна звяртацца ў першую чаргу?

**7.** Прывядзіце прыклады некалькіх аспектаў, якія могуць уваходзіць у эўрыстычную схему для вынаходства зместу выказвання.

**8.** Якія шляхі бібліяграфічнага пошуку ёсць у распараджэнні чалавека, які паглыблена працуе над тэмай тэксту?

**9.** Якія фактары трэба ўлічваць, выбіраючы паслядоўнасць знаёмства з літаратурнымі крыніцамі па тэме выступлення?

**10.** На якія элементы выдання трэба звярнуць асаблівую ўвагу для яго апeратыўнага і якаснага прагляду?

**11.** Якія прыкметы галоўнай інфармацыі спрыяюць яе пошуку ў тэксце?

**12.** Якая з сістэм размяшчэння запісаў па прачытаным пры падрыхтоўцы да прамовы матэрыяле – на асобных аркушах, на картках або ў сшытках – лічыцца больш зручнай і чаму?

## АФАРЫСТЫКА ЯК СКАРБНІЦА РЫТАРЫЧНАГА ВЫНАХОДСТВА. ПЛАН – АСНОВА КАМПАЗІЦЫІ ПРАМОВЫ

### Асноўныя тэарэтычныя звесткі па тэме

Важнай крыніцай сэнсавага ўзбагачэння аратарскай прамовы здольна служыць афарыстыка. Афарызм можа разглядацца як від выслоўя, які належыць пэўнаму аўтару меркавання і які характарызуецца абагульненасцю, універсальнасцю ў адносінах да многіх сітуацый. ***Афарызмамі*** называюць выслоўі, якія характарызуюцца асаблівай ёмістасцю – глыбінёй зместу, адточанасцю і лаканізмам формы. Асноўнымі сэнсавымі тыпамі аўтарскіх афарызмаў, якія, безумоўна, не вычэрпваюць усёй іх разнастайнасці, з’яўляецца сентэнцыя, максіма і парадокс.

Паняцце ***сентэнцыі*** адносіцца да найбольш шырокага спектра афарыстычных выказванняў. Так выяўляюцца розныя абагульненыя меркаванні маральна-этычнага характару, напрыклад: *Сумленне – гэта ўнутраны гонар, а гонар – гэта вонкавае сумленне* (А. Шапенгаўэр); *Гонар – гэта паэзія доўгу* (А. дэ Віньі). У сваю чаргу, ***максімай*** часцей называюць не толькі маральны, але і лагічны рэгулятыў – настойліва выказанае патрабаванне. Класічны прыклад максімы – знакамітая фармулёўка “катэгарычнага імператыва” І. Канта, якая пераклікаецца з біблейскім

Этот электронный документ был загружен с сайта филологического факультета БГУ http://www.philology.bsu.by

“залатым правілам маральнасці”: *дзейнічай так, каб выяўленне тваёй волі магло служыць асновай усеагульнага заканадаўства*. Для максімаў бываюць характэрныя:

§ мадальнасць павіннасці (дзеяслоўныя формы загаднага ладу, кароткія прыметнікі *павінен, абавязаны,* безасабова-прэдыкатыўныя словы тыпа *неабходна*, *трэба,* у тым ліку з адмаўленнем);

§ прыслоўі часу з “пазачасовым”, усеабдымным, катэгарычным значэннем (*заўсёды, ніколі*);

§ у найбольшай ступені, у параўнанні з іншымі тыпамі афарызмаў, клічная інтанацыя.

***Парадокс*** – гэта суджэнне, якое на першы погляд супярэчыць разумнаму сэнсу, але на самай справе яму ўласціва матываванасць (у адрозненне ад алагізма, які прадстаўляе сабой нематываванае парушэнне законаў логікі, сапраўдную недарэчнасць): *Мова дадзена чалавеку для таго, каб хаваць свае думкі* (Ш. Талейран).

Уключэнне ў прамову афарызмаў у форме прамога ці ўскоснага цытавання ўяўляе сабой “аргумент да аўтарытэта” – адзін з прыёмаў узмацнення эмацыянальна-рытарычнай аргументацыі. Ад ужывання чужых афарызмаў творчы аратар можа перайсці да частковай арыгінальнай афарызацыі свайго маўлення – высокай форме яе абагуленасці і стылістычнай адшліфаванасці.

Існуе значная разнастайнасць відаў плана, якія могуць складацца падчас працы над выступленнем. У прыватнасці, гэта ***папярэдні*** (эскізны) план, які вымалёўваецца ў свядомасці яшчэ да спецыяльнага пошуку інфармацыі; ***рабочы*** план, які прадумваецца пры сістэматызацыі матэрыялу на этапе яго размяшчэння; ***аўдыторны*** план – адаптацыя плана, які прадстаўляецца слухачам у час прамовы для палягчэння ўспрымання, сэнсавай арыенціроўкі.

Лагічныя заканамернасці складання планаў з’яўляюцца універсальнымі і павінны абавязкова ўлічвацца. Гэтыя каноны паходзяць ад магчымасці ўбачыць у аснове складання плана лагічную аперацыю дзялення паняцця. З гэтага пункту гледжання як дзялімае родавае паняцце выступае тэма або пункт складанага плана, які падлягае далейшаму падрабязнаму дзяленню; у якасці асновы дзялення – аспект разглядання, які можа змяняцца пасля пэўнага аналізу; у якасці выніковых відавых элементаў дзялення – пункты і падпункты плана.

Нагадаем фундаментальныя правілы карэктнага дзялення паняццяў. Такім чынам, лагічнае граматнае дзяленне паняцця і складанне аднапарадкавых пунктаў плана павінна быць ***суразмераным, размежаваным, аднаасноўным*** і ***непарыўным.*** Парушэнні суразмеранасці дзялення аб’ёму зыходнага паняцця бываюць дваякімі: ***празмернае дзяленне*** (дзяленне з лішнімі элементамі) і ***няпоўнае дзяленне.*** У праекцыі на дзейнасць аратара ў першым выпадку якая-небудзь частка плана выходзіць за рамкі тэмы, вядзе да неабгрунтаваных адступленняў ад яе, а ў другім – план недастаткова яе раскрывае. Аднак, паколькі прамоўца не заўсёды мае

Этот электронный документ был загружен с сайта филологического факультета БГУ http://www.philology.bsu.by

паўнамоцтвы звузіць тэматычнае заданне і ў той жа час часта не можа ахапіць усе нават самыя асноўныя пытанні, дастатковымі мерамі супраць абвінавачвання ў другой з памылак служаць спецыяльныя агаворкі-папярэджанні, канкрэтызацыя, выкарыстоўванне паказчыкаў незавершанасці пералічэння пытанняў, якія трэба раскрыць пры асвятленні тэмы (*і гэдак далей, і да таго падобнае, і іншыя*).

Парушэнні неразмежаванасці дзялення ўзнікаюць, калі аб’ёмы яго выніковых элементаў перамяжоўваюцца паміж сабой (памылка сумяшчэння аб’ёмаў элементаў дзялення). Патрабаванне аднаасноўнасці дзялення паняццяў, адступленне ад якога называецца ***падменай асновы,*** зусім не азначае прынцыповай, катэгарычнай немагчымасці перайсці ад адной плоскасці разглядання да другой, а толькі абараняе ад змешвання пунктаў ці падпунктаў, вылучаных на розных асновах, у адзіным шэрагу. Урэшце, непаслядоўнасць дзялення – суаднесенасць элементаў дзялення розных узроўняў – носіць назву ***скаканне ў дзяленні.*** Апорай на згаданыя крытэрыі забяспечваюцца лагічная выверанасць і стройнасць плана.

Асэнсаванне лагічна паслядоўнага плана прамовы ўяўляе сабой неад’емнае звяно рацыянальна арганізаванай аратарскай дзейнасці.

## Пытанні і заданні

**1.** Па згаданых скарочаных бібліяграфічных апісаннях падзяліце зборнікі афарызмаў на лагічныя групы ў залежнасці ад падыхода да кампазіцыі выдання. (Магчымы выпадкі спалучэння падыходаў.)

1. Симфония разума. М., 1980.
2. Слово о науке: В 2 кн. М., 1981.
3. В мире мудрых мыслей. М., 1962.
4. Афоризмы мыслителей XIX в. СПб., 1999.
5. Ларошфуко Ф. Максимы; Паскаль Б. Мысли; Лабрюйер Ж. Характеры. М., 1974.
6. Витражи мудрости. Мн., 1987.
7. Всеот женщи ны на свете: Крылатые слова всех времен и народов. М., 1996.
8. Энциклопедия новейших афоризмов XX в. Мн., 1999. (Сер. “Классическая философская мысль”.)
9. Лец Е. Непричесанные мысли. М., 1978.
10. Слово о книге. М., 1984.
11. Сладость мудрых речей: Античная афористика. Мн., 1993.
12. Ильин Е. Н. Из болкнота словесника. СПб., 1994.

**2.** Вызначце тып кожнага з прыведзеных афарызмаў (сентэнцыя, максіма, парадокс).

1. Каб змяніць чалавека, трэба пачынаць з яго бабкі (В. Гюго). 2. Тое, што ёсць **у** чалавека, безумоўна, важней таго, што ёсць **каля** чалавека (А. Шапенгаўэр). 3. Высакародна толькі тое, што бескарысліва (Ж. Лабруйер). 4. Не прымай добрых учынкаў, калі можаш без іх абысціся (І. Кант). 5.

Этот электронный документ был загружен с сайта филологического факультета БГУ http://www.philology.bsu.by

Дапамога павінна здзяйсняцца не супраць волі таго, каму дапамагаюць (Ф. Гегель). 6. Часцей за ўсё абцяжарваюць навакольных тыя людзі, якія лічаць, што яны нікому не могуць быць цяжарам (Ф. Ларошфуко). 7. Як жа дарага каштавалі нам тыя няшчасці, якія так і не адбыліся! (Т. Джэферсан). 8. Будзьце міласэрныя да няшчасных, будзьце спагадлівыя да шчаслівых (В. Гюго). Чыстае сумленне – гэта пастаянная Ражаство (Б. Франклін). 10. Гавораць: "Сон праведніка". А ці можа праведнік спаць спакойна? (Ж. Рэнар). 11. Мы жывем таму, што Надзея звяртаецца да Памяці, і абедзьве нам ілгуць (Дж. Байран). 12. Жыццё – трагедыя для тых, хто жыве пачуццямі, і камедыя для тых, хто жыве розумам (Ж. Лабруйер). 13. Жыццё вымушае чалавека шмат рабіць добраахвотна (Е. Лец). 14. Вучыся так, каб быццам бы табе наканавана жыць вечна; жыві так, як быццам бы ты павінен памерці заўтра (С. Смайлс, англійскі пісьменнік-мараліст XIX ст.). 15. Верная прыкмета вельмі неадукаванага чалавека – здольнасць адказаць на ўсе пытанні, якія яму задаюць (Ф. Вальтэр). 16. Вельмі цяжка адказваць на тое пытанне, адказ на якое відавочны (Б. Шоу). 17. Чым больш вы скажыце, тым менш людзі запомняць (Ф. Фенелон, французскі архіепіскап і пісьменнік XVII ст.).

**3.** У кнізе "Жамчужыны мудрасці" ёсць рубрыка "Мудрасць на кожны дзень". Як вы думаеце, які сэнсавы тып афарызмаў тут прадстаўлены вельмі шырока? Чаму вы так вырашылі?

**4.** Вызначыце агульны сэнсавы тып прыведзеных ніжэй афарызмаў. Укажыце прымяняльна да кожнага выказвання моўнае пацвярджэнне свайго пункту гледжання.

1.Прывучы свой розум да сумнення, а сэрца да цярпімасці! (Г. Ліхтэнберг) 2. Трэба быць аптымістам у пачатку работы і поўным сумненняў у канцы яе (Л. Гіршфельд, польскі вучоны-мікрабіёлаг 1-й паловы XX ст.). 3. Неабходна розум свой паглыбляць, а не пашыраць, і, быццам фокус запальнага шкла, сабраць усё цяпло і ўсе прамені свайго розуму ў адну кропку (К. Гельвецый). 4. Не рабіся багатым на розум настолькі, каб стаць бяднейшым на душу (О. Людвіг, нямецкі пісьменнік і крытык XIX ст.). 5. Не трэба цаніць сябе вышэй за свае здольнасці і не трэба сябе зневажаць (І. Гётэ). 6. Паважай сябе, калі хочаш, каб цябе паважалі (Б. Грасіян, іспанскі пісьменнік і філосаф-мараліст XVII ст.). 7. Ніколі не сябруй з чалавекам, якога не можаш паважаць (Ч. Дарвін). 8. Будзь гаспадаром сваёй волі і слугой свайго сумлення (М. Эбнер-Эшэнбах, аўстрыйская пісьменніца XIX ст.). 9. Трэба заўсёды нечага жадаць, каб не стаць няшчасным ад перасыці шчасцем (Б. Грасіян). 10. Ганарыся толькі тымі перамогамі, якія ты атрымаў над самім сабой (Ж. Вольфрам, французскі літаратар XX ст.).

**5.** 1. Паспрабуйце сябе ў ролі парадаксалістаў: самастойна прыдумайце парадаксальныя канцоўкі фраз, пачатак якіх змешчаны ніжэй.

1. Калі жанчына не права, … (Ф. де Круасэ, французскі пісьменнік 1-й паловы XX ст.). 2. Калі хочаш падмануць свет, … (О. Бісмарк). 3. Хто ніколі не рабіў безразважнасцей, той … (Ф. Ларошфуко). 4. Калі мы адмаўляемся ад пахвал у свой адрас, мы толькі … (Ф. Ларошфуко). 5. Каб

Этот электронный документ был загружен с сайта филологического факультета БГУ http://www.philology.bsu.by

дзейнічаць справядліва, трэба ведаць вельмі няшмат, але каб з поўным правам учыняць несправядлівасць, трэба … (Г. Ліхтэнберг). 6. Самая вялікая слабасць – гэта панічны страх… (Ж. Басюэ, французскі епіскап і пісьменнік XVII ст.). 7. Менш за ўсіх любяць парады тыя, хто … (Ф. Чэстэрфілд). 8. Чым больш у чалавека таго, чаго ён саромееца, тым … (Б Шоу). 9. Калі вы хачаце, каб вашы сучаснікі прызналі вас вялікім, пастарайцеся … (А. Бірс, амерыканскі пісьменнік XIX ст.). 10. Жадаеце, каб пра вас добра гаварылі, – … (Б. Паскаль). 11. Калі вы жадаеце мець поспех, вы павінны выглядаць так, быццам бы … (Т. Мур). 12. Характар чалавека лепш за ўсё пазнаецца, калі … (Ж. Поль). 13. Адзіноты трэба шукаць… (Р. Дэкарт). 14. Я ніколі не бываю так заняты, як … (Цыцэрон). 15. У каго шмат сяброў, у таго … (Арыстоцель). 16. Самыя вялікія думкі нараджаюцца … (Л. Вавенарг, французскі пісьменнік XVIII ст.). 17. Сумнявацца ў Богу – значыць … (А. Бальзак). 18. Больш небяспечнымі ворагамі ісціны, чым няпраўда, з’яўляюцца … (Ф. Ніцшэ). 19. Хто занадта старанна пераконвае, той … (Н. Шамфор).

2. Які рытарычны сродак уяўляецца вам найбольш распаўсюджаным у парадаксальных выказваннях?

**6.** “Віктарына для эрудытаў”. Хто з’яўляецца аўтарам прыведзеных выказванняў?

1. Жыццё кароткае, мастацтва даўгавечнае. 2. Усё сваё нашу з сабой. 3. Лепш быць першым у вёсцы, чым другім у Рыме. 4. Грошы не пахнуць. 5. Веды – сіла. 6. Чалавек – усяго толькі трыснёг, але гэта думаючы трыснёг. 7. Я думаю – значыць, існую. 8. Калі Бога не існавала бы, яго трэба было б выдумаць. 9. Няўжо ўнясеш Радзіму на падэшвах бот? 10. Любоў і голад кіруюць светам. 11. Каханню ўсе ўзросты пакорны. 12. Архітэктура – застылая музыка.

**7.** 1. Для развіцця гібкасці і дыялектычнасці мыслення, вынаходства ў падборы довадаў карысна выконваць аблюбаванае сафістамі практыкаванне – пабудаваць доказ і абвяржэнне аднаго і таго ж афарыстычнага тэзіса. (Паспрабуйце быць аднолькава пераканальымі!) Тэзіс можна падабраць самастойна ці выбраць з прыведзеных ніжэй.

1. Твар – люстэрка душы (Цыцэрон). 2. Якое ў людзей жыццё, такое і маўленне (Сенека). 3. Маўклівасць і сціпласць – якасці вельмі прыдатныя для размовы (М. Мантэнь). 4. Звычайна надзея – дрэнны праваднік, хоць добры спадарожнік (Дж. Галіфакс, англійскі дзяржаўны дзеяч XVII ст.). 5. Каханне і сяброўства выключаюць адзін аднаго (Ж. Лабруйер). 6. Чалавек – гаспадар зямлі, на якой жыве (Ж. Ж. Русо). 7. Лепш быць шчаслівым ад памылкі, чым няшчасным ад праўды (Фрыдрых Вялікі). 8. Цярплівасць – лепшая рэлігія (В. Гэго). 9. Каханне – гульня, у якой заўсёды хітруюць (А. Бальзак). 10. Сумленне – афіцыйная назва баязлівасці (О. Уайльд). 11. Лёс – гэта апраўданне бязвольных асоб (Р. Ралан). 12. Усялякая эмоцыя толькі ўзбагачае жыццё (Дж. Галсуорсі).

2. Пры жаданні выкарыстайце прадуманую вамі аргументацыю, каб дапісаць асноўную частку прыведзенай ніжэй прытчы.

Этот электронный документ был загружен с сайта филологического факультета БГУ http://www.philology.bsu.by

У таямнічым змроку бібліятэкі Мудраца два неразлучных браты, Сумненне і Сцвярджэнне, прыпыніліся каля адкрытай кнігі. Зацікаўленасць прымусіла іх звярнуць увагу на першыя строчкі разгорнутага развароту. “…” – сказалі яны.

– Якая бліскучая думка! – усклікнуў брат Сцвярджэнне. – З ёй проста нельга не згадзіцца. Наколькі каротка выказана тут шматлікае!

– Кінь! Што тут бліскучага? – запярэчыў брат Сумненне. – Я, напрыклад, гатоў паспрачацца з аўтарам гэтага выказвання. І з табой таксама, мой брат, які заўсёды пагаджаецца!

– Ну што ж, я прымаю выклік!

...

Вочы братоў гарэлі, шчокі палалі румянцам. Кожны жадаў даказаць сваю праўду. Іх словы вогненнымі іскрамі разляталіся па бібліятэцы, парушаючы яе таямнічую цішыню… У гэты момант дзверы адчыніліся, і з’явіўся Мудрэц.

– Я чуў вашу размову, – сказаў ён, ухмыляючыся.

– Дык хто з нас мае рацыю?! – у адзін голас закрычалі браты.

А Мудрэц адказаў:

– Абодва.

**8.** Перамалюйце ў сшытак схему (мал. 3), дапоўніўшы яе канкрэтнымі відамі плана. Старайцеся дзейнічаць самастойна, не глядзець у тэарэтычную даведку.

**9.** У замежнай рыторыцы распрацоўваліся універсальныя папярэднія планы выступленняў. Размясціце пазначаныя ніжэй пункты падобнага плану, прыведзенага П. Соперам і ў далейшым рэкамендаванага В. А. Баевай, у лагічнай паслядоўнасці. Якой функцыянальнай групе выступленняў адпавядае гэты план?

Сутнасць маёй прапановы па паляпшэнні работы арганізацыі (падраздзялення) (1).

Магчымыя адмоўныя наступствы маёй прапановы і шляхі іх пераадольвання (2).

Канкрэтныя крокі па рэалізацыі маёй прапановы (3).

Станоўчыя змяненні, да якіх прывядзе ўкараненне маёй прапановы (4).

Прычыны, па якіх сённяшняе становішча спраў патрабуе пэўных змен (5).

**10.**Пазначце, якое з правілаў лагічна карэктнага дзялення паняцця парушана ў кожным са змешчаных ніжэй простых планаў выступленняў на філалагічную тэматыку і як можна адрэдагаваць гэтыя планы.

**Жанры мовы**

1. Мастацкія жанры мовы.
2. Немастацкія жанры мовы.
3. Публіцыстычныя жанры мовы.

**Рацыянальная арганізацыя чытання**

Этот электронный документ был загружен с сайта филологического факультета БГУ http://www.philology.bsu.by

1. Чытанне-прагляд.
2. Выбарачнае чытанне.
3. Азнаямленчае чытанне.
4. Вывучальнае чытанне.

**Часціны мовы**

1. Знамянальныя часціны мовы.
2. Прыназоўнікі.
3. Саюзы.
4. Часціцы.
5. Выклічнікі.

**1-я каціліныя Цыцэрона**

1. Дзяцінства і юнацтва Цыцэрона.
2. Пачатак рытарскай кар’еры Цыцэрона.
3. Цыцэрон-консул. Гісторыя вымаўлення 1-й каціліныі.
4. Канцэнтрацыя рытарычных прыёмаў і сродкаў у выступленні.
5. Сацыяльна-палітычнае і эстэтыка-культурнае значэнне прамовы.

**11.** Складзіце абагульняльную табліцу з прыведзенай загалоўкавай графой. Запоўніце правую графу табліцы сваімі прыкладамі простых планаў.

| Важныя патрабаванні да лагічна карэктных планаў | Памылкі, якія ўзнікаюць пры парушэнні лагічных правілаў складання планаў | Прыклады |
|---|---|---|

**12.** У прыведзеным гумарыстычным, парадзійна-гульнявым плане выступлення знайдзіце лагічныя недахопы.

**Жаба як культурна-гістарычны феномен**

1. Месца жабы ў жывёльным свеце.

а) Жабы і палявухі.

б) Жабы і трутні.

в) Жабы і яшчуры.

г) Жабы і гномы.

д) Жабы, жабіхі і жабяняты.

2. Помнік жабе ў Мілане.

а) Біяграфія скульптара.

б) Біяграфія жонкі скульптара.

в) Мастацкая вартасць помніка.

3. Клінічная медыцына і патапсіхалогія жаб.

а) Пераломы і ўдары.

б) Псіхозы.

4. Жаба на нашым стале.

а) Соусы пад жабу.

б) Аб гастранамічнай каштоўнасці жаб у супастаўленні з палявухамі і уліткамі.

в) Віно под жабу.

Этот электронный документ был загружен с сайта филологического факультета БГУ http://www.philology.bsu.by

5. Навейшыя распрацоўкі ў галіне жабалогіі і жабаграфіі.

6. Свята жабы ў палінезійскіх плямёнаў.

(С. Баранаў)

**13.** Прачытайце рэальна складзены план студэнцкага выступлення. Якія парады па ўдасканаленні гэтага плана вы маглі бы даць?

**Асоба Францыска Скарыны як сімвал Беларусі**

1. Месца Ф. Скарыны ў нацыянальнай гісторыі.

2. Эпоха Адраджэння і Ф. Скарына: адзінае і новае.

3. Дзейнасць скарыназнаўцаў:

а) Чэшскі славіст Йосэф Даброўскі;

б) Дз. А. Равінскі;

в) В. У. Стасаў, А. Я. Віктараў, П. В. Уладзіміраў;

г) беларускі філолаг Я. Ф. Карскі, В. Ластоўскі, М. М. Шчакаціхін, М. Доўнар-Запольскі.

4. Выдавецкая дзейнасць Ф. Скарыны:

а) перадумовы і пасляслоўі;

б) другі перыяд дзейнасці;

в) “Апостал” – першая дакладна датаваная кніга Ф. Скарыны.

5. Ці з’яўляецца Ф. Скарына наватарам?

6. Ф. Скарына як паэт.

7. Погляды Ф. Скарыны:

а) грамадска-палітычныя;

б) філасофска-этычныя;

в) дзяржаўна-прававыя.

8. “Я, Францыск, Скарынін сын, з слаўнага горада Полацка”: нацыянальныя і інтэрнацыянальныя погляды Ф. Скарыны.

9. Мова выданняў Ф. Скарыны.

10. Увекавечанне спадчыны і асобы першадрукара:

а) назвы вуліц, устаноў, узнагарод у гонар Ф. Скарыны;

б) 500-годдзе Ф. Скарыны;

в) значэнне для культуры нашай краіны.

11. Водгукі і выказванні нашчадкаў:

а) айчынных;

б) замежных;

в) У. Караткевіча.

**14.** Уявіце сабе, што акадэмічны аратар рыхтуецца да дакладу на пленарным пасяджэнні навукова-практычнай канферэнцыі. Тэма дакладу – “Методыка выкладання рыторыкі ў агульнаадукацыйнай школе: праблемы, пошукі, перспектывы”.

Наш герой сценаграфуе “плынь свядомасці”. Ён запісвае ў выглядзе плана без разбору ўсе ідэі, якія “грукаюць у дзверы розуму”.

Ніжэй падаецца пачатковы фрагмент гэтага плана. Дапамажыце аратару яго адрэдагаваць. Растлумачце прапанаваныя карэктывы.

І. Праблемныя аспекты сучаснага становішча рытарычнай падрыхтоўкі.

2. Атаясамленне прадметнага зместу рыторыкі і

Этот электронный документ был загружен с сайта филологического факультета БГУ http://www.philology.bsu.by

а) функцыянальнай стылістыкі;
б) псіхалогіі зносін;
в) культуры маўлення.

3. Недахоп капіравальнай тэхнікі для тыражыравання рытарычных тэкстаў.

4. Натуральныя псіхалагічныя праяўленні кансерватызму ў настаўніцкім асяроддзі.

5. Непаўната апісальнага гісторыка-культурнага падыходу да навучання.

6. Неабходнасць ў дзейсным, практыка-арыентаваным падыходзе.

7. Эфект старэння навейшай рытарычнай інфармацыі па прычыне спазнення новых паступленняў у бібіліятэкі Рэспублікі Беларусь.

8. Праблемы інфармацыйнага і матэрыяльна-тэхнічнага забеспячэння курса.

9. Несфарміраванасць фона- і відэатэк публічных выступленняў.

10. Неабходнасць у стварэнні не толькі базавых, але і індывідуальных вучэбных планаў.

11. Высокі ўзровень патрабаванняў да самога выкладчыка як развітай і яркай моўнай асобы.

(Некаторыя з пералічаных праблем згадваліся С. А. Мінаевай [4].)

**15.**Складзіце свой лагічна карэктны складаны план выступлення на цікавую для вас філалагічную тэму.

## КАМПАЗІЦЫЙНАЯ СТРУКТУРА РЫТАРСКАГА ВЫСТУПЛЕННЯ

У самым спрошчаным плане ў складзе абсалютнай большасці прамоў, як і любых іншых тэкстаў, магчыма вылучэнне універсальнай кампазіцыйнай схемы-трыяды: уступ, асноўная частка, заключэнне. Уступ і заключэнне прамовы аб’ядноўваюцца ў паняцці ***кампазіцыйнага абрамлення.*** Прапорцыі кампазіцыйных частак выступлення рэгулююцца агульнаэстэтычным канонам **— *правілам “залатога сячэння”,*** вядомым яшчэ з антычнасці і сфармуляваным Л. да Вінчы. У прымяненні да аратарскага выступлення яно гучыць так: уступ і заключэнне прамовы ў аб’ёме сумарна не павінны перавышаць адной трэці ўсяго выказвання.

Фундаментальнай псіхолага-рытарычнай заканамернасцю з’яўляецца таксама ***“фактар краю”*** (“эфект мяжы”), эксперыментальна ўсталяваны ў XIX ст. нямецкім вучоным Г. Эбінгаўзам: пачатак і канец любой паслядоўнасці запамінаюцца больш, чым яе сярэдзіна. У адносінах да рытарскай прамовы гэта азначае, што падрыхтоўка кампазіцыйнага абрамлення патрабуе асаблівай увагі і руплівасці. Сэнсавыя кампаненты, якія могуць быць натуральнымі і выйгрышнымі, зыходзячы з агульнай функцыянальнай прызначанасці уступа і заключэння, абагульнены ў табл. 2.

Этот электронный документ был загружен с сайта филологического факультета БГУ http://www.philology.bsu.by

У класічнай рытарычнай традыцыі вызначаліся два супрацьпастаўленыя віды уступаў: **1)** ***прамы*** (просты, натуральны, непасрэдны) — пачатак прамовы, у якім прамоўца практычна адразу жа знаёміць слухачоў з тэмай выказвання і пачынае яе лагічнае раскрыццё; **2)** ***ускоснае*** (штучнае, апасродкавае) – пачатак прамовы, у якім рытар больш тонка і глыбока рыхтуе аўдыторыю да ўспрымання тэмы. Са структурнага пункту гледжання гэта ажыццяўляецца ў такім выяўленым элеменце ўскоснага выступлення, як ***зачын,*** які папярэджвае ўступу (уводзінам) да прамовы. Дадаткова вылучаецца больш рэдкі, так званы ***нечаканы*** уступ — рэзка эмацыянальны, "выбуховы" пачатак прамовы, які можа звязвацца з якой-небудзь надзвычайнай сітуацыяй.

Па аналогіі магчыма вылучыць прамое і ўскоснае заключэнне. Першае непасрэдна вынікае з астатніх палажэнняў выступлення; другое, прызначанае замацаваць эмацыянальна-цікавае стаўленне слухачоў да прадмета размовы, мае пэўную навізну і менш залежыць ад асноўнай часткі выступлення. Гэта рэалізуецца дзякуючы наяўнасці ў структуры апошняга, акрамя заключэння, больш ці менш разгорнутай ***канцоўкі.***

Выкладанне ў ***асноўнай частцы*** выступлення можа арганізоўвацца рознымі спосабамі ў залежнасці ад наяўнасці і характару сэнсавай сувязі падтэм. У якасці такіх спосабаў вылучаюцца:

- ***паралельны*** **—** асобныя пытанні выступлення практычна аўтаномныя ў сэнсавых адносінах. Дадзены спосаб выкладання найменш тыповы (прыкладам можа служыць выступленне на пасяджэнні па пункту павесткі "Рознае", якая закранае не ўзаемазвязаныя паміж сабой падтэмы);
- ***хранaлагічны*** **—** паміж асобнымі пытаннямі выступлення існуюць адносіны часовай сувязі. На такой аснове могуць будавацца выкладанне біяграфіі вядомай асобы, характарыстыка гістарычнай эпохі і падзеі;
- ***лагічны*** **—** сустракаецца ў разважаннях, дзе паказана прычынна-выніковая сувязь паміж пытаннямі, якія разглядаюцца. Пры гэтым магчымы 2 варыянты разважання: ***дэдуктыўны*** (ад агульнага да прыватнага) і ***індуктыўны*** (ад прыватнага да агульнага), а таксама выкладанне ***па аналогіі.*** У апошнім выпадку на аснове падабенства думкі і маўлення ў частцы прыкмет робіцца вывад аб іх падабенстве па іншых прыкметах. Разважанне па аналогіі са строга лагічнага пункту гледжання не характарызуецца жорсткай прымусовасцю і абсалютнай дакладнасцю вывада, аднак у рытарычным сэнсе можа быць вельмі пераканаўчым.

Пераважнасць дэдуктыўнай або індуктыўнай падачы матэрыялу ў прамове вызначаецца з улікам шэрага ***фактараў,*** галоўнымі з якіх з'яўляюцца:

- ***ступень прастаты/складанасці тэмы.*** Лічыцца, што калі закранутая тэма дастаткова простая, можна сэканоміць час, ужыўшы дэдуктыўнае выкладанне з пералічальнай постпазіцыяй прыватных момантаў. У той жа час, калі тэма складаная для разумення, таксама прымяняецца дэдуктыўны ход думкі, інакш разгалінаваная аргументацыя і

Этот электронный документ был загружен с сайта филологического факультета БГУ http://www.philology.bsu.by

дробязі могуць заблытаць аўдыторыю і трымаць яе ў напружанні, не даючы зразумець галоўнае;

- ***ступень падрыхтаванасці аўдыторыі.*** Гэты фактар узаемазвязаны з згаданым вышэй і з'яўляецца асновай яго ацэньвання, паколькі ступень прастаты/складанасці тэмы — паняцце адноснае, якое вызначаецца зыходзячы з пазнавальных магчымасцей аўдыторыі. Чым больш падрыхтаваным і высокаінтэлектуальным з'яўляецца кантынгент слухачоў, тым больш развіта ў іх здольнасць да абстрактнага мыслення і, адпаведна, тым больш ужываецца дэдуктыўнае выкладанне;
- ***ступень зацікаўленасці слухачоў прадметам абмеркавання.*** Індуктыўнае выкладанне дазваляе ажывіць успрыманне, першапачаткова прыцягнуць увагу канкрэтнымі прыкладамі і падрабязнасцямі;
- ***ступень спрэчнасці тэзіса.*** Калі мы без папярэдняй аргументацыі абвясцім вельмі спрэчны тэзіс, частка аўдыторыі адразу ж паставіцца адмоўна да далейшага. Таму ў выпадках яўнай спрэчнасці тэзіса больш апраўданым звычайна прызнаецца стварэнне аргументаванай базы для сваёй пазіцыі, якая папярэджвае яго ўспрыманню;
- ***нацыянальна-культурная традыцыя.*** Так, прынята думаць, што ў германскай інтэлектуальна-маўленчай культуры перавагу аддаюць дэдуктыўнай пабудове разважання. З іншага боку, у амерыканскай рыторыцы тлумачэнне матэрыялу большай часткай вядзецца індуктыўным спосабам. Падобная манера папулярнага індуктыўнага выкладання часткова аказвае ўплыў на ўстаноўкі ўспрымання ў постсавецкай інфармацыйнай прасторы.

Заўважым, аднак, што ў рэальнай моватворчасці ўсе названыя спосабы выкладання часта камбінуюцца адзін з адным.

У ліку фундаментальных агульнакампазіцыйных прынцыпаў па праву ўзгадваюцца [гл. у асаблівасці 9] прынцыпы ***мэтазгоднай парцыйнасці*** (дакладнасці ў размежаванні матэрыялу на інфармацыйныя блокі), ***паслядоўнасці*** і ***звязнасці*** выкладання. У якасці адпаведнага "маўленчага інструментарыя" — лінгвістычных сродкаў "на службе" кампазіцыйнай стройнасці і рэльефнасці прамовы — неабходна назваць у першую чаргу наступныя функцыянальна-сэнсавыя групы моўных сродкаў:

- ***паказчыкі паслядоўнасці падтэм:*** *па-першае, па-другое, у пачатку (у першую чаргу) звернемся да разглядання..., першае пытанне, другі момант, з аднаго боку, з другога боку; далей, потым; акрамя таго; урэшце, і апошняе* і да т. п.;
- ***паказчыкі ўводу прыкладаў:*** *напрыклад, у прыватнасці, так, разгледзем (прааналізуем) такі прыклад, звернемся (пяройдзем) да прыкладаў; яркімі прыкладамі могуць быць (з'яўляцца, служыць)...* і да т.п.;
- ***паказчыкі спасылак на папярэдняе і наступнае (рэтраспекцыі і праспекцыі):*** *раней я ўжо згадваў пра..., як вы чулі; забягаючы наперад, адзначу..., больш падрабязна мы пагаворым пра гэта некалькі пазней* і да т. п.;

Этот электронный документ был загружен с сайта филологического факультета БГУ http://www.philology.bsu.by

- ***паказчыкі падсумоўвання*** (як агульных вывадаў, якія фармулююцца ў заключэнні, так і прамежкавых рэзюмэ): *значыць, выходзіць, такім чынам, увогуле, у цэлым, як бачна з выкладзенага, мы прыходзім да высновы, што..., абагульняючы, адзначым..., падсумуем вынікі* і да т.п.

Для актывізацыі ўвагі і інтарэсу слухачоў часам выкарыстоўваюць такія “хітрамудрыя” хады ў структурнай арганізацыі матэрыялу, як кампазіцыйная інверсія і рэтардацыя. ***Кампазіцыйная інверсія,*** па аналогіі з сінтаксічнай, — перастаноўка структурных частак выказвання paраўнальна з прамым парадкам выкладання (напрыклад, кульмінацыя ў пачатку апавядання). У сваю чаргу, ***рэтардацыя*** — наўмыснае зацягванне выкладння, адтэрмінаванае паведамленне важных звестак (напрыклад, часовае ўтойванне імені галоўнага героя прамовы, што інтрыгуе слухачоў). Згаданыя прыёмы патрабуюць абдуманага прымянення, каб не прывесці да адмоўнага эфекта — не станіць слухачоў, не дэзарыентаваць іх і не выклікаць згасання інтарэсу.

## Пытанні і заданні

**1.** Ці можна структурыраваць на аснове трохчасткавай кампазіцыйнай схемы наступную прамову караля Генрыха IV Наварскага, якая з’яўляецца сапраўдным шэдэўрам кароткасці? Якая думка доказваецца вашым адказам?

*Салдаты! Я ваш кароль; вы французы. Вось непрыяцель; нападаем.*

**2.** Вядомы ў 20–30-я гг. XX ст. тэарэтык красамоўства А. Міртаў ставіў “каверзнае”, правакацыйнае пытанне, якое дапускае выбар: “Што лепш: моцная прамова са слабым, бескаляровым, вялым канцом або слабая прамова з моцным, удалым завяршэннем?”. Як вы вырашыце гэту дылему? Якой кампазіцыйнай заканамернасцю вы кіраваліся пры разважаннях? Для якой функцыянальнай групы прамоў заключэнне мае асаблівую значнасць: для інфармацыйных або агітацыйных?

**3.** 1. Які рытарычны сродак выкарыстоўваецца ў самой назве правіла “залатога сячэння”? Як можна растлумачыць такую назву?

2. Які, згодна з рытарычнымі ўяўленнямі, максімальны сумарны час выступлення і заключэння даклада на студэнцкай навуковай канферэнцыі, рэгламент якога — 15 хвілін?

**4.** Вызначце від абодвух варыянтаў уступнага фрагмента рытарскай прамовы па хрэстаматыйным апісанні, зробленым расійскім прамоўцам і тэарэтыкам красамоўства А. Ф. Кані. Які ўнутраны элемент структуры ўступу тэкстуальна прыводзіцца аўтарам у апошнім з выпадкаў?

Трэба гаварыць пра Калігулу, рымскага імператара. Калі лектар пачне з таго, што Калігула быў сынам Германіка і Агрыпіны, што нарадзіўся ў гэткім годзе, атрымаў у спадчыну наступныя рысы характару, дзе жыў і выхоўваўся, то... увага наўрад ці будзе прыцягнута. Чаму? Таму што ў гэтых звестках няма нічога незвычайнага і, мабыць, цікавага для таго, каб заваяваць увагу. Даваць гэты матэрыял усё роўна прыйдзецца, але не адразу трэба даваць яго,

Этот электронный документ был загружен с сайта филологического факультета БГУ http://www.philology.bsu.by

а толькі тады, калі ўвага прысутных заваявана, калі яна з рассеянай ператварыцца ў сканцэнтраваную. Першыя словы і маюць гэта за мэту: прыцягнуць увагу аўдыторыі. Першыя словы павінны быць зусім простыя... Можна пачаць так: “У дзяцінстве я любіў чытаць казкі. І з усіх казак на мяне асабліва моцна паўплывала адна (паўза): казка пра людаеда, пажыральніка дзяцей. Мне, маленькаму, было вельмі шкада рабят, якіх велікан-людаед рэзаў, як парасят, вялізным нажом і кідаў у вялікі кацялок. Я пужаўся гэтага людаеда і, калі цямнела ў пакоі, думаў, як бы не трапіць яму на абед. Калі я вырас і нешта даведаўся, то...” далей ідуць пераходныя словы (вельмі важныя) да Калігулы і потым прамова па сутнасці. Скажуць: прычым тут людаед? А пры тым, што людаед — у казцы і Калігула — у жыцці — браты па бязлітасці.

**5.** Успомніце знакаміты громкі пачатак 1-й кацілінарыі Цыцэрона, вывучанай вамі ў курсе гісторыі рыторыкі. Вызначце від уступу, які выкарыстаны вялікім рытарам. Свой адказ аргументуйце, зыходзячы з сітуацыі выступлення.

**6.** Кваліфікуйце від паралельных заключэнняў да выступленняў на аднолькавую тэму. Якія прыёмы выкарыстоўваюцца ў кожным з выпадкаў? Пазначце, якія элементы структуры заключэнняў знайшлі адлюстраванне ў дадзеных урыўках.

а) Такім чынам, рыторыка вывучае заканамернасці эфектыўнага лагічнага і эмацыянальнага ўздзеяння на чалавека з дапамогай маўлення. Шляхам умелага слоўнага пераканання можна змяніць паводзіны людзей, іншы раз уплываючы на іх кардынальным чынам.

б) У старажытнай легендзе расказваецца, як пацярпелыя паражэнне ў вайне спартанцы звярнуліся да знакамітага прадказальніка – Дельфійскага аракула. Яны прасілі выбраць для іх вопытнага, мужнага палкаводца. Якім жа было іх здзіўленне, калі аракул выбраў школьнага настаўніка Тыртэя, які не ведаў воінскай справы і да ўсяго яшчэ быў кульгавы. Спартанцы, аднак, не пасмелі аслухацца і паставілі Тыртэя кіраваць войскам. І што? Здарылася так, што Тыртэй валодаў адной магутнай зброяй, якой могуць карыстацца людзі, – сілай натхняльнага слова. Ідучы ўперадзе войска, Тыртэй праслаўляў доблесных воінаў, ганьбіў здраднікаў і баязліўцаў. Натхнёныя ім, спартанцы акрыялі і разбілі ворага.

Гэта легенда – пра вялікую сілу слова. Ніколі, сябры мае, не страцвайце веры ў яго неадольную сілу і не пагарджайце гэтай магутнай рытарычнай зброяй. Імкніцеся да таго, каб слова стала і гібкім, і гучным у вашых вуснах. І хай у вас усё здзяйсняецца! (Паводле Л. А. Введзенскай, Л. Р. Паўлавай).

**7.** 1. У якім з відаў уступа сустракаюцца спецыяльныя “зачэпвальныя кручкі” (А. Ф. Кані), “прынады для слыху”? Якія прыёмы ўжываюцца ў гэтай функцыі? Выпішыце іх назвы з табл. 2, якая характарызуе кампазіцыйнае абрамленне прамовы.

2. Пакажыце, якія з названых у табліцы прыёмы канструявання канчатковай частцы рытарскай прамовы ў большай ступені характэрны для ўскоснага віда заключэнняў.

Этот электронный документ был загружен с сайта филологического факультета БГУ http://www.philology.bsu.by

Табліца 2

**Структурна-функцыянальная характарыстыка кампазіцыйнага абрамлення прамовы**

| Элементы кампазіцыйнага абрамлення | Іх функцыі | Тыповыя канструктыйныя прыёмы |
|---|---|---|
| Уступ | – прыцягнуць увагу;<br>– выклікаць інтарэс;<br>– заваяваць давер (устанавіць кантакт);<br>– падрыхтаваць успрыманне асноўнай часткі выступлення | – прывітанне;<br>– зварот;<br>–знаёмства аратара з аўдыторыяй;<br>– аб'яўленне тэмы;<br>– прамое падкрэсліванне значэння тэмы;<br>– абвяшчэнне і тлумачэнне “рэкламнай” назвы прамовы;<br>– пастаноўка мэты выступлення;<br>– асвятленне гісторыі ўзнікнення і вывучэння пытання;<br>– азнаямленне слухачоў з планам прамовы;<br>– пастаноўка пытання або серыі пытанняў (тыповая мадэль – *Ці ведаеце вы, што…*);<br>– яркі прыклад (прыклады), у прыватнасці, сюжэтнае апавяданне (расказ, басня, прытча і інш.);<br>– гумарыстычная заўвага;<br>– дэманстрацыя нагляднасці;<br>– апеляцыя да месца і часу выкладання, да складу аўдыторыі;<br>– цытата (у асаблівасці паэтычная і/ці афарызм) |
| Заключэнне | – падсумаваць сказанае;<br>– узмацніць уражанне ад прамовы;<br>– заклікаць да дзеяння | – напамінанне галоўнага (складанне змястоўна-фактычнай інфармацыі);<br>– фармуляванне вывада (складванне змястоўна-канцэптуальнай інфармацыі);<br>– акрэсліванне перспектыў далейшага вывучэння тэмы; |

Этот электронный документ был загружен с сайта филологического факультета БГУ http://www.philology.bsu.by

| | | |
|---|---|---|
| | | –пытанне або серыя пытанняў, якія падтрымліваюць эмацыянальна-зацікаўленае стаўленне да прадмета прамовы;<br>– дарэчная гумарыстычная заўвага;<br>–цытата (у асаблівасці паэтычная ці/і афарызм);<br>– заклік (лозунг, парада), пажаданне;<br>– фармуляванне практычных рэкамендацый;<br>– выражэнне ўдзячнасці слухачам;<br>– развітанне |

**8.** Карыстаючыся табл. 2, пакажыце, якія прыёмы характэрны для ўступу і заключэння прамовы, пабудаванай па апісанай ніжэй мадэлі. Да якога віду будуць адносіцца ўступ і заключэнне, заснаваныя на адзначаных прыёмах?

“Адзін ірландскі палітычны дзеяч, як гавораць, даў наступную параду наконт выступленняў: “Спачатку раскажыце публіцы, што вы збіраецеся расказаць ёй; потым расказвайце, а ўжо далей раскажыце ёй пра тое, што вы ўжо расказалі” (Д. Карнегі).

**9.** Прачытайце пачатак студэнцкага даклада аб літаратуры савецкага перыяду. Аднавіце назвы мастацкіх метадаў, якія прагучалі замест пропускаў. Які від, структурны элемент і прыёмы пабудовы ўступу прадстаўлены ў гэтым урыўку?

Жыў-быў калісьці кароль. І было ў яго адно вока, горб і адна нага. І вось аднойчы ён захацеў, каб лепшыя мастакі краіны намалявалі яго партрэт.

Першы мастак намаляваў караля з цудоўнай постаццю, двума вачамі і на двух нагах. Так нарадзіўся ______________ .

Другі намаляваў караля такім, якім ён быў на самай справе: з адной нагой, з гарбом і адным вокам. Так нарадзіўся ________________ .

А трэці мастак трохі падумаў і намаляваў караля ў профіль у бурцы, вярхом на кані. Так нарадзіўся _____________ .

**10.** 1. Здагадайцеся, якой граматычнай часціне мовы было прысвечана студэнцкае выступленне, пачатак якога вы прачытаеце.

Даўным-даўно, калі Адам яшчэ быў адзінокі і ўся яго праца была даваць імёны жывёлам, думкі яго былі простыя-простыя і караценькія-караценькія. “Гэта – слон! – гаварыў Адам, падумаўшы. – Гэта малпа!” Потым, пачухаўшы за вухам: “Гэта – авадзень!” І так ішлі яго дні.

Але раптам Адам засумаваў… і не ведаў, што рабіць… І не было думак, а толькі слоўная блытаніна. Ён ціха заплакаў, а потым заснуў. Калі ж прачнуўся, то ўбачыў Яе.

– Адам… – усміхнуўся Адам, – і Ева!

Этот электронный документ был загружен с сайта филологического факультета БГУ http://www.philology.bsu.by

– Так з’явіліся …

2. Які від і элемент уступу прадстаўлены гэтым прыкладам?

3. Паспрабуйце самі скласці сюжэт лінгвістычнай казкі аб узнікненні якой-небудзь моўнай з’явы, які можна было б выкласці ва ўступе да прысвечанай ёй прамовы для прыцягнення ўвагі і інтарэсу слухачоў.

**11.** 1. Якія прыёмы выкарыстаны ў асабліва прадуманым заключэнні апошняга, дванаццатага з “Публічных чытанняў пра Пятра Вялікага” С. М. Салаўёва?

Адзначым наша свята дастойным чынам, разуменнем і ўзмацненнем у сябе духу Пятрова… Ды не будзе наша свята толькі ўспамінам мінулага; успомніўшы, будзем выконваць запавет Пятра: “І надалей неабходна працаваць і ўсё загадзя выраблять, бо ўпушчэнне часу смерці варта”. Правіла – век жыві – век вучыся – справядлівае не толькі ў адносінах да аднаго чалавека, але і ў адносінах да цэлых народаў. Няхай жа пройдзе народ наш школу жыцця, як Пётр Вялікі праходзіў сваю шматцяжкую школу, і народ наш будзе доўга жыць на зямлі.

2. Пабудуйце заключэнне актуальнай юбілейнай прамовы аб дзеячы беларускай гісторыі, літаратуры, культуры, звярнуўшыся да слухачоў з заклікам.

**12.** 1. Растлумачце, на якой падставе ў прыведзеную ніжэй калекцыю не зусім удалых пачатковых і заключных фраз рэальных выступленняў залічаны кожны з прыкладаў.

а) “Я не ведаю, як пачаць”; “Я, праўда, спецыяльна не рыхтаваўся”; “Вы, напэўна, не паспяваеце нават за самым новым і важным на старонках газет і часопісаў”; “Як вядома, жнівень змяняецца вераснем. Вось і сёння на двары ў нас вераснёўскі дзень”; “На жаль, я не майстар і не ахвотнік гаварыць”; “Гэта што за паводзіны? Гэта што тут за статак дзікабразаў?”; “Ну, значыцца, так…”; “Мне, ведаеце што, не хапіла часу цалкам падрыхтавацца”; “Вы, безумоўна, ніколі нават і не чулі пра тое, што я вам хачу растлумачыць”.

б) “Ну, што яшчэ сказаць, я нават і не ведаю. Пэўна, у мяне ўсё”; “Ах так, ледзь не забыла. Дарэчы, аб першым пытанні”; “Не хвалюйцеся, я ўжо канчаю. Я разумею, што я вас стаміла, але ўсё ж такі хацела бы дадаць некалькі слоў”; “Ну, калі ласка, пачакайце пару хвілін”; “Ой, ужо званок зараз будзе… Як заўсёды, не паспела!”; “Больш нічога цікавага ўжо не засталося… Ну, увогуле, і ўсё”.

**13.** Якая асаблівасць, што традыцыйна лічыцца не зусім жаданай, характэрна для апісанага М. Твенам уступу? Як вы думаеце, чаму, нягледзячы на гэта, слухачы станоўча паставіліся да такога пачатку прамовы?

Я паміраў ад цікаўнасці паслухаць, як ён пачне. Ён не прымусіў мяне доўга чакаць. Як толькі ён абапёрся на левую руку, закінуў правую за спіну і схіліўся над рукапісам, ён злёгку прыпадняў галаву, мігнуў вачамі на публіку і грамавым мядзвежым голасам прароў гэткую фразу:

– Усе мы паходзім ад нашых продкаў!

Этот электронный документ был загружен с сайта филологического факультета БГУ http://www.philology.bsu.by

Пасля чаго ён так і працягваў равець да самага канца, бесцырымонна пракладаючы сабе дарогу скрозь пастаянныя апладысменты і смех і зусім не звяртаючы ўвагі на іх.

**14.** Ці згодны вы з парадаксальнай рэкамендацыяй ствараць пачатак прамовы ў канцы ўсёй працы над ёй, якая не раз выказвалася ў гісторыі рыторыкі (напрыклад Цыцэронам, Б. Паскалем)? Абгрунтуйце свой пункт гледжання.

**15.** Як вы лічыце, які са спосабаў выкладання – дэдуктыўны або індуктыўны – асабліва рэкамендаваў Арыстоцель для аўдыторыі філосафаў? Адзначце фактар выбару паміж дэдуктыўным і індуктыўным метадамі падачы матэрыялу, які ўлічваўся вамі пры адказе.

**16.** Перад вамі пачатак асноўнай часткі адной з глаў кнігі Д. Карнегі "Як выпрацоўваць упэўненасць у сябе і ўплываць на людзей, выступаючы публічна", створанай на аснове шматгадовага вопыта выкладання курса рытарскага мастацтва тысячам прадстаўнікоў дзелавога свету. Які логіка-кампазіцыйны метад падачы матэрыялу, на ваш погляд, выкарыстаны ў дадзеным выпадку? Які вывад, на вашу думку, робіцца ў канцы пачатага разважання, зыходзячы з праблематыкі кнігі?

Некалькі гадоў таму я пісаў для часопіса "Амэрыкен мэгэзін" расказ пра жыццё аднаго нью-йоркскага банкіра. Я папрасіў аднаго з яго сяброў растлумачыць мне прычыну яго поспехаў. Той адказаў, што важную ролю ў гэтым сыграла яго абаяльная ўсмешка. Спачатку такое заяўленне магло паказацца перабольшаннем, але я веру ў тое, што так яно і было. Іншыя людзі, дзесяткі іншых людзей, нават сотні людзей, магчыма, валодалі больш значнымі вопытам і такімі ж добрымі ведамі ў галіне фінансаў. Аднак у яго была дадатковая перавага, якой яны не валодалі, – ён быў больш ветлівым чалавекам, і адной з моцных рыс была цёплая, добрая ўсмешка, якая адразу заваёўвала давер субяседніка і забяспечвала добрае стаўленне да яе ўладальніка.

**17.** 1. А. К. Міхальская, адзін з найбольш выдатных тэарэтыкаў сучаснага расійскага рытарычнага адраджэння, афарыстычна метка – на фразеалагізаванай аснове – фармулюе наступнае правіла: "Прамова павінна быць не толькі добра скроенай, але і трывала сшытай". Як вам здаецца, менавіта што можна разумець пад моўнымі сродкамі, якія дапамагаюць "добра сшыць" прамову?

2. Чаму лінгва-кампазіцыйныя сродкі часам называюць: а) словамі і выразамі-"мосцікамі"; б) "дарожнымі знакамі" траекторыі руху думкі?

**18.** 1. Ці можна прымяніць да рытарычнага твора выказванне французскага рэжысёра Гадара: "У фільма павінны быць пачатак, сярэдзіна, канец, але не абавязкова ў гэтым парадку"? Як называюцца з'явы кампазіцыйных адхіленняў ад строга лінейнай паслядоўнасці выкладання?

2. Як суадносяцца паняцці прамой і інверсійнай падачы матэрыялу: а) з паняццямі штучнага і натуральнага парадку выкладання; б) з літаратуразнаўчымі паняццямі фабулы і сюжэта?

Этот электронный документ был загружен с сайта филологического факультета БГУ http://www.philology.bsu.by

3. Калі матэрыял у выступленні падаваўся ў інверсійным парадку, як, на ваш погляд, больш разумна ажыццяўляць паўтор найважнейшага ў заключэнні прамовы: так жа ці ў прамой паслядоўнасці? На чым заснавана ваша меркаванне?

**19.** Ці можна прызнаць удалымі згаданыя ніжэй уступныя фразы: а) для тлумачэння настаўніка гісторыі на ўроку ў 5-м класе сярэдняй школы; б) для лекцыі пра школу кінікаў на філасофскім аддзяленні факультэта філасофіі і сацыяльных навук? Растлумачце сваю пазіцыю. (Які структурны ход выкарыстаны ў дадзеным прыкладзе? У якім з выпадкаў можна гаварыць пра "сакрэт Полішынеля"?)

У V ст. да н.э. у Грэцыі жыў адзін дзіўны чалавек. Жыў ён у вялікай і круглай глінянай бочцы – піфасе. Аднойчы сярод белага дня ён пачаў хадзіць з запаленым ліхтаром, каб, паводле яго слоў, "знайсці чалавека"…

**20.** Менавіта якая праблема, на ваш погляд, можа абмяркоўвацца ў навукова-папулярным выступленні, пачатак якога прыведзены ніжэй? Які асаблівы структурны ход выкарыстоўваецца ў дадзеным выпадку?

У нашы часы адным з самых вострых для філолага пытанняў з'яўляецца праблема, з якой кожны з нас сустракаецца штодзённа, нават гэтага не заўважаючы. Праблема, якая паўстае перад намі, калі мы слухаем радыё, глядзім тэлевізар, размаўляем з сябрамі… Праблема, якая вельмі важная не толькі для філолагаў, але і для ўсяго грамадства ўвогуле.

**21.** 1. Якія агульнакампазіцыйныя прыёмы выкарыстаны студэнтам у прыведзеным пачатковым фрагменце біяграфічнага выступлення? Ці змаглі вы здагадацца, жыццю і дзейнасці менавіта каго прысвечана прамова?

"Жыццё яго было кароткім, але насычаным; больш напоўнена працай, чым днямі…

Гэты магутны і нястомны працаўнік, гэты філосаф, гэты мысліцель, гэты геній пражыў сярод нас жыццё, поўнае барацьбы, паядынкаў, бітваў – жыццё, якім ва ўсе часы жывуць усе вялікія людзі. Цяпер ён спазнаў свет. Ён вышэй за саперніцтва і варожасць. У адзін і той жа дзень ён уступіў і ў славу, і ў магілу".

Гэтыя словы прагучалі 21 жніўня 1850 года на могілках Пер-Лашэз у Парыжы, з вуснаў Віктора Гюго. Так развітваўся ён са сваім сябрам і знакамітым пісьменнікам.

Якім жа павінна быць жыццё чалавека, у адрас якога прагучалі гэтыя словы?

2. Падрыхтуйце ўступны фрагмент прамовы пра жыццёвы і творчы шлях любога аўтара, творы якога ўключаны ў школьную праграму па літаратуры, з ужываннем агульнакампазіцыйных прыёмаў інверсіі і рэтардацыі.

## ЗАПАМІНАННЕ ТЭКСТА ВЫСТУПЛЕННЯ. СВОЕАСАБЛІВАСЦЬ ІНФАРМАЦЫЙНЫХ ЖАНРАЎ АРАТАРСКАЙ ПРАМОВЫ

Этот электронный документ был загружен с сайта филологического факультета БГУ http://www.philology.bsu.by

## Асноўныя тэарэтычныя звесткі па тэме

Квінтыліян, следам за Цыцэронам, справядліва называў памяць "скарбніцай прамоўцы": ад надзейнасці яе работы шмат у чым залежаць уражанні слухачоў. У рытарскай традыцыі шлях ад думкі да гучнага слова праходзіў цераз абавязковыя намаганні па спецыяльна арганізаваным запамінанні падрыхтаванага выступлення (раздзел memoria рытарычнага канона). Будучаму аратару і сёння варта ўлічваць асноўныя рэкамендацыі па запамінанні слоўнага матэрыялу, якія носяць рыторыка-псіхалагічны характар. Так, пры запамінанні разгорнутага тэксту мэтазгодна ўнесці ў чарнавік паметкі, што адлюстроўваюць яго структуру, якая добра знаёма аўтару-распрацоўшчыку па пройдзеным ім этапе размяшчэння, а потым у кожнай з інфармацыйных блокаў вылучыць ключавыя, апорныя словы і словазлучэнні. Да іх пажадана падабраць сінанімічныя словы і выразы – для лёгкасці наступнага маўленчага аперыравання назвамі найбольш частотных паняццяў. Сукупнасць асноўных і сэнсавых залежнасцей паміж імі (якія можна абазначыць з дапамогай стрэлак з пазначанымі побач пытаннямі) носяць назву ***"сэнсавага ланцужка"*** выступлення.

Для лепшага замацавання ў памяці вылучанага "сэнсавага ланцужка" магчыма прымяніць прыёмы наглядна-вобразнага запамінання матэрыялу. Так, нярэдка аратарам дапамагае складанне ***карціннага плана*** прамовы, які не толькі рэальна занатоўваецца на бумаге, але і ўяўляецца ў думках. Для абстрактных ключавых паняццяў пры гэтым падбіраюцца канкрэтныя сімвалы, напрыклад, ідэю *прыгажосці* ўвасабляе Венера Мілоская або "агонь, які мігаціць у пасудзіне" (М. Забалоцкі). Апорай для такой канкрэтызацыі могуць часткова паслужыць слоўныя выяўленча-выразныя сродкі, якія ёсць у тэксце выступлення. У спалучэнні з падборам вобразаў, якія ілюструюць апорныя паняцці, для запамінання іх паслядоўнасці іншы раз прымяняюца:

- ***фіксаваны візуальна-лічбавы код*** – выкарыстанне ўстойлівых вобразаў-уяўленняў, якія нагадваюць абрысы лічбаў (напрыклад, *1 – кап'ё*). Пры гэтым фантазія таго, хто запамінае, стварае парныя выявы: вобраз, звязаны з ключавым паняццем + вобраз, звязаны з адпаведным парадкавым номерам;
- рытарычны па сваім паходжанні ***"метад месцаў"*** – спосаб запамінання, пры якім вобразы, што адлюстроўваюць ключавыя паняцці прамовы, сілай фантазіі размяшчаюцца на загадзя вызначаных знамянальных кропках якога-небудзь канстантнага маршрута, добра вядомага аратару. У прыватнасці, у ролі такога маршрута для падарожжа ў думках можа выступаць інтэр'ер дома аратара (у антычным прыкладзе адно з палажэнняў прамовы – аб неабходнасці забяспечыць выхад дзяржавы да мора – замацоўваецца ва ўсведамленні пры дапамозе ўяўлення аб якары, які ўстаноўлены на тронас – крэсла гаспадара дома).

Запамінанне працяглага шэрага разнародных ключавых слоў забяспечваецца таксама складаннем *мнеманічнай фразы* або *тэксту,* дзе

Этот электронный документ был загружен с сайта филологического факультета БГУ http://www.philology.bsu.by

аб'ядноўваюцца адвольным сюжэтам вобразы, якія адлюстроўваюць ключавыя паняцці. Змест такога тэксту зусім не абавязкова павінен быць строга рацыянальным; насупраць, будучы абсурдным, мудрагелістым і фантастычным, ён запамінаецца лепш.

Шляхам актыўнага аднаўлення "сэнсавага ланцужка" тэксту пажадана ўпэўніцца у яго дакладнай засвоенасці. Далей рэкамендуецца яшчэ раз прагледзець і паўтарыць тэкст, у думках "нанізваючы" на кожнае з ключавых паняццяў суаднесеныя з ім падрабязнасці, дэталі. "Сэнсавы ланцужок" выступлення для аднаўлення ўспрымання варта паўтарыць і ў адваротным парадку – ад канца да пачатку (аблюбаваны прыём У. Чэрчыля, які такім чынам "выпрабоўваў на трываласць" прычынна-выніковы аргументаваны каркас прамовы). У заканчэнне ўсіх працэдур па запамінанні можна пераходзіць да рэпетыцыі, у працэсе якой таксама адбываецца дадатковае замацаванне матэрыялу.

Як бачна, эфектыўнасць утрымання прамовы ў памяці можа дасягацца шляхам спалучэння прыёмаў слоўна-лагічнага і наглядна-вобразнага запамінання.

Пераходзячы ад знаёмства з палажэннямі агульнай рыторыкі да засваення асноў прыватнай, адзначым, што пры далейшым прыватнарытарычным аналізе як краевугольны выступае ***функцыянальны*** крытэрый – ужо знаёмае нам размежаванне выступленняў па іх галоўнай мэце. Кожная функцыянальная група выступленняў можа быць разгледжана па адным плане:

- асноўная агульная мэта дадзенай групы прамоў;
- асобныя разнавіднасці выступленняў;
- прынцыпы параджэння прамоў падобнага функцыянальнага профілю.

Рыторыка ***інфармацыйнай*** прамовы набывае асаблівую актуальнасць па прычыне ўласцівага сучаснаму этапу развіцця чалавецтва лавінападобнага, экспаненцыяльнага прыросту інфармацыі, якім абумоўлена небяспека інфармацыйных перагрузак. Таму прынцыпова значнай ***мэтай*** прамоў дадзенай функцыянальнай групы з'яўляецца не толькі перадаць пэўны аб'ём звестак, але і садзейнічаць іх засваенню. Важнейшыя ***жанравыя разнавіднасці*** інфармацыйнай прамовы – хранікальнае і навуковае паведамленні, справаздачны і даследчы даклады, акадэмічная і навукава-папулярная лекцыі, палітычны і навуковы агляды.

***Базавыя прынцыпы параджэння інфармацыйнай навуковай прамовы,*** якая ўяўляе першарадную важнасць для навукава-педагагічных работнікаў, могуць быць згрупаваны вакол наступных катэгорый: **1)** катэгорыя колькасці інфармацыі; **2)** катэгорыя якасці інфармацыі; **3)** катэгорыя спосаба падачы інфармацыі. Кожная з катэгорыйрэалізуецца цераз свае прынцыпы.

**Агульныя прынцыпы параджэння інфармацыйных навуковых выступленняў**

Этот электронный документ был загружен с сайта филологического факультета БГУ http://www.philology.bsu.by

Інфармацыйна-камунікатыўныя катэгорыі
Катэгорыя **колькасці** інфармацыі
а) прынцып лішку ведаў у аратара
б) прынцып патрабавальнасці ў адборы інфармацыі

Катэгорыя **якасці** інфармацыі
а) прынцып адноснай навізны інфармацыі
б) прынцып апоры на вядомае аўдыторыі

Катэгорыя **спосаба падачы** інфармацыі
а)прынцып моўнага і паралінгвістычнага ўвасаблення дынамікі мыслення
б) прынцып памяркоўнасці ў экспрэсіўнасці выказвання і выканання

Палягчае спасціжэнне новага для слухачоў зварот аратара да прыёмаў папулярызацыі навуковай мовы. Да іх адносяцца, у прыватнасці, ***прыёмы тлумачэння паняццяў*** і ***ўключэння лічбавых дадзеных.*** Да ліку першых, акрамя класічнай лагічнай дэфініцыі (азначэння праз бліжэйшы род і відавое адрозненне), належаць:

- апісанне – паказ вонкавых, у тым ліку неістотных, прыкмет прадмета;
- характарыстыка, якая можа трактавацца як ацэначнае меркаванне;
- матывацыйны аналіз – тлумачэнне паходжання слова;
- супастаўленне з вядомымі паняццямі – сінанімізацыя, антанімізацыя;
- тлумачэнне праз аналогію, у тым ліку мастацкага, вобразнага паходжання;
- спасылка на прыклад (прыклады) – у апошнім выпадку мае месца так званы пералічальнае (энумератыўнае) азначэнне;
- нагляднае (астэнсіўнае) тлумачэнне – дэманстрацыя адпаведнага аб'екта;
- кантэкстуальнае ўключэнне, пры якім агульны сэнс паняцця становіцца зразумелым з бліжэйшага слоўнага асяродка.

Прыёмамі палягчэння ўспрымання лічбавага матэрыялу служаць:

- акругленне;
- супастаўленне з іншымі колькаснымі дадзенымі;
- канкрэтызацыя – асабліва нагляднае супастаўленне;
- папярэдняя ацэнка колькасных звестак, якая фарміруе ўстаноўку іх успрымання;
- вылічэнне (аперцыяналізацыя) – так, К. А. Ціміразеў на сваіх лекцыях прапаноўваў слухачам рабіць дзесяцізначныя выкладкі:

Этот электронный документ был загружен с сайта филологического факультета БГУ http://www.philology.bsu.by

у выніку атрыманыя самастойна вывады добра запаміналіся слухачамі;

- спалучэнне абагульненых статыстычных дадзеных з адзінкавым прыкладам (прыкладамі).

Разнастайнасць прыёмаў папулярызацыі інфармацыйнай навуковай прамовы прадстаўлена таксама вывучанымі раней ***кампазіцыйнымі*** прыёмамі інверсіі і рэтардацыі, пабудовы эмацыянальна афарбаванага ўступу і заключэння; ***маўленчымі*** прыёмамі надання стылю выступлення нефармальнай, размоўнай афарбоўкі, дасягнення слоўнай нагляднасці выкладання пры дапамозе тропаў, узмацнення кантактнасці маўлення, павышэння сінтаксічнай экспрэсіі (пры дапамозе ўжывання маўленчых фігур) і г.д.

Згаданыя прыёмы *папулярызацыі* інфармацыйнай навуковай прамовы могуць скарыстоўвацца пры тлумачэнні матэрыялу і дазваляе прамоўцу прыцягнуць увагу аўдыторыі і тым самым – набыць *папулярнасць* сярод слухачоў.

## Пытанні і заданні

**1.** Ніжэй прыведзены перабудаваны і часткова перайначаны фрагмент з “Новага арганона” знакамітага філосафа Фрэнсіса Бэкана. Аднавіце правільны парадак накіравання вобразаў, з дапамогай якіх канкрэтызуюцца абстрактна вылучальныя этапы рытарычнай дзейнасці.

Эмблемы зводзяць інтэлектуальнае да пачуццёвых рэчаў; бо тое, што можна адчуць, заўсёды мацней абуджае памяць і хутчэй запамінаецца, чым інтэлектуальнае… Таму лягчэй утрымаць у памяці вобраз паэта за пісьмовым сталом, паляўнічага, які страляе ў зайца, акцёра, які прагаворвае сваю ролю, хлопчыка, які завучвае верш, аптэкара, які расстаўляе свае каробачкі, чым адпаведныя паняцці вынаходства, размяшчэння, элакуацыі, памяці, дзеяння…

**2.** 1. З прыведзенага спіса выберыце абстрактныя паняцці, пры ўспрыманні якіх для ўзнікнення зрокавых асацыяцый неабходны ўскосныя адпаведнасці.

Дзіця, міласэрнасць, архідэя, вясёлка, надзея, русалка, справядлівасць, сляза, слоўнік, правіннасць, адзінарог, недастатковасць аргументацыі.

2. Прапануйце свае варыянты вобразнай канкрэтызацыі вылучаных вамі паняццяў.

3. Вызначце, як суадносяцца апісанні вобразаў, прапанаваных падвыпрабавальнымі для канкрэтызацыі адабраных вамі паняццяў, з самімі паняццямі.

1) Арол, які лунае ў нябёсах; сцяг, які трапечыцца на ветры; расчыненыя дзверы; разламаныя краты; цыганскі табар;

2) разбітая ваза; дзіця ў кутку; чалавек са схіленай галавой і апушчанымі вачамі; чалавек, які трымае галаву на каленях, абхапіўшы яе рукамі; цёмная пляма або камень на сэрцы;

Этот электронный документ был загружен с сайта филологического факультета БГУ http://www.philology.bsu.by

3) яблык, разрэзаны папалам; шалі; меч; жанчына з завязанымі вачамі;

4) недаспелы вінаград; чалавек, які разводзіць рукамі з разгубленым выглядам; туман і імгла; вада; недабудаваны дом; тройка ў дзённіку; дрэва без каранёў;

5) гадзіннік; чаша, якая вось-вось перапоўніцца; твар маці; прыкаваны Праметэй; хамут; селянін і конь на пашы; манастыр; сэрца са шрамамі; стары з невадам, які "чакае з мора надвор'я";

6) аленяня над ахапкам травы; царква; раскрытыя далоні; медыцынская сястра;

7) дзіця; расток, які прабіваецца на святло; зялёны агеньчык; усход сонца; зорка; прамень святла ў цемры; астравок сушы; саломінка і тапелец; бутэлька з запіскай аб караблекрушэнні, кінутая ў акіян.

**3.** У трактаце фларэнтыйца Космана Раселія (канец XVI ст.) пра мастацтва запамінання ў якасці вобразаў памяці для мастацтваў і навук выступаюць іх выдатныя прадстаўнікі. Падбярыце замест пропускаў імёны тых асоб, якія ўвасабляюць сабой названыя ва ўрыўку навукі і мастацтва і лёгка аднаўляюцца ў вашым уяўленнем.

Так, да граматыцы я размяшчаю [**…**]; да рыторыкі я размяшчаю [**…**]; … [**…**] да філасофіі;… да жывапісу [**…**]; … да астралогіі [**…**];… да музыкі [**…**].

**4.** 1. Разбейце тэкст выступлення пра работу памяці на сэнсавыя блокі. Вылучыце ключавыя словы і словазлучэнні дадзенага тэксту; складзіце яго "сэнсавы ланцужок" (гл. мал. 7).

Давайце ўзгадаем даволі знаёмую карціну. Аднаму з нас даручана зрабіць даклад на цікавую тэму. Ён доўга рыхтуецца, рупліва збірае матэрыял, робіць выпіскі, упарадкоўвае тэкст сваёй прамовы, стараецца знайсці дакладныя словы і яркія параўнанні.

І вось настае хвалюючая гадзіна. Дакладчык ідзе да стала, дастае падрыхтаваны тэкст і … пачынае чытаць. На слухачоў ён не глядзіць: яго вочы не могуць адарвацца ад паперы. Канешне, кантакт з аўдыторыяй не ўсталёўваецца, і нават тыя слухачы, якія ставіліся добразычліва, губляюць інтарэс. Узнікае шум. Дакладчык заўважае ўсё гэта і страчвае ўпэўненасць. Яго жаданне выступаць знікае, а ўвага слухачоў яшчэ больш памяншаецца. Натуральна, што нават добры даклад у такіх умовах асуджаны на няўдачу.

У чым жа прычына гэтай няўдачы?

Перш за ўсё ў тым, што дакладчык не змог запомніць змест даклада і не адрываў галаву ад запісаў. Калі б ён свабодна вымаўляў падрыхтаваную прамову, а не механічна чытаў напісанае, атрымаўся бы зусім іншы вынік. Увага дакладчыка была бы скіравана перш за ўсё на слухачоў, ён мог бы актыўна разважаць уголас, улічваць рэакцыю аўдыторыі, іншымі словамі, размаўляць не з аркушам паперы, а з жывымі людзьмі, якія ўспрымаюць яго прамову. І іх успрыманне, у сваю чаргу, было б зусім іншым: аўдыторыя слухала бы ўважліва і зацікаўлена.

Такім чынам, справа ў запамінанні. Канешне, калі тэкст выступлення параўнальна невялікі і нескладаны (як, напрыклад, невялікае паведамленне),

Этот электронный документ был загружен с сайта филологического факультета БГУ http://www.philology.bsu.by

практычна поўнае яго запамінанне можа адбыцца падчас працы над ім. Аднак значны па аб'ёму тэкст запамінаецца пры гэтым толькі часткова. Тое, што чалавеку мімаволі запомнілася, нагадвае мазаіку, у якой у большай ці меншай колькасці ёсць парожнія лункі. Гэтыя лункі і трэба запоўніць у ходзе далейшага, ужо з усвядомленай устаноўкай, запамінання.

І вось тут, паставіўшы перад сабой задачу запомніць тэкст, мы сутыкаемся з важнай праблемай: як запомніць? Як прымусіць наш рабочы інструмент – памяць – дзейнічаць хутчэй і лепш?

**Дзеянне?**
**Наступства?**
**I.** Даклад Чытаць Адсутнасць кантакту
**Прычына?**
**II.** Поўнае запамінанне Частковае
**Супрацьлегласць?**
**Умова?** **Умова?** **Выхад?**
Невялікі Нескладаны тэкст Адвольнае запамінанне
Законы працы памяці

**Якія?** **Якія?**
**III.** Невядомыя Вядомыя
**IV.** Канцэнтрацыі **V.** Паўторы **VI.** Узаемасувязі
… … …

**Прыклад фрагменту "сэнсавага ланцужка" аналізаванага тэксту**

Гавораць, што з памяццю трэба гаварыць на зручнай для яе мове. Толькі вось мова памяці навукай пакуль што яшчэ недастаткова вывучана. Што такое памяць, як яна дзейнічае, якія заканамернасці яе працы – усе гэтыя пытанні пакуль што яшчэ да канца не высветлены. Магчыма, вы ведаеце, што ў кібернетыцы пры вывучэнні аб'ектаў з невядомай унутранай пабудовай карыстаюцца выразам "чорная скрынка". Па аналогіі вучоныя называюць памяць "ружовай скрынкай", жадаючы падкрэсліць, што работа мозга (ружовага па колеру) як носьбіта памяці ў многім застаецца загадкай.

І ўсё ж такі навука ведае пэўныя законы запамінання, сярод якіх тры галоўныя. Яны вельмі простыя, але на іх заснавана любая сістэма запамінання. Назаву іх: закон канцэнтрацыі, закон паўтарэння, закон узаемасувязі.

Давайце разгледзем гэтыя законы і іх выкарыстанне па парадку.

Пачнем з закона канцэнтрацыі. У псіхалогіі канцэнтрацыя вызначаецца як выбіральная накіраванасць на пазнавальны прадмет. Гэта азначае, што пры

Этот электронный документ был загружен с сайта филологического факультета БГУ http://www.philology.bsu.by

канцэнтрацыі з усіх звестак вылучаецца істотная для нас інфармацыя і на ёй засяроджваецца наша ўвага.

Пазнаёмце сярэдняга чалавека з двума-трыма вашымі сябрамі, і можа здарыцца, што праз некалькі хвілін ён не ўспомніць ніводнага названага яму імя. Ён, верагодна, будзе апраўдвацца, спасылаючыся на дрэнную памяць. Аднак справа перш за ўсё ў тым, што ён быў няўважлівым, не ўключыў механізм усвядомленай і накіраванай увагі. Мы жа не будзем абвінавачваць фотаапарат за тое, што ў тумане здымкі не атрымаліся, але хочам, каб наша ўсведамленне ўтрымала цьмяныя і туманныя ўражанні. Таму запомнім правіла, якое нам дыктуе закон канцэнтарацыі: накіруем увагу на прадмет, які вывучаецца, паспрабуем вылучыць у ім як мага больш прыкмет, рыс, сувязей, не дапускаючы пераключэння ўвагі на іншыя прадметы.

Наступны закон – закон паўтарэння. Пра тое, што паўтарэнне – маці вучэння, ведаюць усе. Аднак паўтараць можна рацыянальна і нерацыянальна. Разумнае паўтарэнне, якое праводзіцца ў адпаведнасці з асаблівасцямі памяці, – вось што нам патрэбна. Быў вычарчаны асобны графік – крывая забывання, узлёт якой прыпадае на самы яе пачатак. Як паказалі даследванні, найбольшая страта інфармацыі прыпадае на першыя 20 секунд пасля засваення, таму на працягу гэтага часу прачытаную фразу трэба асэнсаваць і паўтарыць (інакш інфармацыя можа быць зусім страчана), а за першыя восем гадзін мы забываем больш, чым за наступныя трыццаць дзён. Вядома таксама, што паўтарэнне матэрыялу цераз пэўныя прамежкі часу больш эфектыўныя, чым завучванне ўсяго адразу і да канца. Калі тэкст даклада, напрыклад, падрыхтаваны вамі за 8 дзён да выступлення, то графік паўтарэнняў можа выглядаць такім чынам: матэрыял рэкамендуецца паўтарыць спачатку праз 15–20 хвілін, потым праз 8–9 гадзін і яшчэ раз праз 24 гадзіны. Трэба помніць і пра біярытмічную арганізацыю запамінання: лепш усяго паўтараць матэрыял раніцай і вечарам.

І яшчэ: вялікі па аб’ёму матэрыял дзеліцца пры завучванні на закончаныя сэнсавыя часткі. У гэтым выпадку спачатку кожная частка завучваецца асобна, а потым увесь матэрыял паўтараецца як цэлае. Не перашкодзіць таксама непасрэдна перад выступленнем яшчэ раз прагледзець матэрыялы, прыпомніць факты і імёны.

Запомніўшы гэтыя правілы, якія нам дыктуе закон паўтарэння, пяройдзем да трэцяга з галоўных законаў запамінання – закону ўзаемасувязі. Яго сакрэт – гэта сакрэт стварэння ў нашым усведамленні шматлікіх і разнастайных сувязей вядомага з тымі фактамі, якія мы хочам запомніць. Факты трэба звязваць паміж сабой, нібыта сплятаць сетку з вядомага і невядомага. Як гэта зрабіць? Перш за ўсё шляхам асэнсавання, высвятлення значэння фактаў. Абдумайце новы факт з усіх пунктаў гледжання: чаму, дзе, як, калі гэта здарылася? Што з вядомага гэта нагадвае? З чым можа быць звязана?

Запомнім: усё, што мы хочам запомніць, павінна быць асэнсавана і ўплецена ў нябачную сетку ўсведамлення. Хто больш абдумвае атрыманыя

Этот электронный документ был загружен с сайта филологического факультета БГУ http://www.philology.bsu.by

звесткі і ўстанаўлівае паміж імі больш цесныя сувязі, той будзе паляпшаць сваю памяць.

А цяпер паспрабуем зрабіць вывады. Добрае выступленне, асабліва аб'ёмнае, патрабуе спецыяльных намаганняў, каб яго запомніць. Для лепшай работы памяці трэба ведаць і карыстацца галоўнымі законамі запамінання: канцэнтрацыі, паўтарэння і ўзаемасувязі.

"Сярэдні чалавек, – гаварыў вядомы псіхолаг К. Сішор, – скарыстоўвае не больш за дзесяць працэнтаў прыроджаных магчымасцей сваёй памяці. Астатнія дзевяноста працэнтаў прападаюць, таму што ён парушае натуральныя законы запамінання". Канешне, мы не можам дазволіць сабе быць такімі марнатраўнымі, і хочацца верыць, што прыведзеныя тут рэкамендацыі дапамогуць нашай памяці, а адсюль – і ўсёй нашай працы.

2. Падкрэсліце ключавыя словы (словазлучэнні) 1-га парадку, кожнае з якіх з'яўляецца важным для адпаведнага сэнсавага блока. Падбярыце дапаможныя вобразы для нагляднай канкрэтызацыі тых з іх, якія гэтага патрабуюць. Звярніце ўвагу на выяўленча-выразныя моўныя сродкі, якія ёсць у тэксце.

**5.** Прачытайце мнеманічны мінітэкст прыгоднага зместу, створаны для замацавання ў памяці прыведзенай вышэй прамовы. Назавіце тыя словы выступлення, якія паслужылі вобразнымі апорамі запамінання.

"Выразаўшы паперу ў форме мазаікі, я паклаў яе ў скрынку ад фотаапарата, дзе ўжо ляжаў графік руху паяздоў. "Вось і сетка, каб лавіць прастакоў!" – радасна падумаў я."

**6.**1. У адным з дэтэктыўных расказаў вядомага чэшскага пісьменніка К. Чапека расшукваецца віноўнік дарожнага здарэння, які збіў жанчыну і паехаў, нават не спыніўшыся. Сведкі, якія былі дапрпшаны паліцэйскім чыноўнікам, не запомнілі нумар машыны. Найменш карысным здаваўся паэт, які прысутнічаў пры гэтым, думалі, што ён "лунаў у аблоках" і не праявіў назіральнасці. Аднак, прыйшоўшы дадому, паэт напісаў аб убачаным верш, у якім ёсць такія строчкі:

Повержен в пыль надломленный тюльпан.
Умолкла страсть. Безволие… Забвенье.
О, шея лебедя!
Корона…
Барабан и эти палочки – трагедии знаменье!

Загадкавыя паэтычныя вобразы дапамаглі вызначыць номер машыны, якую шукалі. Паспрабуйце адгадаць, якім ён быў.

2. Падобныя зрокавыя асацыяцыі лічбаў з пэўнымі вобразамі ляжаць у аснове выкарыстання лічбавага кода, які можа прымяняцца для запамінання парадку праходжання элементаў у якім-небудзь складаным шэрагу. Здагадайцеся, якія лічбы "хаваюцца" за прыкладамі індывідуальных, суб'ектыўных вобразных паралелей, прапанаваных падвыпрабавальнымі (лічбы могуць разглядацца ў перавернутым выглядзе). Паспрабуйце ўбачыць гэтыя ўяўленні ўнутраным зрокам.

Этот электронный документ был загружен с сайта филологического факультета БГУ http://www.philology.bsu.by

1) Маланка; парус; зламаны відэлец; жыраф; перавернутае падчас уборкі крэсла на парце; вучань паднімае руку;

2) Посах; страла; тэлеграфны стоўб; цвік; ручка; сучок на галінцы; бусел або чапля; чалавек з доўгім носам;

3) Кошык; замок, які вісіць на дзвяры; сальта гімнаста;

4) Вешалка; фламінга; кіт; гарбун; дзяўчына ў шырокай спадніцы;

5) Крыж; каса (прылада працы); качарга; будаўнічы кран; канатаходзец;

6) Смоўж; паветраны шарык; зачынены парасон; настольная лямпа; клубок з хвосцікам; коска;

7) Серп; ключ; веласіпед уперадзе; палова разрэзанага яблыка з лісцікам;

8) Вілы; відэлец; карона; лук (зброя); спружына; хвалі; чайка; вушы зайца, які спіць; вусы;

9) Заход сонца над вадой; прапелер; гантэль; акуляры; бант або гальштук "бабачкай"; заручальныя пярсцёнкі; крэндзель; пясочны гадзіннік; матрошка;

10) Пярсцёнак; кола; вянок; талерка; кот, які скруціўся клубком; мяч; абаранак або сушка; агурок; луна.

3. Прыдумайце і апішыце (а яшчэ лепш – замалюйце) свой вобразна-лічбавы код для запамінання нумарных паслядоўнасцей. (Можна скарыстоўваць вобразы, якія вам спадабаліся, з ліку прыведзеных вышэй.)

4. Складзіце план будучай прамовы на цікавую для вас тэму (5–10 пунктаў). Падбярыце канкрэтныя вобразы, якія адлюстроўваюць кожны з пунктаў плана. Патрэніруйцеся ў запамінанні маўленчай структуры на аснове фіксаванага наглядна-лічбавага кода. Для праверкі эфектыўнасці запамінання раскажыце пра складзены вамі план выступлення, не карыстаючыся запісамі.

**7.** Самастойна падбярыце тэкст памерам каля 2–3 друкаваных старонак, які мог бы быць выступленнем. Прыкладзіце да яго комплекс вядомых вам спецыяльных прыёмаў запамінання: 1) падзяліце на сэнсавыя блокі, складзіце "сэнсавы ланцужок"; 2) намалюйце карцінны план; 3) складзіце мнеманічную фразу або невялікі тэкст і г.д. (карыстайцеся памяткай для паляпшэння запамінання тэкста прамовы). Выступіце, не звяртаючыся да пісьмовага матэрыялу і ацаніце эфектыўнасць выкарыстаных прыёмаў запамінання.

**8.** Прачытайце фрагмент тлумачэння студэнткай тэмы "Лексічнае і граматычнае значэнне слова" падчас педагагічнай практыцы. Які прынцып падрыхтоўкі інфармацыйных выступленняў знайшоў яркае ўвасабленне ў прыведзеным урыўку?

"Наліваем у стакан ваду. Вада – змест, стакан – форма. Пераліваем ваду ў талерку. Што змянілася: форма ці змест? Форма. Пераліваем ваду з талеркі ў графін. Што змянілася цяпер? Зноў форма. А калі мы ў той жа стакан наліваем кампот? Мяняецца змест.

Тое ж адбываецца і са словамі. Параўнаем словы *стол* і *канапа*. Чым яны адрозніваюцца? Лексічным значэннем (зместам). Форма (граматычнае значэнне) аднолькавая: адзіночны лік, назоўны склон. *На стале, на канапе* –

Этот электронный документ был загружен с сайта филологического факультета БГУ http://www.philology.bsu.by

што змянілася ў гэтых словах? Форма (таксама, як пераліваць ваду ці кампот з стакана ў талерку)…”

**9.** Вызначце прыёмы, выкарыстаныя пры тлумачэнні паняццяў. Якія тлумачэнні і чаму здаюцца вам не зусім удалымі?

1) Агрэсіўны – значыць неміралюбны.

2) Сшыткі, алоўкі, ручкі і да таго падобнае называюцца канцэлярскімі прыналежнасцямі.

3) Логіка – навука аб лагічных формах мыслення і іх адпаведнасці лагічным законам.

4) Амфара – пасудзіна з дзвюма ручкамі па баках, звычайна з намаляванымі чырвонымі або чорнымі фігуркамі.

5) А зараз вы пачуеце гучанне музычнага твора, якое дасягаецца дзякуючы спецыяльнаму прыёму ігры. Гэты прыём вызначаецца тэрмінам *глісанда*.

6) Слова *характар* у перакладзе са старажытнагрэчаскай мовы значыць “пячатка”. Характар – гэта тыя індывідуальныя асаблівасці чалавека, якія накладаюць пячатку на ўсе яго ўчынкі.

**10.** Кваліфікуйце прыёмы тлумачэння тэрмінаў, выкарыстаныя ў дадзеных урыўках з інфармацыйных выказванняў студэнтаў-філолагаў. Знайдзіце няўдалыя тлумачэнні і аргументуйце сваю ацэнку.

1) Само слова *тэрмін* паходзіць ад лацінскага *terminus* – “пагранічны знак, мяжа”. Тэрмін – гэта слова або словазлучэнне, якое перадае дакладна вызначанае, адмежаванае ад іншых навуковае паняцце.

2) Рэкламнае выданне – гэта выданне, якое выходзіць з рэкламнымі мэтамі.

3) Імпліцытны – значыць невідавочны (у процілегласць эксpліцыднаму).

4) Шва – гэта такі няпэўны галосны, які абазначаецца значком-“вечкай” (“домікам”).

5) Гіпербала – гэта калі нехта “робіць з мухі слана”.

6) Дыферэнцыяльныя прыкметы – адметныя, размежавальныя прыкметы.

7) Афіксы – гэта, напрыклад, прыстаўкі, суфіксы, канчаткі…

8) Паміж часткамі складаных слоў змяшчаюцца так званыя інтэрфіксы.

9) Словаформа – элемент парадыгмы словазмянення.

10) Інтэрферэнцыя – гэта, так сказаць, адмоўныя наступствы безумоўна станоўчага факта знаёмства чалавека з іншымі, акрамя роднай, мовамі.

11) Апорны канспект – гэта асобная форма кадзіравання вучэбнай інфармацыі. Вось як выглядае адпаведны плакат для пяцікласнікаў…

12) Агапэ – самы ахвярны і ўзвышаны з адценняў кахання.

13) Афарызмы – своеасаблівыя “крышталі мудрасці”. Быццам запальнае шкло, яны канцэнтруюць прамяні розуму і пачуццяў, часта рассеяныя на сотнях старонак, якія выйшлі з-пад пяра іх творцаў.

**11.** Прааналізуйце ўвесь спектр прыкладаў, ужытых пры тлумачэнні аднаго і таго ж паняцця.

Этот электронный документ был загружен с сайта филологического факультета БГУ http://www.philology.bsu.by

1) Шчасце – гэта крок на шляху ад ціхай радасці да экстазу.

2) Шчасце – гэта адсутнасць няшчасця, гора і пакут.

3) Шчасце – гэта калі ў чалавека ўсё цудоўна і добра.

4) Шчасце – стан чалавека, адпаведны поўнай задаволенасці сваім жыццём.

5) Слова *шчасце* спрадвеку азначае “добрая доля пры дзяльбе”.

6) Шчасце – гэта пачуццё, падобнае на тое, якое адчувае рыбак, спаймаўшы вялізную рыбіну.

7) Шчасце ў жыцці – гэта тое, штоісціна ў пазнанні.

8) Шчасце – гэта калі ты навучыўся плаваць ў воблаках, катацца на вясёлцы і ўбачыў сваімі вачамі жар-птушку з казкі.

9) Тлумачачы, што такое шчасце, можна паказаць партрэт чалавека з усмешкай, у якога вясёлы і задаволены выгляд.

10) Шчасце – найлепшы стан чалавека.

11) Усе людзі імкнуцца да шчасця.

**12.** Растлумачце, што такое тропы:

а) з дапамогай этымалагізацыі;

б) з дапамогай вобразнай аналогіі;

в) пералічальным спосабам.

**13.** Супастаўце паралельныя прыклады увядзення ва інфармацыйную прамову колькасных дадзеных. Урыўкі якога з слупкоў змяшчаюць элементы папулярызацыі ў падачы лічбавага матэрыялу? Паспрабуйце растлумачыць свой пункт гледжання для кожнага з выпадкаў.

| | |
|---|---|
| 1) Першае ўзгадванне пра чайную расліну знаходзіцца ў кітайскай энцыкладедыі за 2 737 гадоў да нашай эры. | 1) Першае ўзгадванне пра чайную расліну знаходзіцца ў кітайскай энцыкладедыі больш за 27 стагоддзяў да нашай эры. |
| 2) Дыяметр Меркурыя складае прыблізна 4 840 кіламетраў. | 2) Дыяметр Меркурыя складае прыблізна 4 840 кіламетраў, а гэта ў 20 разоў менш за дыяметр Зямлі. |
| 3) Самая блізкая да нас зорка знаходзіцца на адлегласці каля 56 трыльёнаў кіламетраў. | 3) Самая блізкая да нас зорка знаходзіцца на адлегласці каля 56 трыльёнаў кіламетраў. Калі паміж гэтай зоркай і Зямлёй працягнуць павуцінку, то яна важыла бы 500 тон, – або, калі на гэтай зорцы зайграла бы музыка і гук мог бы дасягнуць Зямлі, для гэтага спатрэбілася бы амаль што 4 мільёны гадоў. |
| 4) Птушка калібры дасягае ў сярэднім 2 сантыметры ў даўжыню і важыць 2 грамы. | 4) Памеры птушкі калібры ўражваюць сваёй мініяцюрнасцю. Калібры дасягае ў сярэднім 2 сантыметры ў даўжыню і важыць 2 грамы. |
| 5) Паводле старога календара, | 5) Паводле старога календара, |

Этот электронный документ был загружен с сайта филологического факультета БГУ http://www.philology.bsu.by

| | |
|---|---|
| летазлічэнне пачыналася за 5 508 год да нараджэння Хрыста. | летазлічэнне пачыналася за 5 508 год да нараджэння Хрыста. Так, у "Аповесці мінулых гадоў" звесткі пра знакаміты паход Алега на Царгорад, які скончыўся ўмацаваннем княжацкага шчыта на браме горада, датуецца 6 415 годам. Давайце разам вызначым, які гэта быў год паводле новага летазлічэння?.. |

**14.** Параўнайце прыёмы ўвядзення ў інфармацыйную прамову лінгвістычнага зместу лічбавых дадзеных. Назавіце ўрыўкі, якія змяшчаюць прыёмы папулярызацыі лічбавага матэрыялу; кваліфікуйце выкарыстаныя прыёмы.

| | |
|---|---|
| 1) Больш за тысяч гадоў таму ў праславянскай мове налічвалася, паводле меркавання вучоных, некалькі дзесяткаў тысяч слоў. | 1) Больш за тысяч гадоў таму ў праславянскай мове налічвалася, паводле меркавання вучоных, некалькі дзесяткаў тысяч слоў. Многа гэта ці мала? Для параўнання заўважу, што асабісты слоўны запас сучаснага адукаванага чалавека, як правіла, не перавышае 10–12 тыс. слоў, а слоўныя патрэбнасці нашых штодзённых зносін увогуле абмяжоўваецца 2–3 тыс. розных слоў. |
| 2) За апошняе стагоддзе рэзка паскорыліся інфармацыйныя працэсы. Развіццё інфармацыйных магчымасцей людзей ішло так:<br>36 тыс. гадоў таму – з'яўленне самога віда homo sapiens і гукавай мовы;<br>14 тыс. гадоў таму – наскальны жывапіс;<br>6 тыс. гадоў таму – піктаграфія і іерагліфіка;<br>5 тыс. гадоў таму – літарна-гукавае пісьмо;<br>1453 г. – вынаходства кнігадрукавання;<br>1895 г. – кіно, радыё, тэлеграф;<br>1932 г. – тэлебачанне;<br>1942 г. – камп'ютэр;<br>1947 г. – транзістар;<br>1978 г. – відэадыскі.<br>Калі параўнаць часовыя інтэрвалы ад | 2) За апошняе стагоддзе рэзка паскорыліся інфармацыйныя працэсы.<br>Каб наглядна прадставіць іх лавінападобны рост, амерыканскі спецыяліст па тэорыі камунікацыі Фрэдэрык Уільямс параўнаў гісторыю "чалавека разумнага" з двума абаротамі па кругу гадзіннікавай стрэлкі, гэта значыць 36 тыс. гадоў прадставіў як адныя суткі – 24 гадзіны.<br>Развіцце інфармацыйных магчымасцей людзей ішло так:<br>на цыферблаце 00 часоў 00 хвілін – 36 тыс. гадоў таму – з'яўленне самога віда homo sapiens і гукавай мовы;<br>8 раніцы – 14 тыс. гадоў таму – наскальны жывапіс;<br>8 вечара (20-00) – 6 тыс. гадоў таму – |

Этот электронный документ был загружен с сайта филологического факультета БГУ http://www.philology.bsu.by

| | |
|---|---|
| пачатку да канца рада, не цяжка ўбачыць, што важнай передумовай цывілізацыі, залогам далейшага паскарэння інфармацыйных працэсаў было стварэнне пісьма – “вонкавай памяці” чалавецтва… | піктаграфія і іерагліфіка;<br>22-00 – 5 тыс. гадоў таму – літарна-гукавае пісьмо;<br>23 г. 38 хв. – 1453 г. – вынаходства кнігадрукавання;<br>23 г. 55 хв. 47 сек. (разлік пайшоў на хвіліны і секунды!) – 1895 г. – кіно, радыё, тэлеграф;<br>23 г. 56 хв. 11 сек. – 1932 г. – тэлебачанне;<br>23 г. 57 хв. 40 сек. – 1942 г. – камп’ютэр;<br>23 г. 57 хв. 52 сек. – 1947 г. – транзістар;<br>23 г. 59 хв. 1 сек. – 1978 г. – відэадыскі.<br>Калі параўнаць часовыя інтэрвалы ад пачатку да канца рада, нецяжка ўбачыць, што важнай перадумовай цывілізацыі, залогам далейшага паскарэння інфармацыйных працэсаў было стварэнне пісьма – “вонкавай памяці” чалавецтва… |
| 3) Паводле дадзеных шматлікіх даследванняў Т. М. Дрыдзе, недапушчальна вялікую колькасць слухачоў – каля 32 % – разумеюць паведамленне, але адчуваюць цяжкасці з вылучэннем галоўнай думкі. Для аратара гэта значыць: трэба вельмі пільна сачыць, каб галоўная думка была даведзена да слухачоў дакладна і зразумела. | 3) Паводле дадзеных шматлікіх даследванняў Т. М. Дрыдзе, каля 32 % разумеюць паведамленне, але адчуваюць цяжкасці з вылучэннем галоўнай думкі. Для аратара гэта значыць: трэба вельмі пільна сачыць, каб галоўная думка была даведзена да слухачоў дакладна і зразумела. |

**15.** Трансфармуйце друкаваны ўрывак інфармацыйнага характару (асабіста навуковы падстыль) аб’ёмам 1–2 старонкі ў у навукова-папулярнае выступленне. Якую дадатковую агульную мэту (акрамя толькі інфармацыйнай) будзе мець ваша прамова? Паспрабуйце выкарыстаць разнастайныя прыёмы папулярызацыі інфармацыйнага выступлення:

– прыдумванне “рэкламнай” назвы;
– прыцягненне дадатковых прыёмаў тлумачэння паняццяў (2–3-х);
– пабудова ўступу і заключэння ўскоснага тыпу;
– ажыўленне выкладання пры дапамозе слоў і абаротаў размоўнай афарбоўкі (2–3-х);
– падбор дарэчных сродкаў маўленчай вобразнасці – тропаў (2–3-х);

Этот электронный документ был загружен с сайта филологического факультета БГУ http://www.philology.bsu.by

– уключэнне камунікатыўна-кантактных граматычных моўных сродкаў: зваротаў, займеннікавых канструкцый, рытарычных пытанняў, пытальна-адказнага ходу і г.д. (3–4-х).